Шчырая падзяка сп. Але Орса—Рамано за спрыяньне ў выданьні гэтай кніжкі і вялікую працу на ніве беларускае справы.

KAMUNIKAT.org

# УДОГ

Прыпавесць

KAMUNIKAT.org

KAMUNKAT.org

# 1

## 1831
## Пелагея

На небе не было ні хмурынкі, а гром не сціхаў увесь надвячорак. Сіплаваты, як кашаль сухотніка, ён нечакана ўсчынаўся дзесьці ўдалечыні, адзываўся рэхам па наваколлі, павольна патанаў у знямелых ад пярэпалаху гаях і дубровах. Кожны раз зямля страхавіта ўздрыгвала пад ягонымі ўдарамі, а аблепленыя птушкамі дрэвы глуха рыпелі патрывожаным голлем. Раптам невядома адкуль узлятаў вецер, разбэрсваў леташні сухастой на балацінах, з гучным самотным свістам кружыў над імшарамі. Птушкі спалохана сягалі па-над дрэвамі, павісеўшы ў паветры хвіліну-другую, як толькі ён аціхаў, роем клаліся зноў, на голыя з зімы камлі. Зрэдку грымоцце суправаджала бліскавіца. Тады гром неяк адразу глушэў, рабіўся кароткі і рэзкі, бы пошчак пугі. Асветленае на кароткі момант лясное закуцце весела ўспыхвала мірыядамі падталых лужынак-льдзінак. Стомленыя доўгім чаканнем цяплейшых дзён людзі са страхам глядзелі, як узмывае над палеткамі і тут жа знікае ў зямным прадонні вузкі пасак святла, з надзеяй уздыхалі: «Можа, дасць Бог дажджу».

«Лінуў бы ўжо, ці што», — прыхінаючы вольнаю рукою да грудзей саджанец, падумала Пелагея і навобмацак слізганула ў паўзмрок дзвярэй.

Цесная, з патрэсканых неабчасаных бёрнаў кухня сустрэла яе смуродам тытуню. Чатырнаццаць мужчын, якія дагэтуль аб нечым гучна гаманілі, дружна, бы па камандзе, сціхлі.

— Вучыцелька, — падняўся з-за стала гаспадар хаты Міхал Бабышка і з перасцярогаю зірнуў у кут, дзе стаялі прыслоненыя да сцяны чатырнаццаць жалязяк. — Па справе ці як?

— Чула, адыходзіце, дык рашыла разлічыцца. — Жанчына дастала з торбы некалькі бутэлек. — За тое, што страху ў школцы адрамантавалі.

Касінеры заўсміхаліся, падміргваючы адзін аднаму, пацягнуліся рукамі да парожніх кубкаў.

— Што разлічвацца, дзеці нашы, не чужыя, Пелагея Юр'еўна, — незадаволена азваўся чырванатвары маладзец, што сядзеў першы ад парога. Яго звалі Каятан Аўласевіч, ён, хадзілі чуткі, быў сярод тутэйшых касінераў за галоўнага. — Ды і піць нам няможна, заўтра ў дарогу.

Астатнія мужчыны сярдзіта зашыкалі на яго. Маўляў, падумаеш, прычына — у дарогу. Да мястэчка рукой падаць. А адтуль да гасцінца, дзе мяркуецца далучэнне мясцовых паўстанцаў да канфедэратаў, на падводах маюцца падвезці. Панінаму брату Тамашу гэтая справа даручана, а ён чалавек надзейны,

Каятан недаверліва зіркнуў на бутэлькі, падхапіўся з месца, штосьці шапнуў Бабышку на вуха.

— Кажаць пан Аўласевіч — нядобрае пітво, — прамовіў той і пачухаў патыліцу. — Бытта пані вучыцелька прывезлі з Крайны нейкую трасцу і збіраецеся нас усіх ёю патруціць.

— Няпраўда! — зайшлася абурэннем жанчына. — У Крайну я па паперу ды падручнікі ездзіла, а не па атруту.

— А ў істопцы што, зачыніўшыся, два дні рабілі? — уступіў у размову Каятан.

— Дык... гнала гарэлку. — Пелагея рашуча пасунула да сябе адну з бутэлек. — Не верыце — першая вып'ю.

— Годзе ўжо, — прымірэнча сказаў гаспадар і дадаў, звяртаючыся да хаўруснікаў: — Што мы, звяры якія, што бабу будзем мучыць. — Сказаў і ўзяўся адкаркоўваць бутэльку.

Пелагея счакала, пакуль разліюць гарэлку, затым выскачыла з хаты на двор, тулячыся да сцяны, падалася ўсцяж панадворкаў да пакояў. Грымоцце сціхла, але маланкі па-ранейшаму працягвалі секчы, таму было відна, як удзень.

Дапяўшы да першай курціны, яна спынілася. Разграбла рукамі цвердаватую, прыхопленую вечаровым холадам зямлю, дастала з-за пазухі расліну, уторкнула ў ямку. Усміхнулася сама сабе: справа зроблена. І толькі гэтак падумала, як моцны раскат грому скалануў наваколле. Пелагея хуценька падхапілася, шырокім крокам папраставала назад, у вёску.

З Бабышкавай хаты ўжо даносіліся спевы. Спявалі «Нужа, хлопцы...»*.

Сэрца Пелагеіна зайшлося нянавісцю. Каб яны паздыхалі! Колькі ты іх ні вучы людскай мове, як аб сцяну гарох. Як ёй тут усё збрыдзела ў гэтым чужым, незразумелым краі! Але ж неяк будзе, нездарма кажуць: вада і камень точыць. Зараз галоўнае — пра ўцёкі падумаць. Пакуль не спахапіліся.

---

* «Нужа, хлопцы...» — пачатковыя словы «Песні касінераў».

Канстанцыя выбегла следам за дзяўчатамі ў двор і знерухомела ад нечаканасці: сапраўды, усе чатырнаццаць мужчын, што надоечы збіраліся ў мястэчка, каб адтуль пад камандаю яе брата Тамаша рушыць насустрач асноўнаму войску паўстанцаў, сноўдалі па дзядзінцы, асцервянела дзяўблі косамі напалову адталую зямлю. Усе як адзін былі босыя, з расхрыстанымі на грудзях кашулямі. Змясіўшы дарэшты глебу на дзядзінцы, яны ўзяліся нішчыць кустоўе. Ледзь-ледзь набрынялыя пупырышкамі кусцікі ружаў, язміну, бэзу бездапаможна валіліся ніцма пад ударамі косаў, бязжаласна ўтоптваліся ў гразь. Канстанцыя памкнулася туды, але дзяўчаты не пусцілі яе: «Няможна, панечка, здратуюць!» І праўда, паўголыя касінеры з шалёнымі няўцямнымі вачыма нагадвалі гурт здзічэлага статку. Канстанцыя пералажгналася, адступіла назад, да ганка. «Паклічце вучыцельку, Пелагею Юр'еўну, — загадала адной з чалядніц. — Яе пабойваюцца, дык, можа, дасць рады». — «Вучыцелькі няма», — адказала дзеўка. — «Як няма? Дзе ж яна дзелася?» — «Хто ведае. Кажуць, бачылі, як ішла дасвеццем да гасцінца». — «Авохці мне! Уцякла, няйначай. Нездарма Тамаш ёй не давяраў. Як у ваду глядзеў». — Канстанцыя зноў спусцілася на дзядзінец, у разгубленасці стала пад дрэвам. Што рабіць? Думкі, паганяючы адна адну, бязладным роем круціліся ў галаве. «Ідзіце дахаты!» — набраўшы ў лёгкія паболей паветра, выгукнула яна — хутчэй дзеля самазаспакаення, чым у спадзеве на нейкі станоўчы вынік. Касінеры на хвіліну замерлі. «Разыходзьцеся! — скамандавала яна зноў, ужо больш упэўнена. — Ану, каму кажу!» Мужчыны, пагрозліва махаючы косамі, падышлі бліжэй. «Панечка, уцякайце!» — закры-

чалі перапалоханыя дзеўкі і стрымгалоў кінуліся да пакояў. «Я сказала — разыходзьцеся!» — словы самі сабою вылятаалі з вуснаў Канстанцыі. Страху яна болей не адчувала. «Ідзіце дахаты!» — крыкнула яшчэ раз і пайшла насустрач раз'ятраным касінерам. І — здарыўся цуд. Мужчыны спыніліся, драпаючы насамі косаў скалечаную зямлю, пачалі пацíху разыходзіцца.

Канстанцыя перавяла дух, акінула паглядам дзядзінец. Ён нагадваў пляцоўку пасля віхуры. Толькі адна раслінка, нібы насуперак усяму, ацалела ў нялюдскай калатнечы. І нават, нягледзячы на сцюжу, паспела ўжо выпусціць некалькі буравата-зялёных, з малюсенькімі іголачкамі на канцах, лісцікаў. Як яна называецца, Канстанцыя, хоць і была дасведчанай у батаніцы, не ведала. Але зараз ёй тое не абыходзіла. Куды больш непакоілі паводзіны касінераў. Што гэта з імі? Ці не павар'яцелі? Яна паклікала фурмана, з перасцярогаю паглядаючы ўслед мужчынам, што сунуліся краем прысадаў у накірунку вёскі, распарадзілася запрагаць каня.

— У мястэчка да Тамаша паедзеш, — сказала звычным да загадаў голасам. — Раскажаш яму ўсё, як было. Лекара няхай прышлець.

Лекар, сур'ёзны негаваркі чалавек гадоў шасцідзесяці, прыехаў надвячоркам. Ягоны прысуд быў кароткі, бы ўдар бізуна:

— Патруціліся.

— Патруціліся? — Канстанцыя здзіўлена ўзняла бровы. — Чым?

— Гэта аднаму Богу ведама, — усміхнуўся стары. — Ды яшчэ, можа, самім мужыкам. Папытайцеся ў іх, як апрытомнеюць.

Касінеры апрытомнелі, аднак ніякія размовы з імі наконт прычын масавага ачмурэння вынікаў не далі. «Мусіць, вучыцелька гэная нешта падрабіла», — сышліся на думцы, і на тым усё і скончылася.

KAMUNIKAT.org

# 2

## 1960
## Ромка

Запалка порстка шарганулася аб край карабка, успыхнула і тут жа пагасла. Рэзкі серны смурод разліўся па кухні. Ромка паклаў карабок на месца, упёрся пятамі ў дошку ўслона, дастаў з пяколка другі. З гэтага запалка загарэлася адразу. Хлопчык саскочыў з лавы, жвава перабіраючы нагамі па падлозе, накіраваўся ў сені.

З-за хісткай рудой перабойкі, ад суседзяў, даносіліся п'яныя галасы і гукі прайгравальніка. Ромка перабег вузкі, застаўлены living рознымі гаспадарчымі прычындаламі калідор, выскачыў на панадворак.

Ля павеці дуракаваты Юзючок шчапаў дровы. Ён два дні таму прывалокся са сваёй вёскі ў заробкі і зараз так быў заняты справаю, што на Ромку і не зірнуў. І Ромка яго не зачапіў, хуценька, подбегам, папраставаў да пуні.

З-за несупынных дажджоў сена сёлета было крыху ваглаватае, і матка, каб яно не папрэла, штодня адчыняла дзверыну пуні насцеж. Але сёння перад адыходам у краму чамусьці гэтага не зрабіла — мабыць, забылася.

Стромкая вузкаватая кладня на гэты раз здалася больш высокай, як звычайна. Але Ромку тое не збянтэжыла. Чапляючыся рукамі за доўгія, сціснутыя верхнімі пластамі сена канцы цімафееўкі, ён імкліва палез угору і неўзабаве ўжо сядзеў на маціцы, якраз на тым месцы, дзе раней была столь, якую пару гадоў таму знеслі, перарабляючы лямус на пуню.

Тут акурат усё звычайна і адбывалася. Стоячы на маціцы тварам да выемкі ў сене, запальвалі запалку, шпурлялі яе ўніз і, як толькі сена схоплівалася агнём, ніцма валіліся на яго. Полымя гасла, і гэта азначала выйгрыш, перамогу. Калі не ўдавалася даць яму рады адразу, збівалі адзеннем. Забаву прыдумалі старэйшыя хлопцы. А ладзілі яе спачатку ў аборы, дзе, колькі памяталі сябе, валялася старое, паўстлелае пакулле. Днямі тое пакулле кудысьці вывезлі, і старэйшы Ромкаў брат Толік прапанаваў гуляць у пуні. Так і зрабілі — вядома, употайкі ад бацькоў.

Учора выйграў брат. Яму тройчы ўдалося дарэшты накрыць сабою агонь. Сёння ўранку ён выправіўся з маці ў краму на той бок Дзвіны, і Ромку нічога не засталося, як бавіцца ў адзіноце.

У дальнім куце пад самым паддашкам спаў бацька. Калі ён паспеў прыйсці сюды ад суседзяў, Ромка не бачыў, але па гучным, з падсвістам, храпе, імгненна вызначыў: п’яны добра і прачнецца не хутка. Ён дастаў з кішэні карабок, балансуючы босымі нагамі на колкай маціцы, чыркнуў запалкаю па рудым шурпатым баку.

Сена загарэлася ўмомант. Ён не паспеў нават нахіліцца перад скачком, як усё наўкола аказалася ахоплена полымем. Яго было так шмат, што Ромка разгубіўся. Затым, не памятаючы сябе ад страху, кулем сігануў з кладні на дол, пужаючы

курэй, выкаціўся на трасотнік. Юзючок падбег да яго, бездапаможна ўзмахнуў у паветры паленам, адчайна заскуголіў.

Матчыну паставу ён пазнаў здалёк. Затым пачуў і Альбінін голас — перапалоханы, роспачлівы:

— Толік, бяжы па людзей!

Брат кінуўся да пакояў.

Суседзі павыскоквалі на двор, у паніцы замітусіліся ля пуні. Як заўсёды, калі здаралася нешта незвычайнае, каманду ўзяў на сябе Вітольды. Ромка чуў, як ён загадаў старэйшым хлопцам бегчы па коней. Але калі коней прывялі і пачалі запрагаць, каб падвезці да пажарышча вады, ратаваць ужо не было чаго.

Страх абручам скаваў Ромкава цела. За ўвесь час, што гарэла пуня, ён толькі аднойчы прыўзняў галаву — паглядзець, дзе маці. Альбіны ён у дыме не ўбачыў, затое выразна пачуў сярод вэрхалу яе спужаны голас. Падхапіўся, каб бегчы на яго, але не змог, неслухмяныя ногі нібы ўраслі ў зямлю. Стараючыся як менш удыхаць едкі пах гару, урэшце-такі падняўся, пасунуўся бульбянішчам да пакояў.

— Ромак, сынок! — матка абхапіла яго за галаву, прытуліла да сябе.

Толік, стоячы ўбаку, засяроджана глядзеў на брата ўважлівымі, крыху касаватымі блакітнымі вачыма. Ягоны прадаўгаваты, спэцканы сажаю твар нагадваў твар мурына са скульптурнай калекцыі дзядзькі Вітольдага.

— Няхай яму рукі адсохнуць, таму нягодніку, што падпаліў, — не выпускаючы Ромку з абдымкаў, сказала Альбіна.

Занятая меншым сынам, яна і не заўважыла, як перасмыкнуліся нібы ад болю пры гэтых яе словах вусны большага.

Горка галавешак яшчэ прывідна высільвалася рэшткамі дыму, а суседзі, збіўшыся ў гурт, абмяркоўвалі, што рабіць далей. Бедавалі: сена згарэла, а касіць больш няма дзе. З утварэннем у Дубраўцы калгаса людзей паболела, і статку зрабілася цеснавата.

— Як-небудзь будзець, — не адпускаючы ад сябе ні на крок Ромку, сказала Альбіна і занепакоена дадала: — Гірона бачыў хто?

— Мабыць, спаць дзе рынуўся, — адазвалася Бакевічава Галіна. — Выпівалі з Петраком. Гляджу — захмялеў. Кажу: выпіў, дык ідзі кладзіся як чалавек. Ён у дубкі: давай, маўляў, яшчэ. Выпхнула неяк, пайшоў...

— У пуню пайшоў, — вымкнулася наперад старэйшая Галініна Валька.

— Матка Боска! У пуню! — выгукнула Альбіна і непрытомная паваліліся на зямлю.

Шукалі Гірона доўга. Чацвёра прыезджых пажарнікаў і Вітольды спачатку прыгасілі брандспойтам галавешкі ад бёрнаў і дошак лямуса, што праваліліся ў падпол, і толькі пасля гэтага ўзяліся іх разграбаць. Рабілі без супынку некалькі гадзін, аж пакуль не натыкнуліся ў адным з куткоў на счарнелыя косці. З жахам гледзячы на тое, што засталося ад мужа, Альбіна так моцна сціснула Ромкаву руку, што той ускрыкнуў ад болю. Затым яна падышла да машыны, у якой сядзеў са звязанымі рукамі перапалоханы да паўсмерці Юзючок, сказала міліцыянеру:

— Пусціце, ён невінаваты.

— Невінаваты? — здзівіўся той. — Хто ж тады падпаліў пуню?

— Мужык мой заядлы быў курэц, запаліў п'яны, во і загарэлася, — адказала яна і страціла прытомнасць другі раз.

Гірона хавалі на трэці дзень пасля пажару. Майстравіты Вітольды збіў брату труну, аздобіў яе па баках адмысловаю разьбой. Увесь час, што дамавіна стаяла ў хаце, сямігадовы Ромка прасядзеў у суседзяў. І толькі на могільніку, падбадзёраны пяшчотнымі словамі маткі і ксяндза, крыху адтаяў і нават насмеліўся падысці да труны з бацькавымі парэшткамі.

Зямля пахіснулася пад ягонымі нагамі ў гэты момант і доўга, аж пакуль не ўзняўся над магілаю курганок, гайдалася сюды-туды, поўнячы сэрца скрухаю і адчуваннем віны.

Тыдзень пасля пахавання прайшоў у клопатах. Спачатку даводзілі да ладу месца пажарышча. І хоць рабілі гэта прыскакам, пасля працы ў полі, справа рухалася даволі спорна. І неўзабаве, пасля доўгай спрэчкі, ці варта ўзводзіць новы будынак на папялішчы, узяліся класці воддаль першыя вянцы, але не пуні, а шахі*, каб хапіла месца і пад сена, і пад буракі і можна было ў выпадку чаго, як зараз вось, паставіць і статак.

Апроч сена ў агні згарэлі ладныя запасы мукі і мінулагодняй бульбы. У нядзелю Вітольды запрог каня, і Альбіна з Галінінаю сястрой Польцяй Свістуніхай выправіліся на латышскі бок па правіянт.

Грошай хапіла на тры мяхі сечкі, некалькі кіло пернікаў і з дзесятак боханаў пытляванага хлеба.

---

* Шаха (дыял.) — вялікая пуня.

Вярнуўшыся дахаты, жанчыны падзялілі муку між сем'яў, ласункі раздалі дзецям.

Ромка, які пасля смерці бацькі ўвесь час імкнуўся застацца адзін, на пачастунак не паквапіўся. Альбіна загарнула чатыры ягоныя пернікі ў анучку, паклала ў шафу, моўчкі падалася з хаты на двор, дзе каторы дзень запар завіхаўся ля тоўстага ліпавага пакалака самотны Вітольды. Думка вычасаць брату помнік з дрэва прыйшла яму ў голаў яшчэ падчас пахавання, і цяпер ён аддаваў гэтай справе ўвесь вольны час.

Занятай хатнімі клопатамі Альбіне помнік абыходзіў мала. Куды больш непакоілі сыны. Ромка ходзіць сам не свой, па начах будзіць яе і суседзяў нечалавечым крыкам. І Толік перамяніўся са смерцю бацькі: калодзеж суму ў вачах. А ёй і пагаварыць з хлопцамі як след не выпадае з-за праклятай некальніцы.

Напрыканцы тыдня на пляц перад пакоямі ўехала падвода. Кабета год сарака ў крэпдэшынавай сукенцы саскочыла з яе, часценька міргаючы кароткімі светлымі вейкамі, здзіўлена сказала:

— Место какое-то... странное.

Гаварыла яна не па-тутэйшаму, але ўсе зразумелі яе.

— Гэта былая панская сядзіба, — сказаў спадарожнік жанчыны старшыня сельсавета Сцяпанавіч. — Паны з'ехалі, а пакоі, бачыце, ацалелі. Цяпер тут калхознікі жывуць, маладыя сем'і. Казаў той, усё для народа. Гэна — шаха будуецца замест пуні, што згарэла...

— А для клуба где помещение?

— У пакоях. Вялікая зала, месца хопіць. І вам побач для жытла куточак знойдзецца.

— Электричества нет?

— Ёсць, але часова адключанае — лінію рамантуюць. Ці не заўтра падключаць збіраюцца.

Маладзіца няспешна абышла абсаджаны язмінам і ружамі пляц, спынілася перад Вітольдавымі скульптурамі.

— А это что?

— Гэта штукар тут адзін ёсць, дык штукуець, выразаець featureзнае...

— Что же, для украшения клуба вполне могут сгодиться. — Яна пакратала кожную фігуру рукамі, паблажліва ўсміхнулася. — Надо же: в такой глухомани и такой талант!

К вечару ўсе ў Дубраўцы ведалі: у вёсцы будзе клуб і загадчыцу яго, маладзіцу ў крэпдэшынавай сукенцы, зваць Славай.

— Слава? Нянашае нейкае імя, — круцячы галавой, сказаў Пятрок. — Стася і то лепей. Праўда, Раман?

— Не ведаю, дзядзька, — адказаў той і адвёў пагляд убок. Прыезджая яму спадабалася, і ён баяўся, што хто-небудзь пра гэта здагадаецца.

Толік расхінуў бэзавы куст, ступіў у гушчар. Пасталелае за апошні тыдзень дрэўца выглядала неяк непрытульна. Прыгледзеўшыся да яго як след, Толік зразумеў прычыну: усе ягады на ім нібы карова языком злізала.

Дрэўца яны з Ромкам апышкалі на пачатку лета. Ягады хоць і былі зусім маленькія, аказаліся дужа смачныя. Што за яны, ніхто ў вёсцы не ведаў. Нават дасведчаны Вітольды адно паціснуў плячыма: маўляў, на ягонай памяці такіх у Дубраўцы не сустракалася. Можа, птушкі адкуль занеслі насенне. Ягады з кожным днём рабіліся ўсё

смачнейшыя. Дык ці дзіва, што нехта паабзбіраў?

Штосьці шаснула ззаду — быццам хто ішоў. Толік азірнуўся. Ромка, маленькі на фоне гонкага кустоўя, стаяў у некалькіх кроках ад яго і церабіў далонню кішэню прышмальцаваных картовых штаноў.

— Гэта... я абабраў, — сказаў вінаватым голасам і зрабіў яшчэ адзін крок наперад. — Тады, як...

— Як пуня згарэла? — здагадаўся Толік.

Брат раскрыў рот — мусіць, каб пацвердзіць ягоную здагадку, але вымавіць нічога не паспеў. Асляпляльна-жоўты сноп святла ірвануўся з акна бліжэйшай хаты, разануў прыцемак, разліўся ля самых яго ног.

*Агонь так хутка ахапіў кладню, што Гірон не паспеў ахнуць. Пасунуўся ўбок, хаваючы ад полымя твар, пачаў закопвацца глыбей у сена. Гэта не дапамагло, агонь з кожнаю хвілінаю пранікаў усё далей у тоўшчу кладні. Ромка кінуўся з выпрастанымі рукамі да бацькі, узяўся гасіць полымя далонямі. Усё было марна. Агонь не адступіў, наадварот, рабіўся ўсё больш страхавітым. А Гіронава цела ўсё танела і ўрэшце ператварылася ў некалькі чорных костак. Ромка закрычаў, вопрамеццю кінуўся прэч ад жахлівага месца...*

Шукалі яго ўсёю грамадой. Знайшлі пад раніцу ля ракі, побач з млынам.

— Што цябе напалохала, сынок? — ведучы яго сцежкаю да пакояў, дапытвалася Альбіна. — Няўжо праўда, як Толік кажаць, — святло?

Ромка моўчкі матлянуў галавою ў знак згоды.

— Дык святло ўсё ж? Гэта ж алектарка, Ромак, яе не след баяцца. Наадварот, добра, што адрамантавалі... Цяпер у нас заўсёды відна будзець.

Апошнія яе словы прагучалі ў вушах меншага сына як прысуд, але яна пра тое не ведала.

KAMUNIKAT.org

# 3

## 1965
## Любошчы

*Водар парафіну расплыўся ў паветры, і тут жа да яго прымяшаўся пах гарэлага адзення. Бацька прыўзняў у труне галаву, ратуючыся ад агню, пасунуўся ўбок. Полымя ўжо лізала ягоны рукаў і аббіўку дамавіны. Трэба было нешта рабіць. Ромка здзёр з канапы выцвілую старую капу, пачаў збіваць ёю агонь. Але стала яшчэ горш: вогненныя пырскі разляталіся пукамі ўбакі, траплялі ў сцены, у столь, у мэблю. Ромка ў адчаі закрыў твар рукамі, апрометцю кінуўся з лепшага пакоя ў кухню, з якой даносіўся паважны, крыху сярдзіты голас ксяндза...*

— Велькія мальцы, а ў споведзі не былі. — Тонкі, чысты пробашчаў палец ушчувальна захістаўся перад Ромкавымі вачыма. — Нявольна гэтак.

— Даруйце, ойча, — паўтарала як заведзеная Альбіна і роспачліва мітусілася па кухні. — У школе страшаць, што выключаць, як пойдзеш. Што нам рабіць?

Ромка, які яшчэ добра не ачнуўся ад сну, неўразуменна глядзеў то на ксяндза, то на маці.

— Бацькам грэх, не каму. — Ксёндз гаварыў, нібы ўбіваў у бэльку цвікі. Нарэшце, стаміўшыся, мусіць, павучаць, пайшоў.

Ромка, карыстаючыся момантам, слізгануў за парог следам за ім. Альбіна засталася ў хаце адна. Але не паспела яна выцягнуць з печы апошні кацёл, як на ганку зноў пачуліся крокі.

Стася, вясёлая, у новым ваўняным жакеце, увайшла ў кухню.

— Нікога больш няма? — сказала, зырачы па кутках. — Сёння рэпетыцыя, дык прыходзь. «Ленин всегда живой» будзем развучваць.

— Прыйду, а як жа. Вітольдаму сказаць?

— Сама скажу. Дзе ён?

— На трасотніку.

Стася паправіла перад люстэркам валасы, знарок няспешна, быццам нехаця, накіравалася ў сені. Альбіна хуценька ўправілася з печчу, таксама падалася на двор.

Ля прыслоненага да плота Стасінага ровара стаяў Ромка і мацаў пальцамі бліскучую раму.

— Мама, купіш такі?

— Куплю, — сказала яна і ўздыхнула. Дванаццаць яе меншаму, а ценкі, бы васьмігадовы. Маўклівы, зацяты, слова не выцягнеш. І крычыць спрасоння. Вадзіла да шаптухі — каб што. Цяжка з мальцамі.

— Вітольды кажаць, фігуру можна прадаць, і будуць грошы...

— Хто яе купіць, фігуру!

Вітольды сядзеў, абжаргаўшы босымі нагамі камель, на бервяне, дзяўбаў далатом напалову ўжо апрацаванае дрэва. Побач з ім стаяў Толік і ўважліва сачыў за кожным дзядзькавым рухам. Кры-

ху воддаль, на перакуленым пні, сядзела Валька і ела недаспелы гурок. Яна нядаўна вярнулася з Дзвінска, дзе вучылася на швачку і дзе з ёю здарылася непрыемнасць з-за аднаго мужчыны, і, падобна было, шчыраваць з маткаю па гаспадарцы не збіралася. На пачатку года ёй споўнілася семнаццаць, але выглядала яна на больш — з-за паставы, што неяк няўзнак, на вачах акруглілася, зрабілася па-жаночы вабнай. Апошні месяц яна, як і Толік, не адыходзілася ад Вітольдага, і той, хоць і адчуваў няёмкасць перад Галінаю і суседзямі, не надта гэтаму праціўіўся.

Тут жа таўклася і Стася. Непрыязна пазірала спадылба на маладую суперніцу, рабіла выгляд, быццам думае нешта сваё. Убачыла Альбіну, схамянулася, заспяшалася адыходзіць.

— Чакаем на рэпетыцыі, Вітольд Іванавіч, — сказала, падцінаючы тонкія вусны. — У восем.

— Я таксама прыйду, — сказала Валька.

— Ксёндз, відалася, ішоў ад вас, — знарок не зважаючы на яе, а звяртаючыся да Альбіны, працягвала Стася. — Што яму нада?

— Сварыўся, што мальцаў у касцёл не ваджу, — адказала Альбіна.

— Глядзі ты! — Стасін твар успыхнуў ад абурэння. — А што дзяржава ў нас ад царквы аддзеленая — забыўся? — Яна вярнулася да хаты па ровар, узлезла на раму, парупіла з песняю з панадворка.

Альбіна паставіла кошык на ганак, стомлена апусцілася побач. Ісці ў хату не хацелася — за два гады тая так і не стала сваёй. Залетась, акурат во гэткаю парою, як зараз, у пакоях парабілі склады для ўгнаенняў, а жыльцоў паперасялялі ў хаты вывезеных падкулачнікаў. Тады ім, Старынскім,

і дастаўся дзірававаты, хоць з выгляду яшчэ досыць прыстойны трысцен дзядзькі Вайцюля. Пазней, калі зліквідавалі склады, а да пакояў пацягнуліся з усяго наваколля падводы па дармавыя дрэва і цэглу, да іх перабраўся Вітольды. Яна не хацела: мужчына нежанаты, што людзі скажуць? Але мусіла пацясніцца: радня ёсць радня.

А тым часам пакоі зусім заняпалі. Вельмі хутка ад іх засталася адна ніжняя, і то не ўся, частка. Бэлькі, перакрыцці, каменне перакачавалі на ферму, шмат што асела ў асабістых падвор'ях дубраўцаў. Цягнулі ўсё падрад, без разбору. На што ўжо нядбайны Польцін Янка, а і той прывалок дадому рэдалі* каляровае кафлі ад печы, не ведаючы, як даць ёй рады, згрузіў грудаю ля хлява. Адзінае, што засталося на сядзібе некранутым, былі сутарэнні. У іх парабілі загародкі для авечак, а ў апошнім ад лядоўні — клуб. Цяпер Стасі працы паменела, і напрадвесні яе прызначылі па сумяшчальніцтве звеннявой па ільне.

Уздыхнула Альбіна: гэтак усё змянілася ў Дубраўцы апошнім часам. І ці ўсе гэта яшчэ змены? Вунь наваспечаная звеннявая з ранку да змяркання бродае па наваколлі з сякераю, шукае, што яшчэ можна высекчы. Ходзіць пагалоска, нібыта назад, у сваю Крайну, збіраецца, вось і пляжыць падрад, што трапіць пад руку.

З-за кустоўя, ад пуні, пачуўся шоргат ровара. Брыгадзір Мэська Пілецкі, якога ўсе звалі за вочы Манолісам Глезасам, падруліў да самае хаты, спыніўся побач з Альбінай.

— Заўтра лён церабіць, — сказаў надтрэснутым — ці не з перапою — голасам. — Дык прыходзьце ўсе.

---

* Рэдалі — від калёсаў.

Старэйшыя падавалі кулі на канвеер, дзятва пераймала абмалочанае з камбайна, адносіла да сцірты. Праца хоць і здавалася на першы погляд няцяжкай, вельмі хутка стамляла. Апроч стомы, даймаў пыл. За якую гадзіну твары ў людзей зрабіліся шэрыя, бы прысак. Дадаваў клопату і вецер. Сцюдзёны, напорысты, ён віхураю ўрываўся на пляц перад камбайнам, зласліва насвістваў, шпурляў дубраўцам у твар жмені пацяробкаў напалову з пылам. Брыгадзір усё часцей пасыкваў на дзяцей, каб варушыліся.

Альбіна з трывогаю зірнула раз, другі на свайго меншага. Зноў кепска спаў уначы і зараз ходзіць, нібыта здань. А яшчэ ж да катэхета ўвечары, цвічыць малітвы, дык ці вытрывае?

Ззаду нячутна падышоў Вітольды, перакрываючы голасам грукат камбайна, гукнуў у вуха:

— Ксяндза забралі.

— Куды забралі? — не зразумела яна. — Хто?

— Чортведама. Брыгадзірыха ваду прывозіла, дык казала.

— Твая ўжо ці не пастаралася...

— Якая мая?

— Ільнаводка. Звенавая, а на полі не паказалася нават. — Альбіна пераняла апошні куль, панесла да сцірты. — З бартаю* сноўдаецць у прыцемках... Каб на яе дрыстун.

— Шкода пробашча. — Галіна недаўменна пахітала галавой. — І чым ён Стасіндоры не дагадзіў?

— Вядома чым, — сказала Альбіна. — Пасварыўся, што сячэць наўкола, во і адпомсціла, данесла.

— Пакараець яе Бог.

---

* Барта — від сякеры.

— Глядзі, каб не пакараў. Хутчэй, мы тутака ў пустэльні застанемся. Папляжыць усё ды паедзець.

— Думаеш, паедзець?

— Кажуць усе. Нібыта дачка там у яе хворая, няма каму даглядаць. Знова, на Вітольдага крыўда... А й варта! Было не квапіцца на маладога. Ён сабе і дваццацігадовую найдзець. А можа і маладзейшую. Тваю Вальку, да прыкладу.

— Няхай бы, я не проці была б.

— Казала яму — пасмяяўся. Замаладая, маўляў. Яму, мусіць, фігуры ягоныя драўляныя болей за ўсё абыходзяць. Ну дык няхай і цешыцца імі, халасцякуець.

Крокі харыстаў паволі сталі ў вечаровай цішы. Вітольды, ніякавата ўсміхаючыся, моўчкі таптаўся на месцы. Ягоныя закаструбелыя ад пастаяннага сяброўства з далатом і малатком рукі на тле бялюткай святочнай кашулі нагадвалі галаўні. Цяпер, застаўшыся з ім сам-насам, можна было пачынаць размову. Але Стася не спяшалася. Крыўда абручам перацiснула ёй горла. Як яна ўсіх іх ненавідзіць! Усіх — з іх недарэчнымі імёнамі і звычкамі. Гэтага нельга, тое — «нявольна». Адзіным, да каго гарнулася, быў ён, Вітольды. Ды і з ім, падобна, непярэліўкі. А гэтулькі сіл паклала, каб прынадзіць. І ўжо, здавалася, пасунулася справа, як адкуль ні вазьміся гэтая Валька... І ўсе старанні — кату пад хвост. Дык пра што гаварыць? Не, не будзе яна нічога казаць.

— Ад'язджаеш, чуў? Праўда гэта?

— Можа быць. — Стася збегла з ганка, рашуча ступіла ў густы, напоўнены водарам яблыкаў прыцемак. Сякера пры ёй, а больш нічога і не трэба. Маленькая вострая сякерка — адзінае, што патрэбна ёй, каб выказаць сваю пагарду і нянавісць.

Валька зняла з плота даёнку, не даслухаўшы, што казала з істопкі праз адчыненыя дзверы маці, накіравалася да выгана. Спяшалася: карцела як найхутчэй пабачыць Вітольдага.

Вітольды з Толікам палілі на сотках падсохлы бульбоўнік. Было цеплавата, і на спінах у абодвух выступілі плямы поту.

Яна ўладкавалася пад Міртаю, робячы выгляд, быццам доіць, пачала цікаваць за імі.

Сталыя мужчыны заўсёды падабаліся ёй больш, чым аднагодкі. Таму і цяпер закахалася ў старэйшага. Праўда, ніколі нічога путнага з такога кахання не атрымлівалася. Вунь летась выкладчыка аднаго ў Дзвінску ўпадабала — і што? Такі вэрхал узнялі ў вучэльні, што лепш і не ўспамінаць. Выклікалі маці, тая прыехала, каб забраць яе назад у Дубраўку. Сорамна ўспомніць! Прыехала ў ватоўцы і з парога — вучыць, як сябе паводзіць з мужчынамі... Тут зноў — Вітольды. Ёй шаснаццаць, яму — трыццаць шэсць. Да таго ж ходзіць пагалоска, са Стасяй у яго штосьці.

Тым часам мужчыны скончылі працу, пакідалі вілы, накіраваліся да ракі мыцца.

Валька ўскочыла з-пад каровы, хіснулася следам у хмыз.

Паўголы Вітольды здаўся ёй падобным да Бога.

Быццам якая невядомая сіла гнала яго ў гэты вечар да ракі. Альбіна крыкнула наўздагон, каб перавязаў нанач авец, але ён, заняты сваімі думкамі, нават не павёў брывом. Ледзь дапяўшы да прыстані, сцягнуў праз галаву кашулю, убрыў у ваду. Хуценька абліў далонямі жывот і плечы, пацепваючыся, выскачыў назад на бераг. І тае ж хвіліны пачуў ад пакояў знаёмы стук сякеры. «Ха-

лерная баба, — падумаў, абціраючы цела ручніком. — На ляду ператворыць мясціну».

У лагчыне, як і ўчора, калі прыбіралі з Толікам бульбоўнік, Валька валаводзілася з каровай. Тая закрапалася за лазіну, і дзяўчына ніяк не магла яе адкрапаць. Вітольды кінуў на сцежцы ручнік, кінуўся Вальцы на дапамогу.

Яна трымала Мірту за вяроўку, а ён моўчкі кружляў з калком наўкола куста. Калі ланцуг, нарэшце, быў раскрапаны, уторкнуў яго ў ранейшае месца, падаўся да Валькі. Яна, часценька дыхаючы, неяк скоса, нібы не давяраючы, пазірала на яго з-пад рукі. Затым нечакана імкліва пасунулася бліжэй, датыкнулася грудзьмі да ягонага пляча. Ён схапіў дзяўчыну за руку, прыціснуў да сябе. Яна ўскрыкнула, але вырывацца не стала. Усё гэтак жа маўчком ён падвёў яе да хмызу, трымаючы адною рукой за шыю, пачаў другою таропка распранаць. Яна не праціўлялася, толькі безуладна асядала целам усё ніжэй і ніжэй. Не памятаючы сябе ад узбуджэння, ён расшпіліў штаны, паваліў Вальку на траву...

Страхавітая раз'ятраная пачвара нечакана ўзнікла па-над кустоўем, узмахнула ў паветры сякераю. Іржавае тупаватае лязо мільгнула ў паўзмроку, з глухім скавытаннем апусцілася долу, на голаў Вітольдага.

Валька прыўзнялася, намагаючыся скінуць з сябе акрываўленага каханка, падалася целам убок. Крык вырваўся з ейных грудзей, зліўся з посвістам ветру, скалануў наваколле.

Цёмная вялізная хмара запяла сабою неба, праглынуўшы рэшту роспачлівага Вальчынага крыку, тарганулася колькі разоў сюды-туды, замерла над Дубраўкай.

Калі яна ачнулася, наўкола было ціха, як на могільніку. Варухнула рукамі — цэлыя. Тулава, ногі — таксама на месцы. Адзінае, што даймала няўтульнасцю, было адчуванне нечага мокрага на грудзях і шыі. Яна памацала пальцамі мокрыя месцы — падобна на кроў. Але чаму тады пад ёю суха? І дзе Вітольды?

Яна паклікала яго раз, другі — каб гук у адказ. Тады паднялася, пераадольваючы боль пінізу жывата, пасунулася да ракі мыцца. І ўжо калі амаль дапала да вады, успомніла ўсё і страціла прытомнасць.

Зноў ачнулася яна на чацвёрты дзень. У хаце было поўна людзей. Усе глядзелі на яе са шкадаваннем і нібыта чаго чакалі.

З сяней убегла ў пакой Галіна, не выпускаючы з рук секача, якім толькі што секла ў істопцы ахрап'е, кінулася да дачкі.

— Валя! Дачушка!

Валька прыўзнялася на ложку, абвяла прысутных няўцямным паглядам.

— Ві-тольды... дзе?

Наперад прасунулася паўз суседак Альбіна, нахілілася над хвораю.

— Бог ведаець, — сказала з уздыхам. — Як скрозь зямлю праваліўся. Чакалі, калі ты апрытомнееш, думалі — скажаш.

— Стася знаець, — Вальчын голас паслабеў, зрабіўся вялы, невыразны.

— Стася нам не памочніца, — сказала Галіна. — Яна тры дні як з'ехала ў сваю Крайну.

Наваколле абшнарылі некалькі разоў, і ўсё дарэмна. Вітольды, сапраўды, нібы пад зямлю праваліўся.

Тады абшукалі ўсе віры, і таксама беспаспяхова.

І толькі праз два месяцы, ратуючы авечку, што звалілася недалёка ад ракі ў паўзакінутую бульбяную яму, натыкнуліся на яе дне на вымытую дажджом з-пад пяску мужчынскую руку.

Усе, хто прыйшоў паглядзець труп, у адзін голас прызналі ў ім Вітольдага. Паведамілі ў міліцыю. З раёна прыехалі пракурор са следчым, медэксперт і яшчэ некалькі чалавек. Апыталі ўсіх, але безвынікова. Пра абставіны трагедыі ніхто нічога не ведаў.

Тады Альбіна павяла прыезджых да Бакевічаў.

У хаце была адна Валька. Твар яе чырваніў ад слёз. Напярэдадні яна аб'явіла бацькам, што цяжарная, і ёй добра дасталося ад Петрака. Убачыўшы старонніх людзей, яна адразу здагадалася, што да чаго. І, блытаючыся ад хвалявання і страху, расказала ўсё, як было. Усё, апроч аднаго — галоўнага. На тое не хапіла духу.

## Польця
### З магнітафоннага запісу аспіранта М. Дзямешкі

Яно гэдак: не адно, дык другое. Тока Гірона паспелі пахуваць, як на табе — знова бяда. Вітольдага шкода, рабацяшчы быў. І ўмеў усё. Дужа шкода. Адзін за адным браты паляглі. Але што ж, рук, казаў той, не падкладзеш. Як падроблена ўсё роўна.

А што — падрабляюць. Вунака праз целявізар фігурнае катанне надавалі... Мужчына бабу, ці то дзеўку там, падымець і круціць, бытта на пальцы. А тады яшчэ кінець з усяго расшпару. І думаць нечага — падроблена. Гэтаксама і тут, з Вітольдым. Што ён, сам сябе ў яміне тэй засыпаў? Дай ты рады!

Валька, сястры маей стрыечнай дачка, пэўна, знаець, як было. Але маўчыць. Можа, баіцца... А можа і ня хочаць казаць, мала якая прычына. І я дагадваюся, але тожа маўчу. А што, во гэдак вымкнесся, а тады і зробіцца што. Хош яе, Стасі, няма тут цяперака, а раптам вернецца? Усяк жа бываець.

Што пытаецеся? А, гэта? Гэта пакоі. Даўней паны жылі. Ад Саветаў у Польшч уцяклі, а ўсё іхнае асталося. Тут во — кветнікі, кветкі разныя. Улетку як зацвітуць — красна а красна ад цвету. Пакоі бураць. Халерая цябе: каму што нада, тое і бярэць. Пачкі разабралі ўжо. Тожа шкода. Пакоі ладныя былі, што кругом, што сама будыніна. У доле сцены таўстыя, мураваныя. Там кухня з пякарняй, склеп. Два коміны з капцільняй, для вэнджання. Вышэй — жылыя мяшканні. Сталоўка і шэсць пакояў, салон. Яшчэ два пакоі. Крэпкае ўсё, з дубу. Шчыткі красівыя, з маляванай кафлі.

Мне не наравіцца, што бураць. Распасорыць лёгка, а ці збярэш тады? Але як перабаразніць — не знаю. Казаць — што пугай па вадзе сцёбнуць. Тока ворагаў нажывеш. Можа, вы падказалі б, што робіць? Каму яны нада, кажаце? Во, усе так кажуць. Можа, і праўда гэта. Дык звініце, што патурбавала.

А што вы тутака ў нас, па справе ці сяк? Бабы, чула, казалі, бытта, як гаворым, запісываеце. І то работа. І песні тэж? Не, я не пяю, не даў Бог голасу. Тока як памрэць хто, тады разам са спявакамі, за кумпанію. Сястра, пра каторую казала, Галіна, красіва пяець. Ужо ад'язджаеце? Шкода, а то Галіна многа песень знаець. Але як ад'язджаеце, дык што ж... Да відзэнька вам, да свідання! Тэж паляту. Карова рана палёталася, дык во калі ацялілася, даіць надабя.

Неўзабаве пасля пахавання Вітольдага, на пачатку снежня, калі быў падняты з поля і перавезе-

ны ў шаху лён, Альбіна атрымала ліст. Пісаў з Рыгі стрыечны Гіронаў брат Лявон. Вія, ягоная жонка, месяц таму загінула пад машынай. У горадзе аднаму з дзіцем надта цяжка, таму ён хацеў бы вярнуцца на сталае жыццё ў родныя мясціны. Дык ці ёсць магчымасць зачапіцца?

Альбіна і не памятала, калі апошні раз трымала ў руках пісьмовыя прылады. Таму адпісваць ліст узяўся Толік — пад яе дыктоўку. Пасланне атрымалася кароткае, але змястоўнае. Ім вельмі, вельмі шкада Віі. А што да вяртання, дык, вядома ж, можна неяк уладзіць. Пустуе пакой Вітольдага, можна пажыць у ім колькі часу.

Яна адставіла кошык з бульбаю, выпрастала спіну. Ззаду хтосьці падышоў, спыніўся побач. Каторы з сыноў, падумала яна і азірнулася. Не, то былі не сыны.

— Гэтак скора? Мы і не чакалі... А дзе ж дзяўчына?

— У Віінай сяброўкі пакуль асталася.

Лявон, элеганцкі, у даўгім дэмісезонным паліто, стаяў ля бурта і весела ўсміхаўся. Ягоныя, па ўсім відаць, новыя, без адзінае зморшчыны на саюзках туфлі ў камяках гразі нагадвалі хадакі.

— Чаго не паведамілі, што прыедзеце? — збянтэжана паўтарала Альбіна. — Мы каня папрасілі б у брыгадзіра падвязці... А то, бачыце, абутак зблоцілі...

Ён зноў усміхнуўся.

— Абутак не самае галоўнае ў жыцці, — сказаў і, лёгка падхапіўшы адною рукою кошык, панёс яго да хаты.

# 4

## 1966
## Люся

— Гэта я, адчыні. — Лявонаў голас гучаў крыху прастуджана.

Альбіна адчыніла засаўку, ратуючыся ад сцюдзёнага ветру, што ірваўся з вуліцы ў сені, кінулася назад, у хату. Лявон увайшоў следам за ёю, запаліў папяросіну.

— Дык як, не перадумала? — спытаў, зацягваючыся дымам.

— Перадумала? А хіба я што абяцала?

— Я так зразумеў учора, што ўсё вырашана.

— Ой, не ведаю... Года не мінула пасля Віінай смерці... Падумай сам.

— Думаў. Цяпер ад цябе залежыць, як скажаш, так і будзець.

— Куды ты гэтак спяшаешся?

Ён моўчкі пакруціў «беламорыну» ў руцэ.

— Дзяцёнка шкода.

— Гэта іншая размова, — пагадзілася яна.

— На тым тыдні паеду, досыць ёй па чужых бадзяцца пры жывым бацьку. Дровы папілуем, і паеду.

— І я з табой.

— Добра, — сказаў ён і, абдаўшы усё наўкола адчуваннем спакою і трываласці, пасунуўся да ложка распранацца.

Альбіна таксама распранулася, хацела кульнуцца праз яго да сцяны, на сваё ўлюбёнае месца, але ён не даў — абхапіў дужымі, з каструбаватымі далонямі, рукамі, прыхінуў да сябе.

— Пусці, мальцы пачуюць.

— Не пачуюць. — Лявон схіліўся над ёю, пачаў лашчыць шыю і плечы. — Цяпер баішся, а што запяеш, як і дзеўка з'явіцца?

— Калі яшчэ тое будзець, — сказала яна і падалася да яго. Прыхінулася грудзьмі да мужавых грудзей, уздыхнула: ніколі яшчэ не было ёй так добра.

Цягнік прыйшоў у Рыгу а палове сёмай. Увесь час, што крочылі паўз сутарэнні, а потым праз мост да патрэбнага квартала, Альбіна разглядала натоўп. Так шмат людзей адразу яна ніколі не бачыла. Добра, Лявон побач, суцяшала сябе, усё тут ведае, дык дадуць неяк рады.

Тамарын дом знайшлі хутка, ён знаходзіўся недалёка ад чыгункі. Шэрая змрачнаватая будыніна нагадвала больш халупу, чым гарадское жытло.

І ўнутры будынка было не лепш. Цёмны, без аніводнае лямпачкі, калідор, рад пашэрпаных, з патрэсканымі вушакамі дзвярэй. Калі іх абміналі, пах цвілі так моцна шыбануў Альбіне ў нос, што яна міжволі сціснула яго пальцамі.

На званок не адазваліся, але ў памяшканні хтосьці быў: чутно было, як хадзілі. Лявон колькі разоў тарганув ручку дзвярэй угору-ўніз.

— Хто там? — жаночы голас гучаў спалохана.

— Тамара, гэта я, — сказаў Лявон і драпнуў пальцамі па дзвярах. — Я і Альбіна.

Дзверы павольна адчыніліся.

— Ты, Леванарды? — Гаспадыня, тоўстая пажылая кабета з бігудзямі на галаве, адступіла ў глыб прыхожай. — Уваходзьце! Люся, дзіцятка, хадзі сюды!

Яшчэ адна, меншая, постаць, няўпэўнена ступаючы па рыплівай падлозе, наблізілася да гасцей. Лявон правёў далонню па валасах дзяўчынкі, затым узяў яе і Альбініну рукі, звёў у адно.

— Пазнаёмся, дачушка...

— Пусціце! — выхопліваючы руку з Альбінінай далоні, закрычала малая. — Я да мамы хачу!

І апрамеццю кінулася ў цёмны калідор.

Да могілак дабіраліся даволі доўга, амаль гадзіну. Седзячы ўпобачкі з Тамарай на мулкім сядзенні, Альбіна раз-пораз кідала заклапочаны пагляд на падчарку. Тая, уладкаваўшыся на каленях у Лявона, засяроджана малявала ўзоры на заінелым акне трамвая.

Курганок над Віінай магілкай, як і ўсе магілы наўкола, буяў фарбамі штучных кветак. Тамара расклала на століку абрус, дастала з сумкі гарэлку і сёе-тое з ежы.

— Што вы, піць тут будзеце? — Люся схапіла бутэльку, шпурнула ў куст.

Лявон замахнуўся, каб шлёпнуць дачку па руцэ, але Альбіна спыніла яго.

— Нічога, няхай перакіпіць, — сказала і краем вока заўважыла, як малая з удзячнасцю зыркнула на яе з-пад доўгіх веек.

Калі яны прыйшлі на станцыю, да адыходу цягніка заставалася пятнаццаць хвілін. Тамара, якая ўвесь гэты час, што Лявон паказваў жонцы Старую Рыгу, вартавала майно, узяла Люсю пад руку, павяла ў падземку. Альбіна і Лявон моўчкі пасунуліся следам.

Дзяўчынка пакорліва ўвайшла ў вагон, села побач з бацькам. Сядзела ціха, не варушачыся, глядзела, як старэйшыя развітваюцца. І толькі калі састаў крануўся і засталася дзесьці ззаду блішчастая Тамарына хуста, усхапілася з месца, адчайна, уголас, заплакала.

— Нічога, у Дубраўцы ані не горш табе будзець, як тут, — тулячы малую па сябе, сказала Альбіна. — Паглядзіш, ані. А можа яшчэ і лепей.

Толік і Ромка сустрэлі новую сваячку з насцярожанаю цікаўнасцю. Доўга разглядалі канапаты, з няўсмешлівым шырокім ротам твар, ценькую постаць. Гэтае нясклёпістае, палахлівае кураня — іх сястра? Дай ты рады!

Люся, надзіва, да новага жыцця прызвычаілася вельмі хутка. Нават навучылася даіць карову і неўзабаве стала рабіць гэта так спрытна, што не кожная з дубраўскіх равесніц магла з ёю сагнацца. І наогул, вясковы побыт пайшоў ёй на карысць: шчокі праз кароткі час заўважна папаўнелі, паходка зрабілася ўпэўненай і рашучай.

Мачыху, як і тады, у Рызе, яна па-ранейшаму звала цёцяй.

Альбіна выйшла з шахі, пазіраючы на нізкае, усцяж засланае белаватымі аблокамі неба, хутка пакрочыла дахаты. Спяшалася: дзесяць дзён таму скінула свіння, а зараз яшчэ і захварэла, другія

суткі не дакранаецца да ежы. Крый Бог здохне, што тады рабіць, чым карміць сям'ю?

Мужчын у хаце не было. Хлопцы гойсалі недзе на лыжах, Лявон са Свістуном яшчэ на дасвецці падаліся на паляванне. Адна Люся сядзела пры стале, слініла па чарзе каляровыя алоўкі, выводзіла ў сшытку па памяці купалы рыжскіх касцёлаў.

Альбіна ўторкнула штэкер у разетку, праз якую падавалася святло ў хлеў, подбегам выскачыла з сяней на панадворак.

Адчыніла дзверы ў хлеў і адразу зразумела: нешта не тое.

Свіння ляжала калодаю ў грудзе саломы і не падавала прыкмет жыцця. Альбіна прысела над тушаю. Слёзы самі паліліся з вачэй. Выслізнуў з рукі, хруснуў пад ботам шкляны градуснік.

Нехта яшчэ ўвайшоў у хлеў. Асцярожна наблізіўся да загародкі, крануў яе за плячо.

— Не плач, мамачка! Мама, чуеш?

Люся, збянтэжаная, у велізарных Толікавых ботах на босую нагу, стаяла ў праёме дзвярэй і глядзела на яе самотнымі, поўнымі спачування вачыма.

Гэтую хвіліну Альбіна запомніла на ўсё жыццё.

# 5

## 1972
## Браты

Фігура хіснулася, пахілілася набок, але з месца не зрушылася. Яе пачарнелы ад вільгаці, патрэсканы ад перападаў тэмпературы твар дакорліва зірнуў на Альбіну пустым, абведзеным хімічным алоўкам вокам.

Наогул, можна было загадаць сынам яе прыбраць, але яна не наважылася. Толік толькі ўчора прыехаў пасля сесіі на канікулы, і першае, пра што запытаўся, было, ці ўсе статуі на месцы. Спіць і трызніць давесці іх да ладу. Вучыцца на гісторыка, дык хоча ў Дубраўцы музей стварыць. Ёй што, хай стварае, ды каму ён тут, у такім бязлюддзі, патрэбны, музей? Спаліць тое Вітольдава дзерава і то, пэўна, больш карысці было б. Але яна гэтага ніколі не зробіць. Хоць часам, зазлаваўшыся, і пагражае. Не, з сынамі ў дубкі яна не пойдзе. А пчаляра перасунуць хацела, бо надта ж зручнае для стажка месца займае. Во, з раніцы мікіціцца, барані Бог, нанясе дажджу. Сена ўжо варочанае, гэткае больш за ўсё вады баіцца. Дык пры хляве, на месцы, што пчаляр той Вітольдаў займае, спарадкаваць самы цымус быў бы.

З-за пуні пачуліся галасы сыноў.

— Складзем, пакуль не змокла, — выходзячы следам за братам да яе на трасотнік, сказаў старэйшы.

Яна згодна матлянула галавой.

— Добра, — сказала коратка і зірнула на Ромку. Той ад першае хвіліны, як прыехаў брат, паводзіў сябе неяк незразумела, быццам быў нечым незадаволены.

Хлопцы выйшлі з панадворка, сцішана перагаворваючыся, накіраваліся вуліцаю на другі канец вёскі, туды, дзе вытыркаліся з зарасляў дзядоўніку і крапівы ўтравелыя рэшткі колішніх пакояў.

Праца рухалася хутка — ведалі яе змалку. Толік, праўда, з непрывычкі спачатку крыху ўпацеў, але гэта працягвалася нядоўга, пакуль не ўвайшоў у звыклы рытм. Стажкі рабілі невялікія: такія і грузіць на падводу хутчэй, і раскідваць, калі трэба падсушыць, лацвей.

Гаварылі няшмат, і завадатарам размовы ўвесь час быў Толік. Ромка больш слухаў і толькі калі брат што-небудзь пытаўся, адказваў — стрымана, коратка, адным сказам. Не, вучыцца пасля дзесяцігодкі ён не збіраецца. Дачакаецца восені і пойдзе ў войска. Матка хоча, каб паступаў, але не — гэта не для яго. Не ўсім жа вучонымі быць, трэба некаму і рабіць.

На ўзмежку, ля абрыву, сена было зусім сухое.

— Аж шашчыць. — Ромка ўдзюбнуў вілы ў зямлю, трымаючыся за цаўё, стаў — перадыхнуць.

Чырвонае няўрымслівае сонца прамарудзіла хвіліну-другую за воблакам, імкліва вывернулася з-пад яго. Тысячы гарачых прамянёў рассеклі паветра, іскрамі паляцелі ў пожню...

*Бацька ляжаў скрай абрыву і п'яна мармытаў. Паспрабаваў адсунуцца ад агню, але дарэмна. Полымя тым часам з кожным імгненнем падбіралася ўсё бліжэй і бліжэй да яго. Ромка хацеў прыбіць агонь граблямі, але раптам паміж ім і бацькам узнік Толік. Гледзячы брату ў твар, ён усміхнуўся, затым паклаў руку на плячо. Што ён хоча? Няўжо не разумее, што замінае ратаваць Гірона? Ромка паспрабаваў адштурхнуць Толіка ўбок, але той так грунтоўна асталяваўся на вузкім лапіку між бацькам і агнём, што зрабіць гэта можна было толькі спіхнуўшы брата з абрыву. Тым часам агонь усё набліжаўся. Бацька перавярнуўся набок, ратуючыся ад яго, падпоўз да самага абрыву. Яшчэ хвіліна — і кульнецца ў бездань. Не! Ромка разагнуўся, штосілы пхнуў брата пад дых. Той паваліўся, трымаючыся рукамі за альховае карэнне, завіс над абрывам...*

Толік сядзеў на кукішках ля стажка і выціраў аб траву чырвоныя, здзёртыя да крыві рукі. Яго бледны, бы ў нябожчыка, твар зводдалеку нагадваў маску.

— Даруй, мне здалося, там бацька. — Ромка падышоў да брата, у нерашучасці застыў побач.

Толік перавёў дыханне, падхапіўся з месца.

— Ладна, — сказаў ціха і ўсміхнуўся. — Я ўсё разумею.

— Што ты разумееш? — І без таго круглыя вочы Ромкі яшчэ больш акругліліся, твар успыхнуў чырванню. — Што?

— Што ён табе трызніцца, — збянтэжаны новаю хваляю братавай зласлівасці, сказаў Толік. Гэтай размовы ён даўно чакаў, але што ўсё адбудзецца вось гэтак — не спадзяваўся. — І часта такое здараецца?

— Заўсёды, калі бачу агонь. — Ромка гаварыў павольна, як бы нехаця: відаць, шчырасць давалася яму цяжка. Але раптам голас яго акрэп, зрабіўся зноў калючы і злосны. — Гэта цябе зусім, ані на каліва, не тычыцца.

— Тычыцца! — Толік назгодна матлянуў галавою. — Ягады ягадамі, а віна за бацьку на нас абодвух.

Братавы словы неяк дзіўна паўплывалі на Ромку: ён абмяк, выраз жорсткай зацятасці, што увесь час не сыходзіў з ягонага твару, саступіў месца разгубленасці.

— Я з'еду адсюль — падымаючыся з месца, сказаў ён ціха, але ўпэўнена. — Абавязкова, толькі школу скончыць.

Другая хмара, вялізная, няўклюдная, з'явілася на даляглядзе, густым шэрым ценем атуліла дробныя аблокі і наваколле пад імі.

# 6

## 1975
## Наталля

Хлопец у вайсковай апратцы хуценька перабег вуліцу, ратуючыся ад дажджу пад голлем дрэваў, імкліва расчыніў знаёмыя весніцы. Дзверы на гэты раз не рыпнулі, а нібыта охнулі — натужліва, рэзка, бы чымсьці пакрыўджаныя. Але маладому дэмабілізанту было не да іх: думка аб недалёкім ад'ездзе не давала спакою. Убегшы ў хату, ён адразу кінуўся да ложка, на якім ляжала, прыкрыўшыся квяцістаю пухкаю коўдрай, жанчына.

— Дык што, надумалася? Едзеш?

Жанчына моўчкі павярнулася да яго тварам, засланіла далонню вочы ад святла, няўцямна спытала:

— Што? Куды ехаць?

— Вось табе маеш — куды? — ажно зайшоўся абурэннем Раман. І было чаго абурацца: тыдзень мінуў, як яго дэмабілізавалі, учорашнія саслужыўцы недзе па хатах ад'ядаюцца, адзін ён ніяк не зрушыцца з месца.

Жанчына схавала пад коўдру руку, лагодна ўсміхнулася.

— Ну, прычапіўся: едзеш? едзеш? Дрэнна табе тут?

— Я не кажу, што дрэнна. — Раман сеў скрай ложка. — Ды трэба ж некалі рашыцца...

— Хай яно згарыць тое трэба. — Яна прыўзнялася на локцях, прыкрыла прасцінаю шыю, наблізілася да яго, паклала галаву на калені. — І не злуйся.

— Ладна. — Ён скінуў кашулю, штаны, слізгануў да яе пад коўдру.

— Вось, так лепш, — сказала яна і абхапіла Рамана за шыю. — Паеду, а як жа.

Яны пазнаёміліся паўтара года таму. Наталля Сяргееўна рабіла буфетчыцай у сталоўцы, куды яны з таварышам зайшлі падсілкавацца падчас звальнення. Яна ветліва ўсміхнулася ім, запрасіла перакусіць. Ужо шарэла, і, папраўдзе, есці хацелася, але грошай на што грунтоўнае не хапала. Яна нейкім чынам пра тое здагадалася, пайшла на кухню, прынесла дзве талеркі варанай бульбы, палітай зверху мясною жыжай.

Пакуль яны елі, яна распытвала. «Адкуль, вы, хлопчыкі? Ці даўно тут?» Яны адказвалі, а яна ўважліва слухала. Даведаўшыся, адкуль Раман, схамянулася: «А, чула, матцы маёй калісьці ў тых мясцінах даводзілася працаваць. А мяне Натальляй зваць. Можна проста — Наткай Сяргееўнай. І цётачкаю назавяце — таксама не пакрыўджуся. Дарэчы, я тут не заўсёды рабіла. Дыплом бухгалтара маю. — Яна зірнула ў акно, паказала рукою на бліжэйшую ад сталоўкі хату. — Вунь мая сядзіба. Калі што — заходзьце».

«Спраўная кабетка, — калі выйшлі на вуліцу, сказаў саслужывец. — Во каб крыху маладзейшая». — «Гэта не пашкодзіла б», — з выглядам знаўцы адказаў Раман. Дагэтуль мець справу з жанчы-

намі яму не даводзілася, але прызнавацца ў тым сябру, якога яшчэ толкам не ведаў, не хацелася.

Зноў яны спаткаліся дзесьці праз месяц, у чарговае звальненне. Напярэдадні хлопцы да сёмага поту рабілі на лецішчы ва ўзводнага, добра папацелі і ў выніку зарабілі свае законныя суткі.

Плошча, адзінае больш-менш прыстойнае месца ў гарадку, сустрэла іх знаёмаю шыльдаю над дзвярыма сталоўкі. Цётачкі Сяргееўны за стойкай не аказалася. Пасядзеўшы з паўгадзіны за сталом, маладыя людзі засумавалі, пайшлі на вуліцу — праветрыцца. Алег тут жа ўвязаўся за нейкаю дзеўкай, а Раману нічога не заставалася, як працягваць шпацыраваць у адзіноце.

Ён і не заўважыў, як аказаўся ля цётаччынай хаты. Там у вокнах гарэла святло, а гаспадыня, у фартуху зверху летняй паркалёвай сукенкі, завіхалася ў кухні. Падышоўшы бліжэй, Раман убачыў яшчэ адну — мужчынскую — постаць. Мужчына сядзеў на канапе ў лепшым пакоі і курыў папяросіну. На стале побач стаяла талерка з закуссю і бутэлька гарэлкі. Сяргееўна скончыла гатаванне, з патэльняю ў руках падалася да мужчыны. Ледзь паспела яна паставіць страву на стол, як той абхапіў яе за стан, паваліў на тое самае месца, дзе сам толькі што сядзеў. Святло пагасла. Ромка пастаяў яшчэ некалькі хвілін у надзеі, што яно зноў запаліцца, але дарэмна.

А праз два тыдні ён і сам неўпрыкмет аказаўся на месцы таго незнаёмца. Ляжаў у ложку, з прыкрасцю думаў, як бы хутчэй збегчы. Да таго гідкім і няўтульным здавалася ўсё навокал. Дапамагла яна, Наталля. Скінула коўдру, хаваючы

ад яго белае, з таўставатымі нагамі, цела, пачала вобмацкам апранацца. Хацела ўключыць святло, але ён не даў.

— Не трэба.

— Чаму?

— Святло кепска ўплывае на мяне.

— Выдумляй! — Яна дацягнулася рукою да сцяны, пстрыкнула выключальнікам. Лямпачка ўспыхнула, высвеціла куткі па-за мэбляю, мерна захісталася пад столлю пачварным ценем.

— Ну, жывы?

— Жывы, — адмахнуўся Раман і зірнуў на ходзікі. Было дзевяць гадзін.

— Якія доўгія вечары. — Цётачка пазяхнула, шчыльней ухуталася ў коўдру. — А ты не спознішся, хлопец? Глядзі, каб у кутузку не трапіў.

Сапраўды, час быў адыходзіць.

Раман саскочыў з ложка, похапкам нацягнуў гімнасцёрку, штаны. Наталля таксама паднялася, падышла да яго, абхапіла ззаду дужымі, як у мужчыны, рукамі.

— Праўда, святла баішся?

— Праўда.

— Чаму?

— Так, адну гісторыю напамінае. Асабліва калі знянацку ўспыхвае.

— Што за гісторыя?

— Была... у дзяцінстве. Не хочацца расказваць.

— Не хочацца — не трэба. — Яна прыхінулася тварам да ягонай патыліцы, паказытала вуснамі валасы. — А сюды часцей прыходзь, я страх хутка выганю.

Сапраўды, святла ён баяцца перастаў. Цётачка нібыта заваражыла яго. Ён добра спаў і еў, і

кепскія ўспаміны, што не-не ды й давалі аб сабе знаць, калі знаходзіўся ў часці, тут жа некуды сплывалі, як толькі пераступаў парог яе хаты.

І вось — настаў час дэмбелю. Як то прымуць яго дома? Папраўдзе, і самому ніякавата. Наталля на дзесяць гадоў за яго старэйшая — што скажа Альбіна? Да таго ж там, у Дубраўцы, ёй чужое ўсё — ці зможа прывыкнуць? Зрэшты, не бяда, калі што якое, сюды, у Крайну, можна будзе вярнуцца.

— Сюды! Ого, прыдумаў! Мне, значыць, выспятка, а сам да іншай, маладзейшай, пойдзеш.

— А што, калі так? — Раман засмяяўся. Але, убачыўшы зласлівы агеньчык у жончыных вачах, тут жа дадаў: — Нікуды я ад цябе не дзенуся.

Нехта ўвайшоў у сені, шкрабнуў пальцамі па дзвярах.

— Пэўна, мама. — Наталля падхапілася з канапы, падалася да парога.

Слава Васільеўна, бадзёрая, у падперазаным шырокаю дзягаю даўгаватым зялёным паліто, ступіла ў хату, цырымонна прайшла на покуць.

— Усё ж такі ад'язджаеце? — сказала, сцягваючы з галавы на шыю хустку. — Добра — завядзёнка не перарываецца.

— Якая завядзёнка? — не зразумеў Раман.

— А я хіба не казала табе? — цешча здзіўлена глянула на яго. — Ужо колькі пакаленняў жанчыны з нашай сям'і тваю Дубраўку ашчасліўліваюць. Бабуля Натчына, і прабабуля, і прапрабабуля... Цяпер вось і сама туды едзе. Ну, паглядзім жа, што з таго атрымаецца. — Яна дастала з кішэні нейкі сшытак, падала дачцэ. — Тут — патрэбнае, пачытаеш пры нагодзе. І глядзі там, трымайся годна, не паддавайся. Мы не абы-хто. Дык і паводзіць сябе трэба адпаведна.

# 7

## 1976
## Усе

Вестка пра тое, што Ромка вярнуўся з войска не адзін, а з жонкаю, абляцела Дубраўку вокамгненна. Да хаты Старынскіх пацягнуліся людзі, і ўсе нібыта па патрэбе. Сама Альбіна ў гэты дзень была ў райцэнтры, вярнулася ўжо надвячоркам. Убачыла ў прыцемку сынаву абранніцу і ледзь не страціла прытомнасць. Такою старою падалася нявестка. Да таго ж ёй увесь час здавалася, нібыта яны знаёмыя.

Няяснае, хісткае падазрэнне перарасло ва ўпэўненасць, калі запалілі ў хаце святло.

— Наташа, вы такую жанчыну — Слава — не ведаеце?

— Гэта мамка мая. Яна тут у вас некалі працавала. А што, падобныя мы?

— Па... падобныя, — адчуваючы, як дзеравянее язык, адказала Альбіна і без сіл апусцілася на канапу.

Раманава вяртанне адзначылі сціпла. Зарэзалі старую авечку, Мэська выпісаў на ферме з паўсотні кіло свініны. Альбіна з Люсяю нарабілі катлет, рознай салаты. У аўторак раніцой прыехаў Толік.

Ён сёлета скончыў інстытут і працаваў у школе недалёка ад Дубраўкі.

Браты спаткаліся на панадворку. Толік, пасталелы, вельмі падобны з твару да нябожчыка Вітольдага, падаў брату руку, сеў на ганак.

Прыйшла Валька. Абдала хлопцаў воблакам таннае парфумы, уселася побач. За апошнія гады яна вельмі раздалася ўшыркі, таму выглядала старэй свайго ўзросту. Але, надзіва, паўнаты сваёй не саромелася, наадварот, выстаўляла напаказ. Знарок насіла сукенкі з пасамі ўпоперак і наогул усе тое, што падкрэслівала камлюкаватасць паставы. Каб добраю маткаю быць, неабавязкова выглядаць на дзяўчо — гэта былі яе словы. Яе Пецю было ўжо сем гадоў, і хто ягоны бацька, у Дубраўцы па-ранейшаму ніхто дакладна, апроч, канечне, самой Валькі, не ведаў.

І вось... Не, не можа таго быць. Чым пільней узіралася Валька ў здарожаны, падбелены пудраю твар Ромкавай каханкі, тым настойлівей узнімаўся з глыбіні памяці смутны, няпэўны ўспамін. Ці можа тое быць? Яна глянула на Альбіну. Тая сядзела, бы нежывая, насупраць малодшага сына. Што-што, а пакутлівую напружанасць Альбінінага твару Валька чытаць умела.

Пасля трэцяй чаркі браты выйшлі папаліць. Зрабілі на панадворку па зацяжцы, затым, не згаворваючыся, падаліся да руінаў сядзібы. Месца, дзе калісьці былі пакоі, можна было пазнаць па нізкім плоце, якім яно было адгароджана ад кустоўя.

— Вось, аднаўляць будзем, — спыняючыся ля яго, сказаў Толік. — Спецыялісты цвердзяць, сядзіба надта унікальная, узор сядзібна-палацавай

архітэктуры XVI стагоддзя. У даваеннай Польшчы ахоўвалася дзяржавай.

— І хто ўсё гэта раскапаў?

— Археолаг Вашкевіч.

— Той, што некалі Мамкова гарадзішча капаў? П'яніца?

— Ён ужо з дзесяць гадоў не п'е. І чалавек дасведчаны.

— Ну-ну. — Ромка і сам не разумеў, чаго злуецца. — І што ён мяркуе тут рабіць, твой Вашкевіч? Нанова пакоі ўзводзіць? Дзеля чаго?

— Дзеля чаго? Каб людзі маглі любавацца, вось дзеля чаго. Дарэчы, лямус тут адзін з самых адметных у наваколлі быў.

— Лямус? — Раманаў твар зусім спахмурнеў. — Яго таксама будуць узнаўляць? Яшчэ чаго не хапала!

Люся дагнала іх, прытрымліваючы рукамі ад ветру падол сукенкі, стала пасярэдзіне.

— Спрачаецеся? Вось табе на — толькі-толькі сустрэліся, і ўжо сварка.

— Не сварка, так, гутарым, — стараючыся перамагчы раздражнёнасць, што засела стрэмкаю ў горле, сказаў Толік. — Пра пакоі гаворым.

— Што гаварыць пра іх — рэстаўраваць трэба.

Раман адышоўся ўбок, гледзячы сабе пад ногі, усміхнуўся.

— Вас паслухаць, дык больш і клопату няма, як гэтыя развяліны, — сказаў зводдалеку і падкалупнуў носам туфля цагляны аскепак. — Быццам без іх не абыдземся.

— Не абыдземся! — горача запярэчыла Люся. — Гэта памяць наша!

— І твая? Няўжо?

— І мая! Я тут жыву.

— І яе, а як жа, — заступіўся за дзяўчыну Толік. — А ты... ты здзіўляеш мяне.

— Ідзіце вы ведаеце куды? — Раман, адчуваючы, што перавага не на ягоным баку, злосна плюнуў, пакрочыў да хаты.

## Польця
### З магнітафоннага запісу дацэнта М. М. Дзямешкі

Я зразу, як тока яе ўвідзела, дагадалася. Вочы, бровы, губы — усё Стасіна. Асобенна, як загаворыць: нос то ўгору, то ўніз кулыг, бытта якая спрунжыніна ў ім. Кароценькі носік, во і спрунжыніць. І зубы тэж, як у маткі, дрэнь, вялікія і рудыя. Такая значыцца, іхная прырода.

Стася некалі дужа пераживала з-за зубоў. Бывала, перад вечарынай прыйдзець да мяне і будзець казаць: «Я, Польця, у той кут адыдуся, а ты на зубы мае зводдалеку глянь, ці дужа відацца, што благія». Праўда, відалася, але я не казала ей. Скажаш, што рудыя, дык усердзіцца ды дзялку горшую дасць. І у гэтай гэдакія ж нядобрыя, зрудзеўшыя.

Альбіне неўпанараў нявестка. Адно — старэйшая за Ромку. Другое — Стасіна дачка. Абкруціла мальца, і што ты зробіш? Хочаш ня хочаш, прымеш. Так што пакасавурыцца Альбіна, папераживаець і адыдзець. У яе сэрца адходлівае, доўга злавацца ня можаць. Людзі нагаворацца, канечне. Але што людзям? Во Альбіне дык неспадзеўка.

Ну, а вы тут як? Назбіралі троху нашых слоў? Усё ездзіце, ездзіце... На маей памяці вы трэція ўжо. Усё то словы, то песні збіраеце, а каб які толк з таго... Усё на зглум ідзець, а вы з песнямі. Ну, ня злуйцеся... Пакоі? Ат, хто іх тут будзець аднаўляць! Вырванай

валасіны ня вернеш. Другая, можа, вырасцець, а той самай, што па першасці была, зновака не паявіцца. Ага.

Я на пасту бягу. Мой там адзін з каровамі, барані Бог загізуюць, не дасць рады. Да ракі пагонім. Трава ніякая, дык хоць пап'юць... А тады з пасты — сена варочаць. Учора ў амшарыне ўкасіў. Недзе касіць, і няможна, цішком косім. Хто дзе ўрвець, тое і ягонае. Начальства ездзіць, глядзіць. Як зловяць, штрафу дадуць. Дык і вы нікому не кажыце. Ну, паляцела я...

*Гірон перанёс праз парог сваё хударлявае, размякчанае гарэлкаю цела, не распранаючыся кульнуўся на падасланы кажух. Неўзабаве ён заснуў. Пачуўшы бацькаў працяглы храп, Ромка выкараскаўся з сена, узлез на маціцу. Чыркнуў запалку, пачакаў, пакуль яна ўгарыцца, шпурнуў долу, на кладню. Запалка перакулілася ў паветры, звалілася ў сена побач з Гіронам. Той, пачуўшы пах гарэлага, прыўзняўся, каб адсунуцца ўбок, але не даў сабе рады. Ахопленае полымем цела сутаргава тарганулася, зноў павалілася на кажух...*

— Я плявузгаю? — п'яненькі Мэськаў голас узвіўся пад столь. — Плявузгаю? Было гэта!

— Што было? — выходзячы са спальні ў кухню, дзе сядзелі Мэська з Лёдзяю, Альбіна, Польця і Наталля, спытаў Раман.

Наталля перасмыкнула вуснамі, адвяла позірк убок.

— Тое, што з Вітольдым ейная матка... — не здаваўся брыгадзір. — Гэта ўсе ведаюць. А то корчыць з сябе...

— Что он плетёть, этот старый дурак! — падрабляючыся пад тутэйшую гаворку, піскнула Наталля і вопрамеццю кінулася ў сені.

Раман падышоў да Мэські, ударыў наводмаш па пераноссі.

— Пакажу табе, шэрла* дурны, — сказаў і накіраваўся ў сені супакойваць жонку.

Альбіна сцебанула каня пугаю, падцягнула лейцы. Конь фыркнуў, тужачыся, сяк-так ускараскаўся на гару. Ля першай, Пілецкіх, хаты, тоўпіліся людзі. Яна злезла з калёс, не зважаючы на дождж, падышла да іх.

— Што тут такое?

Натоўп моўчкі расступіўся, прапусціў яе ў сені.

У лепшым пакоі ляжаў на канапе акрываўлены Мэська і ціха стагнаў. Ля яго мітусіліся Лёдзя з дочкамі. На зэдліку збоч канапы стаяла мядніца з вадой, Света і Аля, дочкі, па чарзе акуналі ў яе анучку, абмывалі бацькавы твар і рукі. Старая Лёдзіна матка малілася ў куце.

Раптам Мэська стаў задыхацца. Жанчыны, жагнаючыся, паўкругам абступілі канапу.

— Свечку! Дайце свечку! — роспачліва загаласіла Лёдзя.

Адна з дачок кінулася да шафы, дастала жоўтую парафінавую свечку, падала матцы. І толькі Лёдзя паспела яе запаліць, як Мэська выпрастаў руку, перахапіў яе аслабелымі пальцамі. Цела ягонае тарганулася колькі разоў, грудзі ўздрыгнулі, па твары прабег шараваты цень.

— Моўце пацеры, — трымаючы мужа за руку, сказала Лёдзя і першая ўкленчыла.

Альбіна вярнулася зноў на панадворак. Людзі па-ранейшаму тоўпіліся ля весніц.

— Што тут здарылася?

---

* Шэрла — тут: дурань.

— З абрыву зваліўся, цётка, — адказаў нехта.

— Радоўку адбываў і во... Хоць бы ўжо палепшаў.

— Не палепшаець, — Альбіна выйшла з натоўпу, пасунулася да падводы. — Памёр Мэська.

Пра абставіны брыгадзіравай смерці гаманілі доўга. Адны сцвярджалі, што быў нападпітку і сам зваліўся з абрыву, другія — што, няйначай, нехта дапамог гэта зрабіць. Урачы, якія рабілі ўскрыццё, сказалі, што памёр ад асфіксіі ў выніку страсення лёгкіх.

Валька адна не паверыла ў няшчасны выпадак. Хадзіла па Дубраўцы, заводзіла хітрую размову аб тым, колькі зла ад гэтых прыезджых васталыг. І хоць далей намёкаў справа не ішла, усе разумелі, пра што яна гаворыць. Адгалоскі тых размоў даносіліся і да Наталлі. Але яна ўпарта рабіла выгляд, быццам нічога не разумее. Дурніцы абыходзіць, што ў яе забінтаваная рука? Дык мала што — можа, стыгматы з'явіліся.

Тым часам наблізілася пара касавіцы. Клопатаў ва ўсіх паболела, і пра недарэчную Мэськаву смерць хутка перасталі згадваць.

*Страла маланкі прарэзала паветра, асляпляльна-яркаю стужкай забілася між сцен. Шпалера ўспыхнула, пырснула агнём, папаўзла долу, на падлогу — туды, дзе ляжаў раскінуўшы рукі Гірон. Ромка схапіў шпалерыну за адзін канец, паспрабаваў яе загасіць. Але, наадварот, стала яшчэ горш: сухая папера раструшчылася на дробныя аскепкі, паляцела на бацькаву галаву. Гірон закрычаў, вогненным катком пакаціўся па падлозе...*

Наталля злезла з ложка, блытаючыся ў прасціне, падышла да мужа. Той ляжаў дагары на падлозе і неўразуменна глядзеў на яе паўрасплюшчанымі вачыма. Твар ягоны блішчэў ад поту, вусны бязгучна варушыліся. Нарэшце ён апрытомнеў.

— Што... што гэта было?

— Не ведаю... Я ўключыла тэлевізар, ты скаціўся з ложка, закрычаў...

— Няўжо тое, ранейшае, вяртаецца?

— Крый Бог, каб вярнулася. Можа, з'ясі чаго? Ежа супакойвае.

Раман моўчкі падняўся, шлэпаючы босымі нагамі па прахалоднай падлозе, пайшоў у кухню. Наліў у міску бялёнага супу, пачаў есці. Еў і бачыў праз дзверы, як Наталля заплятае перад люстэркам касу з рэдкіх сваіх, з пашчапанымі канцамі валасоў.

— Во што я падумала. — Жончын голас прагучаў неяк па-старэчы сіпла. — Збіраюцца брыгадзіра выбіраць, дык, можа, табе паспрабаваць? І заробак лепшы, як у полі, і пасада... Не з віламі ў гнаі корпацца. Ну, як?

— Чорт яго ведаець... Ці здолею я? Да таго ж не парцейны...

Яна рашуча хітанула галавой.

— Здолееш. Людзей ты знаеш. А калі з паперамі якія непярэліўкі — я памагу. У парцію ўпішамся. Ідзі. Работа клопатная, затое сны дурныя адцягнець.

— Чорт яго ведаець... Можа, праўда, варта паспрабаваць.

Наталля каторы раз растрыбушыла касу, адкінула валасы на плечы.

— Яшчэ як варта, — сказала, падмалёўваючы алоўкам бровы. — Дарэчы, калі ты мне тое дрэўца, што абяцаў, пакажаш?

— Калі хочаш. Можна і зараз.

Яны выйшлі на панадворак, павольна рушылі прысадамі ў бок пакояў. Белая Наталліна кашуля ў месяцовым святле нагадвала строй маладухі.

Ля курціны з шыпшыннікам спыніліся.

— Здаецца, тут.

Раман расхінуў хмыз і, сапраўды, убачылі сярод яго невысокае дрэўца з вялікімі, як у шлібабона, кветкамі.

— Удог! — ледзь зірнуўшы на пакручастыя няроўныя галінкі, сказала Наталля.

— Дык ты знаеш яго? Адкуль?

— Так, з запісаў адной прашчуркі. Яна тут за настаўніцу калісьці была, сама і прывезла яго. Дрэўца гэтае незвычайнае. Ягад як паясі, дык абы-што будзеш рабіць. Пітво таксама можна гатаваць. Матка мне і рэцэпт паказвала, але я забылася. Ды навошта нам усё гэта. Хадзі лепш да мяне!

Яна пацягнула Рамана да сябе, прынікла вуснамі да ягоных вуснаў. Жаданне хваляю пракацілася ўнутры яго. Ён абхапіў Наталлю за стан, моцна прытуліў да сябе.

Яны прашпаравалі сярод хмызу да самага світання.

Альбіна апошні раз крутнула жорны, уздыхнула. З аднаго боку, тое, што сын з нявесткаю пераязджаюць у сваю хату, было няблага, з другога... Тут, пры ёй, усё, што ні рабілася, было навідавоку, а што будзе, як застануцца сам-насам? Ромка гэткі бязвольны, пусці паваллюся, сама вяроўкі віць. І хоць яго, а не Наталлю абралі на сходзе брыгадзірам, ужо і зараз бачна, хто будзе камандаваць. Такая свайго не ўпусціць.

Гул трактара перабіў яе думкі. Альбіна выйшла з клеці і носам у нос сутыкнулася з нявесткаю.

Наталля, чырванатварая, у новай ватоўцы, вывернулася з-за вугла, загарадзіла сабою праём.

— Як вы? — спытала Альбіна.

— Добра. — Наталля адказвала няспешна, быццам нехаця. — Брыгадзірым. Ён загадвает, я пішу. «Трелевка навоза до трёх километров»... — Яна хахатнула. — Вось, «Беларуса» з прычэпам зафрахтавалі на пераезд.

Старэнькі трактарок уз'ехаў на панадворак. Раман выскачыў з кабіны, унікаючы глядзець на маці, хуценька падаўся ў хату — па майно.

Як Альбіна і думала, усе брыгадзірскія справы вельмі хутка перайшлі да Наталлі. Нішто не рабілася без яе згоды, фактычна яна кіравала брыгадаю. Ініцыятыва памяняць назву вёскі на іншую, больш гучную, таксама належала ёй.

Навіна аб гэткім яе намеры абляцела Дубраўку імгненна. Большасці жыхароў яна прыйшлася недаспадобы. Мяняць назву? Навошта?

— Не гучыць, вось дзеля чаго! — раздражнёна адказала брыгадзірыха. — Дубраўка! Можна падумаць, тут суцэльныя зараснікі.

Памятаючы пра нелюбоў да хмызу яе маткі, людзі пацікавіліся, якою ж мае быць новая назва.

— Ці мала як можна назваць, — адказала яна. — Падкрайна, напрыклад.

Напрыканцы сакавіка сабраліся, каб абмеркаваць пытанне больш дэталёва. Амаль усе дубраўцы прагаласавалі супраць змены назвы. Праўда, знайшліся і такія, што падтрымалі Наталлю. Адзін з іх, Чэсік Каралевіч, былы вайсковец, а зараз трэнер калгаснай футбольнай каманды, прапанаваў нават тэрмінова падаць заяву ў выканкам. Але тут, пераадолеўшы сарамлівасць, нечакана ўзяла

слова Альбіна, І так пераканаўча выступіла, што ў выніку і тыя, хто яшчэ вагаўся, прагаласавалі супраць ягонай прапановы.

Наталля, якая не чакала ад свекрыві гэткага запалу, нібы скамянела.

Раман увесь час, што маці гаварыла, сядзеў побач з жонкаю і глядзеў у падлогу. А калі ўзняў нарэшце вочы, каб зірнуць на Наталлю, убачыў на яе твары такую нянавісць, што сцяўся ад страху. Увечары гэтага дня ён пазычыў у Польці бутэльку гарэлкі і ўпершыню ў жыцці напіўся да парасячага віску.

На апошнім тыдні Вялікага посту прыехаў Толік. У школе пачаліся веснавыя канікулы, і ён вырашыў наведаць сваіх.

Браты спаткаліся ў маці. Альбіна клікала і Наталлю, але тая, спаслаўшыся на хатнія справы, адмовілася прыйсці. Апошнім часам у іх з Раманам з-за ягоных выпівак часцяком здараліся сутычкі, да таго ж яна ўсё ніяк не магла дараваць свякрусе яе выступу на сходзе.

Як ні намагаўся Толік разгаварыць брата, размова не клеілася. Раман увесь час маўчаў, а як толькі апаражнілі бутэльку, спаслаўся на нейкую неадкладную справу і пайшоў.

— Што ўжо за справы? — калі ён выйшаў з хаты, спытаў Толік у маці. — З нажом у халяве.

— Кілуноў лягчыць унадзіўся, — уздыхаючы, адказала Альбіна. — Куды паклічуць, туды і ідзець — за гарэлку. І лягчыць, і колець, бываець. Днямі Свістуновым калоў. Нож усадзіў падсвінку ў грудзіну, ды сп’яну не пацэліў. Той ускочыў ды давай насіцца... Смех і грэх.

— А Наталля што?

— Наталля? Мы не сяброўкі з ёю. А ты яшчэ пагавары з братам, Толічак.

— Пагавару, — паабяцаў ён і накіраваўся ў сені.

*Гірон выхапіў з сынавых рук бутэльку, схаваў за пазуху. «Аддай!» — Ромка кінуўся да бацькі, паспрабаваў адабраць пітво. Іскрынка ад ягонай папяросіны паволі апусцілася на абшлаг бацькавага кулька, акурат туды, дзе капнула гарэлка. Абшлаг закуродыміў, кукожачыся спрасаванаю воўнай, абдаў воблакам смуроду. Колькі часу яны моўчкі стаялі на месцы, быццам ацэньвалі собскі шанц на перамогу, і з непрыхаванаю нянавісцю глядзелі спадылба адно на аднаго.*

*Бацька першы адвёў пагляд, прытрымліваючы рукою пад абшлагам бутэльку, увайшоў у пуню. Наблізіўся да кладні, моўчкі пацікаваў за Ромкам, апусціўся на ўлежанае сена. Але толькі ён паспеў улегчыся, як агонь перакінуўся з кулька на кладню і ўжо праз якую хвіліну запоўніў сабою усю будыніну. Гіронаў адчайны, жудасны крык скалануў падстрэшша...*

— Чаго ты? — Наталля спусціла долу белыя, з таўставатымі лыткамі ногі, непрыязна зірнула на Рамана. — Да паўсмерці напалохаў. Равеш, бы недарэзаны.

Ён паспрабаваў прыўзняцца, але не даў сабе рады: галава гэтак балела з перапою, што не было сіл варухнуць пальцам.

— Калі гэта скончыцца? Лячыся ідзі.

— Якое лячыся! — ледзь варочаючы языком, прамовіў Раман. — Не з гарэлкі гэта... бацька сасніўся.

— Больш пі, дык не такое сасніцца. — Наталля рашуча адкінула коўдру, прасунула руку яму пад

трусы. — Во, слабеет і слабеет з кожным днём. Таксама бацька вінаваты?

— У кожнага мужыка гэтак з бадуна.

— Мне ад таго не лягчэй. — Яна зрабіла рукою шмар сюды-туды. — Лячыся.

— Не разумееш... іншае зусім.

Яна саскочыла на падлогу, шмарганула ўбок фіранку.

— Ад іншага сама знайду сродак. Вось толькі ў Крайну з'ездзіць, па сшытак.

— Па які сшытак?

— Па такі — з прапрапрабабуліным рэцэптам.

— Ат, глупства ўсё. — Раман сцягнуў коўдру, перавярнуўся на бок. — Кажаш, слабеець? А гэта што?

Але яна ўжо не слухала. Што карысці гаварыць? Заўтра яна сядзе ў цягнік і праз двое сутак будзе ў маці.

Састаў прыйшоў у Крайну а восьмай гадзіне. А праз паўгадзіны Наталля з маткаю сядзелі ў кухні, снедалі.

— Записи? — Слава Васільеўна, раздабрэлая, але ўсё яшчэ рухавая, наліла дачцэ і сабе, залпам выпіла. — Нету их. Ходила тут одна, будто бы из архива, собирала разный сор, я и отдала.

— Значит, в архиве придётся искать.

— Архив-от московский, дочка.

— Ничего, найдем. — Наталля выпіла, энергічна абмакнула ў падліву сухаватую, падобную да сухара, катлеціну.

Сшытак знайшоўся, але не ў архіве, а ў музеі. Дырэктарка музея ўласнаручна выняла яго з-пад шкла, адгарнула патрэбную старонку.

— Вы растениевод? — спытала, пабліскваючы шыкоўнымі замежнымі акулярамі. — Да?

— Да, — адказала Наталля і непрыкметна сунула ў кішэню тры аркушыкі, што гэтак жа непрыкметна хвіліну таму сама ж і вырвала са сшытка, калі дырэктарка загаварыла пра нешта з супрацоўніцай.

У Дубраўку яна вярнулася на Уздзвіжанне. Адразу дастала з валізы прышмальцаваныя аркушы, узялася чытаць. Чытала амаль да раніцы: незнаёмая прашчурка пра нашчадкаў дбала не надта і пісала зусім неразборліва.

У чацвертай гадзіне Раман прачнуўся ад нейчага дотыку. Над ім стаяла Наталля і не вельмі далікатна тузала за падбароддзе.

— Сікстынская капліца — дзе?

— Здаецца, у Ватыкане, — адказаў ён, пазяхаючы. — Навошта яна табе?

— Пытаюся, значыць трэба.

— У ксяндза папытайся, ён дакладна ведае.

— Папытаюся, анягож. — Яна зняла з сябе кашулю, легла побач. — Ого, сёння дык зусім іншая справа. Трэба мне часцей ад'язджаць з хаты.

Ксёндз не толькі распавёў усё пра капліцу, але і паабяцаў паказаць штосьці падобнае да яе. У адным з прыдзвінскіх гарадкоў на латышскім баку ёсць копія Сікстынскай. За пробашча ў касцёле, дзе яна знаходзіцца, ягоны аднакашнік па семінарыі Мураўскі, дык калі што якое, можна з ім спаткацца.

Вярнуўшыся ад ксяндза, Наталля колькі часу сядзела ў задуменні. Канечне, паехаць у Латвію было б няблага. Вось толькі з пашпартам непрэ-

ліўкі: згубіла, вяртаючыся ад маці з Крайны. Здала дакументы на афармленне новага, а яны ўсё валыняць нешта. Можа, і не спатрэбіцца ў той Латвіі, ды ўсяк бывае...

Апоўдні яна села на аўтобус і паехала ў райцэнтр.

Начальнік пашпартнага стала Кірыла Ігнатавіч Козел, былы кэдэбовец, доўга моўчкі глядзеў на яе з-пад ссунутых броваў.

— Прыспешым ваш дакумент, — сказаў нарэшце, святлеючы з твару. — Ваша матка ў свой час шмат нам добрага зрабіла.

Цяпер, калі справа з атрыманнем пашпарта, здаецца, пасунулася, заставаўся яшчэ адзін клопат — грошы. Каб абярнуцца на аўтобусе туды і назад, патрабавалася даволі значная сума.

Частку наскрэблі, прадаўшы цішком па дзесятцы за кожны чатыры бункеры калгаснае пшаніцы. Рэштаю выручыла Альбіна.

Запасіўшыся сякім-такім правіянтам і лістом да Мураўскага, Наталля дзесятага кастрычніка выехала з дому.

Ксёндз Мураўскі быў хворы і даручыў апеку над госцяю маладой манашцы па імені Аўгустына. Якраз у гэтыя дні каталікі адзначалі нейкае сваё свята, і манашка павяла Наталлю ў плябанію глядзець па тэлевізары, як Папа Рымскі прамаўляе ў Ватыкане з балкона. Ні сам пантыфік, ні выцвілы дыван з ягоным гербам яе не ўразілі.

Не ўразіла і капліца. Наадварот, тое, дзеля чаго давялося пераадолець гэтулькі вёрст, здзівіла шэрасцю і змрочнасцю. Але затое зараз, пасля падрабязных Аўгустыніных тлумачэнняў, што ды як,

Наталля дакладна ведала: зрабіць усё, «як у Сікстынскай капліцы», як таго вымагала прапрапрабабуліна цыдулка, ёй упаўне па сілах.

Яна гэтак была занятая ўсе дні ў незнаёмым горадзе сваімі думкамі, што аднаго разу, шпацыруючы следам за манашкай пасля дажджу па вузкай брукаванцы, паслізнулася на мокрым камені і ледзь не паламала нагу. На шчасце, абышлося вывіхам.

Праводзіць яе ў зваротны шлях прыйшоў і ксёндз Мураўскі. Гэта быў сухенькі дзядок з маладжавым не па ўзросце тварам і дужымі, бы ў юнака, рукамі.

— Спадзяюся, вам у нас спадабалася, — сказаў ён, прэзентуючы зямлячцы на памяць кніжку з жыцця святой Клары.

— Спадабалася, а як жа, — адказала яна і адчула, як рука ў кішэні сама сабою склалася ў дулю.

Дубраўка сустрэла яе звыклымі клопатамі. Але апроч заўсёдных з’явіўся і новы: напярэдадні Толік з Люсяй аб’явілі, што збіраюцца пабрацца. Наталлю гэткая навіна мала кранула. Іншае не ішло з галавы. Прагледзеўшы яшчэ раз прапрапрабабуліны запісы, яна зачынілася ў істопцы і, каб усё дакладна зрабіць, як ў той капліцы, загадала Раману замураваць уваход у яе цэглаю.

На два дні істопкаператварылася ў сакрэтны засек. Два дні Наталля не ела і не піла, награвала на пліце, выварвала, астуджвала, зноў выварвала нейкае зелле. Дубраўцы, бачачы, як валіць з коміна брыгадзіравай хаты чорны дым, толькі развodзілі рукамі.

Нарэшце на трэці дзень дым пачаў святлець і неўзабаве зрабіўся зусім белым. Раман разабраў

цэглу, і Наталля, з цёмнымі кругамі пад вачыма і са змеевікам у руках, выйшла з істопкі. «Гарэлку гнала!» — здагадаліся суседзі і з палёгкаю ўздыхнулі. Збіты з панталыку нечаканым з'яўленнем гаспадыні, кукарэкнуў і тут жа збянтэжана заціх зеленахвосты певень.

KAMUNIKAT.org

# 8

## 1976
## Вар’яцтва

Вяселле прызначылі на Кастрычніцкія святы. Альбіна з Лявонам прывезлі з горада дзве скрыні гарэлкі і дзесяць бутэлек кававага лікёру. Для пэўнасці заставілі яшчэ два бітоны брагі.

Ужо былі зладжаныя катлы і падрыхтавана сцюдзёная вада, як раптам Альбіне стала дрэнна: перахапіла дыханне, а ногі парабіліся нібы ватныя. Выклікалі «хуткую». Маладая ўсмешлівая медсястра агледзела хворую, зрабіла ўкол.

— Паляжыце пару дзён, і ўсё пройдзе, — сказала, складваючы прычындалы. —Ператаміліся крыху, мабыць.

— Можа, і так. Заўчора шаснаццаць качаноў за дзень сшаткавала.

Падмяніць Альбіну ля апарата ўзялася, пры тым, надзіва, па сваёй ахвоце, Наталля. Рэшту дня і ўсю ноч, што свякрова адлежвалася, выконваючы загад лекаркі, яна шчыравала ў істопцы. Што і як яна там рабіла, зноў ніхто не бачыў.

Раман спрабаваў дапасці ў істопку, але яна не дазволіла. І толькі калі развіднела і замычэў на двары, брыдучы гразкаю вуліцай да збітага, вытапта-

нага за лета і восень выгана статак, адчыніла дзверы, гукнула яго да сябе.

— На, пакаштуй, — сказала і плюхнула ў кубак сіваватай вадкасці.

Раман борзда, быццам баючыся, што яна перадумае, выпіў.

— Хто яе знаець, — сказаў, прагавіта паглядаючы на бутэльку. — Крыху нібыта пах... нейкі нязвыклы.

— То ад недапіву, — сказала яна і, пакінуўшы бутэльку на стале, пайшла з хаты. — Пі, я шчодрая сягоння.

Пераход да сынавай хаты даўся Альбіне цяжка. Прайшла колькі соцень метраў і так стамілася, што заняло дыханне.

Нехта сядзеў на панадворку, але хто — здалёку было не пазнаць. Раман, падумала яна і, перадольваючы млявасць, прыбавіла кроку.

Сапраўды, ля хаты сядзеў Раман. Убачыў матку, штосьці мармытнуў сабе пад нос, паспрабаваў падняцца з месца.

Яна падышла бліжэй. Сын, безуладны, з расшпіленаю кятуркай, хістаючыся, стаяў ля сцяны і глядзеў на яе запалымі, цьмянымі, бы ў непрытомнага, вачамі.

— Куды гэта з нажом? — жахнулася яна.

Раман няўцямна хітануў галавой, не ўтрымаўшы раўнавагі, пахіліўся набок.

З хаты выйшла Наталля.

— У нас усё гатова, Вікенцеўна, — сказала, звяртаючыся да Альбіны. — Сёння скончыла гнаць. — Зіркнула на мужа, непрыязна скрывіла вусны: — Ужо намурзаўся, халера цябе!

Яны ўзялі Рамана пад рукі, адна моўчкі, другая разлягаючыся праклёнамі, павялі ў хату.

*Ён падняўся з падлогі, стараючыся трымацца як найпрамей, зноў грукнуў кулаком у дзверы. На гэты раз нібыта недарэмна. У памяшканні пачуліся павольныя, сцішаныя крокі. Затым дзверы рэзка адчыніліся, і на парозе паказаўся Гірон. Ён быў у кульку і падкасаных картовых штанах. «Пахмяліцца хочаш?» — спытаў і падаў сыну кубак з нейкім пітвом. Раман схапіў кубак, але апаражніць не паспеў: вадкасць успыхнула, поўнячы пакой хісткімі ценямі, перакінулася на бацьку...*

— Зноў? — Наталля стаяла над ім і не міргаючы глядзела на ягоны збялелы, спакутаваны твар. За тры гады сумеснага жыцця Раман упершыню бачыў яе такую — суровую, бязлітасную, як тая смага, што мучыла яго толькі што ў сне і працягвае мучыць зараз.

З кухні даносіліся сцішаныя галасы: нанятыя за гаспадынь Польця з Сінкевічавай Алінай завіхаліся ля пліты.

— Дай пахмяліцца.

Наталля дастала з шафачкі бутэльку, наліла паўшклянкі, падала мужу. Той схапіў шклянку абедзвюма рукамі, прагна выпіў. Затым дастаў з-за люстэрка на сцяне лязо, правёў па ім далонню.

— Гэткім не тое што кілуна — мыш не вылегчыш. — Наталля выхапіла з Раманавых рук лязо, самога яго піхнула на ложак. — Праспіся лепш.

Увайшла Польця з драўлянай лыжкай для варэння ў руцэ, заклапочана сказала:

— Цэглы трэба — націснуць рулеты. Дзе ўзяць?

— У павеці шмат было, — коратка адказала Наталля.

— У павеці дрэнная, з рэштаю цэменту, няроўная.

Пачуўшы гаману, з лепшага пакоя выйшла Альбіна.

— Дошку пакладзіце, а зверху камянёў, — сказала аслабелым голасам. — Толькі як след націсніце.

Седзячы за сталом побач са старэйшым сынам, Альбіна задаволена ўсміхалася: вяселле атрымалася добрае, усяго хапала, усё было як след. І Наталля была ў гуморы, нават п'яны муж не раздражняў яе.

Ля сталоў паслугоўвалі гасцям дочкі кухарак Марыся і Галіна. Зрэдку і Аліна з Польцяй, абедзве пры андаляцыях, з'яўляліся ў зале, каб сабраць пусты посуд. Гарэлкаю распараджаўся Лявон. Адкаркоўваў бутэльку, заклапочана пазіраў на жонку, ставіў на стол. Альбіна, пераадольваючы боль, усміхалася яму, рабіла выгляд, нібыта есць.

Маладыя цырымонна сядзелі на покуці, глядзелі адно на аднаго.

Застолле працягвалася да раніцы.

Чаго заўгодна чакала Альбіна, але толькі не гэтага. Перакуліла на другую палову дня, а людзі спалі як забітыя. Усе, апроч яе самой, Наталлі і маладых, уладкаваўшыся хто дзе, храплі так, быццам толькі што палеглі.

Па суседстве, у Мэськавым хляве, мычэла карова і бляялі авечкі. Тое самае чутно было і з другога панадворка, ад Польці. Альбіна абулася, памалу рушыла да хаты Свістуноў.

І самі Свістуны, і ўсе, хто трапіў да іх унаначкі, спалі. Адзін Янка, звесіўшы долу вялізныя, з пакручанымі пальцамі, ногі, сядзеў на ложку і трымаўся аберуч за галаву. Убачыў Альбіну, нешта

мармытнуў сабе пад нос, споўз з ложка, хістаючыся ўбакі, паплёўся да дзвярэй. Альбіна памкнулася спыніць яго, але ён нават не варухнуў брывом. Няўцямна глянуў на яе спадылба, выйшаў у сені.

Яна паспрабавала разбудзіць Польцю, але тая толькі на хвіліну прыўзняла галаву і зноў павалілася, як непрытомная, на падушку.

З вуліцы данесліся нейкія гукі. Альбіна кінулася туды.

Янка, расхрыстаны, з палаючымі вачыма, стаяў на трасотніку і крышыў бартаю прывезеную колькі год таму ад пакояў каляровую кафлю. Ён рабіў гэта з такою зацятасцю, што Альбіна спалохалася. Асцярожна, каб не трапіць Янку на вочы, яна пракралася збоч панадворка да зарасніку бэзу і схавалася за кустом.

Скончыўшы трушчыць кафлю, Янка заклаў барту за пояс штаноў, накіраваўся да пакояў.

Альбіна кінулася назад да сваёй хаты. Надзіва, там шмат хто з гасцей ужо паўставаў. Некалькі чалавек, пабраўшы хто тапор, хто грацоўку, хто лапату, высыпалі на вуліцу, папраставалі следам за Янкам да колішняй сядзібы.

Людзі дайшлі да сядзібы, пачалі навыперадкі руйнаваць узведзены нядаўна рэстаўратарамі падмурак пакояў. Нішчылі падрад усё, што трапляла пад рукі. Крыху пазней да іх далучыліся і тыя, што спалі па суседзях. Справа пайшла спарней, так спорна, што неўзабаве месца ператварылася на гладкі, бы падлога, пляц. Аднак разгарачаным невытлумачальнаю злосцю людзям і гэтага падалося мала. Убачыўшы, што ад падмурка нічога не засталося, яны рынуліся назад, у вёску. Па-звярынаму равучы, дабеглі да першай хаты, пакрышылі

борці і калодзежны будан, прыняліся за сцены. Папярадзе ўсіх размахваў сякераю, снаваў гаспадар падвор'я і падаваў каманды. Разбурыўшы хату дашчэнту, перабеглі на другой, затым да трэцяй. І толькі ля чацвертай натыкнуліся на супраціўленне. Казік Сяховіч, калгасны бібліятэкар, паспеў выскачыць на ганак і некалькі разоў пальнуць у паветра з ружжа. Натоўп сціх, зноў рушыў да пакояў. Але там крышыць ужо не было чаго. Тады зноў павярнулі назад, пабрылі да вёскі. Дапялі да ўдога, што сіратліва ўзвышаўся па-над зараснікам бэзу, пачалі асцервянела ірваць ягады. Плады валіліся долу, крывавымі плямамі трушчыліся пад нагамі. Абарваўшы ўсё знізу, узяліся згінаць вецце, каб дастаць і астатнія. Гэта, аднак, аказалася не пад сілу: моцныя галіны згінацца не хацелі. Двое маладзёнаў спрабавалі залезці на іх, але таксама безвынікова. Роўны, без адзінае шурпаціны камель быў слізкі, ногі і рукі соўгаліся па ім, нібы па лёдзе. Не даўшы рады ўскараскацца на яго, вырашылі перапілаваць. Прынеслі пілу. Але толькі маладзёны пад гіканне астатніх паспелі паднесці яе да камля, як ад хаты Сяховічаў пачуўся гармідар. Наталля, раз'ятраная, страшная, са стрэльбаю ў руках бегла сюды, да дрэва, і без супынку штосьці крычала. Не дабегшы з паўсотні крокаў да людзей, яна спынілася, два разы запар выпаліла ў паветра.

— Не рушце яго, адыдзіцеся! — скамандавала і рашуча навяла ствол на натоўп.

Людзі змоўклі, бязгучна варушачы спэцканымі ў чырвонае вуснамі, адступілі назад.

— Хто гэта даўмеўся пілаваць? — зноў крыкнула яна і падышла з узнятаю руляю ружжа бліжэй. — Ну?

У адказ не пачулася ні гуку.

— Каб ніводная лісціна не пацярпела больш! Чулі? — Наталля пальнула паверх галоў, імкліва пакрочыла назад, да бібліятэкаравай хаты.

Натоўп з палёгкаю ўздыхнуў, рушыў у процілеглы бок.

Зноў спыніліся ля пакояў. Тут, адчуўшы, што небяспека больш не пагражае, падпалілі шаху і да змяркання танцавалі наўкола пажарышча.

*Гірон стаяў збоч ганка, пагладжваў далонню адной рукі падстрыжаную пад «польку» галаву, указальным пальцам другой вабіў Рамана да сябе. Раман падняўся з бервяна, падышоў да бацькі. Хацеў парукацца, але той дэманстрацыйна схаваў сваю руку за спіну, затым рэзка развярнуўся на месцы, хутка пакрочыў сцяжынаю да пакояў. Раман, стараючыся трапляць босымі нагамі ў ягоныя сляды, нехаця паплёўся за ім. Галава ў яго так моцна балела з перапою, што кожны крок аддаваўся ў ёй неймаверным болем.*

*На прысядзібным дзядзінцы мітусіліся людзі. Воддаль, ахопленая полымем, гарэла шаха.*

*Бацька счакаў, пакуль Раман яго дагоніць, рашуча ступіў у вогненна-крывавае воблака. Патрывожанае вогнішча незадаволена гайданулася, шугнула ўгору снопам іскраў...*

*Роспачлівае адчуванне, што Гірон адыходзіць назаўжды, падзесяцярыла Раманавы сілы. Ён закрыў твар далонямі, не зважаючы на гарачыню, ступіў за бацькам у агонь.*

# 9

## 1977
## Перамены

— Полымя яго заўсёды вабіла. — Наталля змахнула з павека слязіну, самотна зіркнула на следчага. — Урэшце, здарылася тое, што павінна было здарыцца.

— Ён нападпітку быў?

— Канечне. Як і ўсе. Не дапіліся б да белай гарачкі, і ўсяго гэтага жаху не было б.

— Вы, кажуць, дрэва выратавалі...

— Выратавала, а як жа. Яго прашчурка мая пасадзіла, і мне шкада было...

— Зразумела. — Следчы спачувальна зірнуў Наталлі ў вочы. — Дзякуй, што дапамаглі следству. Дарэчы, перад вашым прыходам званіў Козел, прасіў, каб, як толькі вызваліцеся, зазірнулі да яго ў кабінет.

— Добра, я сама збіралася. — Наталля выйшла за дзверы, не зашпільваючы паліто, пашыбавала ў другі канец калідора.

Кірыла Ігнатавіч сустрэў яе прыязна, як добрую знаёмую.

— Вельмі, вельмі вам спачуваю, — сказаў, пасадзіўшы ў фатэль насупраць сябе. — І жадаю як

найхутчэй ачомацца. З родных застаўся хто-небудзь жывы?

— Мужаў брат з жонкаю. Яна цяжарная, раджаць хутка будзе.

— Ну, гэткія сваякі крэўных наўрад заменяць, — адгадваючы Наталліны думкі, працягваў Козел.

— Я ведаю. — Наталля на хвіліну сумелася. — Але... Мне адзін чалавек прапаноўвае выходзіць за яго.

— Вось што! І хто ён?

— Вы, пэўна, ведаеце яго. Каралевіч ягонае прозвішча, ён настаўнік фізкультуры.

— О, ведаю, канечне, наш чалавек.

Хвіліну памаўчалі.

— Я днямі на радзіму збіраюся, Кірыла Ігнатавіч, — працягвала Наталля. — А перад тым, прабачце ўжо за нахабства, падтрымкаю вашай хацела б заручыцца.

— А ў чым справа?

— Ды вы ў курсе — наконт назвы вёскі. Вельмі ж нябожчыку хацелася, каб на іншую яе памяняць. Дык, можа, паспрыялі б, Кірыла Ігнатавіч?

Рэакцыя Козела была больш чым прыхільнай.

— Канечне, паспрыяю, — сказаў ён і пазначыў штосьці на календары. — Пішыце ў выканкам заяву, а я прасачу, каб доўга не валакіцілі. Дарэчы, наконт абранніка вашага, Каралевіча, у нас ёсць сякія-такія пражэкты. На прадмет пераводу ў раён. Не хацеў дачасна гаварыць, ды калі ўжо зайшла пра яго размова... Словам, і ў гэтым плане рыхтуйцеся да перамен.

— Вы? — дырэктарка музея ажно адхіснулася ўбок ад нечаканасці. — А мы уже разыскивать вас собрались. Как вы могли на такое пойти? Ну, по-

просили бы разрешения снять ксерокопию, так нет — украли...

— Так надо было. — Наталля дастала з сумачкі лісткі, падала жанчыне. — Вот, все в целости и сохранности.

— Но почему вы решили их возвратить? — з твару дырэктаркі не сыходзіла здзіўленне.

— Может, еще кому понадобятся, — усміхнулася Наталля. — И точно понадобятся, не сейчас, так через сто лет, — дадала і таропка накіравалася да выхаду.

Спяшалася: цягнік на Падкрайну адыходзіў а шостай вечара, а ў яе яшчэ не было квітка.

# 10

## 1998
## Польця
## З магнітафоннага запісу прафесара М. М. Дзямешкі

Тое, гляджу, бытта ідзець нехта. Аж вы. Дык і добра, а то маркотна аднэй. А што дзярэўню паказаць, дык вы ня першыя просіце. Былі тожа неяк прыехаўшы, з горада. А я, як на тое, абы-як надзеўшыся, тока-тока з хлява. Схувалася, думала пойдуць. Не, асталіся. Дзве бабы, мужчына і малец-падулётак. Твары белыя ва ўсіх, як мукой абсыпаныя. Зразу відацца — гарадскія. Паказала ім усё. І вам пакажу, анягож.

Ну, так, значыцца, гэта мая хата. А гэна Бакевічава. Тамака воддаль — Старынскіх. Усе, кром маей, пустыя. Глянеш кароты раз, і ворах шыбанець. Жартачкі, як труны тыя хаты стаяць, нідзе нікагусенькі. Дажыліся.

Гэта во — дзерава. Як называецца, не знаю. Ці не паны яшчэ пасадзілі. Ягады благія: паясі і здурнееш. Я помню такі случай, былі падурнеўшы. Хто што пабралі ды давай усё крышыць. Маладым не наравіцца яно, кажуць, усе беды з тых ягад. Зрэзаць хацелі. Толік Старынскіх з мальцамі спілаваць магаваліся, але мы, старэйшыя, не далі. Сталі кругам і не пусцілі блізка. Толік упырысты. «Цяперака, — кажаць, — не ўда-

сца, пасля зрэжам. Не мы, дык унукі нашы. А расці яно тут ня будзець». Ат, што яны зробяць! Тут во ўперад адно было, а цяперака вун якія зараснікі. З насёна расцець. І ўсюдых так. Днямі сястры маей Фэлі дачка з-пад Гродны прыязджала. І там ужэ поўна гэтых дзераваў. Як наўмысля хто сеець.

Гэна вундзека, дзе пагурак, — пакоі панскія. Іх яшчэ цэлыя помню. Красівыя былі. Ніз цагляны, верх з дубу, страха — гонтавая. Кругом кветкі, дрэвы разныя, бэз, чаромуха, шыпшыннік. Вясной такі пах, аж галава кругам. Алеі ўсюдых, арэшнік. Усё панішчылі, нічога не асталося. Дрэвы, каторыя таўсцейшыя, папілавалі — на падушачкі для рэдаляў. Думалі, добрыя будуць, спілавалі, а яны пагніўшы ўсе. Шкода, дрэвы спрытныя былі, высокія. Во тут, гэтым месцам, тофеліна таўстая стаяла. На ей бацяны пладзіліся. Але яе не пілавалі, сама заваліласа, ад старасці. Бацянёнак адзін, зваліўшыся, крыло паламаў, дык лётаць ня мог. А тады патроху к восені акрэйбаў, паляцеў.

Пакоі самі парылі. Спярша печы, пасля і астальное. А ўжо страху як збурылі, дык і з канцом. А пасля шась — камісія прыехала. Так і так, сядзіба дужа важная, дык нада аднаўляць. Ну, нада дык і нада. Толік Старынскіх за настаўніка, вучоны, узяўся памагаць. І ўжо зробілі што-няшто, як напіліся, ды зноў куралесіць. Бытта Толікавага брата жонка, Натка, усё падробіла, падпаіла нечым. І мой быў здурнеўшы. Пасля адышоў, але жыў нядоўга, не даў клёку. Многія тады памёрлі. А тыя, што выжылі, выязджаць пачалі. Пасля Натка наконт назвы пачала дахаджваць, каб змяніць. Дахадзіла. Была Дубраўка, стала Падкрайна. А я ўсё роўна Дубраўкай заву. І Натцы пра тое казала. А яна: «Скажы, дзякуй, цётка, што Свісцёлкай не назвалі. Усе вы тут свістуны, сваё прасвісталі».

Яно й праўда. Цяперака таго, што ўперад было, і блізка няма. Во хош гарод узяць. Даўней і грэцка табе, і проса, і лён. А сягоння бульба адна ды жыта. Усё звялося, во зямля і быдлеець, як той бабыль.

Што яшчэ вам паказаць, ня здумаю. Можа, магільнік? Хадзіце паглядзіце. Тут во Канстанцыя, паня, ляжыць. Некалі ўпобачкі склеп быў, ды збурылі. Шкода, паны дужа важныя былі людзі. Гэта во — Бакевічавы, Галіна з Петраком. Магілку Валька, дачка іхная, даглядаець. Яна па суседству ў дзярэўню зайшла, дык прыходзіць нараччас. Тут далей — мае. Бацькі абое, мужык і сынок старэйшы, Казік. А тамака вун, за капліцай, — Старынскія, Вітольды, Гірон з Альбінай, Лявон і Ромка. Альбіна ягадамі атруцілася. Гірон і Ромка ў агні згарэлі ў адзін дзень. Лявон з раку нядаўна памёр. Натка, жонка Ромкава, скора па яго смерці ў райцэнтру пераехала з новым мужыком. Начальніцай па культуры, ці як яно там завецца, робіць. Мужыка кінула, трэці раз замуж зайшла, за нейкага Казла. Гэта нядаўна ўжо. Магілы Люся з Толікам даглядаюць. Тэж ужо пенсіянеры, унукаў гадуюць. Па-нашаму ўсе гавoруць. І тут, на магілках, відзіце, па-беларуску напісана, Толік настояў. І мне тое самае раіў зробіць, але я пастыдалася. Якая там разніца, па-якому напісана, адзін чорт.

Капліцу ў складчыну ставілі. Падгніла ўжо, але на мой век досіць. Па вялькіх святах ксёндз прыязджаець, ладзіць імшу. З маладзейшых хто з суседніх дзеравень падляціць, памолімся. А так адна я тут, адна... Але не наракаю. Пачнеш наракаць і на горшае што наўрэеш. Так і сяджу, чакаю, калі Бог злітуецца, возьмець да сябе. А вы што тутака? З цацкамі, гляджу, нейкімі? Запісываеце? Ну, запісывайце, калі інцярэсна... Хош які наедак са старой...

KAMUNIKAT.org

# ШУЛА – МЕГАПОЛІС
## АПОВЕСЦЬ

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

Працэдура дагляду цягамотлівая і доўгая, здаецца, яна ніколі не скончыцца. Мы сядзім у чаканні пашпартоў у салоне аўто ля будана з вакенцам, за якім мудруе пры экране кампутара разамлелы ад спёкі мытнік, назіраем, як мітусяцца ўгары, пад дахам ангара занятыя кармленнем птушанят ластаўкі. Птушак шмат, не менш двух дзесяткаў, і яны без супынку нагадваюць пра сваю прысутнасць пахаплівым шорганнем крылаў ды белымі кроплямі-меткамі на доле. Вывадак асмялелых зялёных яшчарак — люду шмат на тэрыторыі, але ніхто іх тут не чапае — акупаваў лапік зарослае рэдкім трыпутнікам сцежкі наўзбоч стаянкі, грэецца ў промнях цяжкога, бы распалены кавалак жалеззя, ліпеньскага сонца. Мытнікі раз-пораз выходзяць на двор, весела перагукваюцца адзін з адным паўз разнасцежаныя дзверы, ды таўсматая постаць прыбіральшчыцы мільгне рукавом уніформы і знікне па-за елкамі, з-за якіх вытыркаецца рог густа спярэшчанай пракудлівымі надпісамі скрыні для смецця. Шпацыраваць па пляцы пры будане не забаронена, але ніводзін з нас вылазіць з салона не жадае: занадта горача.

Мытня. Пік лета. Поўдзень.

У будынку, відаць па ўсім, ідзе рамонт, гэта надае дзеянням памежнікаў адценне несур'ёзнасці, нават камічнасці. Асабліва, калі чарговы раз ляпаюць дзверы і замест доўгачаканага службоўца з пашпартамі з'яўляецца ў праёме ўсё тая ж цётка-прыбіральшчыца са швабраю ў руцэ. Выбух нашага нервовага смеху, што суправаджае яе з'яўленне, разносіцца рэхам па падстрэшшы ангара, і вось зноў усё заціхае. Ні гуку, ні подыху ветру, толькі бачна, як у вузкім пераходзе паміж службовымі пакоямі і крамай з шыхтам бліскучых бутэлек на самым выгодным, здалёку заўважным месцы ляніва сваволіць з папяровым друзам — то ўздымае яго ўгору, то апускае зноў на дол — слабы скразнячок.

У салоне цеснавата, і тое найбольшая нязручнасць. Варта аднаму з нас варухнуцца, як тае ж хвіліны пачынаюць варушыцца астатнія. Не менш даймае гарачыня. Ледзь прыхінешся плячыма да спінкі сядзення — і яны тут жа вільгатнеюць, робяцца ліпкімі, бы суквецці смолкі ў букеце кіроўцы над бардачком.

Нас пяцёра, усе пры целе. А хто-ніхто, як, напрыклад, галоўны нашай дэлегацыі Зяменя — мы едзем у Т. на ўрачыстасці з нагоды юбілею горада-пабраціма, — і апрануты, нягледзячы на спёку, далёка не па-летняму. Асабліва непрыемна адчуваць дотык чужога ўспацелага цела, ад якога тваё ўласнае ўвобміг напружваецца, выдае хвалю дрыжыкаў. Не грэбуюць мажлівасцю падпсаваць настрой і камары. Месца глухое, хмызістае, аўто стаіць у цяні, і крывасмокі жывасілам лезуць у яго, цiснуцца за шыю, пад каўнер, у калашыны штаноў.

— Вось, а яшчэ шкадавалі, што шорты не апранулі, — кажа Зяменя і млява ўсміхаецца. — Паглядзеў бы я на вашы скусаныя лыткі...

Мытнік за шкляною перагародкаю нарэшце адрывае вочы ад экрана кампутара, абводзіць нас па чарзе ўніклівым паглядам, што неяк зусім не пасуе да пакамечанага, бы з бадуна, твару. Аддае Зяменю пашпарты з дэкларацыямі, дакранаецца даланёй да чырвона-бела-чырвонага паска на грудзіне:

— Шчаслівай дарогі!

— Ужо? — быццам не верачы, што ўсё скончылася, кажа кіроўца і зачыняе дзверкі машыны.

Аўто памалу вырульвае на шашу і адразу ж (мы ўжо спазняемся: а пятнаццатай першая імпрэза, а нам яшчэ ехаць ды ехаць) набірае хуткасць. Багажнік чорнай «бээмвэшкі», што імчыць перад намі, чамусьці незачынены, з яго вытыркаецца, цялёпкаецца на ветры ашмётак цэлафаніны.

Мясціны знаёмыя мне з дзяцінства, я з цікавасцю ўзіраюся ў краявіды, не бачаныя без малога пятнаццаць год, ад паховінаў дзядзькі Міхала, матчынага брата. Калісьці бухмата-ўраджайныя, а зараз спрэс зарослыя дзікім лубінам і цімафееўкай палі ўсцяж дарогі пераліваюцца морам фарбаў-адценняў. Гравейкі, адна з якіх вядзе акурат да кута па той бок ракі, дзе я нарадзіўся, вузкімі віхлястымі атожылкамі разбягаюцца ад шашы ва ўсе бакі, хаваюцца пад шатамі старадрэвінаў.

— Эўропа! — наўмысна выгукае пад «тарашкевіцу» Зяменя і яшчэ больш моршчыць і без таго пасечаны зморшчынамі лоб. Ён ад раніцы, ад тае хвіліны, як ад'ехалі з дому, раз-пораз заводзіць гаворку наконт не так даўняга ўступу суседзяў у Еўразвяз, і кепскі яго настрой, узмоцнены ўтомным чаканнем на мытні ды нашаю маўкліва-зацятаю

няўвагаю да ягоных глыбакадумных высноваў, усё горшае і горшае. — От і няхай! Не хацелі з намі ў хаўрусе быць, то няхай ведаюць... Саюз ім воўкам смярдзеў, ну дык і хай жа во цяпер з гэнымі паспрабуюць! Яшчэ пашкадуюць, паглядзіце, зноў у сябры да нас папросяцца!

Першае пасля мяжы паселішча вымыкаецца з-за павароту нечакана, я ледзь-ледзь паспяваю ўгледзець на ўказальніку знаёмы назоў: Murovanka. І ён, гэты назоў, — ці не адзінае, здаецца, што не змянілася ад даўнейшых часоў, бо сама вёска і блізка не нагадвае тую, якую я памятаю. Так бывае, калі нечаснадзеўна спаткаешся дзе-небудзь у незнаёмым месцы з колішнім знаёмцам, а год прамінула столькі ад вашае апошняе сустрэчы, што не адразу і сцяміш, ці то чалавек перад табою, ці то ягоны прывід.

Кіроўца суцішвае хуткасць, аўто памалу цягнецца ўздоўж хат.

Хаты не менш, калі не больш недагледжаныя, як на нашым баку. Пакрыўленыя платы абапал панадворкаў, запалыя аканіцы з няпэўнага колеру налічнікамі, пашэрханыя сцены. Пасярод вёскі ўзвышаецца-чарнее на месцы хаты рымара Ванагіса комін з паўразбуранай печчу — усё, што засталося ад жытла пасля таго, як яго разабралі. Разабралі, хутчэй за ўсё, на дровы, пра тое сведчаць колькі ўрослых у траву на спажыву непагадзі спарахнелых бэлек уперамешку з гурбаю дошак-шалёвак. Комін, ды печ, ды пара паўздзічэлых прысадзістых яблынь — усё, што нагадвае некалі спраўную сядзібу з добрым тузінам вулляў пад ліпняком і плоймаю нарыхтовак для хамутоў-падсядзёлкаў на дзядзінчыку перад клеццю. Ды яшчэ не зарослая дарэшты сцежка, што вядзе да азяр-

ка, на краі якога ніцее пасярод паўвыспы з маладзенькага альхоўя купка вішняў з абдзёртымі камлямі. Таго самага, у якім мы з сябруком Тонікам аднойчы пакупаліся па дарозе з крамы ды і падчапілі нейкую трасцу і потым доўга, ці не з месяц цягаліся да фельчара ў спадзеве як найхутчэй пазбавіцца каросліўых плямаў пад пахамі і на спінах.

— От і няхай, — кажа Зяменя і задаволена ляпае сябе далонямі па каленях. — І няхай...

Рудое кацяня са збадзянаю на спіне поўсцю вылазіць з падпечка, пужліва азіраецца наўкола, соладка пацягваецца. Другое, крыху большае і больш жвавае, высоўвае пысу з акантаванага дашчэчкамі лазу, выкульваецца ў траву следам за першым, паважнаю спарудай застывае ўпобачкі.

Кіроўца сігналіць, і абодва каты, напалоханыя знячэўным гукам, уздымаюць хвасты, порстка шмыгаюць зноў у падпечак. Усё адбываецца так хутка, што нагадвае змену кадраў пры перамотцы касеты: адно імгненне, адзін узмах хвастом, былі — і няма.

Я азіраюся з надзеяй, што каты зноў вылезуць са схову, але дарэмна. Падпечак хаваецца ў засені парэчніку, паволі сплывае з вачэй разам з комінам. Я сілюся ўявіць яго чэрава, і яшчэ адзін малюнак — цяпер ужо больш як саракагадовае даўніны, мне ледзь споўнілася тады восем — усплывае ў маёй памяці. Усплывае амаль імгненна: што-што, а гэтае месца ў вясковай хаце, падпечак, я памятаю добра. Так добра, што нават, здаецца мне, і зараз, седзячы пры шыбіне найсучаснага аўто, чую яго спецыфічны, разкаваты пах. Пах пер’я ды акамянелых, шорсткіх навобмацак

курыных — не фекаліяў, такога вучонага слова мы, мурзатыя спадкаемцы найпатомных сялянаў, не ведалі, — калткоў...

*Дзень і на палову яшчэ не паспеў перакуліць, а ў кухні ўжо цемнавата, бы ўвечары. Вецер без супынку раве на дварэ, то грукнецца ў дзверы сяней, то шпурне ў вакно жменю крупак-градзінаў, то пужне кароткім злым ударам па сцяне, ад якога ўся хата скаланецца, а бэлькі пад шпалераю зойдуцца роспачлівым енкам. А то раптам зусім сціхне, быццам знарок замрэ, каб даць хвіліну-другую Ларысцы павохкаць, мне — тое вохканне як лепей пачуць.*

*Вохканне — пра адно і тое ж, не вохканне, а заезджаная кружэлка. Толькі Ларыска расшчэпіць вусны, а я ўжо ведаю, што з тых вузенькіх, падфарбаваных матчыным алоўкам шчэлачак-вуснаў вымкнецца:*

*— Ай, вой, і дзе ж гэта ён? Ну ж бадзяжка!*

*Што я чую яе з падпечка і праз тое раблюся сведкам яе перажыванняў, сястру, здаецца, ані не турбуе.*

*Ён — практыкант-«зайцехнік» Вася, студэнт ветінстытута, абаяльны шатэнчык з параю ранніх залысінаў і тампонам у левым вуху, які ён не вымае адтуль — хранічны атыт — амаль ад дня свайго прыезду. Вася кватаруе ў бабулі майго дружбака Тоніка і штодня прыходзіць да нас, дакладней, да Ларыскі. Сястра сустракае яго вясёлым смехам, яны зачыняюцца ў пакоі і сядзяць гэтак удваіх колькі гадзін. Чым яны там займаюцца, я не ведаю. Ды не пацеры, пэўна ж, адмаўляюць: смех, што даносіцца з пакоя, на такую сур'ёзную справу не паказвае. Вясёлы вэрхал за сцяною час ад часу змяняецца цішай, што ці то незнарок, ці то, наад-*

*варот, наўмысна супадае з аціханнем ветру на дварэ, і тады здаецца, што ў тым пакоі наогул нікога няма.*

*Вася — першы студэнт, які ашчаслівіў нашу глухамань сваім прыездам. І семнаццацігадовая Ларыска, якая дагэтуль студэнтаў ніколі не бачыла, штодня ад раніцы чакае ягоных візітаў. А калі ён доўга не прыходзіць, нервуецца так, што пачынае рабіць розныя глупствы. Неабыякавага да сястры Тоніка ўсё гэта вельмі злуе.*

*Адзіны з дарослых, каму недаспадобы студэнтавы візіты, — наш бацька.Сам зацяты, ён лічыць практыканта занадта ўжо ўвішным у стасунках з людзьмі». Далёка пойдзе», — кажа, і вырак той гучыць як найвышэйшая ступень асуджэння найгоршай з чалавечых заганаў. Маці заступаецца за Васю, бо лічыць, што гэта — звычайная зайздрасць сталага чалавека да больш пасяховага маладога. І, бадай, мае рацыю: бацька сам калісь, пры Польшчы, меў намер вучыцца на ветэрынара, і сям’я нібыта сабрала ўжо грошы на вучобу, як уваднача́с парушыліся ўсе тыя амбітныя планы прыходам Саветаў.*

*На дварэ сквар, у хаце паўпрыцемак, у падпечак урэшце прабіваецца, прасіціўшыся паўз шчэлку ў таўшчэзнай наледзі на шыбіне, хісткі сонечны промень. Ён такі кволы, што я баюся дыхнуць: а раптам ён знікне? Час ад часу промень перамяняецца ў цьмяны пасак, і ўсё наўкола таксама ўвобміг цьмянее, вузее, але аднача́сна робіцца ад таго яшчэ больш утульным. У падпечку цёпла, пахне сажаю і курынымі калтамі. Уласна, дзеля іх, калтоў, я ў тое падпечча і палез. Надоечы чуў, як цётка Адальфіна, Тонікава матка, жалілася маёй, што аніяк не можа саўладаць са злыдушнаю звычкаю*

*сына браць іх у рот, і вырашыў сам паспытаць тое «смачноцце» на зуб.*

*Усохлы, шэры, як агарак на кончыку бацькавай папяросіны, калток пахне сераю. Гэтага дастаткова, каб спыніць даследзіны: маці ледзь не штодня перасцерагае мяне, баронь Бог, не смактаць запалкі, бо «вунь адзін пасмактаў і атруціўся, сканаў». Ці праўду яна кажа, ці не (можа, проста палохае), я не ведаю. Але страх сканаць у цёмным, прапахлым цвіллю і курынымі пёрамі падпечку перасільвае цікаўнасць. Канаць жа мне не хочацца. Я ўжо аднойчы бачыў, як канае чалавек, — відовішча не з прыемных. Да таго ж і бацька з маці вось-вось павінны вярнуцца з Т. з кірмашу, і што будзе, як заспеюць за гэткім саромным заняткам?*

*Сястра каторы раз за апошнія паўгадзіны высоўваецца са свайго пакоя, качынаю — нясклёпа! — хадою набліжаецца да печы. Дзве крывыя, як камлі арэшын-спарышоў у загуменні, нагі засланяюць і без таго скупы прамень, спыняюцца насупраць лазу.*

*— Ясі? Скажу маме. — Голас абыякавы і, як заўжды, насмешлівы. Камлі зрушваюцца з месца, павольна знікаюць, але праз колькі хвілін з'яўляюцца зноў.*

*— Сябрук твой, Тонічак, цягнецца, от ужо ўдваіх гаўна наясцёся!*

*Дзверы ляпаюць, уваходзіць Тонік. Ягоная грывастая галава ўсоўваецца ў лаз, і мне нічога не застаецца, як даць яму месца побач. Прызнавацца, чаму я ў падпечку, мне не хочацца, я ўтрапёна, аж да рэзі ўваччу, разглядаю патрушчаную шкарлупіну ад яйка, што нейкім цудам пазбегла курынае дзюбы і цяпер сіратліва боўтаецца ў куце на танюткай — і як дае рады ўтрымацца на ёй? — павуцініне.*

*— Спрабаваў? — Тонікаў голас гучыць даверліва і разам з тым занадта гучна, каб яго не пачула сястра.*

*— Спрабаваў, а як жа, — падае яна голас і здзекліва смяецца, — Але ж і смачна!*

*— А ты адкуль ведаеш? — пераймаю я. — Ела?*

*— Вось яшчэ напрыдумляй! — Сястра абражана фыркае, цягнецца ў пакой.*

*— Тонюсь, Вася дома? — крычыць неўзабаве праз дзверы, і голас яе трымціць, як стомлены абрыдлым вісеннем праз усю зіму ліст на бэзіне пры вакне.*

*— Дома! — крычыць у адказ Тонік і тут жа амаль, размораны цеплынёй, засынае.*

*Я мкнуся перапаўзці праз ягонае нерухомае цела, але няўдала. Тонік прачынаецца ад майго дотыку, чапляецца спрасонку за руку, прыцягвае да сябе. Целы нашы судакранаюцца, і я чую ягонае няроўнае — няйначай, прастуда, — перарывістае дыханне.*

*— Зэ-энік... — кажа ён і яшчэ мацней прытуляецца да мяне. Я разумею, што ён трызніць, і колькі хвілін ляжу нерухома побач. Зэнік — малодшы Тонікаў брат, два гады таму ён памёр, не даўшы рады выкараскацца з нейкай рэдкай сардэчнай хваробы. Я ляжу побач з Тонікам яшчэ колькі часу, а як толькі заўважаю, што ягонае цела мякчэе, паціху вызваляюся з абдоймаў, сунуся па каляным, бы грудок пасля аблівахі, доле да лазу.*

*Мяне нясцерпна, да свербу ў грудзях, вабіць маціца над бацькоўскім ложкам за перабойкаю. Я прабіраюся ціхутка за перабойку, ускокваю на ложак, трапляючы раз-пораз даланёй у павуціну, шнару рукою па шчэлцы паміж маціцай і столлю. Сетка ложка занадта тугая, так і спружыніць пад нагамі, пагражае скінуць мяне на падлогу. Ад хвалявання ды страху, што ўвойдзе ды заспее мяне*

*тут, пры такой справе, сястра, цела маё ахопліваюць дрыжыкі. Як на тое, парушыніна адрываецца ад падстолля, гайдаецца, матляецца перад вачыма, замінае пошукам.*

*Гумкі на месцы, але ўжо іх не чатыры, як заўчора, а толькі тры. Знікненне адной мне незразумелае. Як незразумелае, папраўдзе, і прызначэнне тых гумак наогул. Я бяру адну, надрываю, як і мінулы раз, абгортку.*

*Тугое колка абапал гумкі нагадвае абручык матчыных пяльцаў, толькі шматкроць меншы. Сама гумка гладкая, з рудаватым адценнем. Мне чамусьці прыходзіць у галаву думка ўздзець яе на цвічок збоч маціцы. Але гумка такая далікатная, такая тонкая, што мне робіцца яе шкада. Я вымаю са шпалерыны голку, якою маці звычайна зашывае бэбахі, асцярожна пракалваю гумку пасярэдзіне. Затым хуценька кладу яе на ранейшае месца на маціцы.*

*Голка выслізгвае з маіх рук, з глухім шорганнем падае ў праём між сцяною і ложкам. Я саскокваю на падлогу, сунуся да падпечка.*

*Мне крыху не па сабе, здаецца, што я зрабіў штосьці вельмі кепскае. Я хачу вярнуцца зноў да ложка, каб узяць папсаваную гумку, але згадка, што бацька, мабыць, напярэдадні іх усе палічыў, спыняе мяне.*

*Тонік усё яшчэ спіць, гэта мяне супакойвае. Да таго ж з вуліцы чуюцца крокі.*

*Практыкант Вася ўваходзіць у хату, дае «дзень добры». Ларыска выбягае на ягоны голас, удае ні то радасць, ні то здзіўленне, перарывіста, з прыдыхам хіхікае.*

*— Брат дома? — пытаецца Вася і праз хвіліну — мабыць, Ларыска паказала жэстам, дзе мы, —*

*зазірае ў падпечак. — Паснулі, — кажа і сунецца следам за сястрою ў яе пакой.*

*Ціша, што ўсталёўваецца ў пакоі адразу ж, як толькі зачыняюцца за імі дзверы, здаецца мне падазронаю. Зрэшты, і ўчора, і заўчора было гэтаксама, але ж нічога благога там не здарылася. Абодва выйшлі з пакоя расчырванелыя, але задаволеныя, ні намёку на нейкае непаразуменне. Я ўладкоўваюся на доле побач з Тонікам. І толькі пачынаю засынаць, як Вася выходзіць з пакоя сястры, накіроўваецца за перабойку.*

*Я чую, як рыпяць пад ягонымі нагамі масніцы падлогі, праз хвілю-другую, угінаючыся, — спружыны ложка, як ён сапе, шнарыць рукамі па падстоллі, як урэшце саскоквае з ложка і крадзецца зноў у Ларысчын пакой. Я кладуся побач з Тонікам і, злагоджаны цеплынёй, што зыходзіць ад сябравага цела, ды стомлены прыгодаю з гумкаю, імгненна засынаю.*

*Будзіць мяне голас бацькі. Я падымаю галаў і бачу пад сталом наўскос лазу яго валёнкі ў галёшах з разводамі ні то снегу, ні то солі на насах.*

*— О-от яны, гэтыя Саветы, — кажа ён і казыча даланёю нагу ніжэй калена. — Абы горш чалавеку зрабіць, абы горш...*

*Саветы — яго ўлюбёная тэма, я яшчэ не разумею, што гэта такое, ды і іншы клопат на ўме: каб жа Ларыска не вымкнулася, не прагаварылася пра калты.*

*Лёгкая на ўспамін, сястра ўсоўвае галаў у лаз.*

*— Ну, выспаліся, калтаеды? — кажа і матляе перад нашымі з Тонікам спэцканымі сажаю насамі гасцінцам ад дзядзькі Міхала і цёткі Шуры — скруткам цукерак «Кароўка» і дыхтоўнаю кніжкай з*

*выяваю нясветнае прыгажосці палаца на вокладцы.*

*— Пушкин ... Ска-зки... сказ-ки, — чытае Тонік (я яшчэ не ўмею) і, прыўзняўшыся на жываце, выхоплівае кніжку з Ларысчыных рук.*

*— Штосьці практыканта вашага сёння не бачна, — кажа яна і хітра — ліса дый годзе — пасміхаецца.*

*Што смех той — дачасны, смех-прадвесце драмы, ні сама яна, ні хто з нас яшчэ не ведае.*

*Кепскую навіну прыносіць Вася. Кепскую — для Ларыскі, бо выгляд самога практыканта на няшчаснага не выдае. Наадварот, ён ужо думкамі, здаецца, увесь у сваім горадзе. Тэрмін практыкі скончыўся, заўтра ён, злёгку рассыцелы на вясковым харчы, ад'язджае.*

*Ларыска сядзіць моўчкі насупраць яго, але не плача: маці ў хаце, і паказваць свой адчай ніяк не выпадае. Яна сядзіць немаю зданню пры стале, слухае, як Вася апавядае пра гарадскія норавы. Слухае ды кусае ў роспачы вусны. І толькі калі Вася падымаецца, каб пайсці, не вытрымлівае, ускоквае з месца, кідаецца следам за ім на двор.*

*— Што гэта з дзеўкаю? — дзівіцца маці і хітае галавой. — Га?*

*Яна глядзіць на мяне, быццам чакае падказкі, што тут да чаго, але я маўчу. Мне шкада сястру, ды і таямніцу яе выдаваць не хочацца.*

*— Закахалася, можа? Дурнічка! Трэба нам гэткі... усходнік!*

*Усходнік для маці — ці не горш за лаянку, усходнікаў яна не любіць ад таго часу, як раскулачылі перад вайною, пры першых Саветах, і звезлі некуды за Урал яе бацьку, майго дзеда.*

*— Знайшла кавалера! Лоб, бы калена, і вушы тырчком... Нашы мальцы не горшыя. Ані.*

*Ларыска вяртаецца з вуліцы, ідзе ў свой пакой. Яе плечы паныла ўздрыгваюць у такт крокам, а таўстыя, з плямамі ад прадаўніх фурункулаў лыткі выдаюць яшчэ больш крывымі, як звычайна.*

*Што з сястрою нешта не так, я здагадваюся, ды не больш таго: маці маўчыць, маўчыць і сама Ларыска. Нават прыезд дзядзькі Міхала, які жыве ў Т. і заўжды прывозіць нам з сабою безліч цацак і ласункаў, гэтым разам ні ў кога не выклікае энтузіязму.*

*Дзядзька робіць на фабрыцы, дзе толькі што распачалі выпуск нейкіх штучных нітак, і любіць пахваліцца, як там усё гожа ўладкавана. У фабрычнай краме ўсяго-ўсяго, а ў сталоўцы нават каньяку можна хапіць дзеля гумору падчас абедзеннага перапынку або пасля змены. І ўсё танна, усё можна прыдбаць за капейкі. І наогул, калі верыць яму (а мы верым, канечне), усё ў Т. і яго ваколіцах лепей, як у нас. Смачнейшы хлеб, раўнейшыя дарогі, і соткі штогоду ніхто не перамервае, і быдла можна на вёсцы гадаваць колькі заўгодна, была б толькі ў чалавека ахвота.*

*— Нават каньяку, бач ты, — з недаверам у голасе кажа маці і сунецца ў істопку па чарговую бутэльку гарэлкі.*

*Мужчыны выпіваюць, бацька ўздыхае, ідзе на двор драбляць шулу для лазні, што распачаў месяц таму і ўсё ніяк не давядзе да ладу, бо ўсхапіўся маразяка і на дварэ вельмі сцюдзёна.*

*Дзядзька дастае з кішэні жмут грошай, кладзе на стол.*

*— Колькі здолееш узяць у жменю, — усё тваё, Анэлька.*

*— Ай, не дурніся, братка! — адмахваецца маці. — Нябось скраў у Шуры...*

*— Ага, у Шуры скрадзеш! — кажа ён і сіллю ўпіхвае маці ў далонь колькі паперчын. — Не скраў, сястрыца, зарабіў, вось гэтымі рукамі. Так што бяры, не саромейся... Дасць Бог, калі-небудзь мяне выручыш.*

*Такая сцэна паўтараецца з прыезду ў прыезд і сканчваецца звычайна тым, што грошы застаюцца ў маці. Дзядзька — шчодры, і мы ўсе яго за гэта, вядома ж, любім.*

*Дзядзьку падабаецца роля настаўніка, ён вучыць нас з сястрою латышскім словам. І хоць набор іх у нашым лексіконе яшчэ зусім невялікі, як будзе «па-іхняму» певень, або крама, або малако, мы ўжо ведаем.*

*Гэтым разам урок, аднак, больш складаны, як звычайна.*

*— Kas jauns?* — заклапочаны панылацю на нашых тварах, кажа дзядзька і натыкаецца на сумны, з дамешкам дакору, пагляд маці.*

*— Кінь ты, Міхал, мудрагеліць, — адзываецца яна і кідае ў печ палена. — Кажы па-чалавечы.*

*— Што новага ў вас? — ператлумачвае ён пытанне і абводзіць усіх нас па чарзе дапытлівым позіркам. — Чаму такія сумныя? Здарылася што?*

*Маці падхоплівае яго пад руку, шэпча штосьці ў вуха, цягне ў сені, адтуль — чуваць, як ляпаюць дзверы, — на двор.*

*Вяртаецца маці адна і не хутка, блізу праз паўгадзіны. Загадвае мне выйсці, а сама, ледзь паспяваю я ўзяцца за клямку дзверыны, падсаджваецца да Ларыскі. Пра што яны гамоняць, я не ведаю, хоць і здагадваюся, што вырашаецца нешта важнае.*

---

* Kas jauns? (латышск.) — Якія навіны?

*Бацька мудруе на трасотніку з шулаю, дзядзька Міхал сядзіць побач на гурбіне апалкаў і заўзята, ажно таргаюцца цяглiцы пераносся, паліць. Убачыўшы мяне, мужчыны імгненна сціхаюць.*

*— А як усохне твая шула, тады што? — кажа па невялікай паўзе дзядзька і дакранаецца да на траціну выдзеўбанай бэльчыны рукою. — Можа такое здарыцца?*

*— Канечне, можа, — адказвае бацька. — Асабліва, як шула і бэлькі сяяны не аднае пароды. Тады — дрэнь справа. Як ні круці, а чужое з чужым кепска зжываецца... То важна, каб бэлькі пасавалі ў вянцах да шулы. Бэльчыну падгоніш як след да пазу, і ніякая ўсушка тады не страшная. — Ён кідае сякеру, садзіцца побач з дзядзькам, таксама запальвае. — Шула — гэта ого, усёй будыніны трымач, без яе любое што да часу гахне...*

*Шула амаль гатовая, але вяртацца ў хату, дзе спее-выспявае штосьці нядобрае, ні адзін, ні другі не спяшаюцца. І я сунуся дамоў адзін.*

*Сястра ўжо не плача, толькі зрэдку, як маці адварочваецца, каб зірнуць у печ, паціху румзае.*

*Мужчыны ўваходзяць у хату, уладкоўваюцца ля стала.*

*— О, Т.! — кажа з пафасам, паўз які прабіваецца ніякаватасць, дзядзька Міхал і па чарзе нам усім падміргвае. — Такі горад... самі паглядзіце!*

*Ён адшморгвае фіранку, узіраецца ў прыцемак за вакном. Затым загадвае мне апранацца, ідзе да дзвярэй.*

*— Куды гэта? — пытаецца маці.*

*— Пакажу хлопцу сёе-тое, — адказвае ён і вабіць мяне за сабою.*

*Тонік, які ўвесь гэты час, аказваецца, віжаваў за намі на двары з-за клеці, вымыкаецца са схову, далучаецца да нас.*

*Мы сядзім на руінах былога сядзібнага дома, глядзім, як міргаюць фарамі пазарэччу, на латышскім баку, адмысловыя машыны. Сядзім доўга, не зважаючы на сцюжу. Сузіранне цуду, што дзеецца ўдалечыні, так захоплівае нас, што мы забываемся і на халадэчу, і на час.*

*Урэшце дзядзька падымаецца.*

*— Ну, хопіць... Вось падрасцеце, прыедзеце ў Т. вучыцца ці працаваць, пабачыце ўсё самі,— кажа і падчэплівае носам бота аскепак кафлі, што застаўся ад збуранай не так даўно панскай печы.— Там жытка — не тое што тут. А чалавеку што трэба? Рыбіна — дзе глыбей шукае, чалавек — дзе лепш, чулі такі выраз? Ад Інаркі вам, дарэчы, кавалеры, абодвум прывітанне, ад Рэні таксама.*

*Інарка — дачка дзядзькі Міхала і цёткі Шуры, мая стрыечная сястра. Рэня — Інарчына суседка, Міхалава і Шурына хрэсніца, яе мы з Тонікам дружна недалюбліваем за пагарду да нас ды за тое, што кпіць з нашай мовы. Абедзве прыязджалі да нас улетку і ўнеслі ў нашае ціхаплыннае вясковае існаванне тузін прыгодаў.*

*— Ладна, хадзем дахаты, а то матка абшукаецца,—кажа дзядзька і рушыць да хаты.*

*Ён ідзе прыгнуўшыся, быццам баіцца ўпасці, і ягоная прыбітая нейкім цяжкім одумам — ці не з-за Ларыскі — пастава на тле высозных таполяў здаецца нам з Тонікам нават меншаю за нашы ўласныя.*

*Я азіраюся наастатак: прыгожае чорнае аўто весела — шчаслівае, кіруе ў Т.—міргае мне з зарэчча параю жоўтых, як кропачкі светлякоў, фараў, знікае па-за сумётамі.*

*У Т. з дзядзькам Міхалам едуць маці і Ларыска. Дзядзька замаўляе слова і за мяне, ды маці супраць: замалы, няма чаго блытацца пад нагамі. Адзінае, на што яна згаджаецца, дык гэта на тое, каб я праводзіў тройцу разам з бацькам і Тонікам на падводзе пад цягнік.*

*Праводзіны маркотныя і занадта даўгія. Цягнік спазняецца, і мы па чарзе грэемся — амаль вясна, але мароз пад дваццаць — пры шчытку ў маленькім, вузкім, бы перадлазнік, пакойчыку касіркі. За краткамі пад шчытком порстка паходжваюць, па чарзе высоўваюць вонкі паўз загародку галовы шэры певень і белая курыца.*

*— Во дзе выгода вам была б, хлопцы, — кажа Ларыска, і твар яе, дагэтуль сумны і абыякавы, ненадоўга весялее. — От бы ўжо вы тут пад'елі...*

*Дзяцюк у кажуху ўваходзіць у пакойчык, кідае на падлогу бярэма дроў, скоса глядзіць на гаспадыню.*

*— Заўжды ў цябе тлум, Маня, — кажа незадаволеным голасам і прыхінаецца плячом да шчытка. — Любіш ты кумпанію, ох, любіш...*

*Касірка падымае галаў ад квіткоў, глядзіць на мужчыну даўгім паглядам.*

*— А ты ўжо не дачакаешся, — прамаўляе сцішана, і інтанацыя яе голасу здаецца мне вельмі падобнай да Ларысчынай, калі яна сустракала Васю.*

*Здалёку адзываецца гудком цягнік, маці стукае ў шыбіну, кліча нас на двор.*

*Ларыска зноў сумная, відаць па ўсім, вандроўка ёй не да душы.*

*Мы з Тонікам падаем ім валізы, трымаючыся падалей ад рэек, сунемся да падводы, дзе чакае бацька. Там жа, ля падводы, таўчэцца дзяцюк у кажуху. Ён па чарзе рукаецца з намі на развітанне, юрлівым ценем шмыгае ў пакой касіркі.*

Вяртаюцца яны праз чатыры дні. Маці адразу ж укладвае Ларыску ў ложак і ўвесь час, што тая ляжыць, завіхаецца побач. Сястры кепска, маці кажа — прастудзілася. Але дзеля чаго тады ўсе гэтыя перавязкі, чаму бінты чырвоныя ад крыві? Стос бінтоў на шуфлядзе пры ложку штораз заўважна танее, прытарнаваты пах лекаў пануе ў хаце. Тонік прыходзіць распытаць, што і як было ў Т., але маці тут жа, амаль з сяней, гоніць яго прэч.

— Няма чаго цягацца, — кажа і зачыняе дзьверы. — Гэта ж людзі: абы што трапіла на вочы ці ў вушы, так і панясуць па наваколлі. Каму чужое баліць...

Бацька тэпае па хаце са сціснутымі кулакамі, раз-пораз выходзіць у істопку папаліць і разам паглядзець сваю шулу, што падсыхае каторы дзень пад столлю над шчыткам.

Я падыходжу да ложка, каб загаварыць з Ларыскаю, але яна мяне не пазнае.

— Бач, як растрэсла ў цягніку, — кажа маці і гучна, наўзрыд, плача. — Т. гэты, паскудства...

Бацька кажа, што, мабыць, варта прывезці да хворай фельчара, і ўжо ўсцягвае на ногі валёнкі, каб ісці да фермы па каня, але запозна. Ларыска ўскідвае ўгору збялелую руку, пачынае трызніць. Што яна кажа, не зразумець. Голас яе слабее, слабее і ўрэшце зусім аціхае. Маці торкае ў далонь сястры запаленую свечку, кліча мяне да ложка. Але страх скоўвае мяне.

Я баюся зірнуць на Ларыску, баюся матчынага роспачлівага енку, баюся бацькавага цяжкога позірку. Баюся ўсяго, што гэтак неспадзявана ўвайшло ў нашае, дагэтуль такое ціхамірнае, жыццё. Бацька абхоплівае мяне за плечы, але я вырываюся, кідаюся стрымгалоў да лазу ў падпечак.

*Вымеценая разам са смеццем у падпечак голка (ці не тая самая!) вымыкаецца з кучы, балюча джаліць мяне ў пяту.*

*Бацька выходзіць з хаты і вельмі хутка вяртаецца ўдваіх з цёткаю Адальфінай. Следам за імі цягнецца, шоргае валёнкамі па падлозе Тонік. Я падаю яму знак, каб ішоў да мяне, і ён лезе ў падпечча.*

*Я чую, як бацька садзіцца на зэдаль ля стала, бачу насы ягоных валёнак, і мне робіцца не па сабе — акурат як тады, калі яны вярнуліся з маці з Т. з кірмашу, а я шнарыў перад тым па падстоллі ў пошуку гумак.*

*Маленькі, амаль бязважкі аскепак гліны зрываецца са столі падпечка мне на далонь, але я нават не манюся яго скінуць. Доўга-доўга, аж пакуль ён не перамяняецца ў маіх змучаных глуздах у папсаваную, працятую голкаю гумку, гляджу на яго, павольна ўздымаю ўгору руку, вяртаю на ранейшае месца. Ён вісіць колькі хвілін на належным месцы і зноў, ледзь я паспяваю збольшага супакоіцца, падае долу.*

Імпрэза ў поўным разгары, у зале горача, як у лазні. Па манеры трымацца, па адрэпетаванараскаванай — вольны свет, Т. нядаўна стаў яго часткаю — усмешцы жанчыны за трыбунаю ад першае хвіліны няцяжка здагадацца, што роля галоўнай, якую яна ці то самахоць, ці то паводле службовага абавязку (хутчэй за ўсё, апошняе) узяла на сябе, для яе звыклая і зусім не непрыемная. Ва ўсялякім разе яна так добра арыентуецца ў неабдымнай прасторы памяшкання, што, убачыўшы мой разгублены пагляд, якім я акідваю залу ў пошуку вольнага месца, тут жа паказвае мне яго ледзь улоўным жэстам у другім радзе, побач з групаю іншаземцаў, ці то кітайцаў, ці то карэйцаў.

Маладзён з азіяцкім разрэзам вачэй і слухаўкамі на цемю ветліва падцінае пад сябе ногі, дае мне прайсці. Другі гэтак жа ветліва прымае з вольнага сядзення тэчку з праспектамі, паважліва хітае галавой, штосьці кажа па-свойму.

Палова чацвертай, я, канечне ж, спазніўся. Зала прытомлена гудзе ў такт словам мэра, з фае даносіцца звон посуду: праз чвэрць гадзіны перапынак на каву. Наша гід Жана, маладзічка з блакітнымі вачыма і падазрона наскімі абрысамі твару, не вытручанымі дарэшты адукацыяй ды колькігадовым мусовым замежніцтвам, адорвае мяне са свайго прыстаўнога крэсла ў праходзе прыязнаю ўсмешкай.

Калі меркаваць па ўзнёсласці прамовы ды па доўгай стужцы хлапцоў і дзяўчат з букетамі, што па чарзе прэзентуюць тыя букеты людзям на першым радзе, ідзе ўшанаванне ветэранаў. Прамаўляецца ўсё па-латышску, слухавак не хапае, таму зразумець дакладна, што дзеецца на подыуме і побач з ім, немагчыма. Я нахіляюся да Жаны, каб запытацца, што да чаго.

— Пасля, — адказвае яна похапліва і зноў утаропліваецца вачмі ў сцэну.

Іншаземец здымае з галавы слухаўкі, падае мне. Я хачу адмовіцца ад дарунка, але не паспяваю: зала выбухае воплескамі, усе падымаюцца. Мой сусед разводзіць рукі ўбакі, расчараваны, мусіць, што не ўдалося паслужыць такому сімпатычнаму чалавеку, як я, сціскае маю руку ніжэй локця. Бэйдж з надпісам «Харбін» матляецца на ягоных грудзях, закаваных у шырспажывецкага крою пінжак, бесцырымонна шмаргае мяне кантам па шчацэ.

Я даганяю Жану, і мы ідзем упобачкі паўз абкладзеныя тэчкамі крэслы ў фае.

— Вы не павінны былі спазняцца, — кажа яна з дакорам у голасе і спыняецца ля аднаго са сталоў. — Гэтак і ўсё прапусціце. Што вы хацелі запытацца там, у зале?

— Наконт імпрэзы. Гэта было ўшанаванне, так?

— Ушанаванне, канечне... Хіба нельга было зразумець? Я падумала...

— Што?

Яна схіляецца над сталом з намерам выбраць да кавы штосьці з печыва.

— Так, нічога... Вы маеце праграму дня? Калі не, то вось вам. — Яна корпаецца ў тэчцы, дастае паперчыну, торкае мне ў далонь. — Дарэчы, я ваша зямлячка.

— Я здагадаўся. Адкуль вы?

— Ого, адразу вам так і скажы! Па...

Трое мужчын праціскваюцца да стала, запаўняюць ужо ладна разбухлымі ад дармовае пачосткі целамі прастору між намі. Жана перахінаецца бокам паўз іх, ледзь чутна, бязгучна амаль шэпча:

— Пацярпіце. Дарэчы, вас шукалі... Вось як: толькі прыехалі, а ўжо вас шукаюць.

— Мяне? Шукаюць?

— Жанчына, і сімпатычная. Сказала, што прыйдзе яшчэ, каб пабачыцца. Нейкая Рэгіна.

Рэгіна?

Фае зрушваецца з месца, высвечваючы срэбрам бутэлек з півам і мінеральнаю вадой, гэтак жа імкліва, як распачало рух, спыняецца, ссыроджваецца няўцямна-абыякаваю стрэмкаю прыпаміну ў чэраве маёй прытомленай спёкай і доўгім падарожжам істоты.

*Дзень яшчэ ліпіць на тонкай павуціне апошніх жнівеньскіх прамянёў, а мы ўжо ў ложку. Мы — я і Рэгіна, за ложак нам — свежая кладня ў пуньцы. Мне амаль семнаццаць, Рэгіне — на паўдзесятка болей, гэта надае нашым спатканням адценне нясветнае грахоўнасці. Прынамсі такімі лічыць іх (ці то ўдае, што лічыць) Рэгіна, а яе слова для мяне — што слова Бога. Рэгіна — маё першае ўчуццё, мой вядоўца ў свет таямніц дарослага жыцця. Ён, гэты свет, і прываблівае мяне, і адштурхоўвае адначасна, але першага — болей, таму змаганне з яго не заўжды прывабнымі правамі, падказвае мне інтуіцыя, не мае сэнсу. Таму я з імі надта і не змагаюся, а крочу назіркам усцяж выкрунтасаў лёсу, плыву, бы спанталічаны фатальным збегам абставінаў матрос пасля таго, як патануў карабель, усё далей ды далей у няведамым — дзе ён, жаданы бераг? — накірунку.*

*На дварэ ціха, гэтаксама ціха і ў пуньцы — датуль, пакуль не адзавецца з-за сцяны (пунька — прыбудова-трысцен да хлява) хтось з быдла ці Рэгіна не пачнае шнарыць рукамі па сене.*

*— Што ты робіш?*

*— Асцюкі выбіраю, — адказвае яна і глядзіць на мяне з-пад рукі, і вочы яе сярдзіта паблісквають у паўцемры. — Мог бы дзеля нас і лепшага сена расстарацца. А так... абы-што, абы-што...*

*— Табе дагодзіш!*

*— А ты паспрабуй.*

*— Як?*

*— Казала ўжо: падвышай інтэлектуальны ўзровень. Чытаць, напрыклад, пачні. А то так і застанешся да скону вясковым невукам.*

*Яна дастае з-пад падушкі томік Велты Спаарэ, які паўсюль носіць з сабою, няйначай, дзеля дэманстрацыі нянаскага імя аўтаркі, бо кніжка даўно ўжо, здаецца, ёю прачытаная, усоўвае мне ў руку:*

*— Не Бог ведае што, канечне, але ж і не твой Багроў.*

*Багроў — намёк на фаліянт «Дзіцячых гадоў Багрова-ўнука», які бібліятэкарка дала мне пачытаць у трэцім класе і якім на ўсе астатнія школьныя гады дарэшты адбіла ўва мне якую-кольвек ахвоту да чытання.*

*Я кладу кніжку воддаль, знарок, каб пазлаваць Рэгіну, прыпарушваю яе сенам. Рэгіна — стыхія са сцюдзёных, і, як ні дзіўна, мне найбольш памагаюць у стасунках з ёю менавіта перапады яе настрою, асабліва злосці. Покрыва няўлоўнасці нібы звальваецца з яе ў такія хвіліны, вызваляе эмоцыі, агаляе патаемныя згібы натуры. І робіць іх уладальніцу не проста зразумелай, а нават — безабароннай.*

*Але не гэта зараз мяне найболей займае, а тое, як сказаць пра нас.*

*Хваля рашучасці ўздымаецца ўва мне, гнаная надзеяй, дакочваецца да горла.*

*Цяпер або ніколі!*

*Я пасоўваюся шчытней да Рэгінінага разгарачанага параю ад сена ды жарсцю маіх няўмелых, хоць мне яшчэ і няўцям, што яны акурат такія, любошчаў.*

*— Выходзь за мяне, Рэня...*

*— Рэня? — кажа яна пагрозліва і тыцкае мяне тварам у сена. — Зноў ты за сваё? Я ж прасіла гэтак мяне не называць.*

*— Прабач... Рэгіна...*

*Вочы яе святлеюць, голас набрыньвае пяшчотаю.*

*— Выйсці за цябе? Выкінь з галавы. Які з цябе муж? Якая з мяне жонка? Як ты ўяўляеш нашае сужэнства? Ха-ха! Вось каб ведала, што гэтак уляпаюся, нізавошта не паехала б сюды... Нізавошта!*

*— Я кажу сур'ёзна, — прамаўляю я, і голас мой патанае ў залепленым ластаўчынымі гнёздамі прагалку паміж кроквінамі. Свет нібы перакульваецца ўва мне, робіцца каляным і шорсткім, як словы, што толькі што зляцелі з Рэгініных вуснаў. — Чаму? Чаму ты не хочаш?*

*— Таму што так трэба. Табе — вучобу пачынаць, мне — над дысертацыяй працаваць. Мала гэтага?*

*Яна падаецца ўбок, я мкнуся ўтрымаць яе, і яе сцішана-задаволены смех поўніць пуньку.*

*— Перастань, я не збягаю. Перастань! — Рука яе паволі цягнецца да сумачкі ва ўзгалоўі, ляніва шнарыць па набітых парфумаю ды рознаю іншаю дзявоцкаю драбязою закутках. — Вось, прэзент...*

*— Можа, лепш так — без?.. Ты ж ведаеш, што...*

*— Ага, я што — дурніца? І не думай!*

*Я адварочваюся, каб узброіцца «прэзентам». І не праходзіць і трох хвілін, як ужо мы з Рэгінаю адно, і шалёнае маё жаданне ўтрымаць яе, як і самому дарэшты належаць ёй, засціць мне глузды, ператварае ў ваяўніча-пажадлівую, бессаромную жывёліну. Мне і боязна, я баюся паўтору заўчорашняе паразы, калі ўсё нібыта гэтак жа спраўна пачыналася, а скончылася няўдачай. Але гэтым разам, здаецца, усё добра. Здаецца...*

*Не!*

*Прывід даўняе трагедыі з Ларыскай вытыркаецца з чэрава кладні, нясіліць цела, і я з жахам чую расчараваны голас Рэгіны:*

*— Ну, вось табе маеш... Зноў...*

*І хоць — ні кроплі ў ім дакору ці папроку, адно толькі расчараванне, гэта мяне не ўсцешвае.*

*Я ўбіваюся тварам у сена, брыдкі сам сабе, спаўзаю з кладні.*

*Рэгіна хапае мяне за нагу, маніцца не пусціць, але мне тое ўжо не абыходзіць.*

*Сена глуха рыпіць пад маімі нагамі, і безвыходнае «ніколі, ніколі» чуецца мне ў тым рыпенні і не адпускае нават тады, калі расчыняюцца, падхопленыя скразняком, дзверы пунькі і іншыя, знаёмыя адмалку згукі прытомленай дзённымі турботамі вёскі абрынваюцца на мяне.*

*Ці кахае мяне Рэгіна? Гэта адзінае, што займае мяне цяпер, адзінае, на што хацеў бы я мець дакладны адказ. Мінулае, дзень сённяшні, будучыня — нішто не мае зараз для мяне гэткага значэння, як гэтае «ці кахае?» Тым больш, што сёння яны з Інаркаю з'язджаюць у свой Т., і хто ведае, ці спаткаемся мы калі наогул.*

*Пах гарбаты даносіцца з раснасцежанага вакна да прызбы, дзе я сяджу, шчаслівы Інарчын голас абвяшчае пачатак абеду. Не менш шчаслівы Тонікаў (сябрук праз тыдзень выпраўляецца следам за дзеўкамі ў Т. здаваць іспыты ў тэхнікум) адзываецца на яго, і толькі Рэгінінага — не чутно.*

*— Ты есці будзеш? — пытаецца Інарка і складвае вусны ў дакорлівую ўсмешку. — Хадзі.*

*Рэгіна сядзіць пры стале, прыхінуўшыся плячыма да сцяны, крэмсае відэльцам на талерцы бульбіну. Яе твар прыслонены ценем ад фіранкі, таму ён выдае амаль непранікальным.*

*— Стасік, вырашыў, урэшце, куды паедзеш паступаць? — пытаецца Тонік і тоўхае мяне даланёю*

*ў бок. — Штосьці ж доўга цягамоцішся. Паехалі б удваіх у Т., весялей было б. І лягчэй. Праўда, Рэгіна?*

*— У Т. не вучаць на мастакоў, — адказвае яна холадна і пасоўвае ўбок талерку з рэштаю ежы. — Ты хіба не ведаеш?*

*— Конча на мастака паступаць? — не здаецца Тонік. — Мала іншых факультэтаў паўсюль? Убій сабе штосьці ў галаў...*

*Я бачу, як напружваецца, а затым робіцца дарэшты непранікальным Рэгінін твар, употай наступаю Тоніку на нагу.*

*Я разумею: прысуд канчатковы і абскарджваць яго — марная справа. Тонік запытальна-спагадліва глядзіць на мяне, але што мне з таго за наедак? Што да чыёйсьці, хай і найшчырай, спагады чалавеку, калі ўсё, чым той жыў дагэтуль, — тарчма, наўзбоч, і свет, учора яшчэ прыязна-ветлы, шырокі, раптоўна пажарстчэў, звузіўся, разбіўся на дробныя аскепкі?*

*— Ну, вось, здаецца, пад'ела, — кажа Рэгіна, і голас яе, паважліва-спакойны, абыякавы, крыху нібыта чымсьці незадаволены, пазбаўляе мяне апошняй ілюзіі.*

*Бацька ўязджае з падводаю на панадворак, прыкручвае лейчынай каня да аглоблі, ідзе ў хату. Да прыходу цягніка на паўстанак зусім няшмат застаецца часу, і, каб не спазніцца, неўзабаве, дзесьці праз паўгадзіны, трэба пад яго выпраўляцца. Акурат гэтак яны, дзяўчаты і Тонік, і выпраўляюцца. Клічуць і мяне з сабою, але я адмаўляюся, застаюся памагаць бацькам парадкаваць у пуні прывезенае ўранні ад стожышча сена. Вядома, гэта ўсяго адгаворка, але інакш я не магу.*

*Тонік садзіцца за фурмана, я бачу, як уздрыгваюць наастатак Рэгініны павекі, і вось ужо нагру-*

*жаная валізамі з няхітрымі вясковымі гасцінцамі падвода з’язджае з панадворка.*

*— Ну, не ўсё баляваць, трэба і рабіць сёе-тое, — кажа бацька і праступе да пуні.*

*Мы з маці — унізе, бацька — на кладні, і ён ледзьве паспявае пераймаць важкія зляжалыя пласты, якія я перакідваю яму віламі ў падстрэшша праз маціцу.*

*— Азвярэў ты, хлопец, ці што? — дзівіцца з майго неспадзеўнага імпэту (зазвычай я — гультаяваты, як кажа маці — крыху «пры панку») і шпурляе на дол пакінутую Рэгінаю кніжку аповедаў Велты Спаарэ.*

*Маці запытальна зіркае на мяне спадылба, уздыхае, кладзе кніжку на выступ падмурка пры лазе на гарышча хлява.*

*Тонкі, ледзьве ўлоўны водар Рэгініных духоў далятае да мяне ад кніжкі, перабіты пахам сена і пылу, чэзне ў вузкім праёме паміж кладнёй і сцяною пуні...*

У фае гэтаксама горача, як і ў зале. Я прыхопліваю са стала бутэльку з мінеральнаю вадою, сунуся да выхаду ў дворык. Там таксама не сказаць каб надта прахалодна, да таго ж і поўна ўжо люду. Пад крайнім ад ходніка парасонам тройца з нашае дэлегацыі частуецца півам у кампаніі імпазантнага мужчыны гадоў пяцідзесяці. Мужчына распавядае анекдот пра консула, які рызыкнуў займець больш шыкоўнае аўто, чым у амбасадара, і праз тое пацярпеў. Яго шырокі чырвона-бурачковы твар свеціцца здароўем і непадробнаю шчырасцю, вочы ўзбуджана паблісквають.

— Пазнаёмцеся, гэта наш консул, — дачакаўшыся канца доўгага, як учарашняя стаянка на мы-

тні, расповеду мужчыны, кажа Зяменя і падае мне кухаль з півам.

— Консул Папярэцкі, — ківае той і ўсміхаецца. — Рады яшчэ аднаму суайчынніку. Ведайце: калі ў вас узнікнуць тут якія-колечы праблемы, — я побач. Можа, маеце які асабісты клопат ці просьбу?

— Не, не маю, — няўзнак для сябе самога паддаючыся магнэзу агульнае плыні гаворкі і пераходзячы на расейскую мову, адказваю я.

Бадзёры вятрыска павявае з боку ракі, што цячэ ў колькіх метрах ад будынка мэрыі, ускалыхвае чырвона-бела-чырвонае сцяжышча з жалобнаю стужкаю над нашымі галовамі.

— Што значыць гэтая стужка? — пытаецца Зяменя. — Колькі вёсак ды пасёлкаў праехалі ад мяжы — усюды яна. Бы памёр хто...

Твар консула яшчэ больш ажыўляецца. Бачна, што пытанне яму даспадобы, што ён нават нібыта чакаў яго.

— Чарговыя ўгодкі, як мы ***іх*** пакрыўдзілі, — кажа ён і дапівае піва. — Уяўляеце? Мы ***іх*** пакрыўдзілі, дай рады!.. Тут, дзе, можна сказаць, адвеку жывем, дзе цэлы мацярык з нас, больш за восемдзесят адсоткаў насельніцтва... Палітыка! — Ён маніцца яшчэ штосьці дадаць да прамоўленага, але не паспявае: да нас падыходзіць рэферэнтка Ілга.

— Спадарыня мэр запрашае вас па ўрачыстасці да сябе ў кабінет для неафіцыйнае размовы, — кажа вабная латышачка і датыкаецца па чарзе да рукава кожнага з нас. — А пятай, як толькі ўсё скончыцца ў зале. Ваша гід вам нагадае.

Жана, якая дагэтуль непрыкметна стаяла дзесьці ўбаку, цяпер гэтак жа непрыкметна аказва-

ецца побач, пацвярджае прамоўленае рэферэнткаю кіўком галавы.

Да канца перапынку застаецца пяць хвілін, і мы ўсе, апроч консула, які мусіць ад'ехаць кудысьці па сваіх справах, спяшаемся ў залу, дзе неўзабаве павінен пачацца (так дакляруе праграма) дакументальны фільм з гісторыі горада-пабраціма Т.

Памяшканне паспелі праветрыць, у зале калі не прахалодна, дык больш-менш свежа. Праўда, трывае гэткае даброцце нядоўга. Не мінае і чвэрці гадзіны ад пачатку фільма, як зноў запаноўвае гарачыня. На шчасце, фільм кароткі, ад сілы на паўгадзіны. Фінал яго зала сустракае ўздыхам палёгкі. На сцэну зноў падымаецца мэр, жадае ўсім добрых уражанняў ад горада, нагадвае пра тое, што ўрачыстая вячэра адбудзецца а восьмай гадзіне ў банкетнай зале Цэнтра нацыянальных культур. Апошняе нам перакладае Жана ўжо на выхадзе з памяшкання. Абвестка нас усцешвае, на яе тле нават перспектыва цягнуцца на прыём да мэра, што мае пачацца з хвіліны на хвіліну, ужо не здаецца такою змрочнай. Тым больш што і біць ногі шмат не даводзіцца: кабінет мэра месціцца паверхам вышэй, акурат над фае канферэнц-залы.

Мэр сустракае нас пры дзвярах. Ветлівая ўсмешка, зычлівы пагляд. Нягледзячы на спёку і напружаны рытм працы выглядае яна бадзёрай.

— Ну, вось, цяпер і на мове акупантаў можна паразмаўляць, — кажа і энергічным рухам плячэй страсае з сябе цяжар абрыдлае — так мне, прынамсі, падаецца — афіцыёзнасці.

Прыём у мэра доўжыцца каля гадзіны. Гаспадыня кабінета распавядае пра надзённыя клопаты горада, звязаныя з несупыннымі дажджамі і размыццём дарог, рамонт якіх штомесяц з'ядае львіную долю бюджэту, пра іншыя цяжкасці, якіх яны раней, да ўступу ў Еўразвяз, не ведалі, а вось зараз...

— Проста так, за прыгожыя вочы ніхто нічога не дае! — падводзіць яна рысу і з выглядам чалавека, што дарэшты выканаў свой службовы абавязак, апускаецца ў крэсла.

— Як вы? — Жана, якая дагэтуль ціхамірна падрэмвала пры канцы стала, прыязна глядзіць на мяне. — Не стаміліся?

— Крыху.

— Нічога, — кажа яна і адорвае мяне зычлівым паглядам шэра-зялёных, у аздобе густоўна падфарбаваных веек вачэй. — Адпачнеце да вячэры ў гатэлі і будзеце як новы.

— А вы...

— Што я?

— Вы абяцалі сказаць наконт зямляцтва, — нагадваю я. — Адкуль вы паходзіце?

— А, гэта... — мармыча яна і пераводзіць пагляд на аднаго з нашае дэлегацыі. Той якраз пачаў гаману на тэму спорту, і мая кволенькаая надзея на дыялог з Жанаю канчаткова чэзне ў плыні яго энергічнага, густа перасыпанага лічбамі статыстыкі аповеду.

Жамярына ўлятае ў вакно, падхопленая струменем паветра з кандыцыянера збоч стала, мітусіцца па-над галовамі, садзіцца спартоўцу на шчаку. Мэр выпроствае руку, з мацярынскаю ўсмешкаю на твары, што, мабыць, павінна апраўдаць фамільярнасць наступнае хвіліны, адным рухам тонкіх,

бы сцябліны венерыных валасоў у вазоне насупраць, пальчыкаў адганяе назолу прэч. Выбух смеху, гаворка набывае яшчэ больш даверлівы, амаль прыяцельскі характар.

Ідылію парушае рыпенне дзвярэй. Мужчына ў чорнай камізэльцы ўваходзіць у пакой, падкрэслена сцішанаю ходаю сунецца да вольнага месца. Па ўпэўненасці, з якою ён уладкоўваецца ў крэсле ўпобачкі з мэрам, няцяжка здагадацца, што ён тут не ўпершыню і пачуваецца даволі вольна.

— Віцэ-консул вашага консульства Калевіч, — кажа мэр і адорвае новага госця ўсмешкаю. — І я мушу перадаць вас у яго распараджэнне.

— Прыём у консула а палове пятай, у нас зусім няшмат часу, — кажа мужчына і абводзіць нас усіх па чарзе праніклівым, чамусьці найдаўжэй затрымаўшы яго на мне, паглядам. — Машына пры ўваходзе, так што паспяшаемся. Колькі нас?

— З вамі пяцёра, — кажа Жана і першая ідзе да выхаду. — Гэта без мяне. А калі са мною, то шасцёра.

— З вамі ці без вас — у аўто змесцяцца толькі чацвёра, — кажа віцэ-консул і моршчыць у одуме высокі, як скляпенні калідора, які мы якраз мінаем, лоб. — Так што і вам, і яшчэ камусьці давядзецца застацца.

— Магу застацца я, — пагаджаецца спартовец. — Я не надта добра сябе адчуваю.

Віцэ-консул і Зяменя абменьваюцца шматзначнымі позіркамі.

— Не, — кажа па кароткім маўчанні Зяменя. — Так нельга. Консул цікавіцца спортам і будзе незадаволены вашаю адсутнасцю. А вось калі вас пакінуць... — Ён прыпыняе мяне, адводзіць убок. — Не будзеце пратэставаць, калі вас пакінем? Усё-

ткі мы гаспадарнікі, і нам след быць на прыёме. Вы ж чалавек творчы, далёкі ад рэалій, што вам нашыя заземленыя размовы. Займіцеся чым больш прыемным, схадзіце куды, пашпацыруйце...

— Канечне, — пагаджаюся я. Шчасце сядзець дзесьці ў пакоі і выслухваць розную афіцыйную лухту мяне, сапраўды, не прываблівае. Але і тое, што мною нібы наўмысна грэбуюць, пакідае ў душы непрыемны асадак.

— Што ж гэта яны вас гэтак пракінулі з прыёмам? — іранізуе, ледзь мы застаемся ўдваіх, Жана.

— Мабыць, пабаяліся, што аб'ем, — кажу я як мага весялей. — А можа, збаяліся, каб не выпарыўся дачасна на такой спёцы...

— А ці каб не жэкнулі што не тое, — кажа яна і лёгка, бы дзяўчо, што неспадзявана пазбавілася апекі дарослых, збягае з ганка на ходнік. — Будуць анекдотамі адзін аднаго частаваць пра начальства, дэмакратызм удаваць, то навошта ім лішнія вушы? Я вашы газеты калі-нікалі чытаю, дык цямлю, што да чаго.

— Вы разумная, аднак.

— Ну, ужо ж не зусім дурная, — смяецца яна і прыпыняе крок, каб узяць мяне пад руку.

Дзве гадзіны да абяцанае вячэры пралятаюць нібы адно імгненне. Гатэльчык, у які Жана прыводзіць мяне па кароткім шпацыры па горадзе, уражвае цішынёй і амаль што хатняю ўтульнасцю інтэр'еру. Гаспадар яго, прыбалт у другім калене і вялікі аматар чэшскага піва і сацыяльна арыентаванае эканомікі, асабіста ўручае мне ключ ад пакоя і нават праводзіць бліц-экскурсію па вузкіх, завешаных рэпрадукцыямі канцэптуальнага мастацтва і творамі мясцовых графікаў калідорах. Паці-

кавіўшыся, ці маю я ў чым патрэбу, і атрымаўшы адмоўны адказ, ён хутка знікае, і апеку нада мною пераймае Таня, сімпатычная дзяўчына гадоў дваццаці пяці. Яна прыехала ў Т. восем год таму з Браслава з намерам перабрацца пасля ў Рыгу да сваякоў, ды так тут і засталася. Таня без жаднае натугі пераходзіць з мовы на мову, у тым ліку і на беларускую, так што я пачуваюся ў гатэлі зусім не як чужынец.

А сёмай з'яўляецца Жана, і мы едзем вячэраць. Дзесяць сантымаў, якія я ахвяроўваю на праезд у аўтобусе за сябе і за яе, з каптуром кампенсуюцца адмысловым Жаніным аповедам з жыцця тутэйшага люду. Я паказваю ёй будынак, дзе месцілася колішняя беларуская гімназія, і нават паспяваю да прыпынку распавесці сёе-тое з яе гісторыі і жыццяпісаў людзей, што ёю апекаваліся.

— Што Райніс — класік, я ведаю, канечне. А вось што гэтак нас шанаваў, не здагадвалася нават, — кажа яна з нотаю няёмкасці ў голасе і падымаецца з сядзення. — Як мне пашанцавала, што вы да нас прыехалі!

Ля будынка Цэнтра нацыянальных культур ужо поўна народу, і мы з Жанаю вельмі хутка губляем адно аднаго з поля зроку. На пляц выходзіць Ілга, запрашае ўсіх падымацца ў банкетную залу.

Нікога з нашае дэлегацыі ў зале няма, і мне, як і ўдзень у зале паседжанняў, выпадае сядзець упобачкі з дэлегацыяй з Харбіна. З дзесятка абыходлівых кітайцаў толькі адзін, спадар Ду, разумее па-расейску, таму добрую чвэрць вечарыны я баўлю ў самоце. На шчасце, да мяне падыходзяць двое мастакоў, якіх я ведаю з сумеснае пазалеташняе выставы прамысловага плаката ў Львове, і зап-

рашаюць за свой столік. Там ёсць вольнае месца, я з радасцю скарыстоўваю прапанову перасесці да іх. За сталом, апроч мастакоў, сядзіць паэтка ў ваўнянай, аздобленай нечым блішчастым сукні і з выразам невыказнае скрухі ў вачах цэдзіць праз саломіну кактэйль. Мой прыход яна сустракае падкрэслена абыякава. Ды, ведаючы не з чужых слоў сапраўдны кошт такое жаноцкае абыякавасці, што амаль заўжды неўпрыкмет, але не без прыхаванага змыслу пераходзіць у сваю процілегласць, я не надаю таму вялікага значэння.

Тым часам народ адчувае сябе ўсё больш раскавана, сям-там гучаць спевы.

Дзесьці праз паўгадзіны ў залу ўваходзіць віцэ-консул Калевіч з маімі хаўруснікамі і Жанаю. Кампанія ўладкоўваецца за столікам ў другім канцы залы. І я падымаюся, каб далучыцца да яе, бо запал, з якім даймаюць мяне расповедамі пра свае творчыя ды ўсялякія іншыя праблемы мастакі, адзін з якіх, аказваецца, аўтар малюнкаў у гатэлі, пачынае мяне ўжо раздражняць. Скруха ў вачах паэткі змяняецца расчараваннем, яна праводзіць мяне полымным, як ліпеньская ноч, што абяцае шмат прыгодаў, паглядам.

— Як вам нашая Фаіна? — перахапіўшы яго, пытаецца адзін з мастакоў, што ідзе за мною следам з чаркаю ў руцэ, і, не дачакаўшыся адказу, бо я ўжо адышоўся даволі далёка, плюхаецца на вольнае месца за адным са сталоў.

На подыуме між сцэнаю і столікамі квітнеюць спічы ў гонар сяброўства-пабрацімства. Эстонскі госць, госць ізраільскі, прадстаўнік дэлегацыі з Літвы.... Энергічная мэр раз-пораз дэманструе выбітны гумар, суправаджае словы выступоўцаў кароткімі трапнымі рэплікамі.

Стол, напачатку даволі сціплы, з кожнаю хвілінаю багацее. Хлопчыкі-афіцыянты снуюць у вузкіх праходах з бутэлькамі ў руках, апафеоз гасціннасці — велізарная рыбіна ў аздобе з зяленіва — займае пачэснае месца на стале пасярод залы, да яго тут жа выстройваецца чарга.

— Заўтра прыязджае іхні прэзідэнт, — кажа віцэ-консул і паблажліва ўсміхаецца. — Дарэчы, хочаце анекдот пра прэзідэнта?

Анекдот ліберальны, аж занадта, хоць, папраўдзе, гэткі ж вялы, як фізія апавядальшчыка. Мы ўсміхаемся па яго сканчэнні больш з ветлівасці, і толькі Жана ды Зяменя, каб згладзіць няёмкасць моманту, смяюцца доўга і залівіста, чым узбуджаюць цікаўнасць Фаіны. Паэтка падымае ўгору напоўнены нечым бурачкова-чырвоным фужэрчык, маша нам здаля рукою. Збянтэжаны недахопам эмоцый у нашай ацэнцы ягонага красамоўства віцэ-консул падымае чарку ў адказ, залпам выпівае. Яго высокі, з тузінам кароценькіх валасінак-паўсцінак папералзе, над самымі бровамі лоб пры гэтым чырванее, а вусны стульваюцца ў вузкую, як нітка бурштыну на Жанінай шыі, шчэлку.

— Мы з вамі незнаёмыя? — звяртаецца ён раптам да мяне і па-свойску падміргвае.

— Наўрад, — адказваю я і ўглядаюся ў ягоны перасыпаны дробнымі кропелькамі поту твар. — Не, не думаю, хутчэй за ўсё, не.

— Значыць, я памыліўся, — кажа ён і прастуе паўз залу да стала з рыбінай.

На адлегласці хада яго здаецца мне нібыта знаёмай. Я сілюся згадаць, дзе мог раней бачыць гэтага чалавека, але дарэмна. Прытуманеныя віном і ўражаннямі дня глузды мае спяць і прачынацца, прынамсі зараз, у гэтую хвіліну, не жадаюць.

Вячэра доўжыцца амаль чатыры гадзіны. Першаю адыходзіць («Заўтра вельмі, ну вельмі адказны дзень, вы ўсе людзі дзяржаўныя, разумееце!») мэр. Следам за ёю пакідаюць залу мэрскія чыноўнікі, так што пры гасцях застаецца толькі Ілга. Жаны, якая выйшла кудысьці чвэрць гадзіны таму, дасюль не бачна. Знік і віцэ-консул, і калі я пытаюся пра яго ў Ілгі, яна толькі неўразуменна паціскае плячыма. Затое мастакі ўсё яшчэ тут і адыходзіць, бачна па ўсім, не збіраюцца. Фаіна, якую яны, відаць, добра-ткі данялі нецвярозаю балбатнёй, скарыстаўшыся момантам, падсаджваецца да нас, каб прачытаць новы, толькі што народжаны ў бурапенных нетрах вясёлага застолля верш. Пра каханне — шматабяцальна абвяшчае яна напаўголасу і складае вусны сэрцам.

Верш пафасны і вельмі, ледзь не да слёз, чулліВы. Ілга просіць яго ў аўтаркі перапісаць, але тая адмаўляецца: так бы мовіць, юбілейнае, чатырохсотае тварэнне, і баронь Бог яшчэ згубіцца, так што ўжо, прабачце, як-небудзь іншым разам, пазней...

— Вершы — мае дзеці, — кажа яна і падымае на мяне поўныя жадання атрымаць падтрымку ў гэткай важнай справе вочы. — Вы як чалавек творчы мяне, напэўна, разумееце.

— Канечне, — заспеты знянацку праяваю ўвагі да сваёй персоны, падтакваю я.

— Вось і добра, і цудоўна, — голасам, у якім зліваюцца ў адно бязмежная ўдзячнасць і аванс на штосьці большае, чым звыклы флірт, працягвае яна. — Спадзяюся, вы не кінеце мяне адну, праводзіце дадому.

— Вядома.

— І па дарозе я пачытаю вам яшчэ. Пра каханне. Вы любіце паэзію?

Перспектыва слухаць сярэдначы вершы пяцідзесяціпяцігадовай паэткі Фаіны пра каханне мяне зусім не натхняе, і я сутаргава шукаю слоў, каб збіць яе запал. На шчасце, гэта не патрэбіцца: у размову ўступае Ілга.

— Можаце не турбавацца, Фаіна, — кажа яна і дапівае кактэйль. — У нас ёсць аўто, на ўсялякі выпадак... Кіроўца тут, так што развязем усіх, куды каму трэба. Дык можаце надта не спяшацца адыходзіць, пабудзьце яшчэ з паўгадзінкі.

— Што ж, гэта мяняе расклад, — адзываецца захмялелы Зяменя і замест таго, каб пайсці да выхаду, што не адзін раз ужо мануўся зрабіць перад гэтым, накіроўваецца да століка мастакоў.

Фаіна спапяляе Ілгу паглядам, робячы выгляд, што вельмі радая прапанове наконт аўто, налівае ў фужэр кроплю, як абмачыць вусны, віна.

Паўгадзіны расцягваюцца на цяжка сказаць колькі, і калі мы ўрэшце вырушваем з залы, гадзіннік у холе Цэнтра нацыянальных культур з шыкоўнаю выставаю з жыцця гарадоў-пабрацімаў пры ўваходзе паказвае палову першай.

Дзённая спёка прыносіць навальніцу. Мы сядзім у аўто на стаянцы пры гатэлі, чакаем, калі ён аціхне. Да дзвярэй гатэля крокаў трыццаць, але мокнуць ніхто не жадае. Маланкі раз-пораз успыхваюць, асвятляюць дворык з шыхтам дэкаратыўных дрэўцаў наўзбоч става, фантастычнымі пасамі-ланцугамі сякуць па старанна выстрыжанай траве ўздоўж цэментовай сцяны-агароджы.

Таня выскоквае на ганак са стосам цэлафанавых накідак у руках, порстка імчыць пад ляскат перуноў да машыны, садзіцца на вольнае, вызваленае хвілін дзесяць таму Фаінаю месца.

— Бачыце, якая ў нас выкшталцоная абслуга ў гатэлях, — кажа Ілга і гучна смяецца. — Ну, да заўтра!

Мы выкарасквaемся па чарзе з аўто, шыбуем да будынка.

Абыходліва-ўрачысты, белатвары, бы нябожчык у чысцы на адной з карцін у калідоры, парцье аддае нам ключы, і мы разыходзімся па сваіх паверхах.

Дзверы ў пакой насупраць майго незачыненыя, і я бачу Жану. Яна стаіць паўголая перад люстэркам, падфарбоўвае вусны. Мяне яна не бачыць, і я, не хочучы яе бянтэжыць, адступаю ад дзвярэй у глыб калідора. Паркеціна пад маімі нагамі гучна вішчыць. Жана паварочвае галаў, заўважае мяне. Дзверы ваннага пакоя расчыняюцца, і побач з ёю вырастае на хвіліну і тут жа знікае ў пакоі вузкаплечая, з пластком тлушчыку наўкола пояса пастава віцэ-консула Калевіча.

— Ах, прабачце! — кажа Жана і знікае за дзвярыною шафкі.

Не паспяваю я, аднак, павярнуць ключ у шчыліне замка, як яна зноў выходзіць у калідор.

— Прабачце, — кажа і прыкрывае ніз твару ручніком. — Мне... Мне прыкра, праўда...

— Нічога, — запэўніваю я і, не ведаючы, як згладзіць няёмкасць, што ўзнікла гэтак нечакана, весела працягваю: — Дарэчы, памятаеце, вы абяцалі сказаць...

Напамін мой нагадвае спробу шантажу, але, надзіва, яго дастаткова, каб Жана супакоілася.

— А, гэта! — бы тапелец за саломіну, хапаецца яна за мае словы і, пэўная, мусіць, што праўдзівага адказу ў якасці разліку за маё маўчанне пра яе со-

рам будзе дастаткова, голасам, быццам паведамляе невядома якую гнюснасць, прамаўляе: — Я... з Шаркаўшчыны.

Я ўваходжу ў нумар з цвёрдым намерам тае ж хвіліны рынуцца пад душ, але не паспяваю. Дзверы, якія я неабачліва пакінуў незамкнёнымі, рыпяць, у пакой увальваецца Зяменя з пляшкаю піва ў руцэ.

— Не спіш? — пытаецца ён узрушана і куляецца ў фатэль збоч стала. — Ты ведаеш, а няблага тутачка... Кабеты сімпатычныя, асабліва паэтэска, Фаіна, такая ўжо ляля. Цікава, яна замужам?

— Не ведаю, — шакаваны ягоным неспадзяваным уварваннем, адказваю я.

Мой адказ яго відавочна расчароўвае, ён падымаецца з месца, гэтак жа імгненна, як і прыйшоў, са словамі «Ну, паглядзім, паглядзім!» вылятае з пакоя.

Я мкнуся як хутчэй зашчапіць дзверы, каб засцерагчыся ад новага госця, але зноў спазняюся.

Гэтым разам візітам ашчасліўлівае мяне віцэконсул. Ад яго пахне парфумаю, расчырванелыя пасля мыцця твар і шыя выпраменьваюць здароўе.

— Не будзеце супраць, калі трохі ў вас пабуду? — кажа ён дружалюбна і дастае з пачка цыгарэту.

Ён запальвае, і мне нічога не застаецца, як сесці насупраць.

— Вы сапраўды мяне не памятаеце? — У голасе яго чуюцца адначасна інтрыга і занепакоенасць. — Не?

— Не, прабачце, — пачынаючы нервавацца, адказваю я.

— Што робіць час! — уздыхае ён. — Вы ж Стасік? Так? Няўжо не помніце студэнта, што квата-

раваў у вашых суседзяў? Таго, што выцягваў вас ды вашага дружбака з падпечка, Васю-практыканта? А вы хаваліся ўсё... Ну ж! Ну... Васю-практыканта!

Вузкая прастора пакоя звужваецца яшчэ больш, настуджанае кандыцыянерам паветра халоднаю пленкаю застывае між намі.

Камізэлька на рэспектабельным панку насупраць мяне змяншаецца памеру да сорак шостага, лоб вачавідзь ніжэе, твар драбнее, вочы робяцца светлымі і выразнымі, як у юнака.

Цыгарэта дрыжыць у ягоных спярэшчаных вузлаватымі венамі руках, ашмётак попелу зрываецца з яе, падае на манжэту кашулі. Ён похапкам страсае попел далонню, радасна, ажно загараюцца вочы, усклікае:

— Пазнаў! Бачу: пазнаў!

Прыступ ягонае радасці канчаткова мяне спанталічвае, я не ведаю, што рабіць. Першае, што прыходзіць у галаў, — выпхнуць яго з пакоя. Ды цела маё такое слабое па выпітым-з'едзеным, што нават паварушыцца, не тое што ўчыніць штосьці больш грунтоўнае, для мяне зараз неймаверны цяжар. Да таго ж гэты кандыцыянер...

Я цягнуся рукою да пульта, што ляжыць на тумбе ля вакна, каб адключыць агрэгат, але госць апярэджвае мяне.

— Адключыць? — кажа і націскае на кнопку.

Кандыцыянер змаўкае, і ў пакоі адразу робіцца неяк пуста і няўтульна.

— Мне сказалі, ты мастак. Гэта праўда? Я, прызнацца, тваіх прац не бачыў...

— Я займаюся наладжваннем выставаў, і толькі... Сюды ж наогул прыехаў, каб з сім-тым пабачыцца, вось і ўсё. Выкарыстаў магчымасць...

— Магчымасць не плаціць за візу? — падхоплівае ён. — Так?

— Трыццаць пяць еўра на дарозе не валяюцца.

— Плюс страхоўка, плюс кошт праезду ў два канцы... А я вось — з ветэрынарыі ды ў дыпламатыю, як бачыш. Такі вось фінт у жыцці атрымаўся...

Дзіўна, але з кожнаю хвілінаю ягоная прысутнасць раздражняе мяне ўсё менш і менш. Я сілюся выклікаць у памяці што-небудзь такое, што зрабіла б ягоную істоту яшчэ больш злавеснай, як напачатку, калі ён толькі назваўся, але гэта мне не ўдаецца. Больш за тое, я ўжо за паўкроку ад таго, каб сказаць яму пра Тоніка.

— З сябрам прыехаў пабачыцца? — быццам угадваючы мой намер, пытаецца ён і ўстае з месца. — Так?

— Так. Але размаўляць пра гэта не маю жадання. Я стаміўся, вельмі...

— Як хочаш... Прабач, што патурбаваў. Толькі вось што: пра Жану нікому не кажы, яна дама замужняя, то каб не выйшла якая непрыемнасць, — кажа ён і ідзе да дзвярэй.

Я зашчапляю дзверы на засаўку, брыду ў ванны пакой. На душы ў мяне пуста. Мярзотная прыгнечанасць давіць на цемя, і нават тугім струменям вады не па сілах яе адтуль выпхнуць.

Вася-«заўцехнік», ото неспадзянка!

— А я ж дык хвіліны не заснула, — жаліцца Жана і цярэбіць у одуме сваю зялёную, пад колер кофты, сумачку. — Ні хвілінкі, ведаеце...

Мы сядзім утраіх (трэці — Зяменя) на канапе ў холе гатэля, чакаем, калі выйдуць са сваіх нумароў астатнія. А палове дзесятай экскурсія па го-

радзе, і група з Харбіна, да якое нас далучылі, ужо чакае ў двары ў аўтобусе.

— Але ж і доўга сцэджваюцца, — бурчыць Зяменя і, пазіраючы скоса на экран тэлевізара з відарысам месца двухгадовае даўніны тэракта ў Нью-Ёрку, пачынае разважаць аб прычынах жорсткасці ў стасунках паміж людзьмі. Развагі абяцаюць быць грунтоўнымі, ды, на шчасце, нашы збягаюць у хол, і мы ідзем да аўтобуса.

— Не перадумалі ехаць да сябра? — кажа Жана. — Я перагаварыла з кіроўцам, ён не супраць вас падкінуць куды трэба пасля экскурсіі.

Кіроўца, пажылы чалавек у шэрым швэдры, ветліва матляе мне галавою, падае мапу мікраранаў горада.

— Ну, Жана, вас сам Бог нам паслаў, — кажа Зяменя і шырока, як гіпапатам, пазяхае. — З усіх успамінаў, што ў нас застануцца, вы, бадай, будзеце найпрыемнейшым.

— Няўжо ж прыемнейшым за Фаіну? — кідае ў адказ Жана і залівіста — куды дзелася маркота — смяецца.

— О, Фаіна — па-за канкурэнцыяй! — уздымае ўгору рукі Зяменя. — Фаіна!

— Усе на месцы? — пытаецца Жана і падае кіроўцу знак ад'язджаць.

Чырвоны, з украпінамі чорнага ды шэрага горад плыве наўзбоч, сонна пазяхае насустрач праймамі вокнаў. З абклееных рэкламаю фасадаў млявымі паглядамі завабліваюць да дабрабыту гламурна-глянцавыя прыгажуні. Аўтобус пятляе, то выныrвае з засені дрэваў, то зноў хаваецца сярод іх. Горача. Спадар Ду злазіць з пярэдняга сядзення, уладкоўваецца на больш зручным месцы побач з Зяменем.

— Харбін — вялікі горад? — пытаецца той, і голас яго, падхоплены патокам ветру з форткі, разносіцца па салоне.

— Мегаполіс, восем тысяцы людзей, — адказвае кітаец і тут жа, спахапіўшыся, папраўляе сам сябе: — Мільёнаў восем, мільёнаў...

Уражаны лічбаю Зяменя хоча штосьці сказаць, але ўжо запозна: аўтобус уязджае на тэрыторыю фартэцыі.

Экскурсаводка, энергічная маладзіца з плецаком за спінаю, падыходзіць да нас, вядзе тунелем у прыцемненае дрэвамі чэрава мілітаршчыны-старасветчыны.

— Ну, вось вам і колішняе апірышча імперыі, — кажа і дадае з настальгіяй у голасе: — Год дзесяць таму тут месцілася савецкая вайсковая часць і, адпаведна, гэта быў адзін з элітных раёнаў горада, а зараз, як бачыце...

Фразу яна не паспявае скончыць, бо перашкаджае гул аўто, але гэта і не патрэбна. Пустыя акапознаў... 

— І ўсё кату пад хвост, — падхоплівае яе словы Зяменя і плюе сабе пад ногі. — Гадства нясветнае!

— Цяпер тут самае таннае жыллё... — працягвае, ледзь толькі сціхае гул, экскурсаводка і вядзе нас углыб тэрыторыі.

— Вам даводзілася бываць тут раней? — пытаецца Жана і бярэ мяне пад руку. — Так?

— І нават начаваць двое сутак. Мой сябар рабіў у часці цесляром, і я калі-нікалі яго наведваў.

— Той самы, да якога збіраецеся ў госці? Тое я гляджу: нецікава вам. Канечне, у параўнанні з тым, што раней тут было... Дык, можа, паедзеце да сябра, пакуль аўтобус вольны? Я скажу кіроўцу.

Яна рэзка вымае руку з маёй, шыбуе паўз выбоіны назад да аўтобуса, што акурат вырульвае ўжо на шашу:

— Pagaidiet![*] Пачакайце!

Яе жаданне як хутчэй пазбавіцца мяне, сведкі ўчорашняе сцэны ў гатэлі, мне цалкам зразумелае: з кім не здараецца. Хоць, з іншага боку... Сужэнскія здрады, якія я некалі, па маладосці, гэтак апантана асуджаў, зараз выклікаюць у мяне адно ўсмешку.

Кіроўца высоўвае голаў з кабіны, яны перамаўляюцца. Жана жэстам рукі падзывае мяне да аўтобуса.

— Ведаеце мову, а патлумачыць, што казалася там, у зале, не пажадалі, — кажу я і падымаюся на прыступку. Папрок мой гучыць недарэчна, але Жану ён, здаецца, ані не бянтэжыць.

— Дваццаць словаў, ну, можа, трыццаць, — смяецца яна ў адказ і выводзіць штосьці пальцам на шкле з надворнага боку аўтобуса.

«Ад сілы 50!» — высвечвае, гуляючы ценямі, лічбу запацелая шыбіна і плыве наўздагон гучнаму Жанінаму, з дамешкам гарчыны, смеху.

З кватэры даносіцца музыка, але на званок мой ніхто не адгукаецца. Я тузаю ручку дзвярэй, і тае ж хвіліны яны адчыняюцца.

— Стасік? Ты? — на твары Інары спалох і здзіўленне. Яна адступае ўглыб калідора, прыкрывае далонню рот. — Але ж любіш ты неспадзянкі! Мог бы і папярэдзіць, што прыйдзеш... Ну, ужо як ёсць, уваходзь...

Кучаравы — акурат малады Тонік — юнак вызірае з-за Інарынай спіны, дае кароткае «дзень добры».

---

[*] Pagaidiet! (латышск.) — Пачакайце!

— Прывітайся як след, Андрыс, — кажа Інара і прыбірае похапкам раскіданыя па кватэры рэчы. — Прабач, што гэтак нячыста. Я ж прадпрымальніца зараз, ездзіла ў Маскву па тавар, уначы вярнулася, дык не паспела прыбраць...

Я дастаю з сумкі пакунак з гасцінцамі, і ён вокамгненна губляецца на канапе сярод гурбіны штаноў, камзэлек і рознага іншага кірмашовага рызззя. Андрыс употай, бы малое дзіця, выхоплівае з яго колькі цукерчын, вырашыўшы, відаць, што болей тут няма чаго з намі, мастадонтамі, рабіць, знікае ў другім пакоі.

— З Тонькам мы не жывем, — кажа Інара і садзіцца на канапу. — Ужо два гады... Ты не ведаў? Мяне дасталі ягоныя п'янкі. Чым штодня такое бачыць, лепш ужо адной быць. Не згіну, дам рады! Не глядзі на мой рот! Ніяк не збяруся да дантыста. Ды і дарага. Што ў цябе?

— Ехаў пабачыцца з Тонікам, а тут вось такое... Дзе ён?

— У крэпасці, напэўна, дзе яшчэ... Там поўна падполаў, займаюць лыгі каму каторы глянецца. Я сама не бачыла яго, але кажуць, што там. Спіўся ўшчэнт. Жытло сваё — мы размянялі трохпакаёўку па разводзе — збаёдаў, прадаў за капейкі нейкаму таўстасуму... Нават сына не парупіўся прапісаць, хоць што хлопец меў бы з часам, а так... Андрыс мяне таксама непакоіць, вельмі.

— Чаму? Здаецца, нармальны хлопец...

— Вось-вось, здаецца. — Інара падхопліваецца з канапы, са злосцю расшкамутвае стос рыззя. — Мышы, халера! Пра што гэта мы? А, Андрыс... — яна пераходзіць на шэпт. — Быў бы нармальны, каб не звязаўся з швалллю. Ды з якою! Зрэшты, мы з Тонькам самі вінаватыя. Тонька гэтак піў перад

тым, як я зацяжарала, што я баялася раджаць: раптам калека народзіцца. Дый алкагалізм, я чула, перадаецца ў спадчыну, вось і падумвала перарваць... Доўга мучылася, ды так і не наважылася давесці да канца... А тут Тонька ўзяў ды ляпнуў неяк нападпітку Андрысу пра тыя мае здумкі-пакуты. Хлопцу шаснаццаць тады было, сам разумееш, якая магла быць рэакцыя. З таго часу і пайшло-паехала ў нас усё абы-як. Занурыўся, усё, што ні робіць, — наўпроць... Хацела да псіхолага завесці — адмаўляецца.

— Мама, перастань гнаць істэрыку, — падае голас са свайго пакоя Андрыс. — Я нічога благога не раблю. Ні-чо-га! — Ён вызірае зь дзвярэй, абдорвае мяне цікаўным паглядам. — Чым частаваць госця байкамі, лепш бы кавы прапанавала.

Інара змаўкае, сядае на канапу, але тут жа зноў падхопліваецца.

— А праўда, прабач, Стасік, — кажа і ідзе ў кухню. — Прабач, што гэтак сустракаю. Ведаеш, гэтулькі ўсяго навальваецца, што галава кругам... Ад суда ледзь адбілася, ставілі пытанне аб перасяленні ў сацыяльны дом за няўплату... А там п’янюгі адны ды зладзеі. У мяне запазычанасць за кватэру дзве тысячы латаў, гэта амаль чатыры тысячы даляраў. Дзе ўзяць такія грошы? Добра, Ірэнцы пашчасціла знайсці працу ў Манчэстары, прысылае сто даляраў у тыдзень, паціху сплачваем. З кіпрыётам, піша, пасябравала, нібыта пабрацца ёй прапаноўвае, то, можа, і назаўжды застанецца ў Англіі.

Ірэнка — дачка Інары і Тоніка, апошні раз я бачыў яе падчас канікулаў у вёсцы: мілае дзяўчо з дзвюма тонкімі коскамі цераз плячо.

— А ці лёгка гэта — выправіць дзіця, ды яшчэ якое гэтак цяжка далося, ты ж ведаеш, як я позна

нарадзіла, у чужую краіну і кожную хвіліну думаць, як яно там.

Кава моцная і густая, як кісель, да таго ж аддае чамусьці вішняю.

У пакоі Андрыса адзываецца мабільнік. Інара сціхае, навострвае вушы.

— Мам, Ірка! На...

Інара прыліпае вухам да тэлефона.

— Вы надоўга да нас? — пытаецца Андрыс і схіляе ўбок — бацькава звычка — падфарбаваную белым галаву.

— Паслязаўтра з'язджаю, віза ў мяне на чатыры дні.

— Шкада...

Чаму шкада, ён не дагаворвае, бо зноў у гаворку ўступае Інара. Пасля размовы з дачкою яна значна павесялела, нават пасвятлела з твару.

— Ты па-ранейшаму нацыяналіст? — пытаецца яна і пераводзіць пагляд на сцяну са здымкамі, сярод якіх я пазнаю наш сумесны з Тонікам падчас мітынгу ў Курапатах дзесяцігадовае даўніны. — Усё яшчэ ходзіш на сходкі?

— Не так часта, як раней, але зрэдку бываю. Хоць, папраўдзе, палітыка мяне ўжо не надта цікавіць.

— Расчараваўся? Ат, што я пытаюся, многія расчараваліся. Як згадаю, як сама сядзела пры тэлеку тады, на пачатку дзевяностых, дык сабе не веру, што гэткая была палітызаваная. Цяпер жа адзін клопат: выжыць як-небудзь, здабыць капейчыну. Сам ведаеш, як цяжка адной даваць усяму рады...

Я хачу сказаць ёй пра Васю, але не рашаюся: наўрад гэта зараз будзе дарэчы. І замест таго, каб сказаць, што круціцца на языку, дастаю з кішэні грошы.

— Вось, вазьмі, Інара.

Яна з хвіліну неўразуменна глядзіць на маю далонь.

— Што ты! Не трэба! Во яшчэ надумаўся... — голас яе слабее, робіцца дрыготкім і нерашучым.

— Тут усяго сотня еўра, тое, што я не плаціў за візу і праезд. Гэта замест прэзента, я ніколі вам нічога не дарыў. Будзем лічыць, што гэта я дзядзьку Міхалу вяртаю...

Яна бярэ грошы, павагаўшыся, нібы раздумваючы, ці добра зрабіла, кладзе іх на шуфляду.

Не ведаю, што ўдае ў гэтую хвіліну мой твар, але яна падымаецца, з выглядам, быццам я ўжо сказаў «да пабачэння», падае мне руку.

— Дарэчы, Рэгіна пра цябе ўвесь час пытаецца. Можа, хочаш з ёю спаткацца? Я патэлефаную ёй, скажу, што ты ў Т.

— Яна ведае.

— Вось як! А мне нічога не сказала, от сяброўка! Дык вы ўжо сустракаліся?

— Не.

— Гаварылі па тэлефоне? Зрэшты, што гэта я лезу не ў сваё... — Інара адпускае маю далонь, ідзе ў калідор. — Вось! Вось чым займаецца мой сын! — кажа і падхоплівае на хаду з зэдля нейкі часопіс з выяваю двух юнакоў у напалову спушчаных джынсах, што са смакам цалуюцца на тле разабранага ложка.

Часопіс называецца «Logos-contact» — гэта апошняе, што я бачу перад тым, як вымыкаецца з пакоя Андрыс і выхоплівае яго з рук маці.

Я вяртаюся ў гатэль каля паловы трэцяй. Вандроўка па горадзе стаміла мяне, ды і спатканне з Інараю і Андрысам не дадалі, папраўдзе, бадзё-

расці. Таму найпершая мая зараз мара — адпачыць перад вячэраю. Адпачыць як след, а далей бачна будзе, што ды як.

Час абеду яшчэ не скончыўся, і я цягнуся ў буфет, з якога выходзяць купкамі поўныя ўражанняў ад экскурсіі ў фартэцыю, з вачавідзь пакруглелымі жыватамі ад нязвыклых прыбалтыйска-еўрапейскіх прысмакаў харбінцы. Есці мне не хочацца, толькі піць — ці не нагадвае пра сябе неабачліва з'едзенае ў горадзе занадта салодкае марозіва. Жанчына, што сядзіць у самоце збоч дзвярэй буфета, рэзка падымаецца з канапы, кідаецца мне напярэймы.

— Стас! Гэта ты? — кажа, і яе трымцлівы радасны голас падаецца мне занадта пафасным, а злёгку распаўнелы, хоць усё яшчэ вабны стан — неспасціжна-чужым. — Ну, можа, пацалуеш мяне?

Рэгіна.

Яна падстаўляе шчаку, і мой мусовы — куды тут дзенешся — пацалунак засведчвае пачатак нашае першае за трыццаць гадоў пасля расстання сустрэчы.

— Ну, як ты?

— Усё добра. А ты як?

Мы ўсаджваемся за столік, моўчкі глядзім колькі часу адно на аднаго.

— Як твае? — першая парушае паўзу Рэгіна.

— Дзякуй, усё добра.

— Я заўжды цікавілася ў Інары тваімі справамі. Нават, ці паверыш, ведаю імёны тваіх сыноў. А ў мяне вось дачка. Тут, у Т. жыве. Ужо замужам, нядаўна ўнучкаю мяне ашчаслівіла. Табе, можа, нецікава ўсё гэта...

Мне, сапраўды, не надта цікава, але казаць пра гэта не выпадае.

— Не, што ты, наадварот. Ты працуеш?

— Выкладаю крыху ва універсітэце, — кажа яна і круціць у далоні цыгарэту. — Кандыдат навук, хоць, папраўдзе, якая там навука... Так, вякнула штосьці год дваццаць таму пра памежныя культурна-этнаграфічныя стасункі, прычынілася да ўслаўлення, так бы мовіць, дружбы паміж народамі. А й добра, і прыдалося пад старасць кандыдацтва. Кадраў са ступенямі зараз мала ў вучэльнях, дык шануюць... І пасля дасягнення пенсійнага ўзросту да таго ж можна са ступенню працаваць. А гэта і капейчына лішняя, як сам разумееш, і з людзьмі стасункі.

— Словам, задаволеная жыццём?

— Як сказаць? Напэўна... У маладосці ў раскошы за добрым мужам — ён дырэктарстваваў на заводзе — пажыла, свету пабачыла, пра непамыснаты матэрыяльныя і размовы ніколі не было. Цяпер сціплей, канечне, як адна засталася, жыву, але ж, пэўна, не горш за іншых. Ды і дачка добрая ў мяне, не кіне, паможа, калі што якое...

Яна дастае з сумачкі некалькі здымкаў, раскладае веерам на стале.

— Гэта Ян, муж, ён у пазамінулым годзе памёр з інфаркту, згарэў, можна сказаць, на працы. На дзесяць гадоў быў за мяне старэйшы і такі ўважлівы заўжды... Гэта дачка і зяць, мы ўтраіх у Юрмале залетась падчас фестывалю «Новая хваля». Унучку паказала б, ды, на жаль, няма тут нічога з сабою прыстойнага. Ты не крыўдуеш на мяне, што гэтак тады з табой абышлася?

— Я? — Пытанне заспявае мяне знянацку, я не ведаю, што сказаць.

— Дай агню. — Яна нахіляецца да мяне, абдае водарам духоў уперамешку з пахам тытуню. — Ці ты не паліш, можа?

Афіцыянт падскоквае да століка, паслужліва падносіць ёй газнічку. Рэгіна зацягваецца дымам, прыжмурвае вочы.

— Успамін пра шчаслівае мінулае — не лепшае суцяшэнне для жанчыны ў гэткім веку, як мой,— кажа і зноў похапліва глытае дым. — Прызнацца, мне было часам шкада, што так між намі адбылося. Але ты не адказаў на маё пытанне.

— Ці палю я? Ты ж бачыш: не.

— Не тое... Ці крыўдуеш ты на мяне?

— Ужо не. Хоць, папраўдзе, мне таксама, здаралася, было шкада.

— Ці мне гэта здаецца, ці мы насамрэч аб адным і тым жа шкадуем? — кажа яна ціхім голасам, і мне выразна чуецца ў ім водгулле далёкага-жаданага, ды няспраўджанага. — Я нават, помніцца, з-за імя цябе даставала, такая была сцерва...

Яна абводзіць паглядам размаляваныя садавіною сцены памяшкання, кідае ў папяльніцу недапалак, падпраўляе прычоску.

— Пра Тоніка ведаеш?

— Ведаю, Інара распавяла.

— Маеш намер з ім спаткацца?

— Як атрымаецца. Няблага было б.

— Вось як яно ўсё паварочваецца. — Яна ўздыхае, лезе ў сумачку па насоўку. — Праводзіш мяне? Пагамонім па дарозе.

Яна падымаецца, ідзе да выхаду.

— А можаш і не праводзіць, не пакрыўджуся, — кажа і дадае: — Шкада то шкада, ды, вярніся ўсё зноў, не ведаю, ці зрабіла б я іначай, як тады зрабіла. Хоць хто ведае... Ты кніжку тады знайшоў маю? Памятаеш кніжку Велты Спаарэ? Я знарок, між іншым, яе пакінула. Каб пры выпадку мець нагоду для спаткання. Ты, мабыць, адразу выкінуў яе?

— Пасля бацькавай смерці на гарышчы натыкнуўся сярод рознага друзу. І не выкінуў, аддаў камусьці.

— Але ж і пры сабе не пакінуў. Ат, прабач, што я кажу, хто мы адно аднаму? Ніхто.

Мы выходзім з гатэля, моўчкі праступем да трамвайнага прыпынку.

— Ніхто, — кажа яна зноў і прыспешвае крок, і ўрэшце ідзе так хутка, і хлясцік на яе плашчыку матляецца ў такт крокам так рашуча, што мне нічога не застаецца, як ёй паверыць.

Я думаю пра тое, што яна, мабыць, запросіць мяне дахаты. І калі яна сапраўды прапаноўвае зайсці да яе на каву, адгаворка ў мяне да такой ступені гатовая, што імгненна злятае з вуснаў.

Яшчэ толькі палова шостай, і ў калідоры ціха, бы ў кляштары. Жана з Фаінаю сядзяць на канапе пры дзвярах буфета, штосьці тлумачаць па чарзе разамлеламу ад спёкі ды суседства кабет спадару Ду. Харбінец пры парадзе, яго чорныя, наваксаваныя да бляску туфлі свецяцца, як люстэрка. Жана першая заўважае мяне, твар яе, дагэтуль бесклапотны, імгненна хмурнее.

— Вячэраем у бары а сёмай, — кажа яна і строга, быццам паведамляе невядома якую важную навіну, дадае: — Вас расшукваў віцэ-консул. Сказаў, што прыедзе за гадзіну да вячэры.

Яна зноў паварочваецца тварам да харбінца, і мне міжволі даводзіцца стаць ахвяраю Фаінінай гамонкасці.

— Я, мабыць, кепска выглядаю, — жаліцца паэтка. — Сёння ўсю ноч не заснула, лезлі ў глузды рыфмы праклятыя... О-ох! — Яна адкідвае голаў, робіць выгляд, быццам ратуецца ад непераадольна-

га жадання пазяхнуць, прыкрывае рот рукою. — Што за жыццё стала! Хачу да мамы ў Варонеж з’ездзіць, а ўсё не выпадае — гэтулькі мітрэнгі з візаю, ды і выдаткі не абы-якія. Раней, бывала, квіток купіў, сеў у цягнік, сюды-туды, і вось ён, Варонеж, дом радзінны... Зноў жа, з тутэйшымі было лягчэй ладзіць. Галас ледзь падымуць пра ўціск, а мы ім — іхняй жа зброяй — у адказ: « Пад акупацыяй вы? Пад акупацыяй! То і змоўкніце!». Цяпер гэткае не пройдзе. Вось я пляменнікаў сюды, у Т., за савецкім часам паперацягвала з Варонежа, а цяпер наракаюць: навошта, маўляў? З працаю цяжка, круціцца трэба, а не хочацца, не прывыклі, усё прынясі-падай... І ўдзячнасці ніякай, адно і глядзяць, каб што паймець з цябе. Быццам самой мне нічога не трэба... Во конча кампутар трэба купіць... Зусім іншая выгода, а то скрозь паперы ў кватэры, не дапрыбірацца. Прэзентую сама сабе к дню нараджэння...

Маналог абяцае быць працяглым, гэта мяне засмучае. Выручае Жанін мабільнік.

— Гэта Ілга, яна ў бары, — кажа яна па хвіліне размовы і ўстае з канапы. — Фаіна, мы мусім ехаць сёе-тое памагчы Ілзе, яна просіць... Прабачце, мужчыны.

— Ехаць, ехаць, — хітае галавою спадар Ду і таксама падымаецца. — Ехаць.

— Вам не трэба, — спыняе яго Фаіна, і ён зноў садзіцца. Пра што ён думае пры гэтым — невядома, і я, каб унікнуць перспектывы чарговы раз стаць суразмоўцам — цяпер ужо дапытліваму ўсходняму сябру, — хуценька іду ў свой пакой.

У нумары прахалодна і нязвыкла — пасля святочнае гамэрні ў горадзе ды несупыннага тарато-

рання Фаіны — ціха. Я кладуся на ложак з надзеяй хоць на хвіліну заснуць, але дарэмна. Ледзь змежваю павекі, як перад вачмі ўзнікае пастава віцэ-консула Васі Калевіча. Да ягонага прыходу, калі ён насамрэч прыйдзе, застаецца дзесяць хвілін. Што ён хоча? Зноў пачне казытаць згадкамі пра тое далёкае вясковае? Вось ужо з кім хацеў бы я як менш размаўляць. Ды так яно: чаго пазбягаеш, тое і даганяе.

Пра Тоніка я не думаю. Дакладней, думаю, але думкі пра яго — абрывістыя і вялыя — самі міжволі чэзнуць, ледзь нарадзіўшыся.

Хтосьці падыходзіць да дзвярэй, кранае ручку.

Прыбрыяліненая віцэ-консулава галава з праборам на левай скроні энергічна ўсоўваецца ў праём, падхоплены скразняком з форткі водар адэкалону разліваецца па пакоі.

— Прабач, што турбую. З раніцы шукаю моманту з табою перагаварыць, — кажа ён і сядае на ўчарашняе месца. — Я замовіў каву, дык пагамонім крыху. Ты не супраць?

— Хай будзе так, — ці то кажу, ці то думаю — у галаве туман — я.

Таня ўваходзіць у нумар, ставіць на стол два кубкі кавы і сподак з печывам, уключае электрагарбатнік.

— Што не ў гуморы? Бачыўся з Тонікам?

— Адкуль вы ведаеце пра мой намер з ім пабачыцца?

— Што ты ўсё выкаеш? Мог бы і тыкнуць раз дзеля прыліку, гэтулькі гадоў знаёмыя. Адкуль ведаю? Здагадаўся, калі ты сказаў, што шукаеш чалавека. Каго тут табе яшчэ шукаць? Я, дарэчы, таксама яго доўга расшукваў...

— І ці знай... шлі? — Я хачу сказаць «знайшоў», але язык пратэстуе. — Знайшлі?

— А як жа, знайшоў, канечне. — Ён перастаўляе кубак са стала на канапу, старанна перамешвае пітво лыжкай. — Усё пустое, яму нічым не паможаш. Патэнтаваны хронік. Купіш касцюм, і заўтра ён яго прап'е. Грошы дасі — і толькі горш зробіш, бо будзе квасіць да пасінення. Гэтаксама з працаю. Неяк уладкаваў вартаўніком у кветнік, і што ты думаеш? Збег, не вытрымаў «рэжыму». А рэжыму таго — пасядзець-пахадзіць ля ружаў-лілеяў тры разы на тыдзень. Некандыцыі заўжды шмат, пры жаданні і гандлянуць можна, сякую-такую капейчыну ў сям'ю прынесці. Дзе там, баронь Бог! Палячыцца прапаноўваў — і слухаць не жадае. Ат, што пустое казаць... Чалавек без тормазу. Тут упісвацца трэба ў новыя рэаліі, а гэта — не па ім. Не ўпісаўся і ніколі не ўпішацца. І адсутнасць грамадзянства, і іншае такое — не ў тым справа, усё значна прасцей. Людзі ж жывуць тут і няблага жывуць, хоць бы вашых некаторых узяць...

— Што ж будзе з ім?

— А хто ведае... Змерзне калі ўзімку, ці аўто прыдушыць п'янага. Звычайная рэч, на жаль...

— Чаму вы гэтак пра яго клапоціцеся?

— Таму што адчуваю віну перад вамі ўсімі. Ты ж ведаеш: з-за Ларысы. Гэта заўсёдны мой боль. — Ён адсоўваецца ўглыб пакоя, суцішваецца. — Не ведаю, што і думаць, як тады яно атрымалася. Тры разы мы толькі з ёю ўсяго пабавіліся, ды і гумкаю я карыстаўся. У падстоллі ў вас пачак быў, я браў цішком... А во як выйшла, хто б мог падумаць... Я праз паўгода дзесьці пра ўсё даведаўся, месца сабе не знаходзіў. Я бабнік, канечне, дрэнь, ды не быдляк жа кончаны... Чаму ты маўчыш? Скажы штонебудзь.

— Што я магу сказаць?

— Хоць што! Мацюкніся ці плюнь на мяне...

— Не бачу сэнсу. Ды, папраўдзе, і права наўрад маю... Тады б — плюнуў, і не толькі... — Словы самі вымыкаюцца з маіх вуснаў — такое ўражанне, быццам не я іх прамаўляю, а хтосьці іншы, хто сядзіць ува мне зараз і хто, мабыць, сядзеў заўсёды, ды не асьмельваўся да часу вымыкацца ўсе гэтыя гады. Вымыкаюцца лёгка, як пераспелае зерне з коласа, як пара з гарбатніка, што вось ужо колькі часу сіпіць, пакрыўджаны няўвагаю, на падваконніку. — Хочаце яшчэ кавы?

Ён падстаўляе кубак, нашы рукі на хвіліну судакранаюцца, і я адчуваю, як дрыжыць ягоная.

— Табе так абыякавае мінулае?

— Мінулым не будзеш жыць вечна. Ды і рахункі ў кожнага свае да яго.

— Я не ведаю, не ведаю, як гэта здарылася, — кажа ён і насыпае ў кубак каву. — Сорак гадоў мкнуся даўмецца і ніяк не дам рады... Ты мне не верыш...

— Чаму, веру, — гэтым разам сваім, а не таго, хто староннí ўва мне, голасам адказваю я і падаю яму цукар.

— Праўда? — ажно падскоквае ён ад радасці і ўпіваецца мне далонёю ў запясце. — Няўжо праўда? О, Божа!

— Ад'язджаем, ад'язджаем, — даносіцца з калідора голас Жаны.

Сівы, з плехам на ўсё цемя чалавек падымаецца з месца, нібыта жадаючы ды ніяк не могучы скінуць з плячэй не абы-які цяжар, таргае плячыма. Мне шкада яго, ды не настолькі, каб тут жа, гэтае хвіліны спыніць яго ды падзяліцца з ім цяжарам уласным.

У бары тлумна і горача, пахне каваю. Моладзь трэцца ля стойкі з напоямі, гучна перамаўляецца. Зала, у якой мае быць вячэра, знаходзіцца за перагародкаю насупраць, там пуста, толькі бачна, як завіхаюцца ля сталоў афіцыянткі. Двое хлопцаў, пабраўшыся за рукі, размаўляюць у прыцемку на канапе, то аддаляюцца адзін ад аднаго, то зноў зліваюцца ў экстазе ўзаемаразумення. Яны сядзяць так шчытна, што цені іх сілуэтаў на сцяне зліваюцца ў адзін. Адзін з хлопцаў устае, хісткім няпэўным крокам накіроўваецца ў мой бок.

Бледны, з кругамі наўкола вачэй твар, знаёмая ўсмешка. Другі таксама падымаецца, ідзе следам за першым.

— Гэта Валік, мой сябар. Мы пазнаёміліся праз Інтэрнэт, а потым аказалася, што і жывем у адным мікрараёне. Вы бачылі бацьку?

Валік, падае мне руку, стульвае вусны ў іранічнай усмешцы.

— Не, не бачыў, на жаль. І не ведаю, ці наогул ужо пабачу. Наўрад паспею, заўтра ад'язджаць...

Андрыс прыхінаецца плячом да стойкі, абводзіць паглядам шыхт бутэлек на вітрыне.

— І не варта, — кажа бы між іншым і, какетліва выгнуўшыся зацягнутым у скуру станам, абдымае Валіка.

— Чаму?

— Таму што ён сам не жадае нікога бачыць.

— І цябе?

— Магчыма, жадае. Але я не жадаю.

— Чаму так?

— Не жадаю, і ўсё. Хай жыве, як хоча. Кожны мае права жыць, як хоча. Вас здзіўляюць мае паводзіны? Можаце не адказваць, сам бачу: здзіўляюць. А мне пляваць. Днямі мы з Валікам едзем у

Юрмалу. Потым, калі ўдасца, перабярэмся кудынебудзь у Еўропу. Магчыма, у Манчэстар паедзем, да Іркі... Вось так, бывай, Т.! Дарэчы, здзіўлю вас яшчэ раз: я не підар.

— Як так?

— Вельмі проста, звычайны падман, блеф. Насуперак бацькам, калі даведаўся, што маці не хацела мяне раджаць. Які гэта быў для мяне ўдар! Спачатку я ад злосці ды крыўды падзіравіў ім усе гумкі. Натыкнуўся ў шуфлядзе пры ложку на пачак і голкаю іх, голкаю... Мяне не хацелі, дык вось вам ад мяне дарунак! Вам, вясковаму, ужо прабачце за нетактоўны напамін, у маім узросце гэткія жарсці, пэўна, і не сніліся... Ды дарэмна я з тымі гумкамі стараўся, абышлося без брацікa-сястрычкі. Шкада... А праз год мы вось пазнаёміліся з Валікам, і тады я вырашыў папомсціцца іначай. Маці любіць пра жаніцьбу завесці пры нагодзе гаману, ну, там пра нявестку, унукаў — звычайныя жаноцкія тары-бары, самі ведаеце. Вось тады я і аб'явіў пра сваю нібыта блакітнасць. Так і так, нічога з нашчадкамі не атрымаецца, агідныя мне жанчыны, мужчын люблю. Маўляў, вось вы пры нараджэнні без ахвоты такога, як Бог даў, мяне прынялі, дык цяпер такога прыміце, якім сам хачу быць. Нібыта хачу, разумееце?

— Значыць, усё гэта — тэатр, маскарад? Усе гэтыя часопісы, манера апранацца? Ці не занадта жорстка ў дачыненні да маці?

— Можа, і жорстка, але — справядліва, згадзіцеся. Да таго ж я павінен цяпер, абавязаны падтрымліваць Валіка. Ён быў адзіны, хто зразумеў мяне, калі было кепска, памог у нядобрую хвіліну... Цяпер мая чарга. І мне пляваць на яго арыентацыю. Любіць трэба тых, хто нас любіць, ці не так? І не

трэба мяне перасцерагаць: ах, што, як крый Бог... Тым болей, што, можа, і прыдасца мне, і неаднойчы, яшчэ ўвесь гэты, як вы кажаце, маскарад. Кажуць, у замежжы праз геeўскае асяроддзе заўжды прыезджым лацвей уладкавацца, чым праз якое іншае. Вось і скарыстаюся... А маці... Ёй скажу настатак, ад'язджаючы, каб надта не перажывала. Скажу, вядома... І зараз бы сказаў, ды рагязы не хочацца лішне нарабляць. Ужо няхай будзе да часу, як ёсць..

— Гэта, напэўна, цяжка?

— Што?

— Удаваць тое, што ты ўдаеш. Не быць сабою.

— А вы заўжды такі, як насамрэч? А іншыя? Колькі вы прыгадаеце сваіх знаёмых, якія нічога і нікога не ўдаюць? Шмат? Ісці насуперак заўжды цяжка, вы гэта, пэўна, ведаеце не горш за мяне. Але ж што за жыццё будзе, як ніхто не будзе таго рабіць...

— Навошта вам з'язджаць, вы маглі б і тут няблага ўладкавацца.

— Тут? Вы не ўяўляеце, што такое правінцыя? Да таго ж мы з Валікам не ведаем мовы, а тут гэта якая-ніякая, а праблема.

— Ты не ведаеш мовы?

— Не так дасканала, каб вольна карыстацца. І з кім бы я на ёй тут, у Т., размаўляў, калі б ведаў? — Ён змаўкае на хвіліну, скоса, нібы вагаючыся, ці казаць, што думае, ці не, пазіраючы на мяне, прамаўляе: — Вы гэтак перажываеце за бацьку, між вамі, напэўна, што-небудзь было ў маладосці? У сэнсе...

Тройца нашых на чале з Жанаю ўваходзіць у бар, накіроўваецца ў банкетную залу, дзе ўжо шмат — і калі паспелі прыйсці? — іншых гасцей.

Фаіна ў суправаджэнні Зямені і спадара Ду праплывае паўз мяне, абдае воблакам парфумы.

— Ідзем, ідзем, — кажа Зяменя і цягне мяне следам за паэткаю ў банкетную залу.

— ...у сэнсе сексу, — выгукае наўздагон нам Андрыс, і ягоны голас працінае мне вушы бязглуздасцю прыпушчання.

Вячэра расцягваецца да паўночы. Першымі адыходзяць — употайкі, ні з кім не развітаўшыся, — Фаіна і Зяменя. Усе на добрым падпітку, таму ніхто знікнення пары, здаецца, не заўважае. Толькі незадаволены спрытам суперніка і вераломствам паэткі спадар Ду маркотна круціць у руцэ недапіты келіх ды чухае галаву.

Жана размаўляе з кімсьці па мабільніку.

— Мэр просіць конча яе дачакацца, — кажа па размове і цярэбіць у руцэ сурвэтку. — Яны толькі што праводзілі прэзідэнта, і яна ўжо едзе сюды. Літаральна пяць хвілін пачакаць...

Папярэджанне выглядае як просьба, але гэта лішняе: і без таго пакідаць гасціну ніхто не спяшаецца.

Мне цікава, чаму няма віцэ-консула, але даймаць такім пытаннем Жану не хочацца, і я маўчу.

Мэр уваходзіць у залу, накіроўваецца да столікаў: ветлівая, паводле этыкету, усмешка, падзяка за візіт, апошні, пад сцішаны гул застолля, тост.

— Ну, вось, і фініш, здаецца, — кажа Жана, і мне чуецца ў яе голасе палёгка.

У зале пры стойцы, дзе бавіцца моладзь, яшчэ больш шматлюдна, як напачатку, і я затрымліваюся на хвіліну ў спадзеве ўбачыць Андрыса. Ён сам заўважае мяне, ідзе напярэймы.

— Не крыўдуйце на мяне, — кажа і разводзіць рукі ўбакі. — І не засмучайцеся, што бацьку не

пабачылі. Я пашукаю яго, скажу, што вы былі. Калі ён у стане будзе хоць што ўспрымаць. Шкада, што ўжо з'язджаеце.

— Мне таксама, — кажу я, і маё ненаўмысна-злачыннае мінулае, згарнуўшыся да памеру пары ягоных вачэй, што глядзяць мне ўслед (я заўважаю іх у люстэрку перад дзвярыма), нябачным ценем валачэцца следам за мною да выхаду.

На двары дождж, гэтым разам, праўда, без навальніцы. У аўтобусе прахалодна і вольна: кітайцы ад'ехалі раней, каб паспець на цягнік да Рыгі, ды і нашых паменела.

— Вы ці не скралі сурвэтку? — смяецца Жана і хапае мяне за руку. — Ай-я-яй, ну ж сорам!

Далонь мая выпростваецца, жоўта-залацістая вышыванка бліскае ў паўзмроку дробнымі кветкамі, падае долу. Я адчуваю сябе няёмка, і Жана літасціва прыходзіць мне на дапамогу.

— Не камплексуйце, — кажа і кладзе сурвэтку сабе на калені. — Не знарок жа вы яе панеслі, з кім не здараецца. Хай у мяне застаецца, вярну якнебудзь пры нагодзе ў бар. — Яна разглядае матэрыю, і вочы яе загараюцца гарэзлівым агнём. — А можа і не вярну. Рэч неблагая, застанецца хоць што на памяць пра вас. Яня прыгожыя рэчы любіць, дарма што вясковая.

— Яня? Ваша дачка, мабыць?

— У мяне сын, адзіны. Яня — гэта я. Іаана, а яшчэ правільней — Югана.

— Ажно чатыры імі! Ну і ну! Амаль па адным на кожны дзень тыдня!

— А вы думалі... Ці ж мы з вамі, беларусіны, такія простыя людцы? Ну, вось, цяпер вы ўсё пра мяне, здаецца, ведаеце. Усё, што жадалі, і нават больш.

Я хачу спытаць, ці добра гэта, ці кепска — ***больш***, але Жана апярэджвае мяне бадзёрым, бы майскі гром, смехам. І мне нічога не застаецца, як бегчы следам за астатнімі ў гатэль, каб там, удалечыні ад староннiх вачэй, аддацца чарговы раз чарвячку сумневу. Таго самага, што ўранні ўсё яшчэ бадзёрыць душу спадзевам на спатканне з Тонікам, а напрыканцы дня, спанталічаны маёю нібыта ненарочыстаю — ах, гэтая мітусня! — абыякавасцю да лёсу сябра, выпаўзае вужакай з нетраў памяці і вярэдзіць, вярэдзіць глузды дакорам.

У гатэлі ціха, нават цішэй, як учора. Толькі што з'ехалі літоўцы, рыхтуюцца да ад'езду і іншыя дэлегацыі, так што да раніцы застаемся адно мы. Я іду да пакоя Зямені, каб папытацца, у колькі ад'язджаем, але ён не адзываецца: мабыць, Фаіна залюляла вершамі пра каханне. Размова з Андрысам раз-пораз пракручваецца ў мяне ў галаве, не дае спакою, вярэдзіць адчуваннем віны перад Тонікам: трэба, трэба было расшукаць. Ды далей дакору не ідзе: я занадта стомлены ды і куды зараз, сярэдначы, бегчы?

Я лезу ў душ і, ледзь вярнуўшыся да ложка, засынаю.

Мне сніцца бацька. Ён вышчэплівае ў шуле сякераю чарговы пазок. Трэскі з шумам пырскаюць з-пад ляза, разлятаюцца ва ўсе бакі. Раптам сякерышча крышыцца, і бацька, не жадаючы марнаваць час на яго замену, пачынае хуценька — надвячорак, а паспець скончыць працу трэба да змяркання — вышчэпліваць дрэва кіпцюрамі. Драўніна каляная, і бацькавы далоні ўвобміг робяцца чырвонымі ад крыві. Людзі без твараў — ні вачэй, ні

вуснаў, ні насоў — па чарзе ўзыходзяць на трасотнік, бяруць па шчэпіне, хаваюць пад вопратку. Ларыска, цётка Адальфіна, дзядзька Міхал, маці, усіх іх я пазнаю па паставах. Апошнімі з'яўляюцца на трасотніку Рэгіна і Тонік. Бацька выдзірае з камля чарговую шчэпку, яна, пакружыўшыся ў паветры, з ціхім шоргатам кладзецца ля Тонікавых ног. Ён нагінаецца, каб падняць яе, але не дае рады: шчэпка выслізгвае з ягоных рук, падхопленая ветрам, ўзлятае на дах клеці.

Дзядзька Міхал выходзіць наперад, каб аддаць Тоніку сваю, але той не хоча браць і борзда, як толькі можа, бяжыць прэч, туды, дзе чырванеюць цэглаю муры старое фартэцыі.

«Ну, а ты што?» — кажа бацька і падае мне скрываўленую, з вялізным мазолем на далоні руку. Я мкнуся дацягнуцца да яе, але не паспяваю. Моцны вецер уздымаецца над нашымі галовамі, падхоплівае мяне, нясе кудысьці.

Агромністы, як мора, мегаполіс свеціцца агнямі ўдалечыні, і вось я ў ім, і вузкавокі чалавек з бэджам «Чжан Ду» на грудзях вядзе мяне глядзець чайную цырымонію. Гейша па імі Фаіна выходзіць нам насустрач, вершы раямі вылятаюць з яе вуснаў, асядаюць гірляндамі на галінах магнолій. «Вунь яны», — кажа яна іківае ў бок прыбудовы, у якой стаяць (усё бачна, бо дзверы будыніны расчыненыя) прыкутыя ланцугамі да слупа, бы святы Пётра ў Мамерцінскай вязніцы, віцэ-консул Вася Калевіч і Тонік.

Бэлькі выслізгваюць з шулы ў куце прыбудовы, абрушваюцца на Тоніка. Я кідаюся ратаваць сябра, але мяне апярэджвае бацька. «Парода да пароды мусіць быць, а яшчэ лепш — калі добра падагнана», — кажа і заганяе бэлькі сякераю ў пазы.

Ды яны зноў праз хвіліну вымыкаюцца адтуль, з грукатам падаюць нам на галовы. Бацька разгублена міргае, хапае адною рукою за плячо Тоніка, другою мяне, цягне прэч з прыбудовы...

Парушаныя грукатам будынкі мегаполіса ўздрыгваюць, паволі распаўзаюцца ва ўсе бакі, трушчачы паселішчы наўкола, мкнуцца ўсё далей і далей і ўрэшце, калі ўсё пачынае нагадваць пустэльню, асядаюць долу...

Гэта апошняе, што я бачу: воблака пылу паўзе па-над зямлёю, і густая, як ноч, цемра запаноўвае над усім...

Я прачынаюся а шостай. Ад'езд а дзевятай, і ў гатэлі ціша, толькі кроплі дажджу, што сцякаюць на падваконнік з даху, парушаюць яе аднастайным, метадычным цурчэннем. Уставаць не хочацца, і я доўга качаюся ў ложку, то праглядаю прэзентаваныя Ілгаю і Жанаю напярэдадні праспекты, то проста ляжу ўтаропіўшыся вачмі ў столь. Сілюся зноў заснуць, але беспаспяхова: ледзь зможу павекі, як пачынае здавацца, быццам я не ў пакоі, а ў нейкай скрыні. На шчасце, сродак змагання з гэткаю пошасцю мне вядомы: уключыць святло і ляжаць, ляжаць з расплюшчанымі вачыма, пакуль туман не зацемніць глузды.

Прахопліваюся я зноў ад тэлефоннага званка.

— Прабачце, — кажа парцье, — вы прасілі пабудзіць а палове восьмай.

Зборы займаюць паўгадзіны.

Калі я спускаюся ў хол, усе нашы і Жана ўжо там. Усе ўжо паснедалі і цяпер мусяць чакаць, калі тое ж зраблю я.

Аўто стаіць на рамарэнце пры браме. Зяменя садзіцца побач з кіроўцам, загадвае запускаць матор.

— Фаіна тэлефанавала, жадае ўсім шчаслівай дарогі, — кажа Жана і схмурвае тонкія ільнянашэрыя броўкі. — Я таксама. Шкада, што ад'язджаеце, вельмі, вельмі было з вамі добра.

Яна яшчэ нешта кажа, але я не ўслухоўваюся ў яе словы, увагу маю прыцягвае чорная «volvo», што з'язджае з шашы ў завулак. Мне падаецца чамусьці, што гэта віцэ-консул Калевіч, і я прашу Зяменю хвіліну пачакаць.

«Volvo» спыняецца ля брамы, разварочваецца, вяртаецца зноў на шашу.

Значыць, не віцэ-консул. Дзіўна, але мне нават шкада, што гэта не ён — быццам абрываецца апошняя повязь з мінулым. З не надта прыемным і ўсё ж — блізкім і дарагім.

— Ну, з Богам, — кажа Зяменя, і аўто вырульвае на шашу следам за «volvo».

Дарога да мытні займае дзве з паловай гадзіны — з улікам часу, што змарнавалі ў краме на выездзе з Т. дзеля набыцця мясцовых рознасцяўпрысмакаў. Разлічвалі ўкласціся хвілін у дзесяць, а правалэндаліся ля паліцаў, бы тыя жанкі, усе сорак. Затое і затаварыліся: багажнік як не трэсне.

— Можа, гэтым разам больш пашанцуе, не давядзецца зашмат чакаць, — кажа Зяменя і загадвае кіроўцу прытармазіць вярсты за тры ад памежнага шлагбаума. — Усе пры дакументах, ніхто не забыўся пашпарт у гатэлі?

Пытанне рытарычнае і гучыць недарэчна, ды ніхто пярэчыць Зяменю не жадае: што карысці псаваць нервы ды яшчэ ў гэткую спёку?

Чорнае аўто нячутна падрульвае ззаду, спыняецца побач з намі. Віцэ-консул Калевіч вылазіць з яго, вітаецца з кожным за руку, просіць мяне

выйсці на хвіліну. Адводзіць ўбок, ціха, нібы асцерагаецца, каб не пачулі нашую гаману астатнія, кажа:

— Там паглядзі, хата іхняя нібыта пустая стаіць, можа, угаворым Тоніка пераехаць. Можа, хоць родныя сцены памогуць яму, так бывае, ведаеш... А я, калі што якое, тут плячо падстаўлю, памагу з афармленнем дакументаў. Абы толькі сам ён не ўпёрся рогам... Дык памяркуй... Грошы спатрэбяцца — не шкадуй, усё сплачу, да капейкі.

— Няблага было б, — адказваю я, і няверʼе ў станоўчы зыход ягонае задумы прабіваецца паўз мае вусны так незаўважна, што я і сам яго ледзь-ледзь улоўліваю.

— Ну, тады бывай, — кажа ён і ідзе да машыны.

Я гляджу яму наўздагон, і ўражанне, што час спыніўся, захрас на мяжы двух светаў, ахоплівае мяне. Як неўпрыцям усё зрабілася неістотным з мінулага жыцця, як незаўважна аддалілася, стала абыякавым тое, што калісь гарачыла кроў, казытала глузды спадзевам на новыя даляглядЫ!

Мне горача і хочацца як хутчэй дадому. Я думаю пра няспраўджанае жаданне цёткі Шуры вярнуцца па мужавай смерці дажываць век у родныя мясціны, затым пра Тонікавых сына ды дачку, што асталююцца, хутчэй за ўсё, назаўжды ў якой-небудзь Англіі, урэшце, пра сваіх сыноў, унукаў і жонку і міжволі — каторы раз за апошнія дні — згадваю бацькаву шулу і яго больш як саракагадовае даўніны размову з дзядзькам Міхалам на трасотніку.

Жаночы твар з няпэўнымі абрысамі — маці? Ларыска? Рэгіна? — мільгае перад маімі вачыма, я правальваюся ў хісткую, як марыва над полем пасля дажджу, дрымоту. І прачынаюся толькі ў Мураванцы — ад Зяменевага воклічу:

— Охці-вохці, ёрш т-тваю, было — і няма.

Я прахопліваюся ад одуму, і відарыс збуранага котлішча рымара Ванагіса, што паўстае наўзбоч, збівае мяне з тропу: ні коміна, ні падпечка, ні нават цагліны. Толькі самотны куст парэчніку, ды сляды ад падводы, што губляюцца сярод прыбітага коламі быльнягу, ды ўсё тая ж купка здзічэлых вішняў на краі паўвыспы.

— А ўмеюць частаваць гэтыя еўразвязаўцы, умеюць пыл пусціць у вочы... — кажа Зяменя і смачна пацягваецца ўсім целам. — А няхай...

Мытнік, той самы, што гэтак доўга мучыў нас тры дні таму чаканнем на ўездзе, падыходзіць да аўто, каб спраўдзіць дакументы, і чарада ластавак між кроквамі ангара адзываецца на ягоныя крокі похапліва-сцішаным шорганнем крылаў.

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

# ДЗЕНЬ БУБНА
## Прыпавесць

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

*Любові, гарчэйшай за мёд*

Плынь штохвілі рабілася ўсё больш лянівай, і струкі бобу з разбухлымі бобінамі ўсярэдзіне часцей ды часцей вымыкаліся ёй насустрач з прагалаў між купкамі водарасцяў ды плямамі рыбінага малака, і ўрэшце іх так шмат стала паўсюль, што сумневу быць не магло: яна прыплыла. Няўжо-такі прыплыла?! Стужка высунула галаў з вады, аглядзелася. Той самы, што і калісь, у маленстве, пляскаты — ані дрэўца наўкола, ані берага паблізу, ані следу цюшынае прысутнасці — краявід слаўся зморшчынамі рабізны наўсцяж да самага далягляду, сляпіў вочы празрыстасцю паветра. Яна пагайдалася колькі імгненняў на хвалях, каб хаця крыху дабраць моцы перад апошнім кідком да няведамага, што ці не тут дзесьці якраз, гэтым месцам на доле, падчэквала яе, пачала павольна апускацца паўз ланцужкі бурбалак у спярэшчаную пасамі водарасцяў і хісткіх сонечных прамянёў марскую невараць. Сіло няпэўнасці, якое і дагэтуль неаднойчы паўставала на яе шляху ў акіяне і якога яна кожны раз пасяхова ўнікала, занятая несупынным дбаннем пра бяспеку, зноў насунулася на яе, спавіло на момант глузды здрадліва-казытлівым павуціннем сумневу.

Што чакае яе ў гэтай сатканай з лагоды і супакою стыхіі мора Сяродморскага? Чым аддзячыць яна здарожанай вугрынай істоце за ахвярную, на мяжы рызыкоўна-безагляднага балансавання паміж жыццём і смерцю, адданасць? Ці не павернецца замест прывітання спінаю, ці не агаломшыць замест святочнае пачосткі жахлівымі ікламі драпежніка? Ці не змусіць, урэшце, адпрэчыўшы, бы лёс бадзяжку таго марнатраўнага, шукаць шляхоў вяртання назад, да родных азёрна-раўчуковых берагоў, абрысы якіх і праз гэтулькі часу не-не ды і праб'юцца з глыбіні памяці, паўстануць прад вачыма паўз друз напатканых у акіяне непамыснотаў?

Пукі водарасцяў суладна зыбнуліся, быццам вітаючы яе ды жадаючы як найхутчэй адагнаць нядобрыя прыпушчанні, але праз міг зноў застылі пруцінамі ў халоднай абыякавасці абапал накірунку яе руху. Чародка пярэстых рыбак мільгнула ўдалечыні, жвава рассыпалася ўбакі, каб зноў праз хвілю згамузавацца ў гуллівую сябрыну, ды пара фанабэрлівых крабаў — адыстар шчупак з акунём у возеры — няспешна прафланіравала наўзбоч у пошуку харчу, знікла ў бездані.

Дно тым часам усё бліжэла, і Стужка міжвольна прыспешыла рух. Ні асаблівага ўзрушэння, ні радасці не было. Толькі стома, ды тупое, на мяжы паўзабыцця, бяздум'е, ды яшчэ — адчуванне збольшага выкананага абавязку, быццам узяла і пераплыла няўзнак, ратуючыся ад драпежніка, з аднаго азярка ў другое, бо так мусіла зрабіць, бо так патрабуюць няведама кім і калі ўладаваны закон прыроды і неадольнае, падсвядомае імкненне працягу роду.

Відарыс, што паўстаў перад вачыма на дне, жахнуў яе. Усё наўкола, дакуль сягаў зрок, было заслане вугрынымі парэшткамі. Армады крабаў балявалі на

скалянелых, спачвараных тушках, з імпэтам заўзятых ваяроў таўкліся клюшнямі ў бойцы за лепшы кавалак. Адзіным, што апроч іх ажыўляла гіганцкі могільнік, былі сілуэты самотных вугроў-залётнікаў, што, як і яна, прыпазніліся прыплысці да месца нераставання і зараз заклапочана мітусіліся сярод усяго гэтага вэрхалу ў пошуку выпадковае каханкі. Адразу колькі самцоў заўважылі яе, рынуліся напярэймы. Але яна была такая стомленая, што нават не зірнула на іх. Падплыла пад водарасціну, не маючы больш сілы трываць у сабе неймаверны цяжар, церанулася аб яе жыватом.

Ікра струменем пырснула з яе вантробаў, рассыпалася наўкола. Юрлівы самец, што першы падплыў да яе, ледзь яна тут з'явілася, вымкнуўся з гушчы супернікаў, цыркнуў на ікру семем. Пакружыўся хвіліну-другую, мабыць, дзеля прыліку, упобачкі і хуценька знік.

Яна паманулася зноў плысці ўгору, але не здолела: вызваленае ад ікры цела пачало калянець і неўзабаве зрабілася амаль неслухмяным. Яна ўткнулася пысаю ў каменьчык, зняможана расцягнулася целам на дне. Абрывістыя згадкі з прамінулага жыцця і ўтомнага падарожжа з азярка ў адкрыты акіян, што ўрэшце-такі прывяло яе сюды, да месца нераставання, жмутам разнаколерных ніцяў вымкнуліся са свядомасці, прыспешваючы адна адну, сткаліся ў пярэста-мудрагелісты дыванок успаміну.

Калі ўсё пачалося? Калі ўпершыню адчула яна той уладны покліч, што адарваў яе ад наседжанага месца, ад любых сэрцу нерата і друшляка і пасля гэтулькіх дзён ды начэй поўнае небяспекі вандроўкі прывёў да жаданай мэты? Ці не тады, калі, гнаная цікаўнасцю і ахвотаю пашырыць абсягі ўяўлення пра навакольны свет, плыла з возера ў паселішча

цюхаў? Ці, можа, значна яшчэ раней, тады, калі, пазбаўленая радасці апекавацца ўласнаю малечаю, упершыню пазайздросціла рыбам-маткам, якіх лёс такою мажлівасцю не абдзяліў? А можа, падчас знячэўнага спаткання са Стужыкам ды кароткіх, бы дзень узімку, мілаванак-заляцанак з ім у яшчэ па-летняму цёплым, але ўжо спавітым на дасвецці густою перадвосеньскаю шэранню азярку?

Невялікі, на добрую трацiну меншы за яе вугрык-меланіст*, што толькі што, як і яна, выканаў свой апошні і найгалоўны абавязак перад прыродаю, зняможана апусціўся побач на глей, забіўся ў перадсмяротных канвульсіях. «Стужык», — падумала яна і памкнулася да яго.

Не, то быў не Стужык. І ўсё адно ёй захацелася хоць чым памагчы яму. Яна падплыла бліжэй, зазірнула ў шырока развінутыя, але ўжо пазначаныя таўром адыходу ў іншы свет вугрыныя вочы. Вугрык прыязна хітнуў ёй у адказ галавою, і цень ці то шкадобы ад усведамлення трагедыі дачаснага, у росквіце сілаў скону, ці то перасцярогі, бо памаўзлівая збродня з паўдзесятка крабаў ужо спружынілася навокал з выразным намерам падсілкавацца імі, мільгнуў у ягоным паглядзе, апёк яе вусцішнасцю непазбежнага.

Яна вярнулася на ранейшае месца, не маючы ані сілы, ані жадання не тое што кудысьці плысці далей, а нават паварушыцца, зноў аддалася ўладзе ўспамінаў...

Кіці, калісь заўзятая яе варагіня і ненавісніца, а цяпер вось воляю выпадку найлепшая дружбачка, высунула твар з-за купы водарасцяў, быццам жадаючы падбадзёрыць яе ды яшчэ трывалей змацаваць

---

* Меланіст — жывёла, якая мае ў афарбоўцы толькі адзін пігмент — меланін, што дае адпаведна адзін колер — чорны.

нябачную повязь, што ўсталявалася між імі падчас апошняга, неспадзеўнага спаткання ў доме аднавокага гандляра, штосьці ціха ёй шапнула і зноў стаяла ў чэраве неабсяжнае, шкляна-празрыстае марское ясноты. Плынь падхапіла той шэпт, сшыла ніткаю падабенства лёсаў дзве іх, цюшыную і вугрыную памяці ў адну, панесла, панесла ў мінулае, да берагоў Азёрнай Цюханіі...

...Раўчук хіснуўся ўбок, завіўся пелькаю, так што амаль датыкнуўся на імгненне да самога сябе, млява, быццам нехаця, быццам насуперак уласнаму жаданню памяняць накірунак пацёк паўз зараснікі асакі далей, выпаўз на край поплаву.

Стужка запаволіла рух, з перасцярогаю азірнулася. Гукаў бубна, што колькі хвілін таму прабіліся кароткаю кананадаю ад паселішча, болей чутно не было, гэта яе канчаткова заспакоіла. Яна намацала хвастом грунт на дне раўчука, імкліва выпрасталася ўсім целам, узнялася па-над вадою. Глянула, бы ў люстэрка, на собскі адбітак, што невыразным ценем гайдануўся насустрач, і зноў апусцілася ў ваду.

Звычку гэтак глядзецца-прыхарошвацца, выгнуўшыся сярпом над паверхняю азярка ці ручая, яна займела нядаўна, калі пабачыла, як тое робяць падчас купання маладыя цюхі. Паспрабавала аднойчы зрабіць, як яны, і вось ужо не можа без таго, каб два-тры разы на дні не высунуцца з вады ды не зірнуць на сябе краем вока, а адначасна не прадэманстраваць наваколлю ды ўсяму свету някідкае сваё вугрынае хараство. І адно зараз толькі непакоіць яе: як паглядзіць на такое какецтва Стужык, ці не палічыць яе фліртаманкай? Чаго-чаго, а гэтага ёй, адмалку сур’ёзнай ды развaж-

най, менш за ўсё хацелася б. Але ж хіба дасі рады стрымліваецца, калі ўскалыхнутая неспадзеўным спатканнем душа так і мкнецца да паднебных вышыняў, а сэрца соладка ные ў прадчуванні новай сустрэчы з прыгажуном.

Яна праплыла колькі метраў па паверхні ручая, зноў выпрасталася, упетрыла пагляд у неба ў спадзеве пабачыць сузор'е Вялікага Каўша. Але дарэмна: угары, як і заўжды ў гэтую няпэўную і ціхую — ні цюшынага голасу, ні рыку жывёліны — пару паміж поўднем і надвячоркам, было пуста. Гэтаксама пуста, да вусцішу бясцюшна было і ў паселішчы. Адзінае, за што міжвольна зачапілася на імгненне яе вока, — сілуэт нейкай цюхі пры вакне адной з хат крыху воддаль ад берага. Але і ён неўзабаве знік, бо маладзіца, што ратавалася, відаць, гэткім чынам ад сонечных прамянёў, прыкрыла твар, а разам з ім і шыбіну газетай.

Яна пазыбалася яшчэ колькі хвілін на хвалях, не жадаючы паддавацца маркоце — з такім бы толькі і надалей ёй знацца горачкам, як гэтае бясцюшша! — апусцілася на збарозненае слімакамі, выгінаста-няроўнае, латаком, дно раўчука, паплыла ў накірунку лазні.

*Сартавальшчыца рыбы цюхаазёрненскага рыбалоўчага кааператыва «Мярэжа» Кіці Бубнач сядзела пры вакне, чытала «Навіны краю». Дакладней, рабіла выгляд, быццам чытае: навіны былі не новыя, ды і жахлівыя гісторыі пра вугроў, што ад нядаўна панадзіліся вандраваць па падворках паселішча, яе мала кранalі. Гэтаксама, як не кранaлі яе і радыёпаведамленні, што даносіліся з прыймача ў кухні і да драбніцаў нагадвалі гэтыя во, газетныя, што былі зараз перад вачыма. Каб яшчэ*

*не ведала яна, Кіці, скуль растуць вушы ў тых баек, то, можа, і іначай да іх ставілася, а так... А так куды больш займаў сёння яе глузды дымок па-над лазняю пры возеры, што ўсё танеў з кожнаю хвіляй і ўрэшце зусім знік, зліўся колерам з напаленым за дзень сонечнымі прамянямі паветрам. «І цяпер, калі сітуацыя вымагае... кожны мусіць... грамадзянскі абавязак кожнага цюхаазёрненца...» — працінаў слых віскляваты голас дыктаркі, і хісткая ваконная шыбіна падтаквала яму дробным, як згук дрогання колаў па бруку, трымценнем. Кіці паднялася, каб пайсці ў кухню ды выключыць радыё, але перадумала. Ат, няхай балбочуць, такой бяды, ні горача ні сцюдзёна каму ад іхняе балбатні! І зноў, каторы ўжо раз за апошнія паўгадзіны вярнулася ў думках да тых хвілін, калі ўзахвоцілася зранку памагаць Валеру ўходжвацца ў лазні.*

*Ён папрасіў — яна не адмовілася. Хаця і магла б, вунь колькі працы: усе балеі поўныя рыбы, адно паспявай даваць рады.Варыўня, кладоўка, падпол — усё занята папярэднімі ўловамі, ад паху рыбінага не прадыхнуць ужо. А маці, скватпныя вочы, у хаце не стыкаецца. Усё валачэ ды валачэ то пласкірку, то язя, то ліня, то падбірае драбязу за рыбаловамі, а то сама ўпражэцца разам з мужчынамі ў браднік. Хоць колькі тае моцы, сем дзесяткаў як-ніяк кабеціне, магла б ужо гэтак і не высільвацца. Магла б — ды не можа. Такі характар, пераняты ад продкаў-бубначоў ды замацаваны неабходнасцю рупнага штохвіліннага шчыравання па гаспадарцы. Во і шчыруе. Ды так, што нават на вышыванку сваю з радаводным дрэвам, якую нядаўна распачала і дзеля здабычы звестак для якой нават студэнта Люціка, унука старога Арцюха, за ўласны*

*кошт у няблізкі шлях у сталічны архіў «камандзіравала», ці не дарэшты забылася.*

*Кіці — мянушка, ашчасліві́ў ёю ўсё той жа Валер яшчэ перад тым, як матка выправіла яе ў горад вучыцца на кулінара. Быў то пік змагання цюхаазёрненцаў з андатрамі, што, як зараз во вугры, запаланілі тады, ніскуль узяўшыся і выпхнуўшы нават з азёраў ды рэк рэшту панішчаных яшчэ раней выдрыных ды бабрыных статкаў, і галава краёвай управы ваявода Амёлка, папярэднік цяперашняга, Амялы, выдаў загад вытруціць прыблудную нечысць, каб не нішчыла рыбу, з усіх вадаёмаў. Яшчэ той, памятаецца, быў час: доўбні не высыхалі ад крыві жывёлін, рулі стрэльбаў не паспявалі астываць у руках заўзятараў-паляўнічых. Падстрэшшы гнуліся ад выраблены́х ды нявырабленых андатравых шкурак, паўпадпольны гандаль імі, а разам і бубнамі (якое ж паляванне без іх) ішоў жвавенька. Паселішча кішэла перакупшчыкамі, дня не мінала без удалага торгу. Круцейшыя ды спраўнейшыя вачавідзь парабіліся яшчэ больш заможнымі, бедныя калі не раскашавалі, дык ад нішчымніцы не пакутавалі. Думалі, раю таму андатраваму не будзе канца. Быў яшчэ жывы, хоць і падупалы з-за хваробы нырак — зазімніўся ў пастарунку, куды трапіў па абвінавачанні ў супрацыве паляванню на андатраў, — бацька Кіці, гаспадарка пры дужых мужчынскіх руках квітнела, і матка, паддаўшыся моднаму павеву, выправіла і яе, адзіную дачку, у няблізкі горад следам за іншымі.*

*Атрымалася, аднак, чортведама што — такое, што і дасюль прыкра згадваць. Стрыечны брат аднай з аднагрупніц, увішны маладзён год пад трыццаць, што паклаў на Кіці вока падчас першае ж вечарыны ў інтэрнаце для іншагародніх, дзе яна,*

*вясковая шаснаццацігадовая дурнічка, асталявалася на час вучобы, глядзець дзеўкам у зубы звычкі не меў і вельмі хутка дамогся свайго. А праз паўгода, наталіўшы пажаду яе чыстым правінцыйным наівам і не сказаўшы ані слова на развітанне, адарыў гарохавым вянком — ажаніўся з другою.*

*Гэта быў першы ўдар, якім агаломшыў Кіці лёс. Ці то чаканая, ды ўсё адно, як заўжды гэта бывае, неспадзеўная бацькава смерць зрабіла той удар не такім балючым, ці то яшчэ што, але яго яна вытрымала даволі годна. Хоць, праўда, і не без сякіх-такіх выдаткаў у выглядзе слёз роспачы, ды ранняга недаверу да мужчынскае паловы чалавецтва, ды дачаснага, пад вохканні-прыпушчанні суседзяў — а што ж там здарылася ў тым горадзе? ці не згвалціў хто дзеўку? — вяртання ў роднае паселішча. На шчасце, яна тады не зацяжарыла: юрлівец аказаўся дасведчаным у такіх справах. Зрэшты, гэта тады так ёй здавалася, што на шчасце, ды насамрэч, пэўна, так і было яно на тую хвіліну, цяпер жа... Цяпер во і хацела б Кіці займець дзіця, а — не атрымліваецца. Быццам парушылася штосьці ў яе ўлонні пасля тае першае мужчынскае здрады. Быццам змерзлі ды ніяк не дадуць рады адтаяць усе тыя шляхі-праточкі, што вядуць да жаданага, ды прыпозненага і ўжо быццам і недасяжнага, як па сённяшнім дні, калі гэтак рана бяруцца маладыя шлюбам, законнага, а не якога-небудзь там байстручна-ўпотайнага мацярынства.*

*Гурт рыбаловаў з поўнымі торбамі здабычы пазаплеччу і бубнамі на шыях прайшоў пад несціханы сабачы брэх паўз вокны хат, рассеяўся па панадворках. Кіці паднялася з-за стала, уключыла тэлевізар. Пазелянелы ад шалу Робі Вільямс са стужкамі гадаўя, ні то вужак, ні то вугроў, што па-*

*самі вытыркаліся з ягонае прамежнасці, віхляў агаленым торсам перад вачыма пад бой бубнаў, блытаў дарэшты і без таго зблытаныя думкі Кіці.*

*Маці выйшла з істопкі з харугвай падпахай, якую ўжо каторы дзень то выварвала на пліце ў мядніцы, то зафарбоўвала згатаванаю з нейкага экзатычнага зелля фарбаю, дарэмна мкнучыся вытруціць з тканіны забаронены ваяводаваю ўправай знак-сімвал Божага Сына, выцерла аб фартух рукі, няўхвальна зіркнула на экран.*

*— Паскудства, — плюнула і ўзялася каторы раз за апошнія тры гадзіны наракаць на татальнае падзенне норавая. Панаракаўшы, перайшла да настальгічна-ўздыхлівых згадак пра тое, як было раней. Дапала чарговы раз да высновы, што было калісь, канечне ж, лепей, як цяпер, ды і выправілася на двор — ці то карміць гусей, ці то напінаць на чарговы абруч выпрабленую яшчэ за царом Гарохам сабачую скуру. Апантаная спадкаеміца справы патомных рамеснікаў-бубначоў, яна ўсё жыццё прысвяціла працы на фабрыцы па вырабе бубнаў. І цяпер, калі даўно ўжо і падмурку ад тае фабрыкі, лічы, не засталося, нібыта жадаючы апраўдаць прозвішча слаўных прашчураў, ад якога не адцуралася па шлюбе і нават перапанала мужа, каб даць яго дачцэ, не-не ды і вярталася, хоць як, хоць саматугам да любага сэрцу занятку. Кіці колькі разоў спрабавала адгаварыць старую ад пустой гэтай справы, але тая і слухаць не жадала. «Сваё ёсць сваё, — адказвала і здзекліва біла ўсохлымі косткамі пальцаў па імпартовым бубне.— Хіба ж гэта гук, ха-ха, з гэткім хіба што быдла пасвіць, ды і то калі нічога лепшага няма шака пад рукою!» І з яшчэ большым імпэтам пускалася ў расповеды пра працоўныя ды розныя іншыя по-*

*дзвігі далёкіх і не надта далёкіх продкаў-буб-
начоў.*

*Кіці зноў тыцнулася тварам у вакно, скіравала пагляд у бок лазні.*

*Валер стаяў пры дзвярах будыніны, закінуўшы за голаў рукі з парожнімі рэзгінамі, з якіх толькі што выкуліў бярэма прынесенага з хмызняку хлуду дзеля распалкі печы, лавіў тварам сонечныя прамяні. Затым павесіў рэзгіны на сцяну, няспешна-самавіта азірнуўся, адчыніў дзверы перадлазніка.*

*Сонца вызірнула з-за воблака, асвяціла паўрасчыненую дзверыну, затым пожню з тонкім, у таўшчыню дзвюх далоняў паскам раўчука, перакінулася на здратаванае — спрэс ніцыя бездапаможныя камельчыкі з парожнімі азызлымі струкамі — гарохавае поле, застыла распаленаю патэльняй над даляглядам.*

*Час быў і ёй, Кіці, вырушваць з хаты. Яна выйшла на двор, употайкі слізганула за дрывотню, прыціснулася плячыма да спарахнелае ад часу сцяны пунькі. Маці, відаць, пачула яе крокі, бо тут жа азірнулася, працяла паветра асіплым ад доўгага стаяння ў вадзе падчас учорашняе рыбнае лоўлі голасам:*

*— Кася, ты?*

*Кіці ўжо расчыніла рот, каб азвацца, бо маўчаць ніяк не выпадала, як узнялі галас узрушаныя матчынаю гаманою і мешанкаю з бацвіння і здробненых у жорнах ды абвараных збольшага ў рондалі на пліце рыбіных касцей гусі: бязладна загялдэкалі, забілі крыламі, быццам надумаліся ўзляцець.*

*Яна адарвалася ад сцяны, хаваючыся за кустоўем і з кожным крокам усё смялей топчучы ў сабе рэшту дзявочае (ах, калі яно тое было, дзявочае, і ці было наогул?) годнасці, што не-не ды і адзыва-*

*лася дзесьці глыбока ў чэраве дакорлівым ёканнем ці то сэрца, ці то ныцк, імкліва пакрочыла ў накірунку лазні.*

*Немаўля ў хаце суседзяў зайшлося плачам ёй услед, ды затрымала на імгненне пагляд у ручаіне пры каменнай загародцы ні то патарчака, ні то пасак ціны. Яна нахінулася, каб выхапіць той пасак з вады, але ён адхіснуўся ад рукі, з нечаканым спрытам жывое істоты шмыгануў прэч, стаіўся ў глеі між зараснікамі асакі. Кіці замёрла ў здранцвенні на хвіліну, асэнсоўваючы, што гэта было за дзіва, але хутка зноў прадоўжыла шлях. Такой неістотнай здалася ёй у параўнанні з хвілінамі асалоды ад блізкасці з Валерам, што чакала яе наперадзе, гэтая неспадзеўная прыгода, што яна нават не палічыла патрэбным тыцнуць пруцінаю ў месца, дзе схавалася вадзяная пачвара. Наблізілася да ўваходу ў перадлазнік, рашуча, ажно хруснулі пальцы, ірванула на сябе спэцканую сажаю ад Валеравых далоняў клямку дзіравае, спярэшчанае плямамі рудавата-шэрае цвілі дзверыны.*

Раўчук чарговы раз перавярнуўся вужакаю наўкола сябе, упёрся ў каменную загародку з вузкім, плыткім прагалкам пасярэдзіне. Стужка схамянулася, усё яшчэ поўная сполаху ад дотыку цюшыных пальцаў, калі тая паманулася схапіць яе, нырнула ў прагалак. Лазня было ўжо зусім блізка, і чым больш выразнымі рабіліся на тле кустоўя дачасна згнілыя ад блізкасці вады бясформенныя, грыбам, вянцы будыніны, тым большая ахоплівала яе цікаўнасць. Дым, што ад раніцы клубіўся па-над страхою лазні і белавата-шызым воблакам слаўся над возерам, даўно стаяў. Але тут, побач з уваходам у перадлазнік, да якога заставаліся ліча-

ныя метры, яшчэ адчуваўся яго іржава-металёвы ад распаленага камення, з дамешкам водару смаліцы пах. Ды яшчэ пах ледзь улоўнага, няпэўнага, як хісткі спакой, што ўрэшце запанаваў над наваколлем пасля трох дзён жаху, абяцання любошчаў-мілаванак — пах, які яна, Стужка, самотная цнатліўка, ніколі ні з якім іншым не зблытае.

Менавіта любошчаў, гэта яна, узброеная немалым досведам назірання за цюхамі ды ўзбуджаная ўчорашнім спатканнем са Стужыкам, інстынктыўна адчула яшчэ апоўдні, цікуючы са схову за цюхаю і цюхам-марудам, калі тыя насілі вёдрамі ў лазню ваду. Іх шматзначныя позіркі, жарстлівыя, нібыта неспадзеўныя дотыкі адно да аднаго, мройліва-ўтрапёныя ўсмешкі на тварах — усё так нагадвала ёй бачанае раней, падчас начных вандровак у паселішча, што і прыпушчаць штосьці іншае, апроч прэлюдыі любошчаў, у тых позірках-дотыках ды ўсмешках не выпадала.

Папраўдзе, самі мілаванкі цюхаў як акт зліцця двух ахопленых жарсцю целаў яе не надта цікавілі. Сышліся ён ды яна і цешацца адно адным — што тут такога? Не горш, але і не лепш, чым робяць тое ж, мілуюцца-кахаюцца, як прыспее час гону, на лузе пры азярку жарабец з жаробкаю, ці баран ды авечка, ці іншае быдла. Любошчы тубыльцаў цюхаў, насельнікаў Азёрнай Цюханіі, займаюць яе найперш таму, што хоць і чыняцца з перасцярогаю быць заспетымі падчас іх ды асуджанымі — вось жа дурноцце! — да сябе падобнымі, усё ж, у адрозненне ад астатняга, што яны робяць, маюць у сабе драбок разняволенасці. Гэта адзіны, бадай, бок іхняга існавання, дзе кожны пачуваецца збольшага гаспадаром самога сябе, а не так, як зазвычай: быццам трапіў у мярэжу і ніяк

не насмеліцца выкараскацца з яе без старонняга загаду. Ці не з гэтае прычыны дасюль віжаванкі па хатах паселішча і не страцілі для яе, Стужкі, прывабнасці і яна, ледзь з’яўляецца магчымасць, кідаецца, бы нырэц стоць галавою ў вір, у штораз ўсё больш небяспечную прыгоду. Смеху варта, але дайшло да таго, што дзеля іх, віжаванак, нават звыклы лад жыцця яна, насуперак вугрынай сваёй натуры, памяняла: уначы адпачывае, як цюхі, удзень — гойсае па наваколлі.

Упершыню яна стала міжвольнаю сведкай іх любошчаў, калі старая цюха зачэрпнула яе аднойчы сонную пры беразе вядром і занесла ў хату, дзе пяшчоцілася-кахалася за перабойкаю пры печы маладая пара. Відовішча было захапляльнае, ды занадта абрывістае. Занятая лушчэннем гароху старая ўвесь час сноўдала з гарнушкам па хаце, і маладзёну з маладзіцай нічога не заставалася, як прыхоўваць кожны раз, як толькі яна ўваходзіла, свой разбухлы, бы цэбар з брагаю ў закуцці, набрынялы пажадаю імпэт пад коўдрай. Скончылася тым, што абое ўскочылі дачасна з ложка, папілі па чарзе квартаю з вядра азёрнае вадзіцы, і старая (на шчасце, падслепаватая, а то б ці пажадала гэтак лёгка выпусціць з рук неспадзеўную здабычу) выплюхнула яе разам з рэштаю вады пад плот побач з раўчуком.

Тады, дарэчы, яна ўпершыню пачула гэтае дзіўнаватае, нязвыклае для вугрынага слыху слова — *цюх*. Так назвала каханка маладзіца, што падсуклечвала злавіць яе, Стужку, у раўчуку, а ён, недарэка, не даў рады злаўчыцца.

А найболей уразіў яе у той дзень крык цюханемаўляці. Роспачны, як погук неўспадзеў заспетае святлом савы, і лёгкі, як знячэўны подых вят-

рыска ў невыносна спякотлівы поўдзень, ён данёсся з суседняе хаты і так зачараваў-паланіў яе, што яна доўга-доўга яшчэ згадвала яго потым, па вяртанні ў азярко, ды, ахопленая раптоўнаю прагаю мацярынства, песціла ў памяці як найпрыгажэйшы з усіх, што даводзілася ёй чуць з цюшыных вуснаў. Было тое на пачатку лета. Несупынна ішлі дажджы, возера разлілося, і яна без цяжкасці вярнулася ад хаты ў яго, каб назаўтра зноў, цяпер ужо самахоць, з уласнага жадання пусціцца ўсё тым жа раўчуком у няблізкую, поўную неспадзянак выправу. Як гэтая во сённяшняя, рызыкоўная, бы паабедзенны спачынак пад носам у шчупака.

Цюха тым часам наблізілася да ўваходу ў будыніну, слізганула ў праём дзвярэй. Што яна зараз у лазні не адна, сумневу не было. Цюх-маруда незадоўга перад тым вярнуўся з кустоўя з рэзгінамі хлуду на плячах і больш на двор не выходзіў. Разы з два ляпнуў дзвярыма перадлазніка, высунуў вонкі голаў, быццам правяраў, ці не ідзе хто яшчэ, ды і суцішыўся, агалошваючы зрэдчасу паўсоннае наваколле нягучным спевам.

Раўчук выцякаў акурат з-пад ніжняга вянца лазні, і Стужка хуценька — заспее хто, не абярэшся тады клопату ўцякаць — хіснулася пад яго. Прабралася паўз вузенькі праём між бэлек унутр будынка, стаілася ў запоўненай вадою, напалову асветленай агніскам ліхтара сцёкавай выемцы побач з печчу.

Цюх-маруда ляжаў дагары на шырокім, даўгім палку насупраць запятага фіранкаю вакенца, то ўтрапёна чухаў далонню грудзі, то пагладжваў цягліцы жывата. Яго вялікае, з кропелькамі пару на грудзіне цела ўздрыгвала, быццам ад холаду, натомленыя ўзбуджэннем вочы з набраклымі ці то

ад пажады, ці то ад гарачыні павекамі раз-пораз саслізгвалі са столі, застывалі на ўзроўні дзвярэй перадлазніка.

Дзверы адчыніліся, увайшла, прапусціўшы паперад сябе віхлясты даўгі цень, цюха. Схілілася ў нерашучасці над дзяжою з зімнай вадой, быццам няпэўная, ці ўсё робіць як след, плюхнула конаўкаю вады на каменне, пачала борзда наліваць яе пад абуранае сіпенне патрывожанай перападам тэмпературы печы ў ражку. Цюх-маруда варухнуўся, упетрыўся паглядам у яе белае, з ружова-рудаватымі кружкамі наўкола смочкаў цела, выцягнуў наперад рукі.

— Хадзі, — сказаў нібы загадаў і перавярнуўся да цюхі жыватом, дэманструючы шворанчык паўсталае самечае годнасці ў аздобе кучаравага, з смаляна-попельным адценнем валосся. Дошкі палка гучна рыпнулі, яшчэ больш угнуліся пад цяжарам ягонага мускулістага, налітага моцай і рашучасцю торса.

Цюха кінула конаўку, хіснулася да яго. Правяла далонню па цюхавай грудзіне, абыякава, быццам штодня выпадала ёй ды вось і надакучыла тое рабіць, шмарганула пальцамі па жываце. Цюх-маруда падхапіўся з палка, схапіў яе аберуч за пояс, кінуў ніцма на месца, дзе сам толькі што ляжаў. Затым падумаў з хвіліну, быццам прымерваўся, ці зручна гэтак ім будзе мілавацца, перавярнуў пад пагрозлівае рыпенне палка абмяклую ад ягоных грубавата-трапяткіх дотыкаў цюху на спіну. Яна выпрастала рукі, каб прыцягнуць цюха-маруду да сябе, і доўга чакаць ёй не давялося. Яны зліліся ў абдоймах, іх скрыжаваныя, разамлелыя ад гарачыні целы павольна затаргаліся ва ўнісон адно аднаму. Так працягвалася даволі доўга.

Цюх-маруда апрытомнеў першы. Пасунуўся ўбок, замёр у здранцвенні на краі палка.

— Мне б нарадзіць, — сцішана-пяшчотным і адначасна нейкім безнадзейным голасам прамовіла цюха і ўчапілася пальцамі каханку ў валасы на патыліцы.

— Што-што? — азваўся ён няўцямна і прыўзняў голаў. — Нарадзіць? Яшчэ што выдумай! Ага! Надумалася!

— Мне не семнаццаць, не забывайся, — дакорліва сказала яна і абхапіла цюха-маруду за шыю. — Мужчыну гэтага не зразумець. — Яе пагляд упаў на выемку-лужыну пры печы, і зрэнкі яе расшырыліся ад сполаху і агіды. — Фу, гадзіна! І тут іх поўна! Фу!

Пагрозліва-зласлівыя ноткі ў голасе цюхі нічога добрага не абяцалі. Стужка хіснулася ўбок, бліжэй да пафарбаванай у брудна-жоўты колер печы, каб як меней быць прыкметнаю, стаілася ў чаканні, што будзе далей.

— Пра што гэта ты? — спанталічаны зласлівасцю сяброўкі, спытаў цюх.

— Пра вугроў, — адказала яна, працягваючы пільна ўглядацца з-пад цюхавай рукі ў Стужчын бок. Конаўка варухнулася на краі палка ад дотыку яе нагі, зачапіла паўстлелую ад пастаяннай вільгаці фіранку на шыбіне, паляцела тарчма ў ражку. Фіранка глуха шорхнула цвічком па сцяне, апала долу, бездапаможнаю анучай павісла ўздоўж сцяны на тонкай, ледзь бачнай у прыцемку нітцы. Цюха прыўзнялася, каб зноў запяць вакно, і зноў яе пагляд свідрануў выемку. — Гадаўё! Ненавіджу!

— Таго лёгка ненавідзець, каго не разумееш, — сказаў цюх абыякава і саскочыў з палка.

Трэба было ратавацца.

Стужка нырнула ў глыб выемкі, з яе, не марудзячы ні хвіліны — чорт ведае, што ў малодкі наўме, — шмыганула пад бэльку і праз хвіліну была на дварэ.

Падлетак год трынаццаці стаяў ля вакна лазні, захоплены відовішчам, што адкрывалася вачам паўз фіранку, жэстамі падзываў да сябе, клікаў у хаўруснікі-падглядчыкі другога, меншага, які таптаўся ў нерашучасці воддаль.

Стужка апусцілася на дно раўчука, хутка, як толькі магла, паплыла да возера. Плыла і згадвала зноў і зноў словы цюхі, калі тая ўбачыла яе ў яміне, ды яе скажоны нянавісцю, збялелы твар.

Надзіва, ніякіх пачуццяў наўзаем тыя згадкі ў яе не выклікалі. Нішто, апроч незразумелай трывогі, што чарговы раз хваляю паднялася з чэрава і стаяла ў развярэджаных сцэнаю ў лазні глуздах, ды жадання як хутчэй, вось хоць зараз, гэтае ж хвіліны пабачыць Стужыка, яе не турбавала.

Яна з асалодаю кульнулася ў атуленае вечаровым змрокам возера, унікаючы ўлюбёных месцаў палявання шчупака, падплыла бліжэй да віру, здранцвелаю пруцінай застыла паміж глеем і аброслым цінаю ісподам каменя.

*Кіці выслізнула ў перадлазнік, намацала ў цемры вопратку. Прыслухалася: наўкола было ціха, толькі ўсплёск вады за спінаю — Валер працягваў астуджаць разгарачанае любошчамі цела — ды ледзь улоўныя, ні то шэпт, ні то пошум ветру, гукі даносіліся знадворку. Яна рэзка расчыніла дзверы і ў сполаху адхіснулася назад: двое падшыванцаў плюшчылі насы аб шыбіну, віжавалі пры вакенцы лазні. Убачылі яе голую ў праёме, з гучным, ажно дзвэнкнула ў яе ўвушшу, рогатам кінуліся прэч.*

*На хвіліну Кіці быццам скамянела, вусціш ахапіў яе. Гэткае яшчэ не хапала ёй турботы! Разнясуць па паселішчы, што бачылі тут, а бачылі ж, пэўна, нямала, і адмывайся тады ад плётак, даводзь кожнаму, што не шлэнда. Яна ступіла назад у прыцемак перадлазніка, хіснулася да Валера. Той усё яшчэ плёскаўся пасярод лазні, ліў ды ліў на голаў конаўкаю з ражкі зімную ваду, ды фыркаў, ды крактаў ад задавальнення пад прахалоднымі струменямі.*

*— Ну, што, яшчэ, можа, наастатак пабавімся? — спытаў і паклаў руку ёй на клуб. — Бог тройцу любіць, ці не так?*

*Кіці адняла руку, рашуча, аж ён зніякавеў на хвіліну, адпіхнула каханка ад сябе.*

*— Перастань, дурыла! Пры вакне хтось быў, расплявузгаюць па наваколлі...*

*— Такой бяды! — хмыкнуў Валер і жартам лінуў ёй з ражкі на лыткі рэшту вады. — Падумаеш — расплявузгаюць... Глупства!*

*— Табе — канечне, глупства! А мне? Падумаў пра гэта?*

*Валер незадаволена перасмыкнуў вуснамі, агаляючы шыхт белых, бы цукар, і дробных, як у драпежнай рыбіны, зубоў.*

*— Дык што цяпер — шукаць іх, бегчы наўздагон на скрут галавы? Пазнала хоць каторага?*

*— Аднаго пазнала. Вартаўніка з гарохавага поля сынок. Смаркач, з жанчынамі мыцца ў лазню ходзіць. На палок ляжа, цацку вытыркне ў шчэлку між дошкамі і гайдае, пакуль каторая з баб не абурыцца.*

*— То ўжо лягчэй, як пазнала. Прыпужнуць, ды і ўсяе справы...*

*— Ты прыпужнеш, анягож. — Кіці ірванула да сябе ражку, тая з грукатам паляцела прэч, зака-*

*цілася пад палок. — Не лезь, сама дам рады. Тут з розумам трэба, з падыходам, а не абы-як. Каб карысць была...*

*— Ну, глядзі, мне што...*

*— Яшчэ во...*

*— Што?*

*— Тое, што казала ўжо... Гэтыя вугры... скрозь гойсаюць, ратунку няма, хутка кроку не ступіш, каб не натыкнуцца на каторага. Павар'яцелі, няйначай, перад адплыццём да свайго мора Сяродморскага. Перагарадзіў бы ты ручай... На поплаве, дзе найвузей, можна лёгка перагарадзіць каменнем. Ці жвірам хаця б закідаць.*

*— Менш байкі трэба слухаць. — Валер абхапіў яе за стан, памкнуўся прыціснуць да сцяны. — Вугры! Ты бачыла хоць аднаго дзе-небудзь, апроч матні ці балеі? Бачыла?*

*— А то не! Во хоць бы тут... — Кіці паспрабавала вызваліцца, але Валер не пусціў яе, абдаў пахам не выбітага дарэшты параю перагару:*

*— Дзе?*

*— А вось тут! — паказала яна на выемку збоч ніжняга вянца.*

*— Нікога тут няма! Дурніца!*

*— То, мабыць, уцёк, — сказала яна і пасунулася зноў у перадлазнік.*

*Валер незадаволена хмыкнуў, пайшоў следам за ёю.*

*— Ну, хіба што так, — прамовіў і, ахоплены новым прылівам пажады ды прагай як хутчэй спатоліць яе, памануўся паваліць Кіці ніцма на лаву з вяхоткамі і скарыстанымі венікамі ды гурбаю зжоўклых «Навінаў краю» для распальвання печы.*

*— Пусці! — крыкнула яна і з выразам неўдаванае злосці на твары замахнулася на яго апалкам,*

*які паспела выхапіць з-пад лавы. — Не чапай! Хопіць!*

*— Вар'ятка, — сказаў ён і пачаў нехаця апранацца.*

*Калі яны выйшлі, урэшце, з лазні, расчырванелае сонца хавалася за кустоўем. Валер прапанаваў падвезці яе дахаты на ровары, але Кіці адмовілася: лепш вяртацца ў паселішча паасобку, меней будзе плётак. Вольныя то вольныя яны абое, ды каму тут, у паселішчы, у гэтай ні то вёсцы, ні то гэпэ, дзе кожны крок кожнага навідавоку, дзе кожны ведае, колькі разоў і чым сусед у нужнік схадзіў, тое абыходзіць?*

*Яна счакала, пакуль Валер ад'едзецца на ладную адлегласць, рашуча пакрочыла сцежкаю да хаты вартаўніка.*

Дзень ваўсю ўжо шчыраваў над возерам, а Стужка ўсё адпачывала. Не тое каб стома даймала яе — не, хутчэй, абыякавасць, што прысунулася неўпрыкмет на змену ўзбуджэнню і трымала, трымала пры сабе ды адпускала на якую хвіліну толькі дзеля таго, каб даць мажлівасць упэўніцца, што небяспека ніадкуль не пагражае, ды дазволіць і надалей біць брынды. Упершыню за апошні час яна хавалася не ў звыклым сваім схроне — нератку, а ў выпадковым месцы. Але ж колькі можна рызыкаваць жыццём?

Яна праціснулася паўз трыснёг, бясшумна — крый лёс узбіцца на драпежніка — слізганула ў нераток.

У гэтым дзіравper dзіравым — 

заўся ў нератку і нагадваў з абрысаў сузор'е Вялікага Каўша на небе, было, папраўдзе, цеснавата, затое даволі бяспечна. Даволі, ды не дарэшты, так што асцярожнасць ніколі не залішняя.

Яна натыкнулася на нераток з месяц таму, уцякаючы ад шчупака. А цяпер во ратуецца ў ім ад рыбаловаў. Нераток — яе надзейнейшы абаронца ад непамыснотаў азёрнага жыцця, яго яна пільнуецца штохвіліны і пакідае толькі дзеля таго, каб падсілкавацца. Звычайна пакідае надвечар, калі ўсё наўкола аціхае. Ці на золаку, калі вада яшчэ зімнаватая і бязлітасныя браднікі ды сеткі ціхамірна спачываюць на пожні пры беразе ў чаканні чарговага лову-палявання. Найлепш, канечне, было б зашывацца ў глей. Але дно ў віры так засмечана розным ламаччам, што лепш туды не совацца.

Паляванне пачалося пасля таго, як статак гусей выдратаваў чарговую надзею эканамічнай бяспекі краю — гарохавае поле. Патрава здарылася сярэдначы. На дасвецці дажджом гусіныя сляды змыла, і цюхі-дазорцы, якія нічога не бачылі, бо напярэдадні перапіліся гарам і ноч правялі ў пахмеллі, падалі начальству, што ўвесь гэты рэзрух на полі — справа вугроў. Маўляў, павыпаўзала гадаўё з возера падкарміцца гарохам ды і панішчыла ўраджай, шнарачы ў пошуку лепшых струкоў. Даследчыкі міграцый вугроў пры ўправе ваяводы выказалі здагадку, што, хутчэй за ўсё, не абышлося без змыслу іншаземных варожых сілаў. Версію падхапілі газетчыкі, з іх лёгкай рукі натхніцелькай дыверсіі была названая даўняя непрыяцелька Азёрнай Цюханіі і асабіста ваяводы Амялы Цюханія Прыморская, краіна-вытворца бобу паблізу мора Сяродморскага, ад берагоў якой

нібыта апрацаваныя адпаведнымі службамі вугры, як колісь андатры, і прыплываюць на тутэйшыя рэкі ды азёры. Выяву вугра тэрмінова замянілі на дзяржаўным сцягу на выяву гарохавага струка, арцель «Футра» перайменавалі ў «Мярэжу», а імя Бога-Сына на харугвах і крыжах мясцовых святыняў, а таксама на строях святароў ды на абразах, каб і напаміну не засталося пра рыбінае яго паходжанне, вытруцілі ці зафарбавалі балотна-зялёнаю, пад колер спелага гароху, фарбаю. Управу «Рыбанагляду» перарабілі на «Краёвы Штаб Рыбалова», аб'явілі ўсеагульную мабілізацыю. Усіх без вынятку, хто мог хоць збольшага рухацца, нават стогадовых дзядкоў і нямоглых бабуляў пазвозілі з невадамі, венцерамі, восцямі і іншым рыбалоўскім начыннем да возера, загадалі пад бой бубнаў выпужваць са спратаў ды вылоўліваць гадападобных, а нязгодных адзначыцца ў справе абавязалі пад пагрозаю пакарання ў трохдзённы тэрмін памяняць разуменне патрыятычнага абавязку грамадзяніна Азёрнай Цюханіі.

Пра ўсё гэта яна, Стужка, даведалася з размовы (разумець гаману цюхаў яна збольшага навучылася падчас усё тых жа вандровак у паселішча) дваіх рыбаловаў. І з таго часу і залягла ў схове і вымыкаецца з яго толькі ў выпадку крайняе патрэбы. Тады, калі аціхае, праглынутае туманом, апошняе рэха гукаў бубна, а натомленыя рупнаю працаю мабілізанты з поўнымі торбамі здабычы спяшаюцца прэч ад гэтага тхланістага, шчодрага на нездароўе касцей ды іншых частак далікатнага цюшынага цела месца. Ці ў гэткі во час сутак, як зараз, апоўдні, калі яшчэ не перастаюць прабівацца на дно азярка паўз лістоту альхоўя прамяні сонца, але лапік жвіру наўзбоч патарчакі пася-

род тоні, дзе найбольш рачкоў ды малюскаў, ужо цямнее і можна дарэшты зліцца з яго няясным, няпэўнага колеру фонам. Або — тады яшчэ бяспечней — апоўначы. Не надта шыкоўна, бо небяспека небяспекаю, а есці заўжды хочацца.

Напамін пра харч канчаткова змінорыў і без таго мінорны Стужчын настрой: жамяры з кожным днём меней і меней наўкола, бо восень, лічы, на дварэ, і ў лепшыя часы, калі і вада, памятаецца, была куды чысцейшая, не тое што цяпер, — не самая ўежная пара года. Аднае радасці застаецца, што вусені ручайнікаў ды каляныя вадамеркі ў зарасніку аеру ўсцяж берага. А тут яшчэ пільнуйся, каб самой не стаць ахвяраю злыдуха шчупака. Толькі злаўчышся што-нішто ўхапіць, каб паласавацца, як ён ужо тут як тут. Вунь учора ледзь паспела схавацца ў нератку, гэтак нечакана вымкнуўся з-за плескача.

Велізарны, жаўтабрухі, заўжды гатовы да нападу шчупак у суправаджэнні адданейшага свайго клеўрэта акуня праплыў над нератком, стаіўся цьмяным прывідам сярод аеру ў чаканні спажывы. Стужка асцярожна шмыганула пад друшляк, зашылася ў глей. Заінтрыгаваны каламутаю шчупак падплыў да нератка, але соваць пысу ўсярэдзіну не наважыўся. Пакружляў колькі часу з абыякавым выглядам наўкола і знік.

Гаспадарок! Усё, што можна, прыбраў пад сябе ў гэтай бруднай яміне. Адно і клопату — праглынуць што-кольвек, набіць вантробы. Але лёгка быць героем, калі ўсе наўкола цябе баяцца. А паглядзець бы на ягонае геройства дзе-небудзь у акіяне, дзе ні каменьчыка табе, каб схавацца, ні аерыны на сотні вёрст — толькі вада, вада ды чароды гэткіх во, як сам, хцівых ненажэраў.

Акіян... Хоць вось ужо амаль восем год прамінула, як яна паднялася ценькаю ларваю* з яго дна, дзе бацькі пусцілі на свет, а дасюль памятае і водар таго дна, і салёны прысмак вады, і шмат што яшчэ, што не-не ды і ўсплыве ў памяці, напоўніць чуллівае рыбіна сэрца скрухаю і надзеяй.

Як неспадзеўна завітала яна, надзея, надоечы зніадкуль, як перавярнула ўвобміг звыклую ходу жыцця. Вугрык той, Стужык, пэўна, і не здагадваецца, якую буру эмоцый унёс у яе ціхаплыннае існаванне сваім нечаканым з'яўленнем. Цэрануўся аб бок, перавярнуўся ды і знік, як растаў, як і не было яго. Знік, і што, як болей не пажадае прыплысці? Гэтулькі вугрых-красуняў наўкола, завабіць каторая — і бывай, прывіднае шчасце! Тады адзіны застанецца ёй, Стужцы, спадзеў — на выпадковую сустрэчу пры скаце ў мора на шляху да нерасцілішча. Калі, вядома, не ахмурыць к таму часу маладзёнчыка спрытнейшая.

Стары лінь высунуўся з глею, пазяхнуў і зноў схаваўся ў нары. Небарака! Нават цюхі-тубыльцы, далёка не выбрэды і не гурманы, пужаюцца ягонай хваробы. Падсекшы на вуду, як хутчэй імкнуцца пазбавіцца, напалоханыя страхавітымі наростамі паразітаў на тлустым целе. Якой толькі трасцы не прыдумала прырода на бедную рыбіну!

Ды няма ўсё ж такі пошасці найнярыбшай за рыбажэрства. Асабліва ў акіяне, дзе, куды ні кінь вокам, — скрозь канібалы, сёй-той і дзіцем уласным не пагрэбуе падсілкавацца. Не кажучы ўжо пра баракудаў ды розных іншых страшыдлаў кшталту акулаў. Апошніх з каптуром нагледзелася яна,

* Ларва — малёнак вугра даўжынёй каля 5 мм адразу па вылупленні з ікрынкі.

плывучы восем год таму, падхопленая цёплым марскім цячэннем, у ціхае гэтае, парослае лілеямі ды аерам азярко. І хоць была тады амаль немаўлём, як цяпер памятае жудасныя сцэны расправы зубатых забойцаў з бязвіннымі кіцянятамі. А яшчэ — спакутаваныя вочы матак кіціх, што, нягледзячы на аграмадны свой памер, не далі рады памагчы дзіцяці пазбегнуць страшнога фіналу.

І ўсё-ткі гэткае пакоры ўціску слабейшых, як тут, у возеры, у акіяне не было. Можа, таму што абшары там непараўнальна большыя? Слабыя заўжды збіваліся ў хаўрусы, і гэта памагала ім выжыць. Не ўсім, вядома, ды хоць колькі асобін ратавалася. Іншая рэч, што як толькі небяспека мінала, учорашнія хаўруснікі спакваля рабіліся ахвярамі зламысніцтва адзін аднаго. Несупынныя, бясконцыя, як марскія нетры, сваркі-звады за лепшае месца ў тых нетрах, у якіх заўжды перамагаў больш спрытны і нахабны, нямала псавалі крыві найбольш далікатным. А нярэдка служылі кепскую службу і ўсяму статку. Ды ўсё адно дух братэрства там адчуваўся выяўней.

Тут жа, у возеры, дзе драпежнікаў нашмат меней, як гэта ні дзіўна, усё, нават смерць куды больш дакладна рэгламентаваная, як у моры ці ў акіяне. Найчасцей небяспека, вядома, зыходзіць ад цюхаў, што не-не ды і аб'яўяць вайну чарговаму водна-падводнаму ворагу. Толькі на яе, Стужкі, памяці колькі іх, такіх войнаў, было ўсчата: то супраць выдраў, то супраць баброў, то супраць андатраў... І што найбольш уражвае падчас іх, дык гэта зацятасць, з якою, насуперак здароваму сэнсу, нішчыцца тымі ж цюхамі ўсё жывое. Быццам яны апошнюю хвілю жывуць пры гэтых рэках і азёрах і суворыя законы выжывання ніколі не запатрабу-

юць ад іх у прышласці расплаты за неашчаднае, бяздумнае ўчорашняе.

Але, што праўда, і законы выжывання сярод сваіх не меней жорсткія. Азёрная прастора такая абмежаваная, што, як ні мкніся пазбегнуць пасткі, рана ці позна галодная шчупакова ці акунёва пашча дагоніць. Хто-хто, а гэтыя двое гарбузавацца ўмеюць. Так дасканала ўсё разлічаць, так выразна акрэсляць-падзеляць міжсобку — часцей за ўсё праз пагрозу малёнкам — абсягі палявання, што астатнім рыбкам нічога не застаецца, як дагаджаць абодвум.

Асабліва кепска ўзімку, калі возера зацягваецца лёдам. Усё тады ўвобміг вузее, цяснее, і ні да берага табе хіснуцца, уцякаючы ад драпежніка, ні па-над вадою скочыць. Добра тым, што з першымі прымаразкамі залягаюць па вірах. І куды горай таму, хто, як яна, Стужка, да такога ладу жыцця не прызвычаены. Адзіны паратунак такім застаецца — не страчваць ні на хвілю пільнасці. Ды — рыбаловы, што цягаюць тых самых шчупакоў ды акунёў сотнямі, бо нікога іншага ні адзін, ні другі, на бяду сабе, да прынады не падпусцяць. А яшчэ — пара веснавога паводка, калі возера выходзіць з берагоў і можна вольна гойсаць па залітых талінай поплавах, а то і, як пашанцуе, пераплысці раўчуком у суседняе, менш заселенае хціўцамі азярко. Праўда, у такім выпадку заўсёды ёсць рызыка захраснуць на водмелі і назаўжды скласці на ёй косці. Але гэта, пэўна, не горш, чым скончыць сваё існаванне ў нечых смуродных, прапахлых тхлінаю вантробах.

*Кіці ўскуліла на пас транспарцёра балею з рыбай, уздыхнула з палёгкаю: апошняя, можна неўза-*

*баве збірацца дахаты. Агрэгат рыпнуў паржавелымі дэталямі, скрануўся з месца, павольна пасунуўся да вакенца прыёмніка. Стрэлка гадзінніка на сцяне крэкнула яму наўздагон, тарганулася, быццам няпэўная, ці варта рухацца далей, замёрла на лічбе «пяць». Кіці пацягнулася заплылым ад доўгага стаяння пры балеях целам, узялася прыбіраць сталы. Настрой быў амаль святочны, адзінае, што крыху яго мінорыла, — асцярога, што, крый Бог, падпсуюць, чаго добрага, маліну рыбаловы. Прыцягнуць пры канцы змены пуд, а то і два драбязы, і хоцькі-няхоцькі даводзь яе да ладу. Як чатыры дні таму, напярэдадні ўсяго гэтага вар'яцтва з паляваннем на вугроў. Толькі паспела тады збольшага пасартаваць прынесенае ўранні, як Валер з хаўруснікамі прывалаклі яшчэ. Добра, Панурчык не адмовіўся памагчы, а то б і да поўначы, пэўна, праміТрэнжылася пры збрыдзелых балеях.*

*Панурчык — не тое што балбатун Валер, іншага гатунку чалавек. Зацяты, маўклівы, дарэмна слова не вымавіць. Але ўжо затое і як зацісне дзе ў куце — хочаш не хочаш заякочаш. У той вечар і не заўважыла, як завабіў у канюшыну збоч гарохавага поля. Кось-кось ды ў аглоблі, апамятацца не паспела, гэтак спраўна перакуліў яе на дол. Па ўсім рукою мац яна па нізе жывата, а там нібыта смаркачы. Абачлівы дзяцюк, дарма што з выгляду разявака.*

*Прыгода тая надоўга ім абаім, і ёй, і Панурчыку, запомніцца — з-за гусей. Наляцелі немаведама скуль на поле і давай балявацъ. Розгалас пад неба сягаў ад іхняга гергетання, а вартаўнікі не ўчулі, гэтак звечара начыміргесіліся. Прачнуліся ўранні — і ва ўправу. Маўляў, вугры паначы павыходзілі з возера і во што нарабілі. Яна, як пачула тое*

*ўсё, ледзь не памерла ад смеху. Хацела ўсё распавесці дазнаўцам, як было, ды ўчасна стрымалася: пачнуць высвятляць, што ды як, з кім была і навошта, — з галавою сябе патопіш. Змаўчала, а цяпер во, аказалася, і дарэчы было маўчанне. Хай толькі ляпне каму недаростак вартаўнікоў пра забаву яе з Валерам у лазні — яна і падторкне бацьку тым, сп'яну ім прытрызненым. Канечне, вугроў шкада. Ды ўсіх не нашкадуешся, свая кашуля бліжэй да цела.*

*Яна вярнулася да стала, прыслухалася. Знадворку не даносілася ні гуку, апроч аддаленага бомкання бубна, — гэта яшчэ больш яе ўсцешыла. Толькі ж бы прыйшоў да возера, як дамаўляліся, Панурчык. Абы прыйшоў, а ўжо распажадзіць яго яна дасць рады.*

*Нешта шаснула ў калідоры і аціхла, быццам хто віжаваў пры дзвярах. Кіці хіснулася да дзвярэй, трымаючы напагатове дошку для разбірання рыбы, расчыніла іх.*

*У калідоры нікога не было, толькі ў вузкім праёме між дзвюма парожнімі балеямі свяцілася пара кашэчых вачэй. «Ты, Драмадэр?» — гукнула яна і схапіла ката за шкірку. Шпурнула ў камору і тут жа хуценька зачыніла зноў за сабою дзверыну. Кот незадаволена мяўкнуў, скочыў, відаць, на паліцу з начыннем, бо тае ж хвіліны дзвэнкнулі, пасыпаліся на дол бляшанкі для кансерваў.*

*Кіці ў задуменні прыхінулася плячыма да вушака. Жыццё! Так во і праміне наўзбоч — сярод скрынак, ды бляшанак, ды адвечнага рыбінага смуроду. Рукі згрубеюць, твар абсіверае, зробіцца чырвоным, як у большасці тутэйшых жанок, цела раздасца ўшыркі — жах! Пару яшчэ гадоў — і каму будзеш патрэбная, застанешся да скону адна, бы гарох*

*пры дарозе — нічый, хто захацеў, той і вылушчыў-паласаваўся. І што карысці будзе перад кім фанабэрыцца тымі васьмю пашанотнымі каленамі продкаў з матчынай вышыванкі, калі сваё адно не дасі рады давесці да ладу, як патрабуе таго прырода.*

*Балея пры канцы транспарцёра ўсё яшчэ гайдалася на пасе пры вакенцы прыёмніка, дзе павінна была пераняць яе, ды чамусьці не спяшалася пераймаць развядзёнка Ядзя, і яе роспачлівы піск раз-пораз агалошваў праніцаную дарэшты рыбіным пахам прастору памяшкання. Кіці выключыла агрэгат, падалася да вакенца.*

*На тым баку прыёмніка было нязвыкла ціха, але з бытоўкі пры канцы калідора даносіліся гукі — мабыць, там працаваў тэлевізар. Кіці зазірнула ў пакой: ён быў пусты. Голас дыктаркі, якую ажно, здаецца, распірала ад жадання як мага далей пабыць на экране ў ролі штатнага абвінаваўцы вугрынага племя, рэхам разносіўся па пакоі, то ўзмываў пад столь, то тонкім пафасным дыскантам губляўся ў праходзе паміж закратаваным вакном і шыхтам запоўненых рыбаю балеяў.*

*— Ядзя! — гукнула Кіці рэзкім голасам і азірнулася.*

*Жаночая галава з перахопленымі ўдолушкі гумкай бігудзямі высунулася з-за занавескі, што аддзяляла гасцявую частку бытоўкі ад раздзявальні, дзе стаяла канапа, і зноў схавалася, збянтэжаная яе нечаканым прыходам.*

*— Ты, Каська? Так ціха ўвайшла, я не пачула нават...*

*— Дзверы трэба зашчапляць ды тэлек выключаць, — сказала яна і казытнула пазногцем голую мужчынскую пяту, што неўпрыкмет вытыркну-*

*лася, як толькі яны загаманілі з Ядзяю, з-пад занавескі.*

*— Чула я, свята новае, Дзень Бубна, ваявода абвясціў, праўда гэта? — памкнулася перавесці размову на іншае жанчына. — Цікава ж, ці будуць хто з нашых на яго запрошаныя?*

*— Будуць, а як жа: усе блядзі, апроч Ядзі, — ледзь стрымліваючы злосць, найперш — на Валера, што гэтак утульна ўладкаваўся на канапе побач з прыёмшчыцай і нават не парупіўся пры гэтым прыхаваць падалей ад старонняга вока густа аблепленыя глеем ногі, адрэзала Кіці і падалася да выхаду.*

*Ядзя штосьці жэкнула ёй у адказ на абразу, але што — яна ўжо не чула. Борзда, як ашпараная, выбегла на двор, адтуль краем поплаву, што ўпіраўся акурат у лазняк пры самым беразе, падалася да возера. І чым імклівей набліжалася да вады, тым больш прытупляўся, глушэў сярод хваляў узбуджэння чарвячок крыўды на здрадніка Валера і ўрэшце зусім змізарнеў, счэзнуў пад ціскам прысмаку чарговае любоўнае прыгоды.*

Вада гайданулася ад берага, імкліваю хваляю прабегла па паверхні. Чарада плотак-сяголетак вымкнулася з-за каменя, рынулася да берага, дзе заўжды з таго часу, як упобачкі з возерам пабудавалі гаргару з трубою — цюхі называлі яе цэхам, — можна было знайсці сёе-тое на спажыву.

Стужка выслізнула са схрону, звіваючыся ўсё яшчэ неслухмяным спрасоння целам, падалася следам за чарадою.

Распалавіненая паверхняю вады на ўзроўні пояса цюха, тая самая, што надоечы была з цюхаммарудам у лазні, стаяла ў заточцы, прыкрыўшы адною рукою саромнае месца і пазіраючы раз-по-

раз на ўласны адбітак у вадзе, пальцамі другой распраствала даўгія, разбэрсаныя па плячах і грудзях валасы. Час ад часу яна мяняла рукі, і тады лона агалялася, і маладзіца похапліва прысядала, хавала яго між ружовых і чыстых, як скура маладой рыбіны, складак жывата, і валасы яе, падхопленыя хваляю, тонкім багавіннем рассыпаліся наўкола стану. Плоткі кружыліся ля яе ног, тут жа таўклася, весела корпалася ў разварушаным глеі стайка растлусцелых за лета курмялёў.

Ад берага пачуўся ўсплёск. Пара стаўбунаватых, жылістых, бы карэнне прыбярэжнае вербалозіны лытак ступіла ў ваду, пачала павольна набліжацца да цюхі.

Цела цюхі страпянулася, рукі нервова тарганuліся да трохкутніка між ног.

Пануры, бы прыбіты неймаверным одумам малады цюх падышоў зусім блізка да яе, так што яго ўзняты фалас упёрся ёй у жывот, рэзкім — каб каліва табе пяшчоты! — рухам разняў ногі, паклаў далонь на лона. Яна адступіла крок назад, па целе яе прабегла хваля дрыжыкаў. Цюх-панурчык абшчаперыў яе абедзвюма рукамі за клубы, штомоцы прыхінуў да сябе. Цюха застагнала, бездапаможнаю капою павісла на дужых яго, са шнарамі ніжэй локцяў руках. Кончыкі яе валасоў, якія яна гэтак старанна перад гэтым прыгладжвала, зноў збіліся ў бязладную гурму, затрапяталіся на паверхні вады. Плоткі з разяўленымі ртамі замітусіліся наўкола пары, то падплывалі зусім блізка, то порстка рассыпаліся ўбакі.

Стужка адплыла воддаль, стаілася ў ціне паблізу нератка. Гульня пары навіною для яе, у адрозненне ад плотак, не была. Гэткую яна аднойчы бачыла падчас усё той жа вандроўкі ў акіяне. Праў-

да, цюх і цюха там былі чорныя, але рабілі яны ўсё тое ж, што робяць гэтыя двое, толькі ўчапіўшыся ў борт лодкі, і згібы іх целаў, падсвечаныя промнямі гарачага паўднёвага сонца, на тле празрыстае вады выдавалі больш контурнымі і выразнымі, а любошчы — больш палкімі, жарстлівымі.

Тым часам целы цюхаў выгіналіся, біліся ўсё хутчэй, і ўспененая іх пажадлівымі рухамі вада хвалямі разыходзілася ва ўсіх накірунках па паверхні возера. Раптам торс цюха-панурчыка моцна тарғануўся, бы яго выцялі чымсьці, падаўся наперад, замёр у здранцвенні. Рэшта жаўтлява-празрыстага семя сцякла з ягонай вызваленай з цюшынага лона плоці, падхопленая вадою, закружылася вакол ног да радасці плотак, што тут жа навыперадкі кінуліся да яго, расшкуматалі на кавалкі.

Сцэна гэтая зноў, як і ўчора ў лазні, калі яна падглядала за цюхаю і цюхам-марудам, выклікала ў Стужкі дзіўнае пачуццё трывогі — быццам хтосьці паклікаў яе. Покліч гэтым разам быў такі магутны і ўладны і суправаджаўся такім моцным адчуваннем цяжару ў жываце, што яна ледзь дала рады не страціць пільнасці. На шчасце, бо шчупак ужо цікаваў з-за аерыны, яшчэ хвіліна — і ён, пэўна, рынуўся б у атаку.

Цюха абыякава глядзела ўслед постаці каханка, што, няспешна акунаючы па чарзе ў ваду ногі, брыў да берага. Раптам яна выпрасталася, з выразам нянавісці на твары тыцнула пальцам у Стужчын бок.

— Лента! Лента! — закрычала і кінулася следам за цюхам-панурчыкам.

Заспеты знянацку яе воклічам цюх-панурчык азірнуўся, незадаволена керхнуў. Затым вярнуўся на ранейшае месца, абвёў паглядам вір і нава-

колле. Не ўбачыўшы нічога, апроч звыклае чарады плотак ды курмялёў, махнуў незадаволена рукою, пасунуўся зноў да берага. Праз колькі хвілін абое — цюха са спевам на вуснах, ён зладзеявата, быццам штосьці ўкраў, азіраючыся, — зніклі ў прыбярэжным хмызняку.

Нехта маланкаю вымкнуўся з глыбіні возера, наблізіўся да яе. Стужка азірнулася, і ўся істота яе затрапятала ад радаснага ўзбуджэння. Прама на яе плыў, няведама скуль узяўшыся, Стужык і прыязна звіваўся хвастом у неглыбокай, ускаламучанай нагамі цюхаў вадзе.

Сэрца яе так моцна забілася, што яна ледзь дала рады скрануцца з месца. Махнула хвастом, удаючы абыякавасць, адплылася да лапіка ціны па другі бок віру. Стужык дагнаў яе, не зважаючы на незадаволенасць пласкірак, што кружыліся наўкола ў чаканні, калі лёс прынясе яшчэ што-небудзь на спажыву, замёр упобачкі з ёю.

Яна варухнулася, але падплыць зусім блізка не палічыла патрэбным: хай папакутуе. Самцу завабіць самку ў цянёты кахання — раз плюнуць, дык ці варта гэтак во адразу, стрымгалоў кідацца ў абдоймы. Што лёгка даецца — гэтак жа лёгка і сплывае. То хай не думае маладзёнчык, быццам яна пустальга, якую можна мімаходзь спакусіць і кінуць у самоце. Ды і які ні абыходлівы ён, а пэўна ж дзяцей яе ў пашчы, як той цяляпін сужэнак, песціць ды аберагаць ад драпежнікаў не будзе.

Вада ўгары зморшчылася, пакрылася пластам пухіроў: пайшоў дождж. І адразу на дне зрабілася цёмна і няўтульна.

Стужка адштурхнулася хвастом ад глею, паплыла да бліжэйшага каменя. Хацела ўладкавацца на жвірку між ім і аерам, але тут высунуўся з-пад

каменя ўзлаваны прысутнасцю староннiх мянтуз, незадаволена забiў хвастом па жвiры.

Трэба было шукаць нейкае iншае месца, i яна рушыла зноў у накiрунку быстраку. Плыла асцярожна, але хутка, чамусьцi пэўная, што Стужык ужо не адстане. I сапраўды, ледзь паспела яна дапасцi да ямiны памiж быстраком i берагам, як i ён з'явiўся побач, закружляў над ёю. Яна спынiлася, падалася да яго ўсiм сваiм набрынялым пяшчотаю i млявасцю целам.

Патрывожаная iх з'яўленнем карасiха з пiрсiнгам з зазуба ў скiвiцы — днямi падчапiў хтосьцi нябогу на вуду, ды не даў рады выцягнуць, так i застаўся зазуб з рэштаю лёсы ў пысе — высунулася з глею, паварушыла бездапаможна ротам раздругi i схавалася зноў у нары.

Стужык тым часам падплыў зусiм блiзка. Целы iх датыкнулiся адно да аднаго, завiлiся ў шнур, забiлiся ў салодкай знямозе. Так доўжылася хвiлiн дзесяць, да першых гукаў бубна. Стужык спуджана страпянуўся, бы ад удару, выслiзнуў з абдоймаў, не падаўшы нават знаку, што развiтваецца, раптоўна, як i з'явiўся, знiк у воднай тоўшчы.

*Мацi стаяла ля плiты, пражыла на блясе боб ды, кiдаючы раз-пораз заклапочаны позiрк на вышыванку з радаводным дрэвам, што ўжо ладна зелянелася пад пяльцамi лiстотаю на шаравата-белым iльняным радне, слухала па радыё чарговую перадачу пра шкоду ад чужынскiх павеваў, што нiбыта зыходзяць жыхарам Азёрнае Цюханii ад злыдухаў вугроў, ды пра тое, як мусiць паспалiты люд згамузавацца дзеля адпору iм у шчыльны гурт вакол ваяводы.*

*— Вось ты граматная ў мяне дзеўка, адукаваная, — сказала з выклікам у голасе. — Дык скажы, што гэта значыць: вугры — злыдухі? Як гэта? Вось скажы!*

*— Клопату табе, — радая, што абышлося без лішніх роспытаў, дзе гэтулькі часу прабавілася, адказала Кіці і падчапіла нагою балейку, у якой плавалі на самым дне колькі акунькоў. — Во акуняты гэтыя... Пакуль малыя — сімпотныя гэткія рыбкі. А ўбяруцца ў сілу, пачнуць іншых жэрці — і паробяцца ўваднаЧас злыдухамі.*

*— Ой, штось не тое, дачка, — хітнула недаверліва галавою старая. — Штось не тое... Ужо ж не пра вугроў такое казаць... Ну, няхай сабе бабры, — вядомыя драпежнікі, рыбу нішчаць, няхай андатры, але каб вугры? Не тое... Так і да гусей, глядзіш, дойдзе...*

*— Тое, не тое — якая табе розніца? Слухай, што кажуць па радыё, ды рабі, як вучаць.*

*Маці чарговы раз перавярнула на блясе лыжкаю боб, адышлася ў кут пад абразамі. Глянула на выяву Маці Божае пры крыжы з распнутым Богам Сынам і скамянела ад убачанага.*

*— Авохці, і тут... гэтае, — злякана сказала нутраным, быццам на сябе самое скіраваным голасам і хуценька зняла абраз з цвічка. — Есці будзеш?*

*— Боб ды боб, а не каб рыбіну падсмажыць... Вугра таго ж...*

*— Скажаш — вугра! Гадаўё гэтае есці? Надумалася! Хай яго чэрці жаруць! У нас, здаецца, іншых страваў зараз пара, ці ты не цяміш?*

*— Во якая ты патрыётка, аказваецца! То чаму ж тады за вугроў гэтак бярэшся? І боб імпартовы гатуеш насуперак загаду спажываць сваё, той жа гарох, да прыкладу...*

*— Які табе імпартовы? Свой, з леташняга ўраджаю застаўся, не марнаваць жа.*

*— Ну і гірса ў цябе, мама, у галаве! Каша дый годзе!*

*Маці са злосцю кінула лыжку на стол.*

*— А ў цябе не каша? Мне раіш рабіць, што загадваюць, а сама? Смелая — у хаце! Добра, не чуе ніхто... Забылася, чыя ты дачка, чыйго бацьку пад бой бубнаў у пастарунак вялі? Як толькі самы лянівы не плюнуў у твар пасля таго, як здрайцам аб'явілі?*

*— Адна рэч — слухаць ды рабіць, як кажуць, і іншая зусім — слухаць ды рабіць нібыта па-іхняму, а насамрэч — па-свойму.*

*— Во наказала, во накруціла! Дзяды-прадзеды ў магілках ад гэткага казання папераварочваюцца. Дзе была гэтак доўга? Дзевятая гадзіна...*

*— Мылася ў возеры. А што?*

*— Нічога... Штодзень мыццё, то ў лазні, то ў возеры. Глядзі, дамыешся.*

*— А няўжо ж брудная хадзіць! — Кіці глянула ў вакно і міжволі ўсміхнулася, убачыўшы ў гурце рыбаловаў, што сунуліся паўз хаты да возера ставіць на ноч венцеры, каржакаватую, крыху асіметрычную ад пастаяннага цягання балеяў — адно плячо вышэй, другое ніжэй — постаць Валера. Мужчыны няспешна прайшлі паўз падворак, зніклі пры павароце да поплаву. — Ці не сама казала: марку продкаў трэба трымаць. Маўляў, не жартачкі, восем каленаў ледзь не сусветна вядомых бубначоў...*

*— І казала, і зноў скажу... Вось скончу вышываць дрэва, сама тады пабачыш, што да чаго, калі цяпер не даходзіць.*

*Кіці паклала дзеля прыліку сабе ў талерку колькі бобін, пайшла ў пакой. Прыхінулася плячыма да*

*рабрыны канапы, прыкрыла павекі, аддалася ўспамінам пра дзве свае запар — з Валерам і Панурчыкам — прыгоды.*

*Каторы з іх лепшы, катораму аддаць перавагу? Уявіла абодвух па чарзе ў ролі мужоў, і рот міжволі скрывіўся ад уяўлення гэткае перспектывы. Ат, што меркаваць: абое рабое, цюхі, цяпкуны з'ёдадэфіцычаныя. Казаў той, піхні — павалюся... Гэткія добра калі сябе збольшага забяспечаць, не тое што сям'ю. Вунь надоечы сяброўка з замежжа ліст прыслала — о, гэта цымус! Пазнаёмілася праз Інтэрнэт з мужыком і цяпер бяды не ведае. Кватэра ў горадзе, дамок у гарах, у курортным месцы. Кліча да сябе, дык, можа, і праўда, і ёй следам падацца? Во якраз цэх замежнікі збіраюцца неўзабаве будаваць пры возеры, дык узяць і ачмурыць каторага, як заявяцца?*

*Есці не хацелася, ды і боб быў калянаваты. Яна адставіла талерку, дастала з шафы новую кофту, ускінула на плечы. Падышла да люстэрка, каб зірнуць на сябе, як у пакой усунулася маці.*

*— Прыхарошваешся ўсё, выстройваешся? Абнову, бач, апранула... Ну-ну...*

*— Што «ну-ну»? У зрэбнае мне прыбірацца, ці што?*

*Маці моўчкі пахітала галавою, быццам хацела яшчэ штосьці дадаць, ды перадумала, пайшла прэч.*

*Кіці наблізіла твар да люстэрка, упетрылася паглядам ва ўласны адбітак. «Нішто пакуль, — падумала сама сабе і стала ў профіль. — Але што будзе праз пару гадоў?»*

*Маці з абразом пры грудзіне прамільгнула прыгорбленаю паставаю за вакном, схавалася ў пуні.*

*Кіці выйшла з хаты, ціхутка, пакуль маці штосьці варажыла ў пуні з абразом (ці не хавала па-*

*далей ад староннягa вока), пасунулася краем гарода да атуленага змрокам дальняга згібу возера, туды, дзе заўжды чамусьці найярчэйшымі выдаюць у цемры на паверхні вады адбіткі зорак Вялікага Каўша.*

*Пелька-гірлянда з сямі светлякоў хіснулася ёй насустрач з-за кустоўя ды знікла, спуджаная парывам ветру, у азёрным прадонні. Але праз хвіліну, ледзь вецер суцішыўся, зноў усплыла, заслізгала пукамі прамянёў па вадзе. Статак гусей прывітаў яе вяртанне радасным гергетаннем, і адзінокі бубен азваўся яму здалёку апошнім перадночным бомканнем.*

Ноч Стужка правяла ў трывожным одуме пра змены, што, адчувала, чакаюць яе неўзабаве. Што то будуць за змены, яна не ведала, і няведанне тое дарэшты выбівала яе з каляіны звыклага існавання. І толькі на досвітку, змучаная бессанню, яна ненадоўга прыснула пад друшляком.

Сасніўся ёй акіян — без канца і краю, смарагдава-зялёны ад водарасцяў. Стужык плаваў побач, заваблівaў да месца, што аблюбаваў для нераставання.

Што такое нераставанне, яна ведала змалку, назіраючы ў іншых рыбаў. А вось як яно адбываецца ў вугроў — зусім не ўяўляла. Як на тое, іншых вугрыных пар наўкола не было — спрэс адны скаты, крабы ды нейкія цьмяна-зялёныя страхавітыя істоты з доўгімі, бы антэны, вусамі. Ці, наадварот, амаль празрыстыя, зграбныя і лёгкія, як лісціна на паверхні возера. І адных, і другіх яны са Стужыкам абачліва ўнікалі: ці мала якая можа здарыцца неспадзянка і бяскрыўдны камень няўзнак перавернецца ў бязжаласнага драпежніка. Але як

ні асцерагаліся — не заўважылі небяспекі. Страхарыбіна з нашчэраным плаўнікам, вельмі падобная да акуня, толькі нашмат мажнейшая і тлусцейшая, вымкнулася аднекуль збоку, хіснулася да іх.

Яны кінуліся куды каторы ў дружным памкненні збіць нападоўцу з панталыку, на шчасце — удала. І тае ж хвіліны пагублялі адно аднаго з поля зроку.

Яна абшукала дно наўкола, але Стужыка нідзе не было. Адчай ахапіў яе.

Хтосьці заварушыўся ля каменя на дне. Яна падумала, што гэта, магчыма, мурэна, і на ўсялякі выпадак адплылася далей.

Гэта быў ужо не сон. Карасіха церлася пысаю аб камень-слюдзянчык у надзеі пазбавіцца зазуба. Трое яе сыноў і пяцёра дачок — усё, што дзякуючы апетыту шчупака ды акуня з яршом засталося з вясны ад немалога вывадка, — круціліся побач, утрапёна падхоплівалі ртамі з разварушанага маткаю глею дробную спажыву.

Цень мільгнуў угары, доўгае звілістае цела стралою прамчалася збоч каменя, апусцілася побач з нераткам.

Стужык!

Яна выслізнула з-пад друшляка, радая, што Стужык вярнуўся, і адначасна сярдзітая, што ўпотай, бы злодзей, знік заўчора, у пакрыўджанай позе завісла над карасінаю гамэрняй. І толькі калі ён падплыў бліжэй і датыкнуўся, прабачаючыся, бокам да яе спіны, крыху адпусцілася, дазволіла абвіць сябе хвастом.

Лодка-маторка з надпісам «Краёвы Штаб Рыбалова» на баку праплыла воддаль, стаяла ўдалечыні. Узнятая шалёнаю хуткасцю вада падхапіла іх разmoраныя пяшчотаю целы, загайдала, па-

несла да берага, кінула на гурбу сапрэлага леташняга трыснягу.

Дзве цюхі са спалоханымі тварамі і харугвамі падпахамі падышлі да возера, хуценька зачэрпнулі вёдрамі вады, сталі над імі.

Стужык наспружыніўся, зазбіраўся ўцякаць, але яна не пусціла.

«Дурненькі, чаго ты? Яны самі баяцца».

«Баяцца? Каго?»

«Сказаў бы хто мне. Адвеку, колькі іх бачу, — такія яны, бытта нехта іх даганяе. Відаць, драпежнік нейкі не дае спакою, падсцерагае».

Цюхі пачаплялі вёдры на каромыслы, пайшлі краем берага да сцежкі. Расклалі на траве харугвы, узяліся апантана мянташыць па іх пранікамі. Колькі ссохлых лісцінак азваліся на грукат, адарваліся ад альшыны, бясшумна, толькі ледзь-ледзь задрыжэла пад імі вада, упалі ў возера.

Стужка павярнулася жыватом да Стужыка, куснула гулліва за бок, павабіла на сярэдзіну віру. Адтуль, быццам незнарок, быццам выконвала чыйсьці загад, — далей да водападзелу, дзе возера канчалася і пачыналася рэчка.

Вада ў рэчцы была куды зімнейшая, як у азярку, і яны на колькі хвілін прыпыніліся, прывыкаючы да яе. Шчупак, які суправаджаў іх ажно да самага вусця ў спадзеве ўхапіць каторага, расчаравана шчоўкнуў зубамі, паплыў прэч. Абураны неспадзяванаю гасцінаю рак-адзінотнік убачыў, што яны спыняцца не збіраюцца, змяніў злосць на літасць, прыязна махнуў ім на развітанне тоўстаю, бы карэнь аерыны, клюшнёй. Ды зарана.

Усё вусце ад берага да берага перагароджваў невад. Пелькі яго былі такія вузкія, што аніякай на-

дзеі на тое, каб праслізнуць паўз іх, не было і блізка. Стужык паспрабаваў зрабіць гэта, але тут жа захрас галавою ў адной з іх. Яна кінулася памагаць яму, але не паспела наблізіцца да невада, як ён пачаў згортвацца і падымацца ўгору. Яна ў адчаі закружылася наўкола Стужыка. Неўзабаве яны былі па розныя бакі невада, хоць і бачылі адно аднаго.

Стужык зрабіў чарговую спробу вызваліць галаў з пелькі, і гэта яму нарэшце ўдалося. Але цяпер ужо замінаў выкараскацца на волю сам невад, што з кожнаю хвілінаю згортваўся столкамі ўсё шчытней і шчытней.

Яна падплыла зусім блізка да невада, рассунула столкі тулавам. Матлянула хвастом, запрашаючы Стужыка хіснуцца ў праём, але ён тое зрабіць не наважыўся. Ніякаватым позіркам, быццам саромеўся ўласнае нерашучасці, глянуў на яе, яшчэ глыбей апусціўся долу ўпоперак сеткі.

Апошняе, што яна бачыла, было бліскучае Стужыкава цела па-над вадою і вясёлы твар цюха-маруды, які з задаволеным воклічам выхапіў яго з невада і шпурнуў у перакінутую праз плячо шырачэзную торбу. Апошняе, што чула, — бомканне бубна, што праціяло паветра ды і растала, усцешанае здабычаю, сярод асірацелых, спустошаных венцерамі, сеткамі, нератамі, мярэжамі ды браднікамі-таптухамі віроў і віркоў.

*Кіці апаласнула рукі, акінула паглядам запоўненыя дарэшты заўчорашнім ды ўчорашнім уловамі балеі. Акінула і ажно міжволі сумелася: рыбы ў цэху так шмат, а тары не хапае. Патэлефанавала з раніцы дырэктару гуты, каб прыслаў хацяб якіх слоікаў. Абяцаў памагчы, але ўжо і паўдня*

*мінула, і надвячорак на носе, а абяцанага як няма дык і няма. Двойчы спрабавала нагадаць пра дамову праз сакратарку, але як знарок ніхто на тым канцы провада не здымае слухаўку. І што, як не прывязуць наогул тых слоікаў, што рабіць тады з усім гэтым дабром?*

*Маладая верхаводка вымкнулася на паверхню адной з балеяў, быццам жадаючы звярнуць увагу на сябе ды на іншых, гэткіх, як сама, закладнікаў людское сквапнасці, адчайна хапіла ротам паветра і зноў утачылася вузкім целам у прагал паміж плаўнікамі ды галовамі язёў, краснапёрак і плотак.*

*Кіці ў задуменні схілілася над сталом. Цікава, што адчуваюць усе гэтыя паняволеныя істоты? Адчай? Нянавісць? Як успрымаюць сваіх катаў? І навошта гэтулькі ўсяго вылоўліваць, як не даеш рады з'есці? Вунь ужо і Цюханія Прыморская, паведамілі з замежжа, студэнт Люцік, аматар паслухаць навіны з-за бугра, распавядаў, выказала ноту ваяводу Амяле з-за парушэння канвенцыі аб здабычы рыбы. Лядоўняў мала, улоў так хутка псуецца, што даводзіцца вывозіць частку яго за паселішча ды скульваць у яму для ўтылю. Спачатку звозілі ў лес вепрукам, але і тыя ўжо ад'еліся, не жадаюць датыкацца. Люд ад'еўся, быдла ад'елася, што далей? Ці не атрымаецца, як калісь атрымалася з андатравымі, а перад тым — з выдрынымі і бабрынымі шкурамі, калі замест футраў пачалі з іх вусцілкі ў боты ды валёнкі, а то і вяхоткі для мыцця прыбіральняў выраблаць. Добра, як на добрае, а як да вышэйшага начальства, да таго ж ваяводы дойдзе пра гэткае марнатраўства? Каго найперш абвінавацяць, чые паляцяць галовы? Спадзяваліся на замежнікаў: маўляў, наладзяць закуп, а яны штосьці не надта спяшаюцца. І не дзіва:*

*абсталяванне старое, што на гэткім талковага вытварыш, каб здзівіць іхняга спешчанага дабрабытам спажыўца? Прыехалі, пакруціліся панове, паглядзелі на ўсё гэтае цюхаазёрненскае бязладдзе ды і падаліся зноў ў свае ўтульныя палестыны — нібыта раіцца з начальствам. А ці насамрэч раіцца з'ехалі, ці проста лататы далі — хто ж ведае.*

*З вуліцы данесліся галасы. Кіці хіснулася да вакна, з заміраннем сэрца — раптам што яшчэ валакуць рыбаловы — прынікла тварам да запацелай ад вільгаці шыбіны. Ішлі, сапраўды, рыбаловы, але не з возера, а, наадварот, да возера. Гэта яе супакоіла. Паперадзе сунуўся з сур'ёзным выглядам Панурчык, за ім, цягнучы за клячнікі таптуху, шлэпалі стары Арцюх і Люцік, дваццацігадовы студэнт з нязвыкла белым для гэткае прыпарнае часіны года тварам.*

*Хоць адзін не маргінал, падумала Кіці і ўсміхнулася кампаніі праз вакно. Слова «маргінал» яна вычытала нядаўна ў «Навінах краю» ў фельетоне, прысвечаным працаўнікам масавага нішчэння вугроў, і потым яшчэ раз — у адным часопісе, які атрымала ў якасці бясплатнага даважку да моднае спадніцы ад заезджай тарбэшніцы-бэбахшчыцы, спакусіўшыся каляровымі здымкамі аголенай натуры на вокладцы. І хоць дакладны сэнс слова так і застаўся ёй няведамым, што гэта нешта непрыемнае, нават брыдкае — усё ж такі яна збольшага зразумела.*

*Студэнт прыязна ўсміхнуўся ёй, і Панурчык, які нават вока скасіць у бок вакна не палічыў патрэбным, хоць, без сумневу, і ведаў, што яна тут, апёк маладзёна спадылба зласлівым паглядам.*

*Раўнуе, і добра, падумала Кіці і яшчэ больш агаліла і без таго напалову голыя — у памяшканні па-*

*навала задуха — грудзі. Люцік заўважыў, відаць, яе жэст, бо зноў пасміхнуўся, гэтым разам употайкі ад Панурчыка. Тройца моўчкі прайшла паўз будынак, знікла за гародамі.*

*Кіці выйшла на двор, прымасцілася, каб перавесці дух, на цэментовай пліце збоч ганка. Падумала пра тое, што будзе рабіць, калі ўсё ж такі не прывязуць, насуперак абяцанкам, слоікі, і страх ахапіў яе.*

*Страх! Каторы раз апошнім часам вось гэтак неўпрыцям, з-за нейкае драбязы прахопліваецца з вантробаў. Ды каб жа толькі прахопліваўся ды тут жа і адпускаў! Не ж, працінае глузды і ўсю істоту так моцна, што, здаецца, ніколі ўжо ад яго не пазбавіцца. Страх зрабіць не так, як патрабуецца, страх камусьці не дагадзіць, не спадабацца, урэшце, — самы, бадай, галоўны, прынамсі, для яе галоўны — застацца да скону ў адзіноце, бы заціснутая з усіх бакоў вузкае прасторы става рыбіна. Накшталт той, якую калісь нябожчык-бацька злавіў падчас нерасту ў возеры ды і кінуў на ўсцеху ім, дзятве, у сажалку. Як яна сумавала ў балотна-зялёнай вадзе, як кідалася ад берага да берага ў надзеі адшукаць выйсце з палону! У якой маркотнай позе застывала, знясіленая марнымі пошукамі шляху да волі, сярод става і як адчайна падавала сігналы бедства усяму жывому самотным сваім плаўніком, падобным да згубленага сярод неабсяжных марскіх прастораў ветразя карабля.*

*Думкі ўсё плылі ды плылі, як раптам зноў Кіці ўбачыла Люціка. Хлопец ішоў, накульгваючы на левую нагу, і ягоная падкасаная да калена калашына танных шэрых спраднікаў дзіўна кантраставала з колерам усяго астатняга, а на твары застыла пакутлівая грымаса. Кіці памкнулася да яго, каб*

*запытацца, што здарылася, але ён ужо сам накіраваўся да яе.*

*— На жалязяку ўзбіўся, — прамовіў і адвёў чамусьці ўбок пагляд, як дзіця, якому конча патрэбная спагада.*

*Кіці падхапіла яго пад руку, павяла ў памяшканне. Замітусілася па пакоі ў пошуку лекаў, але нічога не знайшла. Узгадала, як Ядзя тры дні таму парэзала аб акунёў плаўнік палец, падумала, што, мабыць, узяла для лекавання аптэчку дахаты ды і забылася вярнуць на месца.*

*Люцік сеў на тапчанчык у куце, абаперся ілбом на пакладзеную тарчма на калена руку.*

*— Баліць? — спытала яна.*

*Студэнт моўчкі пасунуўся ўбок, даючы ёй месца побач, і ягонае перарывістае дыханне апякло яе знаёмым адчуваннем нястрымнае пажадлівасці.*

*Ён абхапіў яе рукамі за стан, убіўся тварам у пеліну, бязладна зашмаргаў рукамі па нізе спіны.*

*— Што ты? — сказала яна і шчытней прыціснула ягоныя далоні сваімі да клубоў.*

*— Там, на возеры... заўчора... я бачыў, — выдыхнуў ён нарэшце, спрабуючы паваліць яе на тапчан. — Як вы з Валерам...*

*Кіці рэзка, ажно сцялася ў горле дыханне, адхіснулася ад яго, квэцнула рукою па цемю.*

*— Ах, вось што! — сказала насмешліва і перавярнула на стол балейку з рыбаю. — Падумаў — гулёна я? Ну, дзякуй, хлапчына!*

*Яна думала, што Люцік падхопіцца і пойдзе прэч, але ён нават не варухнуўся. І толькі калі яна ўзялася чысціць рыбу і луска пырскамі паляцела з-пад нажа па пакоі, трапляючы яму на твар і вопратку, ціха, быццам нехаця падняўся, пасунуўся паўз балеі да выхаду.*

*— Вы... вы... — адно прамармытаў ад дзвярэй і знік у калідоры.*

*«З хвіліны на хвіліну не лягчэй, — падумала яна і змахнула слязіну, што немаведама з чаго — калі гэткае было з ёю апошні раз? — ускруцілася на вейка. — Як мала жанчыне трэба для шчасцейка».*

Амаль гадзіну правартавала Стужка ў ціне ля берага ў марным чаканні, што Стужык вернецца. А калі страціла ўсялякую надзею і памкнулася да скату ў другую, больш шырокую і больш павольную раку, што, памятала, акурат вяла да мора, было запозна. Заслона з другога невада, у пельках якога білася ўжо каля дзесятка рыбін, паўстала перад ёю. Яна праплыла ўздоўж яго ад берага да берага ў спадзеве знайсці хоць якую шчэлку, каб праслізнуць на той бок, але дарэмна. Тады яна паспрабавала падняць іспод невада, пракапаўшы галавою лаз унізе, але гэта таксама не атрымалася: дно было занадта жвірыстае, калянае. Тым часам усё новыя і новыя рыбы штурмавалі сетку. Некаторыя кідаліся ў адчаі на яе і заблытваліся ў пельках, найбольш спрытныя пераскоквалі невад панад вадою, але такіх было зусім няшмат.

Двое цюхаў падышлі да берага з розных бакоў, пачалі хутка падымаць невад угору. Трэці ўбрыў па калені ў ваду з другога берага, узяўся штомоцы мянташыць кулаком у бубен.

Рыбы ў адчаі замітусіліся ля сеткі, спуджаныя боем бубна, кідаліся на невад.

Стужка хіснулася да берага, стаілася ў прагалку між карэннем аеру. Агаломшаная ўбачаным, яна і не заўважыла, як яшчэ двое цюхаў, у адным з якіх яна пазнала цюха-панурчыка, абкружылі яе таптухаю, пацягнулі разам з глеем і ла-

маччам, якога тут поўна было яшчэ з паводка, да берага.

Цюхі вывалаклі таптуху на бераг, расцягнулі на пожні. Улоў быў так сабе: драбяза, больш усё плоткі ды курмялі, пара ліньковў.

— Нішто сабе рыбіна, — прамовіў, убачыўшы Стужку, кульгавы маладзейшы і адышоўся воддаль.

Цюх-панурчык нахіліўся, працягнуў рукі да невада.

Стужка выгнулася ўсім целам, хіснулася ўбок, стаілася між качуроў счышчанае з сеткі ціны.

— Вёрткі, халера, — сказаў цюх-панурчык і падчапіў яе разам з цінай нагою.

Яна зноў вывернулася, памкнулася зашыцца ў глей збоч невада, набраўшы на ўсялякі выпадак у жабравую поласць — а раптам выцягнуць, то як тады найдалей пратрымацца? — паболей вады, надзейна прыкрыла яе шчэлепамі.

Маладзейшы падскочыў да невада, зняў з пляча торбу, падсунуў ёй пад галаву.

Цюх-панурчык згроб далонямі ў кучу астатніх рыбаў, не зважаючы на пратэсты хаўрусніка — маўляў, замалыя, след бы выпусціць, — кінуў у прыхопленую ўгары матузамі торбу. Затым абхапіў пальцамі за тулава Стужку, з вясёлым смехам пхнуў следам за малечаю у цёмнае, бы ноч, прадонне.

У торбе было цесна, да таго ж калоліся выдраныя жывасілам з целаў іншых рыбін ашмёткі лускі. Усё рухалася, кожны з палоннікаў караскаўся на іспод, куды сцякала і затрымлівалася там, хоць і ненадоўга, жыццядайная вада.

Стужка нырнула ў гушчу паняволеных целаў, праціснулася на дно торбы. З жахам адчула, як з

кожнаю хвіляю калянеюць, робяцца нерухомымі целы над ёю, замітусілася пысаю ўздоўж шва ў пошуку якой шчэлкі.

Шво было моцнае, непрыступнае. У колькіх сантыметрах ад яго, праўда, свіцілася, прапускаючы ў чэрава торбы вузенькі пасак святла, дзірачка, але яна была такая вузкая, што і марыць не было чаго выкуліцца з торбы праз яе. І потым — што выкуліўшыся? Куды трапіш, у якое пекла? Мяркуючы па хістанні торбы, цюх-панурчык ужо добра паспеў адысціся ад берага. Яго спеў, прыглушаны матэрыяй, рабіўся ўсё больш і больш ціхім, а хада — павольнай і лянівай.

Дзіва, але ёй зусім не хацелася есці. Толькі зараз, у гэтай шорсткай, запоўненай амаль да паловы палоннікамі торбе Стужка ўпершыню падумала пра тое, што ад учарашняга дня, ад тае самае хвіліны, як вярнуўся Стужык, яна нічога не мела ў роце. Не тое каб не было чаго — праглынуць у вадзе заўжды што-небудзь знойдзецца, — не, проста было ёй зусім не да ежы. Стужык так шмат займаў цяпер месца ў яе жыцці, што ні пра што іншае дбаць не выпадала.

Стужык! Дзе ён зараз, і што з ім? Ці думае пра яе? І ці давядзецца ім яшчэ пабачыцца? Дай жа лёс, каб так сталася. Толькі пабачыцца — а там хай будзе, як наканавана.

А яшчэ думалася ёй пра роднае сховішча. З якою асалодаю згарнулася б яна зараз у колца пад друшляком у нераце, якімі цёплымі ды ўтульнымі падаліся б, мабыць, ёй пасля ўсіх прыгодаў дня яго іржавыя, зрудзелыя бакі. Добра, як не знайшлося ахвотніка прысабечыць, але ж ліха ведае — усяляк бывае. Вернешся, а там новы гаспадар, што тады рабіць?

Крокі цюха-панурчыка яшчэ больш запаволіліся. І неўзабаве зусім аціхлі — мабыць, ён спыніўся. Штосьці рыпнула ўпобачкі, і тонкі, вельмі знаёмы голас ірвануўся яму насустрач:

— Ну, хваліся, як улоў!

Торба саслізнула долу з ягонага пляча, калечачы яшчэ больш і без таго ўжо скалечаныя целы рыбаў, упала на нешта калянае. Дзве рукі прасунуліся ў яе, абмацалі здабычу. Затым тыя ж рукі перавярнулі торбу, высыпалі змесціва яе на шырокі і доўгі, зацярушаны лускою ад папярэдніх уловаў стол.

Учорашняя цюха з возера стаяла збоч стала, заклапочана вызірала штосьці ў гурбіне рыбіных целаў.

— Во яшчэ адзін, — сказала і, выхапіўшы Стужку з гурбіны, хуценька, так што яна і агледзецца як след не паспела наўкола, шпурнула ў пасудзіну на другім стале. — Бач, срэбнабокі! Будзеш ведаць, як гарох дратаваць! А гэтых, малечу, навошта прывалок? Хай бы даспявалі...

— Ты, Кіці, як Люцік, — гэткая ж дабраслівая. Да-спя-ва-а-лі! У чэраве даспеюць! — хіхікнуў цюх-панурчык. — Мала рыбы ў возеры? — Ён згроб рэшту рыбаў у балейку з вадою, панёс некуды. Не паспеў ён адчыніць, аднак, дзвярэй, як маладая пласкірка выскачыла з балеі, пляснулася бокам на падлогу. Кіці памкнулася падняць яе, але спазнілася. Калматае рудое стварэнне вымкнулася з-пад стала, перахапіла няшчасную, абшчаперыла зубамі.

— Апсік, Драмадэр! — сыкнуў на яго цюх-панурчык, і яно, як было з пласкіркаю ў зубах, знікла зноў пад сталом.

Цюх-панурчык і Кіці паблажліва засмяяліся. Жахлівы хруст пласкірчыных касцей агаласіў па-

кой. Цюх-панурчык пастаяў хвіліну ля дзвярэй, знік у вузкім, як прасвет між камянёў на шляху з возера да ракі, праёме.

— Ну, за працу, — сказала сама сабе Кіці і падкасала падол спадніцы. Пара крамяна-ружовых лытак мільгнула па-над падлогаю, застыла збоч мешанкі з ціны і лускі. Дзверы зноў адчыніліся, у памяшканне ўвайшоў цюх-панурчык з парожняю балейкай у руках. Кіці памкнулася да яго, абхапіла за шыю, паклала далонь на грудзіну.

— Здурнела? Заспее Валер — будзе нам, — натужліва дыхаючы, сказаў цюх-панурчык і паваліў яе ніцма на стол.

— А хай сабе, падумаеш, — здушаным голасам прамовіла яна. — Я яму нічога не абяцала.

Цюх-панурчык рэзкім рухам здзёр з Кіці сподняе, наваліўся целам ззаду. Яна енкнула, ці то ад болю, ці то адно ўдаючы яго, гучна застагнала.

Гэта ўжо было не надта цікава, і Стужка адвярнулася. Пагляд яе ўпаў на прыкрыты зжоўклаю газецінай слоік на палку збоч стала. Штосьці быццам варухнулася ў ім і зноў скамянела, сціснутае з усіх бакоў шклом.

Тым часам Кіці енкнула апошні раз, ухапілася пальцамі за рог стала разам з газецінай. Газеціна глуха шорхнула, звалілася на стол. Кіці скамечыла яе, вызвалілася з-пад цяжару цюхавага цела, пачала старанна выціраць спэцканыя лускою і сліззю далоні. Затым зняла з палка слоік, перакуліла ў балейку. Звілістае вузкае цела вымкнулася са слоіка, гучна пляснулася аб дно пасудзіны.

Стужык?!

Стужка перавярнулася ў балеі, не зважаючы на цюха-панурчыка і Кіці, упетрылася вачмі ў пасудзіну насупраць.

Стужык!

Ён таксама пазнаў яе. Гэта яна адразу зразумела, ледзь спаткаліся іх вочы.

Цюх-панурчык запусціў руку ў балею, схапіў Стужыка за галаў, вышмаргнуў на другі, з перагародкамі па краях, стол. Затым акунуў пальцы ў слоік, відаць, з намерам выцягнуць і яе, Стужку, ды не даў рады. Шыракаватая далонь, якою ён толькі што лашчыў разамлелую ад пажады сяброўку, засела ў адтуліне, нерухома застыла над Стужчынай галавою.

— Рассыцеў ты, аднак, — сказала з усмехам Кіці і паспяшалася каханку на дапамогу.

Яе рука ўвайшла ў слоік вельмі лёгка і гэтак жа лёгка адарвала Стужку ад дна, падцягнула ўгору. Але захрасла на выхадзе, бо сціснуты кулак ніяк не жадаў праходзіць у адтуліну. І Стужка не марудзячы скарысталася гэтым, выслізнула з пальцаў. Кіці паўтарыла спробу яшчэ раз, і зноў беспаспяхова.

— Халера яе. — Кіці ў адчаі засоўвала зноў і зноў руку ў слоік, і кожнага разу Стужцы ўдавалася выслізнуць у апошнюю хвіліну з яе далоні.

Знерваваны няўдачаю цюх-панурчык схапіў слоік, хуценька перакуліў яго на стол.

Каляная паверхня стала казытнула скуру, пакорліва дала ёй месца побач са знерухомелым ад шоку целам Стужыка. Целы іх судакрануліся, і яна адчула трымценне яго бездапаможнай, з камякамі глею грудзіны.

Цюх-панурчык паклаў іх упобачкі, галава да галавы, хвост да хваста, загадаў штосьці Кіці. Тая зняла з палка лінейку, прыклала да стала ўздоўж іх целаў.

— Некандыцыя, замалы, — буркнула злосна і шваргнула Стужыка назад у балею. — Самец, няйначай...

Кропля поту скацілася з яе ілба, упала цюхупанурчыку на кашулю. Ён сцёр кроплю даланёй, незадаволена, ажно пабіўся зморшчынамі руды ад загару лоб, адхіснуўся воддаль ад стала.

— І пацееш жа ты, дзеўка, — сказаў і паклаў далонь Кіцці на клуб.

— Табе клопату! — агрызнулася яна. — Сваё глядзі, ледзьве ліпіць, а абяцаў — зорачкі буду лічыць на столі! Дзе ж яны, тыя зорачкі, га?

— Мала табе ўсё! То Валер хай дадасць. — Цюхпанурчык квэцнуў Кіці па спіне, млява, бы нехаця, паваліў — гэтым разам дагары — на стол.

Дзверы адчыніліся, цюх-маруда ўваліўся ў памяшканне, паўзіраўся хвіліну-другую ў Кіці і цюха-панурчыка, раз'ятраным зверам хіснуўся да іх.

— Во, значыцца, што! — гыркнуў як не сваім голасам і ўдарыў суперніка па шыі. — Праўду людзі пра вас кажуць... Ну, чакайце! — Ён схапіў лінейку, штомоцы выцяў ёю цюха-панурчыка па патыліцы. Той падхапіўся, пашукаў вачмі, чым можна аддзячыць крыўдзіцелю, і, не знайшоўшы нічога, квэцнуў кулаком у пераноссе.

Пляма крыві расплылася па стале, замітусілася па краі ў пошуку сцёку.

Устрывожаны бойкаю Драмадэр вымкнуўся са схову, маланкаю пераляцеў ад стала ў кут.

— Годзе табе злаваць, Валер, — сказаў пераможца і падаў скрываўленаму ворагу-таварышу нейкую анучыну. — Вытрыся во... Падумаеш — баба... Хопіць абодвум.

— Ага, абодвум, глядзі ты!— усхапілася Кіці і склала дуліну. — Я вам што — прастытутка? Адно і маеце наўме, мудакі... А не каб прылашчыць кабеціну па-чалавечы, мацярынствам адарыць... Дзе там, ані блізка! Рыбы-дзецюкі са сваімі каханкамі

так не абыходзяцца, як вы з намі, кабетамі. З’ехаць ад вас куды, ці што? Вось пазнаёмлюся з якім замежнікам...

— Ага, з гэткім імем, як тваё, акурат што трэба будзе замежнік! Кі-і-іці! Цьфу!—прамовіў Валер.

— Сам перакруціў-перарабіў, а зараз цвелішся, свінюк... Кася я — забыўся?

— Памятаю, анягож! Рукі ад рыбінага смуроду перад тым, як ехаць, не палянуйся як след адшараваць. З’едзе яна...

Валер, палагаднелы і, мусіць, задаволены, што абышлося без большае крыві, зачэрпнуў далонямі з балеі вады, плюхнуў сабе на шыю.

— Пудзілы гарохавыя! — прамовіла злосна Кіці і энергічна, ажно хруснулі косці ў перадплеччах, пацягнулася. Затым апаласнула анучу ў балеі, пачала выціраць стол.

— Кажаш, некандыцыя? — сказаў цюх-панурчык і ўтаропіўся ў Стужку абыякавым паглядам. — Дык што рабіць будзем?

— Гэнага — да стала гасцям к Дню Бубна, гэтага — у акварыум.

— Да стала! Навошта? Быццам самі не дамо рады з’есці! Гарбееш тут за капейкі і нейкага чорта яшчэ кармі... — Голас цюха-панурчыка ўсё больш набрыньваў злосцю і ўрэшце зусім перайшоў у крык. — Гасцей гэтых заўжды — бы вошай на сабаку, толькі паспявай частаваць. Абыдуцца!

Ён выпрастаў руку, каб схапіць Стужку, але Кіці яго апярэдзіла:

— Так зробім, як загадана. Я дабрабытам сваім дзеля твайго праўдалюбства ахвяраваць не збіраюся. Не ведаеш хіба: праўда шмат каштуе, а цэнніца — танна, — сказала рашуча і шваргнула Стужку зноў у слоік. І з пераможным выглядам, паказ-

ваючы, што спрэчка ёй надакучыла, уключыла радыё. — Надумаўся: гусей дражніць!

Голас дыктаркі порстка вырваўся з прыймача, узвіўся пад столь, запоўніў прапахлую луской прастору памяшкання чарговаю адозвай ваяводы Амялы.

*Кіці ціха адчыніла дзверы з сянец у кухню і тае ж хвіліны натыкнулася паглядам на маці. Старая сядзела за сталом, варажыла над вышыванкаю. Надоечы яна скончыла вышываць шостае калена продкаў і цяпер усцешліва акідвала паглядам пяльцы, прымервалася, як выгодней размясціць на тканіне галіны двух апошніх. Адначасна і бедавала: галіны гэткія бухмацістыя, а нітак мала, у абрэз, добра, як хопіць на палову астатку працы. А ўсё з-за гэтых вугроў. Урад Цюханіі Захмызнай, суседняй краіны, незадаволены масавым вылавам рыбы ў памежных водах, што ўвобміг адбіўся на дабрабыце суседзяў, наклаў у знак пратэсту забарону на гандаль з Азёрнай Цюханіяй трыкатажам. І цяпер чортведама куды кінуцца па тыя ніткі, хоць даставай з гарышча прабабулін калаўрот ды пачынай прасці. Адно дадае гумору: днямі прыязджалі тэлевізійшчыкі здымаць пра дрэва сюжэт, надта ж упадабалі яе працу, то, можа, чым-нічым, хоць вось ніткамі памогуць. Абяцалі, а як там будзе — пакажа час.*

*Усё гэта старая распавяла Кіці, ледзь тая ступіла на парог, і такая матчына гамонкасць прыйшлася ёй не даспадобы. Колькі можна чаўпсці адно і тое? Каб хаця б якая была каму карысць з тых васьмі каленаў і з гэтага дрэва, а то ж — ніякай. Наадварот, адны выдаткі ды турботы: тканіну набудзь, нітак купі... Ды і не ў пашане зараз усе*

*гэтыя радаводна-патомныя вышукі, уся гэтая старасветчына, іншымі клопатамі людзі жывуць. Але паспрабуй ты ўсё тое давесці чалавеку, які і слухаць цябе не хоча, і пра інакшае жыццё не мае ўяўлення і мець яго не жадае.*

*Кіці паманулася праціснуцца як хутчэй у свой пакой, маючы наўвеце конча адпісаць сёння ліст сяброўцы ў замежжа, але не паспела і кроку зрабіць, як маці зноў спыніла яе:*

*— Дзе была?*

*— На працы ў цэху, дзе яшчэ! Быццам не ведаеш...*

*— Добра, а то...*

*— Што? Зноў нейкія плёткі?*

*— Плёткі не плёткі, а сёе-тое дайшло да мяне. Бытта ты адно і маеш наўме, каб з мужыком якім скруціцца. Сорам, гадства, і як мне ў вочы людзям пасля такога глядзець?*

*— Дык і не глядзі, хай яны глядзяць.*

*— Разумная якая! Пастыдалася б, падумала б, што робіш, перш чым памяць продкаў ганьбіць. Што бацька сказаў бы? У нашым родзе адвеку такое распусты блізка не было.*

*— Перастань, мама!*

*Кіці шмыганула ў пакой, зачыніла за сабою дзверы. Села на зэдаль пры вакне, задуменна ўпетрылася вачыма ў мурзатую, з рагамі ад ранішняга дажджу шыбіну.*

*Можа, і праўда гэткая яна дрэнь, як людзі кажуць? Што, сапраўды, сказаў бы бацька, каб быў жывы, пра ўсе гэтыя яе любошчы з Валерам ды Панурчыкам? Наўрад бы ўхваліў, строгі, нават суворы быў чалавек, што да сябе, што да іншых. Хоць і добры адначасна, вунь як песціў яе, калі пачала нявесціцца. Асабліва напрыканцы, калі ўжо зусім кепска сябе адчуваў, быццам ведаў, як цяжка бу-*

*дзе дачцэ без бацькоўскае, мужчынскае апекі. Тая андатравая гаржэтка з аздобаю пад боа з лебядзінага пуху, што падараваў ёй за тыдзень да скону, — як цешыўся, бачачы, як загарэліся пры выглядзе дарунка яе вочы. Так яна тую гаржэтку ні разу і не апранула па ягонай смерці, усё неяк не надаралася нагоды, і Бог ведае, ці надарыцца калі наогул. Хіба што зараз вось, падчас святкавання Дня Бубна. Калі запрасяць...*

*Яна падышла да шафы з адзеннем, расчыніла яе. Плойма молі вымкнулася з шафы, закружляла наўкола. Яна пашнарыла рукою па закуцці па-за вешакамі з жакетамі ды кофтамі, дастала гаржэтку.*

*Футра было цэлае — амаль, за выняткам рога на правым баку. Кіці захінула рог так, каб не вытыркалася папсутае, прышпіліла гаржэтку навобмацак да каўнерыка кофты, зірнула на сябе ў люстэрка. «Чым не дама! — падумала задаволена і зноў падалася да вакна.—Не Перыс Хілтан, вядома, ды ўсё ж...»*

*Дзіва, але гаржэтка на плячах супакоіла яе, дадала гумору. Цікава, што сказалі б у цэху, убачыўшы яе ў гэткім строі? Апрануць калі дзеля смеху, ці што?*

*Напамін пра цэх нагадаў размову з маці, і настрой яе зноў сапсаваўся. Яна шчытней прысунулася, каб хутчэй адагнаць прэч нядобрае, тварам да шыбіны. Але і гэта не дапамагло, бо тае ж хвіліну цішу за вакном працяў, абвясціўшы пачатак чарговага начнога лову, працяглы гук бубна.*

*Яна зашмаргнула шыбу фіранкаю, расклала ложак, распранулася. Ныркнула пад коўдру ў спадзеве адразу ж заснуць, ды таксама дарэмна. Ледзь змежыла павекі, як цьмяныя пачвары, ні то вужакі, ні то вугры з выгінастымі даўгімі целамі зава-*

*рушыліся наўкола, папаўзлі па століі, па сцяне, па падлозе.*

*Срэбнабокі, гатовы да адплыцця ў мора Сяродморскае вугор (ці мо вугрыха, халера яго ведае) плёснуўся ў слоіку на стале, абдаў растузаныя одумам глузды Кіці пырскамі ці то дакору, ці то спачування і заціх, прымглёны сполахамі трывожнага, як зарыва бліскавіцы ўдалечыні, арабінаваружовага сну.*

Стужка перавярнулася ў слоіку, пашукала вачыма Стужыка. Адшукала і адразу адчула палёгку. Ноч яны правялі амаль што ўпобачкі, раздзеленыя адлегласцю ў даўжыню пакоя. Бачыць адно аднаго замінала цямрэча, і, каб нагадаць другому пра сябе, заставалася плёхацца бакамі аб сценкі слоікаў. Штораз гукі прыцягвалі ўвагу Драмадэра, і ён падоўгу сядзеў побач у чаканні дармовае пачосткі. А аднаго разу, акурат хвілін дзесяць таму, наважыўся нават прасунуць у гарляк пасудзіны кіпцюрыстую сваю лапу. І невядома, чым бы ўсё вось і зараз скончылася, калі б не запалілася святло і ў пакой не ўвайшлі цюхі з чарговаю порцыяй улову.

Здабыча гэтым разам была не так сабе: усё больш вугры і нават велізарны, падобны на баракуду — гэткая ж страхавітая пашча, гэткая ж магутная, з наросцем спіна — шчупак. З пашчы драпежніка тырчаў хвост нейкай рыбіны, ці не ярша, якога сквапнюга праглынуў, мабыць, ужо ў торбе, а зараз ніяк не мог даць рады выпхнуць з горла і толькі адчайна рухаў сюды-туды зраненымі яршовымі плаўнікамі шчэлепамі.

Кіці ўвайшла следам за рыбаловамі ў памяшканне, выхапіла шчупака з кучы, паласнула нажом па падшчэлеп'і.

— Ну, а цяпер з гэтымі разбярэмся, — сказала і ўзялася раскладваць упоперак стала прынесеных вугроў. — І скуль бяруцца гадаўё? Здаецца, месца вольнага няма ў возеры ад начыння, а на табе: трапляюць ды трапляюць, і канца ім не бачна...

— Будзе, як з андатрамі: нішчылі, нішчылі, а ўсё адно не-не ды і натрапіш на каторага, — сказаў Валер і махнуў рукою. — Супраць прыроды не папрэш.

— Нам што? — ціхмяным голасам, нібы апраўдваючыся, азваўся цюх-панурчык. — Наша справа — рабіць, як кажуць, а астатняе нас не тычыцца. Загадалі лавіць — мы і ловім.

— Твая праўда, — падтакнула з'едліва Кіці і нахілілася над сталом. — Толькі вось што будзем рабіць, як скончыцца ўся гэтая маліна? Быдла пазбыліся, зямлю ўрабляць развучыліся — чым не пустадомкі...

Увесь час, што Кіці завіхалася ля прынесеных вугроў, Стужка ўважліва сачыла за кожным яе рухам. Спадзеў, што ўсё пераменіцца і яны са Стужыкам апынуцца разам, не пакідаў яе.

Але цуду не здарылася. Кіці колькі хвілін памарудзіла, затым спрытна падхапіла яе тронкамі нажа, скуліла ў другую, што стаяла ўпобачкі з той, адкуль ужо ўважліва сачыў за імі ў трывожным чаканні Стужык, балею.

Здранцвелыя, скаваныя страхам целы іншых вугроў абкружылі Стужку, і цяпер, калі іх са Стужыкам зноў гэтак фатальна разлучылі, гэта было адзінае, што яднала яе з астатнім светам і надавала гэтаму свету хоць нейкі сэнс.

Валер выцягнуў са схову пад сталом бутэльку, хуценька адкаркаваў зубамі, падаў Кіці. Тая пахапліва адхлюбнула, перадала пітво трэцяму.

— Ну, улагодзілі, дзядзькі, улагодзілі, — сакатала падабрэлым голасам, пераразаючы напалам прыкалянелага і пасінелага шчупака. — Зусім іншая цяпер справа! — І, патрымаўшы кавалкі рыбіны наперавес у адной і другой руцэ, быццам узважваючы ды сумняваючыся, каторага з хаўруснікаў-палюбоўнікаў ашчасліваць большым, аддала Валеру і цюху-панурчыку.

— А госці ж як? — не вытрымаў, пацвеліўся Валер. — А начальства? Га?

— Фугу на іхнія пашчы, — адказала яна злосна і накрыла балею, дзе быў Стужык, вечкам з дробненькіх, перахопленых драцінаю дашчэчак.

— Добра накрывай, а то крый Бог паўцякаюць — будзе тое, што Люціку, — сказаў цюх-панурчык.

— А што Люціку? — навострыла вушы Кіці.

— А тое! Нераты, дурань, падзіравіў уначы і папаўся. Паэт Ямбук, што лазню пры возеры пад леціішча летась атрымаў ад ваяводы ў якасці ўзнагароды за лепшы вершык у гонар датэрміновага зарыблення новых сажалак, упільнаваў ды данёс інспектарам з «Краёвага Штаба Рыбалова». Тыя і загрэблі цёпленькага, зараз адседжваецца ў пастарунку. Вугроў, бач, шкада яму стала...

— Во як! Я і не ведала нічога, — сказала Кіці і ўсклала на балею дзеля надзейнасці цагліну.

Тройца пайшла, і нецвярозыя крокі яе спакваля аціхалі, аж пакуль дарэшты не стаялі ў сутарэнні калідора.

Яна вызваліла сціснутае з усіх бакоў іншымі палоннікамі цела, прыхінулася пысаю да шкла. Наўкола было светла, паўз залепленую лускою фіранку на вакне ў пакой лагодным струменем лілося сонца.

У хаўрусе, што з грукатам уваліўся ў памяшканне, з сярэдначнае тройцы была толькі Кіці. Яна паздымала вечкі з балеяў, акунула дзеля чагосьці па чарзе ў ваду рукі, загадала несці абедзве балеі ў калідор.

— Шчупак дзе? — сказаў, пыхкаючы цыгаркаю, адзін з цюхаў. — Сплыў, ці што?

— Ага, на Галапосы* папёрся, — азвалася жартаўліва Кіці і ўшчыкнула дзецюка за бок. — Цешыцца морам разам з пінгвінамі. Сплыў, і насып яму солі на хвост!

— На Галапосах чарапахі і ігуаны, а не пінгвіны, — чухнуў патыліцу цюх і ўзяўся за ніз балеі, дзе быў Стужык. — Вось даказаць на вас, як казённым дабром распараджаецеся, будзеце ведаць....

— А ты дакажы, паспрабуй! — жэкнула Кіці. — Толькі на свае грашкі не забудзься, даказчык! Дакажа ён!

Яна выхапіла з суседняе балеі нейкую дробную рыбіну, што невядома якім чынам аказалася ў гурме вугроў, кінула на дол. Драмадэр маланкаю жвыхнуў з-пад стала на здабычу, і праз хвіліну ад той засталася толькі пляма на падлозе.

Цюхі пабралі па двое балеі, панеслі з пакоя. Узгрузілі ў двары па чарзе ў машыну, адпусціўшы на адрас Кіці, што з пакрыўджаным выглядам выйшла іх праводзіць, колькі з’едлівых рэплік, улезлі ў кузаў. Калматае стварэнне выскачыла з дзвярэй, незадаволенае чымсьці, зласліва мяўкнула. Машына кранулася з месца, памчалася прэч ад будынка.

Стужка вывернулася з-пад целаў, каб паглядзець, дзе другая балея. Тая калыхалася ўпобачкі. І хоць угледзець Стужыка ў клубку іншых палон-

* Галапагосы.

нікаў было немагчыма, пэўнасць, што ён тут, побач, супакоіла яе.

Будынак, да якога іх прывезлі, быў зусім непадобны на папярэдні. Ва ўсялякім разе луской і цінаю тут не смярдзела. На фасадзе цешыў вока кідкаю адозваю «Ешце сваё!» велізарны плакат з выяваю рыбінага хваста і дададзенай понізу нейкім пракудам прыпіскаю «жарыце!», усюды было чыста. Ды і цюхі, якія сустрэлі іх пры дзвярах, выглядалі зусім іначай, чым тыя, у цэху. Фацэтны, пры камізэльцы цюх увесь час, што згружалі балеі з машыны, ветліва ўсміхаўся, гэткімі ж ветлівымі і абыходлівымі былі дзве ягоныя памочніцы.

Балею са Стужыкам знялі з кузава, панеслі ў прыбудову з комінам. Стужка спадзявалася, што і іхнюю панясуць туды ж, але атрымалася іначай. Балею ўнеслі ў калідор, і адразу ж з'явіліся следам цюхі-памочніцы з трохколкаю, на якой стаяла шкляная скрыня з вадою і пукамі водарасцяў пасярэдзіне і ўсцяж бакавін. Адна з цюхаў усунула ў балею падхватнік, павадзіла ім па дне і тут жа выхапіла вонкі, перакуліла ў скрыню. Такую скрыню Стужка аднойчы ўжо бачыла: цюшонак-нямко, які гады два таму злавіў яе венцерам, а потым насуперак нязгодзе бацькі выпусціў у возера, называў яе акварыумам. І гэтая была якраз такая ж, толькі больш шырокая.

Вада ў акварыуме была значна цяплейшая, як у балеі, і больш шорсткая. Засланае ж жвірам дно, наадварот, больш прахалоднае. Збоч водарасцяў у куце пыхкала пухірамі тонкая, бы камель трысьнягу, трубка.

Фацэтны цюх увайшоў у калідор, загадаў везці акварыум далей. Цюхі скранулі трохколку з мес-

ца, пакацілі праходам у процілеглы канец калідора, адтуль — у садок, на ўскрайку якога бялеўся абсаджаны экзатычнаю расліннасцю будынак з расфарбаванымі ў розныя колеры вушакамі і налічнікамі.

Мажная цюха ў капелюшы з аздобаю ў выглядзе брошкі з выяваю вугра адчыніла ім дзверы, акварыум знялі з трохколкі, асцярожна — дываны надта дарагія, папярэдзіла цюха — унеслі ў памяшканне, усцягнулі на пастамент з невыразнаю разьбою на тэму ўдарнае працы арцельшчыкаўрыбаловаў.

— Мабыць, няроўна крыху, — сказала цюха і, схіліўшы набок галаву, цмокнула языком. — Сюды пасуньце!

— Так клапоціцеся, быццам немаведама якіх гасцей чакаеце, — сказаў адзін з тых, што кацілі скрыню.

— А то! — прамовіла цюха і папракіла даланёю на капелюшы брошку. — Не жартачкі вам: Дзень Бубна адзначаем! Сам намеснік ваяводы абяцае прыехаць. Шэф службы бяспекі, як заўжды, рэферэнт таксама. Паэт Ямбук, ці як там яго... Яшчэ нібыта, чуткі ходзяць, з замежнікаў хтосьці, з тых, што цэх абяцаюць пераабсталяваць... Во колькі, як не клапаціцца, як не біць ногі.

— Забава, відаць, нішто сабе будзе.

— Ну, ужо ж! — цюха скрушліва пахітала галавою, і твар яе, дагэтуль бездакорна белы, пакрыўся плямамі абурэння. — Мінулы раз спаборніцтва ўладзілі: хто рыбіну далей кіне. Мала не паўтоны язя збаёдалі, кідаючыся... А што зараз змысляць, аднаму Богу ведама.

У залу ўкаціліся чатыры круглаватыя цюхі-маладзіцы, узяліся накрываць абрусамі сталы ўздоўж сценаў.

Цюха адышлася да сцяны, зірнула зводдалеку на собскі адбітак у люстэрку на бакавіне пастамента. Зірнула і з жахам адхіснулася ўбок. Азіраючыся штоаразу на цюхаў пры сталах, употай адшпіліла з капелюша брошку з выяваю вугра, пайшла з памяшкання.

*Кіці сядзела ў пакоі пры вакне, глядзела, як кулогаюцца на двары ў сажалцы гусі. Уздыхала раз-поразу: яна ды гэтыя мурзатыя ненажэры гусі — вось, мабыць, і ўсе, хто застаўся ў паселішчы. Ды яшчэ, праўда, маці, што нацягалася з раніцы ад возера з рыбаю і зараз ціхамірна адпачывала-пахрэпвала ў сваім пакоі. Дзень Бубна, вялікае свята, усе падаліся на баль. Апошняе аўто з гасцямі прамчалася паўз хату з паўгадзіны таму, і з тае хвіліны каб прыкмета руху на двары, усё нібыта вымерла.*

*Крыўда ахапіла знэнджаную чаканнем істоту Кіці, працяла сэрца стрэмкаю ўсведамлення відочнае несправядлівасці. Дзень Бубна, здавалася б, каго і запрасіць найперш на святкаванне, як не яе. Яе, у чыіх жылах не тое што нейкая там мізэрная кропля — цэбры памяці знакамітых, калі матцы ды прывезеным Люцікам з архіўных сховішчаў дакументам веры даваць, на паўсвету (ды што там на паўсвету — на свет цэлы) бубначоў.*

*Узяць хаця б першага з вядомых яе продкаў. Такія бубны дзядзька зладжваў з цялячых скураў, што ніводзін іншаземец не мінаў нагоды іх набыць. Маці кажа, адзін з ягоных бубнаў нават у далёкай Цюханіі Прыморскай два вякі таму прыдаўся падчас нейкага там нутранога закалоту, гэткі меў гучнапрынадлівы голас. А цяпер нібыта ў адным з тамтэйшых музеяў захоўваецца як найкаштоўнейшы гістарычны экспанат. Ці вось прадзеда яе па мянуш-*

*цы Кульгавы з сабачае скуры бубны, што пазней ужо, у сярэдзіне пазамінулага стагоддзя, у часе пакарання паўстанцка-інсургенцкай зброднi тут, у Азёрнай Цюханіі, і пасля яе, як улада памянялася, падчас жалобных цырымоній у гонар тых пакараных паўстанцаў не абы-якім карысталіся попытам. А колькі вяльможных і не надта галоваў паляцелі з плячэй пад гукі экспартовых тутэйшых бубнаў у розных краях ды краінах, а ўзрастанню патрыятычнага духу колькіх каленаў малечы ў самой Азёрнай Цюханіі яны паспрыялі! А колькімі вясельнымі ды іншымі маршамі пацешылі тубыльцаў, узвысілі іх сярмяжныя душы суладным боем ляскотак ды калатушак. І ўсё забыта, адрынута навекі, быццам нічога і не было такога ў прыродзе? Але што зробіш, калі гэтак сярод людства: хто найбольш варты ўвагі ды пашаны, таго зазвычай і абыдуць больш увішныя ды спрытныя.*

*З раніцы заходзіла Ядзя, казала, што абедзвюх іх таксама маюць намер нібыта запрасіць. Але вось і ссутоньвацца пачало, а ніякага знаку прыходзіць ніхто ёй, Кіці, так і не падаў. Можа, забыліся? І Ядзя штосьці не адзываецца, мабыць, гэтаксама сядзіць у самоце, чакае запрашэння. Цікава, ці запросяць жа замежніка, што быццам снег на галаву зваліўся, заявіўся акурат учора доўжыць перамовы наконт пераабсталявання цэха. Кажуць, дзяцюк нішто сабе і Ядзя ўжо нібыта падбівае пад яго кліны.*

*Яна ўздыхнула, не жадаючы болей квяліць душу, уключыла прыймач. Як на тое, па радыё распавядалі пра падрыхтоўку да Дня Бубна.*

*Авохці!*

*Кіці выключыла прыймач, разгарнула «Навіны краю». Вочы слізганулі па радках, спыніліся на зды-*

*мку понізу старонкі. Як сведчыў подпіс да здымка, службовец з «Краёвага Штаба Рыбаловаў» дэманстраваў на ім страпарэз, якім студэнт папсаваў надоечы ўначы некалькі невадаў, а пасля, ці то ахоплены страхам пакарання за ганебны ўчынак, ці то забрытаны прыступам вар'яцтва, у дадатак да ўсяго зраўняў з зямлёю падмурак колішняе фабрыкі бубнаў. Побач са службоўцам стаяў на тле вязніцы з закладзенымі за спіну рукамі сам зламыснік і кпліва пасміхаўся. У тэксце збоч здымка паведамлялася, што затрыманне прайшло гладка і зараз студэнта чакае заслужаны вырак.*

*Шкадоба агарнула Кіціна сэрца. Яна паднялася з месца, адчуваючы, як з кожнаю хвіляй дужае, набіраецца ў грудзях моцы хваля спагады да хлопца і адначасна — нянавісці да яго і сваіх крыўдзіцеляў, нервова захадзіла па пакоі. Маці ў суседнім пакоі, відаць, пачула яе крокі, паляпала даланёй па перабойцы.*

*Яна суцішылася, яшчэ няпэўная, што будзе рабіць далей, усторкнула на ногі туфлі, пайшла да дзвярэй. Выйшла на двор, рашучым крокам пашыбавала ў накірунку пастарунка.*

*Ля пастарунка, невысокага, перарobленага з клеці будынка без даху, было, як і ва ўсім паселішчы, бязлюдна. Нават вартавога не было бачна — няйначай, выправіўся разам з усімі святкаваць Дзень Бубна.*

*Кіці паднялася па драбінах да перакрапанай сеткаю маціцы, зазірнула ўнутр клеці.*

*Люцік ляжаў з расплюшчанымі вачыма на капе саломы і з сумам глядзеў на аблокі, што чарадою плылі над галавой. Яго аголены маладыя жывот са жмутам цяглiцаў і ладным вандзэлкам мужчынскае годнасці понізу — кашуля задзёрлася і даходзі-*

*ла яму амаль да грудзей — уздымаўся ў такт дыханню, а ўся поза была такая кранальная, што Кіці ледзь стрымалася, каб не гукнуць няшчаснаму што-небудзь пяшчотнае.*

*Вязень колькі хвілін неўразуменна ўзіраўся ў яе, затым страпянуўся, імкліва падхапіўся з капы.*

*— Вы? — прамовіў і сарамяжліва аправіў на жываце кашулю. — Што вы тут робіце?*

*Кіці моўчкі згрэбла на край маціцы сетку, прывязала адным канцом да бэлькі, другі кінула студэнту. Ён спрытна падцягнуўся па сетцы ўгору, перакуліўся паўз маціцу на драбіны, спусціўся следам за ёю долу.*

*— Чаму вы гэта зрабілі? — спытаў і абдаў яе перарывістым дыханнем.*

*— Таму што ты не маргінал, — напусціўшы на сябе загадкавасць, адказала яна і тузанула Люціка за ніз кашулі. — Да таго ж... — Але дагаварыць не паспела: хтосьці набліжаўся да будыніны. Крокі то гучалі напоўніцу, то аціхалі, і тады з-за рога клеці чуўся стоены смех уперамешку з шэптам. Кіці штурхнула студэнта за куст парэчак, прыклала да вуснаў палец: — Ц-с-с...*

*На слаба асветленую адзіным, аблепленым роем жамяры ліхтаром пляцоўку выйшлі з-за клеці Панурчык і Ядзя, штохвіліны цалуючыся, пасунуліся да стажка, што чарнеўся скасабочанаю аблавухаю наўзбоч арцельнага гарохасховішча.*

*— О-о-го-о! — прамовіла Кіці і, каб не страціць раўнавагі, на ўсялякі выпадак мацней учапілася ў ніз студэнтавай кашулі. Але не дала сабе рады, усё-ткі пахіснулася — такім вялікім было ўзрушэнне ад убачанага. Рука яе аслабела, бездапаможна слізганула уздоўж студэнтавых сцёгнаў, упёрлася ў калянае на ўзроўні шырынкі.*

*Хлопец схапіў яе за запясце, быццам жадаючы дадаць запалу, якога яна пазбылася ў выніку сведчання Панурчыкавай памаўзлівасці, расшчаперыў яе пальцы, абвіў імі калянае.*

*Кіці ўдзячна прыхінулася да Люціка, не маючы ані сілы, ані жадання працівіцца ягонай пяшчоце, абвіла рукамі за стан.*

*Мужчынскае надзейнае плячо — вось што больш за ўсё ёй зараз патрэбна, вось што толькі застаецца ёй, кінутай у вір роспачы здрадлівымі каханкамі ды ўсімі гэтымі забыўліва-абыякавымі чынушамі, што гэтак бессаромна абышліся з ёю, не запрасіўшы на Дзень Бубна.*

*Яна рэзкім рухам галавы распрастала валасы, рассыпала іх вакол Люцікавай галавы, павольна, бы ў сне, пачала асядаць долу. Студэнт глуха войкнуў, падставіў рукі, каб не даць ёй упасці, але і сам не ўтрымаўся, абмяклым кулем прызямліўся побач. Падсунуў рукі ёй пад спіну, пачаў сквапна, бы знашчаны марцовы кот, цалаваць.*

*— Ну, што ты, што ты, дурненькі? — енкнула яна нібы ў адчаі ад ягонае настойлівасці і сама не заўважыла, як няўзнак расшпіліла вольнаю рукою два верхнія гузікі кофты. Падумала, што, мабыць, варта расшпіліць і трэці, і ўжо памкнулася тое зрабіць, ды не паспела. Хлопец з такім імпэтам рынуўся ёй памагаць, што гузікі самі — усе сем, нават з рукавоў — разляцеліся ўбакі.*

*Яна паманулася шнарыць рукамі наўкола ў пошуку іх, але беспаспяхова. «Ат, новыя прышыю», — падумала наастатак і заплюшчыла вочы ў салодкай знямозе.*

Колькі часу было зусім ціха. Але чым больш ссутоньвалася на дварэ, тым выяўней адчуваўся рух

з калідора. Запахла смажаным-вараным. Цюхі ў фірмовай апратцы замітусіліся сюды-туды з талеркамі ды місамі са стравамі і бутэлькамі з напоямі на падносах.

Рэй вёў фацэтны цюх. Цяпер ён быў у дыхтоўным гарнітуры і пры пальчатках, і сіваватыя яго валасы пасамі спадалі на каўнер, зліваліся з колерам тканіны. Наглянцаваныя да бляску відэльцы і нажы пераліваліся срэбрам у святле бра, зялёныя люстры ціха пакалыхваліся ў такт крокам банкетнай чэлядзі.

Першы госць, ён жа рэферэнт управы, прыбыў а сёмай. Ягонае прозвішча аб'явіў фацэтны цюх па паперцы, і ўсе з абслугі, хто заставаўся на гэтую хвіліну пры сталах, схілілі галовы ў пашанотным паклоне.

Следам за рэферэнтам, літаральна праз колькі хвілін з бакавога ўваходу ўляцелі ў залу два бамбізы. Па тым, як заўзята пачалі яны даследаваць шчэлкі паміж сталоў ды куты па-за імі, абглядаць ды абнюхваць стравы, няцяжка было здагадацца: служба бяспекі. Упэўніўшыся, што ўсё добра, службоўцы рынуліся дакладваць пра тое начальству, што, мяркуючы па паху тытуню, які даносіўся з суседняга, для VIP-персонаў, памяшкання, таксама ўжо было тут.

Наступным увайшоў у залу цюх у белай пляжнай кепцы з брылём набакір. Слізгануў вокам па сталах з закуссю, аблізнуўся ды сеў у фатэльчык пры вакне.

— Паэт прыйшоў! Паэт! — крыкнула адна з цюхаў і з бляскам у вачах, што сведчыў пра немалую ступень экзальтацыі, кінулася да яго праз залу з нататнікам для запісу замоваў па аўтограф.

Цюх у кепцы дастаў з кішэні пінжака самапіску, грамзануў штосьці ў нататніку, і выраз скрайняга голаду ў ягоных вачах саступіў месца млявай задаволенасці. Увагу ягоную прыцягнуў акварыум. Ён няўклюдна, ажно віскнулі па паркеце ножкі фатэля, падняўся з месца, падышоў бліжэй да пастамента. Ляпнуў раз і другі самапіскаю па баку скрыні, здзіўлена пахітаў галавою, пайшоў прэч. Праз хвіліну ён зноў сядзеў у фатэлі, пазіраючы раз-пораз здалёку на акварыум, шырока пазяхаў.

Гасцей тым часам усё болела і болела, і Стужка ледзьве паспявала сачыць за новымі. Дзе быў Стужык, яна па-ранейшаму не ведала, але адчуванне, што яны неўзабаве спаткаюцца, не пакідала яе.

Апошні ўвайшоў у залу пад бой турэцкіх бубнаў намеснік ваяводы. Ён напярэдадні атрымаў справаздачу падначаленых аб бясспрэчнай перамозе ў змаганні супраць вугрыных інтрыг-падкопаў і ўсім сваім выглядам дэманстраваў, што дзяліцца яе вынікамі ні з кім, апроч хіба што самога ваяводы, не збіраецца. Яго высозная, хоць крыху і вузкаватая ў плячах, атуленая рудым строем з блішчастаю спражкаю на поясе постаць была такая ўнушальная, што ўсё наўкола на фоне яе вачавідзь здрабнела, зрабілася бляклым і невыразным. Нават капялюшык на галаве мажнай цюхі з пукам гарохавых суквеццяў замест брошкі-выявы вугра — і калі паспела прычапіць? — перастаў хістацца, а сурвэткі на сталах увобміг сшарэлі, бы звычайныя анучы. Намеснік акінуў залу засяроджаным паглядам, накіраваўся ў суправаджэнні фацэтнага цюха да свайго — у сярэдзіне залы, тварам да пастамента — месца.

Гурт людзей у адмысловых апратках з арнаментамі, што дагэтуль ціхамірна назіраў за ўсім, што

дзецца, з дальняга, адгароджанага ад сталоў падстаўкамі з кветкамі кута, падняў угору смыкі, зайграў немудрагелістую, але цёплую, як відарыс падчас цвіцення гароху на тутэйшых палях мелодыю. Нягучная, ды досыць бадзёрая, яна напоўніла залу, разлілася ў жоўтым ад святла люстраў і бра, наэлектрызаваным прысутнасцю не абы-якіх гасцей паветры.

Імпрэза пачалася.

*Кіці прахапілася ад забыцця, расплюшчыла вочы. Зорак Вялікага Каўша, звыклых для позірку ў гэтую пару, на небе не было бачна, усё яно спрэс было зацягнутае хмарамі. Але, надзіва, гумору гэта ёй не сапсавала. Наадварот, чым пільней узіралася яна ў пустое неба, тым больш адчувала сябе шчаслівай. Люцік схіліўся над ёю, з няўцямна-захопленым выразам маладога самца на твары — што значыць упершыню паспытаць салодкасці жаноцкага цела — упетрыўся паглядам у яе вочы.*

*— Колькі часу? — спытала яна як мага больш будзённым голасам і абаперлася на локці.*

*Люцік памкнуўся зноў паваліць яе, але яна не далася.*

*— Трэба ісці, — сказала і спружыніста пацягнулася. Адчуванне ўзлёту, якое яна толькі што перажыла побач з Люцікам, неўпрыкмет адцясніў прывід шэрае будзённасці, што не прамарудзіў азвацца з паселішча спачатку працяглым мычэннем каровы, затым, праз хвіліну, — гусіным гергетаннем, і працівіцца яму не было ў яе ні сіл, ні жадання.*

*Яна паднялася, пачала пахапкам апранацца. Падумала, што няблага было б усё-ткі сабраць павырываныя падчас валтузні з Люцікам гузікі, але не стала таго рабіць: час змарнуеш толькі, а дома,*

*можа, ужо чакае хто з запрашэннем на свята. Нікуды не дзенуцца тыя гузікі, уранку, як развіднее, можна прыйсці ды сабраць.*

*Люцік таксама падхапіўся з долу, не жадаючы адпускаць яе, абхапіў рукамі за стан.*

*— Пусці, — сказала яна рашуча і вызвалілася з абдоймаў.*

*— А мне куды?*

*— Куды? Уцякаць, куды яшчэ... — не паспела яна дагаварыць, як здалёку пачуліся мужчынскія галасы.*

*Яны хіснуліся з пляцу ў кустоўе, стаіліся ў надзеі, што іх не заўважаць.*

*Мужчыны (у адным Кіці пазнала стрыечнага Валеравага брата Зютака, другі быў ёй незнаёмы) выйшлі на пляц, спыніліся якраз насупраць іх. Пук святла ад ліхтарыка ўпаў на месца, дзе яны толькі што са студэнтам мілаваліся, застыў на адным з гузікаў. Незнаёмец нахіліўся, каб падняць яго, і ягоная пастава кальнула пагляд Кіці прыкметамі нетутэйшасці: дагледжаная, дарэшты абголеная галава, шорцікі з налепкамі абапал кішэньчыкаў, модная, з ушыўкамі ад пляча да пляча кашуля. На грудзях у мужчыны боўтаўся бэдж з фоткаю, акурат такі, якімі фарсяць на тэлеэкранах падчас розных фэстаў кіназоркі.*

*Вось яно — іншаземец!*

*Яна адпіхнула Люціка прэч, ціха слізганула далей у хмыз, да сцежкі, што вяла да хаты.*

*Маці яшчэ не спала, сядзела ў сваім пакоі, прамаўляла на ружанцы «Вітай, Марыя!», і яе глухаваты голас то ўзносіўся да патэтычных інтанацый, то, наадварот, пакорліва сцінаўся, то зусім аціхаў, каб праз хвіліну прабіцца зноў ды запоўніць сабою да вусціш ўрачыстую цішыню паўпустое хаты.*

*Кіці сцягнула з сябе кофту, раз-пораз прыслухоўваючыся да матчынага голасу, апранулася ў чыстае — так, на ўсялякі выпадак: а раптам не забыліся дарэшты на яе арганізатары свята і надумаюцца ўсё-ткі запрасіць. Хоць якія там запрасіны аб адзінаццатай гадзіне...*

*Маці скончыла адмаўляць ружанец, і словы малітваў за перабойкаю саступілі месца звыклым старэчым охам-уздыхам.*

*Нехта ўзышоў на ганак, тоўхнуў дзверыну. «Люцік!» — падумала яна і хіснулася ў сенцы з намерам прагнаць маладзёнчыка прэч.*

*На парозе стаялі, асветленыя кволым святлом ад заседжанай мухамі лямпачкі, Зютак і іншаземец.*

*— Пазнаёмся, Касюля, гэта Крыстоф, — сказаў Зютак. — Дзякуй Богу, адшукалі ўрэшце цябе... Збірайся, госці чакаюць.*

*Іншаземец моўчкі дастаў з кішэні жменю гузікаў, з пачцівай усмешкаю на твары працягнуў Кіці.*

*— То не мае! — паспяшалася яна адхрысціцца ад дарунка і шмыганула назад у хату, каб дадаць да святочнага гардэроба андатравую сваю — прыдалася-такі ўрэшце! — гаржэтку. Похапкам ускінула гаржэтку на плечы, зноў хіснулася ў сені, дзе чакалі Зютак і іншаземец.*

*Зютак памкнуўся падаць ёй руку, каб памагчы сысці з ганка, але яна, не заўважыўшы гэткае абыходлівасці, пахінулася да Крыстофа, з пяшчотаю коткі, што вось-вось пухнатым дыванком расцягнецца ля ног, абаперлася аб ягонае плячо.*

*— Ды кіньце вы гэтую дрэнь, — сказала са смехам і расшчапіла пальцы левае рукі іншаземца з гузікамі.*

*— Так, так, — пагадзіўся ён і няўзнак дакрануўся рабрынаю далоні да пругкага, наструненага*

*прадвесцем здзяйснення прадаўняе мары Кіцінага клуба.*

Музыкі гралі ўсё шпарчэй, да скрыпак далучыліся цымбалы і бубны, гасціна ўсё больш і больш разнявольвалася. Увялі брахлівую жывёліну з абручам з паўжывога вугра на галаве і бразготкаю з запоўненага сушаным гарохам гусінага гарляка на шыі, і яна пад рогат застолля выканала пад акампанемент усё тых жа музыкаў танец з прысяданкамі. Адзін за адным пачалі пускацца ў скокі парамі цюхі. І неўзабаве ўся зала нагадвала вялізную танцпляцоўку. Цюхаў-маладзіц было, аднак, замала, і ўсе з нецярпеннем чакалі папаўнення, па якое фацэтны цюх з гадзіну таму выправіў у паселішча аднаго са сваіх падначаленых. Сярод тых, каго неўзабаве прывялі, была Кіці ў шыкоўнай гаржэтцы з устаўкамі з лебядзінага пуху, яе суправаджаў зухаваты дзяцюк гадоў трыццаці пяці з бэджам на грудзях, што сведчыў пра нетутэйшае падданства. Яшчэ праз колькі хвілін да іх далучылася яшчэ адна цюха, якую Стужка бачыла неяк у цэху і памятала нават яе імя — Ядзя.

Час ад часу каторы з гасцей, прытомлены гулямі, падыходзіў да акварыума, пачынаў вадзіць далонню па прыпацелым ад выпарэнняў шкле, і тоўстыя яго, з плямамі тлушчу ад страваў пальцы здаваліся Стужцы клюшнямі.

Намеснік ваяводы з чынна-задуменным выглядам сядзеў за сталом у атачэнні аховы і задаволена ўсміхаўся. Акцыя па выкараненні вугроў праходзіла ўдала, газеты стракацелі расповедамі аб рэзкім скоку спажывання людам паспалітым рыбы, неймаверна ўзрос экспарт у замежжа рыбных далікатэсаў — чым не падстава быць у гуморы?

Тым больш, што неўзабаве павінны адбыцца чарговыя выбары ваяводы, і хоць ніхто нібыта не сумняваецца ў іх выніках ды ў тым, хто будзе галоўным фігурантам цырымоніі інагурацыі, чорт ведае, якім бокам яно ўсё павернецца? Раптам падфарціць, і не Амяле, насуперак прагнозам газетчыкаў, аддадуць выбарцы галасы, а яму, намесніку...

Час ад часу намеснік уздымаў вочы, пагляд ягоны спыняўся на Кіці, дакладней, на яе шыкоўнай андатравай гаржэтцы, і выраз утрапёнай задуменнасці на ягоным твары саступаў месца грымасе незадаволенасці. Рэферэнт падскочыў да Кіці, штосьці прашаптаў ёй на вуха. Абое падняліся, некуды пайшлі і праз колькі хвілін вярнуліся зноў, Кіці гэтым разам ужо была без гаржэткі.

Паэт Ямбук раз-пораз ускокваў з месца, парываўся нешта казаць, але яго ветліва асаджалі: час паэзіі не наспеў, маўляў, пачакай. Чакаць, па ўсім было бачна, заставалася доўга, бо ўсё новыя і новыя стравы ўносілі ў залу і неўзабаве ўсім наогул стала не да паэзіі.

Намеснікззбіраўся адыходзіць і ўжо падняўся з месца, як аб'явілі забаву. Эксклюзіўную, пабяцаў фацэтны цюх і запрасіў на сярэдзіну залы каго-небудзь з гасцей. Ахвочых выйсці не знайшлося, і тады намеснік загадаў зрабіць гэта самому гаспадару залы. Фацэтны цюх хвіліну паўпіраўся, але пагрозлівы пагляд намесніка тут жа яго ацверазіў, і ён пад гучныя воплескі гасцінны падаўся ў круг.

Сутнасць забавы заключалася ў тым, каб выхапіць з акварыума на пастаменце аднаго з вугроў, трымаючы за галаў і хвост, разгайдаць ды і пераскочыць, бы праз скакалку.

Спроба фацэтнага цюха аказалася няўдалаю. Ледзь ён выхапіў вугра з вады, як той выслізнуў з

ягоных рук на падлогу. Хтосьці падчапіў яго чаравікам, адштурнуў пад стол. У зале засвісталі, намеснік схмурыў бровы.

Напружаную цішыню, што ўсталявалася следам за свістам, парушыў знябожаны доўгім чаканнем голас паэта.

— Можна, я пачытаю? — сказаў ён і дастаў з-за пазухі паперчыну.

Намеснік яшчэ больш схмурыўся, зірнуў спадылба на шэфа службы бяспекі. Той ускочыў з месца, пазвоньваючы медалямі, што бліскучым шыхтам размясціліся ад шыі да нізу пінжака, з суворым выглядам накіраваўся да Ямбука.

Усе сталі дыханне ў чаканні, што будзе далей.

Шэф службы бяспекі прабег вачыма па паперчыне, і выраз ягонага твару прыкметна памякчэў.

— Можна, — сказаў ён паблажліва і пайшоў да свайго месца.

Узбадзёраны высокім дазволам Ямбук лісліва крэкнуў, набраў у грудзі паболей паветра, пачаў дэкламаваць.

Вершык быў прысвечаны Дню Бубна, а заканчваўся падзякаю прысутным высокім гасцям за бацькоўскі клопат пра ўзрастанне дабрабыту цюхаазёрненскага люду. Уражаная яго зместам, а яшчэ больш незвычайнасцю — з павышэннем ды паніжэннем голасу ў найбольш патэтычных месцах — чытання публіка выбухнула воплескамі. Мажная цюха сарвала з капялюшыка пук прывялых гарохавых суквеццяў, уздзела паэту на галаў. Затым, палічыўшы, відаць, што ўсяго таго замала, яго паднялі на рукі, з гвалтам і гіканнем уссадзілі на пастамент побач з акварыумам.

Тым часам, пакуль ён там сядзеў і думаў, як спусціцца долу, зноў успомнілі пра забаву.

Гэтым разам паспытаць шчасця вырашыў рэферэнт.

Стужка, баючыся, што ягоны выбар падзе на яе, вільнула хвастом, глыбей зашылася ў прасвет паміж цінаю і целам суседа. Самавіты госць адным сваім выглядам — рудыя, бы нафарбаваныя вусы, шырокія сківіцы з барадаўкаю наўзбоч — яе палохаў. А каля яна ўбачыла скіраваныя на яе голаў тоўстыя пальцы з поўсцю понізу суставаў і нават адчула іх халодны, бы ад каменя ўзімку дотык, сэрца яе і наогул зайшлося ад страху.

На шчасце, дзяцюк выбраў не яе, а суседа. Гэта яна зразумела ўжо тады, калі цела няшчаснага вымкнулася з вады і бездапаможнаю вяроўчынай абмякла ў чэпкіх далонях першага.

Рэферэнту пашанцавала больш, як фацэтнаму цюху, ён не толькі скочыў праз жывую скакалку, а нават паспеў ляснуць ёю ў паветры, бы пугай.

— Супер, — сказаў намеснік і ўпершыню за ўвесь вечар падняўся з-за стала. Затым адсунуў фатэль убок, лёгкім і крыху віхлястым, бы эквілібрыст на канаце крокам пачаў набліжацца да пастамента.

І зноў Стужку ахапіла трывога. У акварыуме апроч яе знаходзіўся толькі адзін вугор, і шанц на выратаванне быў зусім нікчэмны.

Але ёй зноў пашчасціла. Намеснік патрымаў колькі хвілін руку ў вадзе ў нерашучасці, быццам вагаўся, каторага з іх схапіць, і выбраў таго, другога. І моўчкі, пад гучныя воплескі, ад якіх скалануліся сцены і задрыжэў посуд на сталах, уручыў рэферэнту — у якасці падарунка за ўдалае прадстаўленне. Рэферэнт, які перад гэтым перашэптваўся аб чымсьці з Ядзяй, перадаў ёй трафей — мабыць, загадаў прыхаваць дзе-небудзь да ягона-

га адыходу. Яна крутнулася ўбок, ён дагнаў яе, і яны ўдваіх выйшлі з залы.

Унеслі чарговую страву. Велізарныя, дыяметрам з добрую мядніцу талеркі дыміліся параю, паўз пару вабна чырванела аксамітавымі бакамі нейкая гародніна ўперамешку з пражаным гарохам.

Фацэтны цюх разагнаў даланёй пару над адной з талерак, узброіўшыся блішчастаю кароткаю палкаю з расшчэпам унізе, спрытна выхапіў стравіну з гурбы, падняў угору.

«Стужык!» — мільгнула маланкаю ў Стужчынай галаве, і яна страціла прытомнасць.

Калі яна ачнулася, госці зноў танчылі. Паўпустыя талеркі сям-там бялеліся рэштаю гародніны, цюхі ў фартухах заклапочана сноўдалі ў праходах з поўнымі разносамі парожніх пляшак і скарыстаных сурвэтак.

З высокіх гасцей у зале быў толькі шэф службы бяспекі. Ён сядзеў на месцы намесніка і, вольна заклаўшы нага за нагу, пацягваў з фужэра чырвонае віно. Фацэтны Цюх падышоў да яго, паказаў пальцам у яе, Стужкі, бок. Шэф службы бяспекі падняўся, з фужэрам у руцэ пайшоў да пастамента. Затым паклікаў да сябе паэта, і, як толькі сціхла музыка і ўсе зноў расселіся за сталамі, загадаў зняць акварыум, гучна аб’явіўшы пры гэтым, што прэзентуе яго Ямбуку як галоўнаму творцу ўсёй Азёрнай Цюханіі. Паэт адбіў чатыры паклоны — на кожны бок свету па адным — і прачытаў яшчэ адзін вершык-экспромт, цяпер ужо ў гонар свайго новага сябра — шэфа службы бяспекі.

Чацвёрка цюхаў у фартухах падхапіла акварыум, асцярожна, як найвялікшую каштоўнасць, панесла да выхаду.

Пакой, у які ўнеслі акварыум, быў значна меншы і вузейшы за залу, застаўлены ўздоўж сцен плітамі, на якіх смажылася, сярдзіта пырскала тлушчам ва ўсе бакі нейкая страва. У процілеглым ад дзвярэй яго канцы сіратліва туліўся акварыум — той самы, у якім панеслі Стужыка. Яна адразу пазнала яго па блішчастай, крыху скрыўленай пярэчыне збоч трубкі. Акварыум быў пусты.

Цюхі ў фартухах паставілі ношу побач з ім, пакрочылі зноў у залу. Ледзь яны зніклі, як з-за занавескі выйшла Ядзя. За ёю крадком, бы злодзей, высунуўся рэферэнт. Ён быў голы ніжай пояса, трусы цялёпкаліся на ягоных лытках, як пута, а напалову паўсталы фалас смешна пагойдваўся ў такт рухам. Пара злілася ў жарстлівых абдоймах, порстка шмыганула зноў за занавеску.

Нецвярозы Валер з вугром у руцэ і пабітым плямамі, бы прыхопленае хіладанелёзам цела карпа тварам увайшоў у памяшканне. Распрастаў рыбіну ад галавы да хваста, пачаў апантана скакаць праз яе.

— Вух! — рабіў чарговы скачок, крычаў задаволены ўласным спрытам Валер.

— О-ох, — падтаквала яму, глуха стагнала з-за занавескі ўсцешаная зухаватасцю рэферэнта Ядзя.

Так працягвалася хвілін дзесяць. Фацэтны цюх увайшоў у пакой з падхватнікам у руцэ, з заклапочаным выглядам падышоў да акварыумаў. Выхапіў Стужку падхватнікам, хуценька ператарыў у нізенькую, даволі шырокую пасудзіну кшталту місы. Затым адчыніў дзверку лядоўні, сунуў у яе пасудзіну.

Дзверка віскнула гумаю, зачынілася.

Стужка ў адчаі выгнулася ўсім целам, прынікла галавою да боку пасудзіны.

Ляпнулі, зачыняючыся за фацэтным цюхам, уваходныя дзверы. Праз хвіліну расчыніліся і ляпнулі яшчэ раз — напэўна, пайшоў Валер. І цяпер ужо толькі прыглушаныя дзверыною лядоўні воклічы Ядзі даносіліся да яе, ды і то нядоўга.

Яна згарнулася клубком, стомленая ўражаннямі бясконца доўгага дня, ціха заснула.

Прачнулася яна ад невыноснае сцюжы. Хацела павярнуцца, каб хоць крыху сагрэцца, але не змагла: наўкола быў лёд. Адзінае, што дала рады зрабіць, — варухнуцца ў вузкай, можа, у які сантыметр, шчэлцы паміж ільдзінаю і ўласным скалянелым целам.

Ото цямніца! У нератку ў параўнанні з ёю — прастора без канца-краю.

Следам за хвіляю панікі прыйшла абыякавасць: ат, як будзе, так і будзе. З сітуацыяй, падобнай гэтай, яна сутыкалася пару год таму, калі заплыла перад зімою ў заточку пры возеры і трапіла ў пастку з ільдзін. Ужо прыгатавалася тады да горшага, ды нечакана грымнула адліга, і выратаванне прыйшло само сабою. Тут, праўда, на адлігу спадзявацца не выпадае, але чаго ні здараецца ў жыцці. Вось прачнецца яна ўранку — і сама сабе гаспадыня, і Стужык побач. А можа, паэт злітасцівіцца, выпусціць на волю?

Вузкі прасвет між лёдам і ёю тым часам усё больш вузеў. Ужо і паварушыцца ў місе было амаль немагчыма, і цела ажно вішчэла ад ціску ледзянога крышталю.

Хтосьці (адзін? двое?) увайшоў у пакой, прашкандыбаў цяжкім крокам ад дзвярэй да лядоўні. Рыпнула дзверка, і галава мажнай цюхі з дзіркаю

на месцы гарохавага пука на капелюшы мільгнула перад ёю.

— Ну, вось жа ён, ваш прэзент, — сказала яна нервова і тыцнула пальцам у місу.

Паэт Ямбук вызірнуў з-за яе шырокай, падобнай на дошку для апрацоўкі рыбы спіны.

— Хочаце, верш вам прысвячу? — сказаў, задаволены, што дарунак шэфа бяспекі, сапраўды, на месцы, і какетліва, бы жанчына, засмяяўся.

— І пра што ж ён будзе? — заінтрыгаваная абяцанкаю, спытала цюха.

— Пра тое, як я пасля смерці траплю ў рай і там, на вышынях горніх, згадаю пра шчасце, якое вы мне тут, на грэшнай зямлі, падарылі, — адказаў ён і ненаўмысна паклаў ёй руку на спіну ніжэй пояса.

Цюха падскочыла ад нечаканасці, але рукі не скінула, а толькі, нібыта незнарок страціўшы на імгненне раўнавагу, упала грудзьмі паэту ў абдоймы.

— Як нам усім на вас пашанцавала! — сказала перарывістым голасам і заціхла ў чэпкіх Ямбуковых руках.

Гэта было апошняе, што Стужка бачыла і чула.

Дзверка лядоўні глуха віскнула, і надзея на волю ды ратаванне змізарнела, звузілася зноў да памеру ледзяной глыбы ў місе.

Як паэт перакуліў яе ўранні разам з лёдам у валізу, як вынес на двор, як паставіў упобачкі з сабою на сядзенне аўтобуса з надзеяю здзівіць ды парадаваць жонку і дзяцей, а калі ўдасца адхапіць незаўважна кавалак — і палюбоўніцу, незвычайным гасцінцам, яна не чула і не бачыла. Лёд так шчыльна скаваў яе з усіх бакоў, што не тое што ўбачыць што-кольвек паўз яго тоўшчу, а нават паварушыцца было немагчыма.

У салоне было, аднак, цёпла, і лёд пачаў пакрысе раставаць. Спачатку краі ільдзіны засачыліся кроплямі, затым наўкола цела зрабілася вальней, і ўрэшце круглая, паводле формы місы глыба парэпалася, трэснула, бы яечная шкарлупіна, распалася на два кавалкі.

Стужка высунула голаў з лёду, агледзелася наўкола.

У аўтобусе было пыльна, з дынаміка неслася, поўніла салон музыка. Пахла чымсьці вельмі, аж да ванітаў, нясмачным, да таго ж моцна гайдала.

Яна асцярожна, унікаючы вострых голак ільдзініны, выпаўзла з валізы на сядзенне.

Паэт спаў. Спалі і ўсе наўкола, не спаў толькі кіроўца. Яна слізганула долу, пад ногі паэта, пакідаючы на пласціку мокры след, скіравала да шчыліны між створкамі дзвярэй. Затрымалася на хвіліну, каб пераадолець страх, напружылася, рынулася стоць галавою ў цёмнае — спрэс пыл ды гар — прадонне.

Шалёны паветраны паток падхапіў яе напаўпрытомнае ад доўгага ляжання ў ледзяной вязніцы цела, тузануў штосілы, апусціў у прыдарожны зараснік.

*Упершыню за апошні час Кіці спала так моцна, што нават не чула, як маці ўходжваецца па гаспадарцы. Прачнулася ад дотыку сонечнага прамяня да павекаў, са сполахам зірнула на гадзіннік. Дванаццаць! Што скажуць у цэху, як гэтак позна яна заявіцца на працу? І маці — добрая цаца: трэба ж, не пабудзіла.От і паспадзявайся на каго...*

*Кіці выслізнула з ложка, поўная крыўды-абурэння на маці, выйшла ў калідор. Расчыніла рот, каб выгаварыць старой, што напаўголасу штосьці бу-*

*бніла сама сабе, за гэткае разявацтва, як тут жа і асеклася на паўслове.*

*У гасцёўні сядзеў на канапе Крыстоф, разглядаў вышыванку ды слухаў распавед маці пра радаводнае дрэва. Слухаў ды хітаў галавою, ды ўдаваў нясветную зацікаўленасць.*

*— Добрай раніцы! — прамовіў абыходліва і акінуў Кіці шчымліва-пранікнёным паглядам.*

*— Вы? — сумелася яна і хіснулася назад у пакой. Ускінула на сябе сукенку, усторкнула на ногі новыя, тыдзень таму набытыя на кірмашы туфлі з моднымі даўгімі насамі, падсела да люстэрка.*

*— Што-небудзь трэба, дачка? — падала голас маці.*

*— Усё, што можна было, ты ўжо зрабіла, — адказала яна незадаволена, расчэсваючы валасы. — Не магла пабудзіць у пару?*

*— Нядзеля, дык што крутаць? Паспала даўжэй, і дзякуй Богу, не так часта здараецца.*

*— Нядзеля сёння? Ну, тады хай сабе... Прычыні дзверы, падмарафеціцца мне трэба.*

*Калі яна праз чвэрць гадзіны ўвайшла ў гасцёўню, маці з госцем пілі гарбату. Маці пабыла з імі колькі хвілін, далікатненька падхапілася, пайшла з пакоя.*

*Кіці карцела распытаць у Крыстофа сёе-тое пра замежныя норавы ды апратку тамтэйшых маладзіц, але яму было тое, відаць, нецікава, і ён адразу перавёў размову ў практычны бок.*

*— Калі дамова між намі наконт вашага ад’езду застаецца ў сіле, на пачатку наступнага тыдня можна будзе пачынаць нашую авантуру... Як вы гледзіце? — Голас яго гучаў настойліва і крыху сухавата.*

*— Ужо на пачатку наступнага? — ахнула яна і, задаволеная, што не давялося нават нагадваць*

*пра ўчорашняе яго паўп’янае абяцанне, пасунула нагу бліжэй да Крыстофавай. — І як усё тое будзе выглядаць?*

*— Упаўне прыстойна, — адказаў ён і чамусьці наўздзіў неяк порстка, аж яна такога не чакала, адсунуўся ад яе, застыў воддаль у абыякавай позе. — Да мора па рацэ на маторцы падвязем, далей — катамаран падбярэ. Не хвалюйцеся, усё будзе о’кей, нашы людзі папярэджаныя. Толькі не набірайце шмат майткоў, чым менш іх, тым лягчэй будзе...*

*— А я ўжо баялася, што Ядзі перавагу аддасце, — сказала яна паўжартам. Хацела зноў пасунуцца бліжэй да яго, але не рызыкнула. — Вунь як учора яе ўлагоджвалі... Як глядзелі на яе...*

*— Вы памыляецеся, — адказаў ён рашуча і, угледзеўшы на двары гурт рыбаловаў, між якіх вылучаліся аднолькавымі імпартовымі майкамі з пальмамі на ўсю спіну Валераў шаснаццацігадовы брат Цімох і яго аднакласніца прыгажуня Дыянка, паспешліва падняўся з месца. — Жанчыны — не мая стыхія.*

*Ён пайшоў, і ёй толькі і засталося, што пацiснуць плячыма.*

*Жанчыны — не яго стыхія? А хто ж тады — яго? Вар’яцтва дый годзе! А калі ўсе яны там, у замежжы, гэткія, не такія, як след? То дзеля чаго ёй туды перціся? Во гэтак падсуслішся да каторага, а ён табе: прабач, не мая стыхія. Усяляк можа стацца, вядома ж: што аднаму — апраметная, другому, наадварот, — узнясенне. Але не, не можа таго быць, каб усе былі такія... Жэняцца ж яны, урэшце, дзяцей раджаюць. Ды і яна не век давякоўваць едзе, не спадабаецца — заўжды можна будзе вярнуцца да сваіх панурчыкаў-марудаў. Калі, праўда, выпусцяць яшчэ, вунь колькі рознага ўсяго пі-*

*шуць у газетах і балбочуць па тэлеку ды па радыё пра гандаль кабетамі...*

*Маці ўсунула голаў у пакой, перарвала яе думкі чарговым уздыхам:*

*— Штосьці ж пасядзелі вы зусім мала... Ці не пакрыўдзіла ты яго? От жа нораў!*

*— Колькі хацеў, гэтулькі і пасядзеў, за крысо не будзеш трымаць. Падумаеш — гэткі госць важны. Ды і не жанчыны — ягоная стыхія.*

*— Што-што?*

*— Не жанчыны, кажу, — зазлавала яна і адвярнулася да вакна, за якім рыбаловы штосьці гучна тлумачылі пад гусінае гергетанне цікаўнаму Крыстофу.*

*Маці з перасцярогаю зірнула праз яе плячо ў вакно.*

*— Няўжо з гэных, што ў серыяле па тэлевізары ўчора паказвалі? Што цалуюцца адзін з адным? Ружовыя, ці як там іх? Цьфу, бубна добрага на іх нямашака! А з выгляду дык і не скажаш, прыстойны чалавек нібыта,—сказала абурана і пайшла з хаты.*

*Кіці вярнулася ў свой пакой, уключыла радыё. Надзіва, прыймач маўчаў, нават звыклага трэску не было ў ім чуваць. Яна прыбрала ложак, узрушаная размоваю з Крыстофам і ягонаю абяцанкаю хуткага ад'езду, дастала з шафы боа. Прымерылася, як будзе выглядаць у ім на замежных дыхтоўных, калі даваць веры расповедам сяброўкі ў лістах, ходніках, ды і зноў пайшла ў гасцёўню.*

*Мужчыны і Дыянка ўсё яшчэ таўкліся на двары. Яны стаялі паўкругам тварамі да хаты і штосьці ажыўлена абмяркоўвалі. На доле перад імі ляжаў нежывы бабёр і таропіўся на бакі ашклянелымі, ледзь бачнымі з-пад густое шчэці вачыма.*

*Кіці выйшла на двор, наблізілася да гурту.*

*Жывёліна была, мяркуючы па памерах, зусім маладая.*

*— Драбяза, — сказаў, зацягваючыся цыгарэтаю, стары Арцюх. — Памятаю, гадоў гэтак з восем таму, пры Амёлку яшчэ, увесну падчас крыгаходу неяк на аднаго натрапілі, ото была аграмадзіна... Таўсматы, гад, страшны, глянеш — ворах па спіне. Утраіх ледзьве далі рады ўходаць. Хвілін дзесяць білі баграмі, рукі да пухіроў пазбівалі, б’ючы, а ён усё жывы... Думалі, не даб’ём, кінуць хацелі...*

*— То б і кінулі, што замінала?—болей з жадання нагадаць пра сябе Крыстофу, чым з зацікаўленасці размоваю падала голас Кіці і дадала словамі Валера, чутымі ў лазні: — Лёгка ненавідзець таго, каго не разумееш. І біць...*

*— Ага, кінеш тут, як імпэт забярэ, — працягваў стары. — Паляванне — то ж як у карты гульня, чым далей гуляеш, тым болей хочацца... І ведаеш, што след бы спыніцца, бо нічога кепскага табе тая жывёліна не зрабіла і не зробіць, а не можаш. І хэнць, і злосць — адкуль што тады бярэцца... Дык во якія былі даўней бабры... А гэта што ж: так, драбяза. Здрабнела ўсё, і звяр’ё здрабнела...*

*— Файны экспанат, — пазіраючы то на Дыянку, то на нежывога бабра, сказаў Крыстоф і весела падміргнуў Кіці.*

*«Вось і зразумей ты гэткага, — падумала яна і міргнула іншаземцу ў адказ. — То пра не сваю стыхію штосьці вярзе, а то во ўжо зноў — да непаўналеткі заляцаецца». Падумала гэтак і пасунулася зноў у хату.*

*Мужчыны паднялі бабра, пацягнуліся ўсім хаўрусам у накірунку возера.*

*Кіці зірнула на тое месца, дзе толькі што ляжала забітая жывёліна, у задуменні адхінулася патыліцай да сцяны.*

*Адкуль у люду гэтулькі нянавісці? Учора — да баброў, сёння во — да тых жа вугроў... Ну, няхай рыба нішчыцца — такі загад. А хто тым жа мужыкам бабра загадваў забіваць? Здаецца, людзі як людзі, а вось жа...*

*Маці ўвайшла ў хату.*

*— Не, каб пакінуць — панеслі, — сказала незадаволеным голасам і дакорліва, быццам яна, Кіці, была ў тым вінаватая, што мужчыны забралі тушу звера, пахітала галавой. — Якая там ні здабыча, а на паўкаўняра да паліто, глядзіш, і было б.*

Цела знібела, быццам па ім прапаўзла сотня крабаў. Паўз хмыз паблісквала ў колькіх метрах ціхая вадзяная гладзь азярка. Стужка сабрала апошнія, што засталіся пасля падзення, сілы, папаўзла туды. Вада была такая знаёмая, што ў яе перахапіла дыханне.

Яе азярко!

Цела яе ўвобміг напружылася, налілося такою моцаю, што яна і сама таму здзівілася.

Плоткі, нават ёрш, нават судак, што прыплыў з суседняга возера з надзеяй заняць месца зніклага без звестак падчас апошняга лову шчупака, зляканыя яе неспадзеўным ныркам, у страху кінуліся куды каторы, стаіліся сярод аерніку ў асцярожлівым чаканні, што будзе далей. Толькі гамуз акунёў абкружыў яе, падплыў бліжэй з намерам напасці, але дарэмна. Яна з такім імпэтам рынулася на яго, з гэткаю адвагаю ляснула хвастом перад нашчэранымі пашчамі, што ён тут жа зніякавеў, рассыпаўся, раструшчыўся на дробнае ашмёцце.

Яна, яна тут гаспадыня! Не самая-самая, ды ўжо ж роўная астатнім. Наканаваныя ёй лёсам няшчасці, што выпалі ўжо ды выпадуць, мажліва, яшчэ, ды страх, што так доўга скоўваў яе і які ўрэшце дала яна рады, хай і праз неймаверныя выпрабаванні, у сабе пераадолець, — ці не падставы ёй нікога і нічога больш не баяцца?

Яна падплыла да сярэдзіны віру, перажываючы зноў і зноў перыпетыі апошніх дзён: шчаслівыя імгненні кахання да Стужыка, гвалтоўнае развітанне з ім, палон, уцёкі з яго, — застыла ў самотным здранцвенні збоч нератка. Хацела ўплысці ў яго, але перадумала: ці варта вяртацца да таго, што аніяк ужо не вернеш?

Ніхто не зачапіў яе, ніхто не асмеліўся парушыць яе самоты. Статкі дробнарыбіц, заўжды палахлівых, заўжды перасцярожлівых, з неўласціваю ім адвагаю павыплывалі са сховаў, абшчапілі яе цесным колам, закружыліся побач у спачувальным карагодзе.

Хвалі лашчылі яе зняможанае цела, сонечныя прамяні атульвалі цеплынёй і лагодаю.

Так правісела яна нерухома ў вадзе да самага вечара. А калі пачало ссутоньвацца і цені альшын разбэрсаліся бязладнымі пасамі па паверхні вады — страпянулася, паплыла прэч.

Карасіха з пірсінгам высунула галаў з нары, праводзіла яе наастатак доўгім паглядам спакутаваных болем вачэй. Ды друшляк цьмяна бліснуў у нератку парэпаным, паржавелым бокам і знік, заслонены шыхтам самотных, спярэшчаных знакамі-меткамі апошніх перадвосеньскіх стракозаў аерын.

Куды яна паплыве далей, яна не ўяўляла. Адзінае, што ведала дакладна, дык гэта тое, што тут, у

возеры, больш не застанецца. Быццам нейкая няведамая істота-прывід гнала яе прэч, і не было ні жадання, ні моцы ёй працівіцца. Кропляю ў акіяне бязмежнага, як сама вечнасць, жыцця — вось кім адчувала яна сябе ў гэтую хвіліну. І боль ад развітання з месцам, якое згодна з памяццю прашчураў абрала колькі год таму за сталы прыстанак і якое гэтак любіла несуперак усім непамысноам цяжкога, аж да агіды часам, да нянавісці існавання, драбнеў, мізарнеў на тле гэткага адчування.

Трое цюхаў, што вартавалі на беразе пры вогнішчы з юшкаю нейкага маладзенькага арыштанта з закладзенымі за спіну рукамі, угледзелі яе цень паўз тоўшчу вады, праводзілі гучным гіканнем. І яна, зусім нядаўна яшчэ гэтак абражаная, знешчасліўленая легкавернасцю іх і прымхлівасцю, што ледзь не каштавалі ёй галавы, нават не схамянулася, ніводным рухам не ўдала, як тое ёй абыякава ці, наадварот, абыходзіць. Тое, што чакала яе наперадзе, уяўлялася ёй больш значным, больш істотным за цяперашняе. Новыя далячыні вабілі яе, і сілы такой не было на свеце, каб яе ад іх адвярнуць.

Маркоціцца? Які ў тым сэнс? Жыццё не стаіць на месцы, дык што карысці чапляцца за імгненне? Якая б моцная повязь ні лучыла яе з гэтым возерам — яна сплыве. Здрада? Не. У адрозненне ад цюхаў, у якіх ад страху часам перахоплівае дыханне, яна свой страх пераадолела. Не яе віна, што найгоршы для яе племя і асабісты яе час сплаціць належнае прыродзе супалі. Яе нашчадкі, якім дасць яна жыццё ўзамен на сваё ўласнае і якіх шчодра надзеліць памяццю роду, прыплывуць сюды, каб ажывіць сабою небагатыя, праніцаныя страхам ды адвечнаю перасцярогаю берагі, — хіба гэта не

станецца найлепшым апраўданнем яе цяперашняму ўчынку?

Так думала яна, плывучы паўз аернік ды каркасы цэхаў-навабудаў, што неўпрыкмет павырасталі паўсюль на беразе ўпобачкі з месцамі найбольш багатых уловаў рыбы, да ракі, дзе два дні таму страціла назаўжды свайго Стужыка.

Раку, што шырэла з кожнаю вярстою, — мора было ўжо, відаць, не так далёка — яна праплыла без асаблівых прыгодаў. Перашкодаў на шляху не траплялася, адзіным, што псавала вандроўку, былі ўсё тыя ж рыбаловы. Ды яшчэ маторкі: крый Бог трапіць пад каторую, змесіць у друз ці так знявечыць, што і плысці далей не здолееш. Ды яна, навучаная горкім досведам, ужо не толькі ведала, як унікнуць жалезных пачвараў, але магла нават дазволіць сабе зрэдчасу з імі пасвавольнічаць. Напрыклад, усплысці перад самым носам цюхаў на паверхню і зрабіць выгляд, быццам не бачыць іх рыбалоўскага начыння. Ці падплысці да самага невада і, як толькі цюхі пачнуць яго згортваць, маланкаю прамчацца наўзбоч, стаяць у водных нетрах.

Забавы бадзёрылі яе, адцягвалі ад думак пра небяспеку, што, магчыма, яшчэ падчэквае дзе-небудзь наперадзе. А разам і прытупплялі ўспамін пра Стужыка, што не-не ды і паўставаў перад вачыма ў выглядзе выпадковага — ламаччыны, кавалка вяроўчыны, абарванага троса — прадмета.

Мора прыняло яе не надта гасцінна. Церусіў дождж, вецер быў такі моцны, так іраваў хвалі, што яны нагадвалі расшкуматаныя аблокі. Што гэта мора, а не якое-небудзь возера, яна адразу здага-

далася па смаку вады. Вада была гэткая ж салёная, як і шмат гадоў таму, калі яна вандравала ў ёй, ператварыўшыся з нягегліцы-ларвы ў вабнага, празрыстага, бы шкельца, шклянога вугрыка, і аддавала водарасцямі. Затое смецця ў ёй было не так шмат, як у возеры, ва ўсялякім разе ў вочы яно тут не кідалася.

Яна праплыла колькі вёрст усцяж берага, прывыкаючы да новага асяроддзя, і, як толькі зразумела, што асцерагацца няма чаго, рэзка памяняла курс, паплыла напрасткі да супрацьлеглага — павінен жа ён дзесьці быць — берага. І хоць плыла наўздагад, нават каліва сумневу, што трапіць акурат туды, куды трэба, куды кліча яе рыбіна прырода, у яе не было. Так дапала яна да пратокі, што злучала адно мора з другім. І тут, пры выхадзе ў другое, натыкнулася на неспадзянку.

Бы тать у ночы вымкнуліся з цемры два — адзін пад сцягам Гарохавага Струка, другі — Россыпаў Бобу — катамараны, рынуліся ёй наперарэз. Па важкім скрутку ўпалі з адной і з другой палубаў у ваду, вухнулі выбухамі перад самым яе носам, аглушылі-агаломшылі тугою, як наспружыненая сетка браднiка, калі яго выцягваюць з вады, хваляю.

Яна паманулася ўцякаць, але ледзьве дала рады нават варухнуцца: цела скалянела, зрабілася неслухмяным.

Катамараны спынілі ход, па дзве шлюпкі аддзяліліся ад кожнага, пачалі навыперадкі акружаць невадамі спярэшчанае перакуленымі дагары рыбінымі тушамі месца. Спрактыкаваным вокам заўсёднае патэнцыйнае ахвяры яна вызначыла даўжыню невадаў, што ўжо амаль зліліся ў дружным пераможным экстазе, высілілася, хіснулася пад іх.

Гэта было ўсё, на што яна, аглушаная выбухам, заставалася здатная.

Як скочыла ўпотайкі з катамарана са сцягам з выяваю Гарохавага Струка і паплыла да другога нейкая цюха, ні занятыя сеткамі рыбаловы, ні яна не бачылі.

*Хвалі то ненадоўга адступалі, то зноў накотваліся адна за адной на галаў і плечы. Кіці перакулілася на жывот, прыбавіла хуткасці. Нервавалася: плыўчыха так сабе з яе, а мора — не азярко, дзе махель рукамі раз, махель другі, і вось ён, бераг. І што, як наогул не заўважаць яе з другога катамарана ды паплывуць прэч? Што тады? Як ратавацца ў гэтых жудасных марскіх абшарах, каго клікаць на помач? Добра, як акулаў няма паблізу, а крый Бог узбіцца на каторую знячэўку — гамон, кранты... Адно ўсцешна, не так і шмат застаецца плысці да катамарана, можа, з якую сотню метраў. Але ж і сілаў плысці ўжо амаль не засталося. Ды яшчэ гэты абутак, так і цягне долу, праклятыя, так і цягне. Ды і пляцак за спінаю, хоць колькі там у ім таго майна, не дадае лёгкасці.*

*Яна зноў перакулілася, цяпер — на бок, спрытным рухам — прыдаліся трэніроўкі ў возеры падчас мілаванак з Валерам ды Панурчыкам — сашморгнула па чарзе з ног адну туфлю, другую.*

*Штосьці паскам слізганула ўздоўж яе цела, шмыганула да каленяў, прыляпілася да лыткі. Яна падумала, што гэта, мабыць, водарасціна. Хіснулася ўбок, каб пазбавіцца яе з дапамогаю плыні, але дарэмна. Пасак імкліва пасунуўся вышэй, тыцнуўся ёй у плячо, застыў на ўзроўні шыі. Яна выпрастала руку ў надзеі схапіць яго даланёй ды адкінуць прэч і ўжо амаль схапіла, як раптам убачыла сет-*

*ку невада, што прамільгнула над галавой ды мякка апусцілася ў ваду літаральна ў колькіх сантыметрах ад яе.*

*Двое мужчын падцягнулі яе сеткаю да палубы, паказваючы штосьці на мігі, пачалі спускаць у ваду вераўчаныя драбіны.*

*Слізкі пасак тым часам ужо амаль дасягнуў яе вушэй. Яна ўхапілася адною рукой у пярэчыну драбінаў, другою паспрабавала аддзерці яго ад скуры. Ён падаўся наўздзіў лёгка і нават тады, калі яна перахапіла яго пасярэдзіне далонню і моцна сціснула, не падаў і знаку, што жадае вызваліцца, толькі бліснуў адчайна-роспачліва кропачкамі вачэй.*

*Гэта быў вугор.*

*Кіці колькі хвілін глядзела на яго ў одуме, што мае рабіць далей, але, як на тое, нічога ў галаў ёй не прыходзіла. Паманулася размахнуцца, каб ускінуць неспадзеўную здабычу на палубу, дзе кешкаліся з невадам мужчыны, як раптам хваля млоснасці паднялася з вантробаў да грудзей, знерухоміла рукі і ўсё цела.*

*Вугор выслізнуў з яе далоні ў ваду, але не паплыў, а застыў у абыякавай здранцвеласці збоч сеткі.*

*Адзін з мужчын схапіў падхватнік, нахіліўся з палубы, паспрабаваў злавіць ім вугра, ды не здолеў: цаўё падхватніка было занадта кароткае. Мужчына пакруціў незадаволена галавою, поўны жадання давесці справу да канца, пачаў таропка спускацца па хісткіх драбінах долу.*

*Зарослыя, як у Панурчыка, валасіннем ногі імкліва наблізіліся да яе галавы, спыніліся на ўзроўні вачэй.*

*Што ён хоча? Такі імпэт мае да рыбнае лоўлі, што і чалавекам гатовы ахвяраваць дзеля сумнеўнае здабычы?*

*Яна выхапіла з рук мужчыны падхватнік, падчапіла ім вугра, адкінула прэч, падалей ад катамарана.*

*Мужчына штосьці сказаў узлаваным голасам, замахнуўся, каб ударыць яе, але голас другога спыніў яго. Той другі, чарнявы бамбіза з пукам перавязаных гумкаю валасоў на патыліцы, падаў Кіці руку, лёгка, бы парушынку, усцягнуў разам з плецаком, што збіўся бязладнаю гурбінай у яе на спіне, на палубу.*

*— Мамэрт, — назваўся і штурхнуў яе далей, у каюту.*

*У каюце было цесна і даволі змрочна. Пры стале са свечкамі дзве маладзіцы ласаваліся папкорнам і півам. Абедзве палілі, раз-пораз змахваючы попел у няроўна — карункамі — адчыненую бляшанку з-пад кансерваў.*

*— Я Анэта, — сказала тая, што сядзела пры дальнім канцы стала і паставіла перад Кіці шклянку з пітвом. — Разумееш мяне?*

*Кіці матлянула галавою.*

*— Канечне. Я таксама з Азёрнай Цюханії.*

*Суразмоўніца стуліла рот у незадаволенай грымасе.*

*— Таксама? Вось яшчэ адна праніклівая! Хіба па мне бачна, адкуль я?*

*— У цябе пярсцёнак з выяваю гарошыны. І кофта ў гарохавыя струкі. Мне гэтага дастаткова, каб здагадацца, — сказала Кіці і павярнулася да Анэты спінаю.*

*Мамэрт увайшоў у каюту, гучна, быццам папярэджваючы, што ён тут, кашлянуў, кінуў на зэдаль стос адзення.*

*— Вось, сэканд-хэнд сякі-такі для паненкі... Пераапраніся. Гахі, гаспадар ваш, які надалей вамі ўсімі будзе апекавацца, неахайных не любіць.*

*— Пераапраніся, — з выглядам асобы, што міжволі мусіць узяць на сябе ролю галоўнай, падтакнула яму Анэта і пусціла пад столь колца дыму.*

*Кіці стрэсла са спіны прыліплы да вопраткі пляцак, пашнарыла ў ім рукою, вывудзіла з-пад исподу цэлафанавы мяшэчак з гаржэткаю.*

*Надзіва, гаржэтка была зусім сухая, і тут, у паўпрыцемку слаба асветленай агніскам ліхтара каюце, на тле пасляштормавага бязладдзя выдавала ледзь не апошнім піскам моды. Кіці страсянула яе, каб распрастаць пух ды надаць рэчы яшчэ большае шыкоўнасці, абыякавым рухам ускінула сабе на плечы.*

*Анэта зіркнула спадылба на гаржэтку, і твар яе прыкметна схмурнеў.*

*— І валоссе падпраў, лахудраў, ведаеш, без нас паўсюль хапае, — сказала, удаючы, быццам яе куды болей займае малюнак на кубку з півам, чым гэтая цюхаазёрненская андатрава-гусіная модная прычындаліна, і ледзь чутна дадала: — Сучка і пры гаржэтцы — сучка...*

Стужка памалу варухнулася, спраўджваючы, ці жывая, выпрасталася целам у вадзе. Усё нібыта было добра, ды разам з тым не так, як след, — і ў ёй самой, і ва ўсім, што цяпер, па шчаслівым выратаванні з цюшынага палону, яе акружала. Быццам штосьці чужое праняло ўсю яе, ад галавы да апошняй лусчыны на хвасце, істоту і не давала спакою, вярэдзіла пачуццём — не, не сумневу нават — відочнае аблуды. Упершыню за ўвесь час вандроўкі яна адчувала, што кіруецца не туды, куды мусіць кіравацца, але як даць рады сабе, свайму целу — даўмецца не магла.

Вада, дно, да якога яна раз-пораз апускалася, каб спраўдзіць глыбіню, статкі рыбаў, пах вада-

расцяў, купкі ціны — усё было іншае, як восем год таму. У той даўняй стыхіі яна адчувала сябе вольна і ўпэўнена, зараз жа кожны рух даваўся ёй праз сілу, праз неймавернае намаганне. Не рызыкуючы аддаляцца ад берага, які заставаўся справа ад яе, у той час, як, паводле логікі, што дыктавала памяць, павінен быў быць дзесьці злева, яна ўпарта плыла наперад у спадзеве натыкнуцца на што-небудзь з тых, васьмігадовае даўніны арыенціраў. І толькі калі бераг стаў падвышацца і пачалі прабівацца паўз шэрань на даляглядзе вострыя шпількі ды скалы першых ф'ёрдаў, зразумела, што заблукала канчаткова, і вырашыла спыніцца. Рашуча развярнулася, паплыла да берага. І першымі, каго там пабачыла, былі цюхі.

Стары, зусім стары — патухлыя вочы, пабіты зморшчынамі твар, запаволеныя рухі — рыбалоў і маладая пара, можа, дзеці ягоныя, а можа, унукі бавіліся пад пошум мора паважнаю бяседаю. Стары раз-пораз закідваў у ваду вуду, вецер падхопліваў лёсу, сярдзіта шпурляў у тонь між камення. З паўгадзіны назірала Стужка за імі зводдалеку, дрэйфуючы на хвалях, падплываючы ўсё бліжэй і бліжэй.

Мабыць, стары заўважыў яе, бо раптам прыўзняўся, упёрся нагамі ў выступ скалы, пацягнуў на сябе клячнікі, што дагэтуль стаялі прыслоненыя да каменя ля ягоных ног. Папяросіна выпала з яго зубоў, закружыла ва ўспененай хвалямі, што адбіваліся ад берага, вадзе. Белая птушка высунула з расшчэліны скалы дзюбку, захітала галавою ў чаканні, што будзе далей.

Што паблізу небяспека, яна здагадалася не адразу. Страпянулася, каб пусціцца наўцёкі, але было позна. Дно пад ёю заварушылася, сетка, якую яна

дагэтуль не заўважала, скранулася з месца, пацягнула за сабою.

Невад! Пастка была зусім неспадзеўнаю. Стары цюх выдаваў такім ціхамірным, лагодным, што яна нават паспела пранікнуцца да яго сімпатыяй. І вось на табе — трапіла ў ягонае ж сіло.

Ссечаны вятрамі бераг ф'ёрда ўсё бліжэў. Аблепленыя непрамакальнымі плашчамі постаці маладой пары, што раз-пораз адварочвалася ад старога, каб употайкі пацалавацца, рабіліся ўсё больш і больш выразнымі.

Стары падцягнуў невад пад каменную загародку, крэхчучы ад натугі, вышмаргнуў на бераг. Затым выцягнуў яе, Стужку, вузлаватымі пальцамі за галаву з пелькі, асцярожна — зусім не так, як гэта рабілі цюха з возера і яе хаўруснікі, — усадзіў у вядро з вадою.

— Паглядзіце, фрэкен Дагні, на гэтае дзіва, — сказаў, звяртаючыся да цюхі-маладзіцы, і станчэлыя яго ад часу вусны пад доўгім, знявечаным вятранкаю носам стуліліся ў кволай усмешцы. — Вугор!

Фрэкен з цікаўнасцю зазірнула ў вядро, дакранулася пальчыкамі да паверхні вады.

— Вугор? Я ніколі не бачыла гэткай рыбіны. Спадзяюся, яна не кусаецца?

Малады цюх уціснуў голаў між іхнімі тварамі, безуважна зіркнуў на Стужку.

— Дурнічка, — сказаў пяшчотна і абхапіў фрэкен Дагні рукамі за стан.

Яны пайшлі за скалу, і стары застаўся пры вядры адзін. Пакорпаўся ў кішэні плашча, дастаў папяросіну, запаліў. Затым нахіліўся над пасудзінай, ціха-ціха, ледзьве чутна загаварыў асіплым ці то ад сцюжы, ці то ад бесперапыннага палення голасам.

Гаварыў ён доўга, як цюх з цюхам, як рыбіна з рыбінай. Пра нябожчыцу жонку, якая памерла раптоўна два месяцы таму. Пра страх за сына — от гэтага самага, што тут, пры ім да часу, ды неўзабаве мусіць выпраўляцца пад бой вайсковых бубнаў парыць ногі ў пясках на чужой вайне. Пра боль у грудзях, што не адпускае ні ўдзень, ні ўначы, і няма лепшага, бадай, ад яго паратунку, як легчы жыўцом у магілу, але ж не дазваляе таго вера прашчураў.

Сліна пырскала з ягонага роту ў вядро, белымі пухіркамі асядала па краях эмалі, і салёная марская вада абыякава паглынала яе.

Ён гаварыў, і хвалі глушылі ягоны голас, і ўздыхі зліваліся з пошумам ветру, і скруха выступала белаватымі плямамі горычы на руках і шчоках. Выгаварыўшыся, ён падняў вядро, выліў ваду разам са Стужкаю ў мора. Затым зачапіў парожняе вядро на руку, зацята, бы падказваючы ёй, куды далей плысці, упетрыўся паглядам у далячынь.

Стужка падплыла пад камень, стаілася, назіраючы за старым. Шкадоба ахапіла яе. Упершыню гэтак шкада ёй было цюха, упершыню падумалася ёй, як няпроста кожнаму церабіць сцяжыну ў гэтым свеце.

Фрэкен Дагні і сын старога вызірнулі з-за скалы, пастаялі з хвіліну ў шчаслівай здранцвеласці ад блізкасці адно аднаго і зноў зліліся ў пахаплівым пацалунку.

Яна плыла, і зрэзаны хвалямі і вятрамі бераг сушы, што зрэдчасу вымыкаўся ўдалечыні, болей не прываблівае яе. Але варта было ёй аднаго разу адчуць смак прэснае вады, што сцяка-

ла ў затоку з ракі, як яна тут жа без ваганняў рынулася ў яе.

Горад, што адкрыўся ёй неўзабаве, здаўся шэрым, невыразным. Скаваныя плітамі берагі ракі і блізка не былі падобныя да тых, што яна бачыла раней. Каменна-цагляныя сілуэты забудоваў адзываліся насустрач вуркатаннем галубоў, адлюстроўваліся ў мутнаватай, спрэс засмечанай друзам вадзе. Цюхі заклапочана сноўдалі сюды-туды па набярэжнай, і хада іх нагадвала бязладны рух рыбін у моры на скрыжаванні шляхоў.

Гурт цюхаў, усе чырванатварыя, усе ў пярэстых клятчастых спадніцах, з пляшкамі піва ў руках, наблізіўся да самае вады, агаласіў наваколле нецвярозаю гаманой.

Калона з жалезных бліскучых істотаў (гэткія, толькі менш шыкоўныя, яна бачыла неаднойчы на беразе свайго азярка ўлетку) павольна прасунулася наўзбоч ажурнага, з выступамі-спарудамі ўсцяж парапета моста, і тысячны натоўп пры ходніку, адгароджаны ад праезнай часткі зырклівымі дзецюкамі ва уніформе, выбухнуў воклічам радасці. Віталі якуюсь важную старую ў капелюшы з каронаю, што кроем нагадваў убор мажнай цюхі падчас забавы ў прысутнасці гасцей на чале з намеснікам ваяводы Амялы.

Стужка падплыла бліжэй да моста, каб крыху сагрэцца, застыла нерухома амаль на самай паверхні.

Ніхто не заўважыў яе, ніхто не адазваўся на яе з'яўленне аніводным жэстам. І толькі заблукалы ў трохкутніку з трох сталіцаў цюх-касмапаліт угледзеў яе паўз акуляры, узяў пад руку жонку і са скрухаю ў голасе, што, відаць, павінна была надаць моманту значнасці, сказаў:

— Сара, я цябе ўсцешу: аказваецца, вугры, як і мы, ёсць паўсюль*.

— Як і бубны, любы, — прамовіла цюха, і яе пахмуры, пазначаны мецінай вечнага выгнанніцтва твар яшчэ больш спахмурнеў.

*Гартанна-выбухны голас доктара разануў слых чарговаю фразаю, няўцямным пытальнікам — як кепска ўсё ж такі не ведаць мовы! — адбіўся ў вачах Кіці. Доктар памыў рукі, спорненькім старэчым — туп-туп-туп — крокам вярнуўся да стала. Юрлівая ўсмешка мільгнула ў куточках яго тонкіх, спярэшчаных гадамі і Бог ведае якімі жыццёвымі непамыснотамі вуснаў з шыхтам бліскучых штучных зубоў понізу, апякла Кіці здагадкаю.*

*Яна цяжарная? Няўжо? Быць таго не можа!*

*Доктар паказаў жэстам, каб яна садзілася, зноў упетрыўся паглядам у паперчыну. Штосьці яшчэ сказаў, быццам з намерам спраўдзіць, ці зразумела яна хоць што-колечы, рэзка ўзняў вочы.*

*— Я цяжарная? — прамовіла Кіці няўпэўнена і склала дзеля даходлівасці рукі абручам наўкола жывата.*

*Так, упэўнена матлянуў ён галавою замест адказу і ўхвальна паляпаў яе даланёй па плячы.*

*За вакном па-ранейшаму бушавала навальніца. Кіці міжволі (інстынкт мацярынства — ці не зарана?) ускінула на плечы кофту, і доктар зноў адарыў яе ўхвальным паглядам. Акінуў наастатак вачмі ўсю, ад галавы да пятаў, схіліўся над паперамі. Штось яшчэ прамармытаў на развітанне з-пад рукі, крэкнуў, склаў вусны ў шматзначнай усмешцы.*

---

* Перафраз рэплікі з аповеду Б. Маламуда «Анёл Левін».

*Кіці выйшла на ганак. Дождж вадаспадам абрынуўся ёй на плечы, увобміг змокрый кофту і сукенку пад ёю. Яна перабегла ў другі канец спачваранага непагаддзю двара, дзе самотна туліўся ля слупка пры кветніку супольны іх з Анэтаю — адзін на дваіх — ровар.*

*Ёй раптам стала горача, зноў, як і ўранку, пацягнула на ваніты. Яна схілілася над сметніцай у чаканні, што прыступ млоснасці, можа, пройдзе, але дарэмна. Нутраны смех вырваўся з яе горла, памарудзіў колькі хвілінаў у роце, тонкаю хрыплівую цурчынай вымкнуўся разам з ежаю вонкі.*

*Яна падставіла твар пад дождж, каб змыць з вуснаў ашмёцце ванітаў, села на ровар, павольна пакіравала ў накірунку свайго квартала.*

*На вуліцы было пуста. І гэтаксама пуста было ў галаве ў Кіці: ані думкі, нават пра тое, хто б мог быць бацькам дзіцяці, згадваць не хацелася. Адзіным, што прыйшло ёй ў голаў, але гэта нават не думка была, а, хутчэй, імгненная перакананасць, — што тут, у гэтым чужым горадзе, ёй болей рабіць няма чаго.*

*Канечне, ніякіх ваганняў, ніякага сумневу, усё вырашана: яна паедзе дадому. Толькі б не даведаўся дачасна пра цяжарнасць Гахі, хто ведае, як паставіцца да гэткае навіны, ці не пачне чыніць перашкоды яе вяртанню ў Азёрную Цюханію.*

*Ля дома Гахі было ціха і неяк не па-летняму прахалодна. Дзве прастытуткі таропкаю хадою прайшлі наўзбоч брамы, малады негрытос у белым, сплямленым дажджом пінжаку спыніўся на хвіліну перад дзвярыма, нібы у роздуме, ці варта ўвайсці, нават пакратаў кнопку дамафона з намерам пазваніць, але чамусьці перадумаў, і зноў наўкола зрабілася пуста. Кіці ўзбегла на ганак, хуценька адчыніла дзверыну.*

*Анэта ляжала на ложку, гартала часопіс са згадкамі Аманды Лір пра Далі. Дакладней, разглядала фоткі: ведаў мовы, каб што-колечы як след зразумець, ёй, як і Кіці, катастрафічна не хапала. Кніжку ўчора пасля вечаровае прагулянкі, падчас якой Анэта бессаромна зырыла вачмі па баках на мужчын, падсунуў ёй Гахі — мабыць, дзеля ўзору, як павінна паводзіць сябе з немаладым каханкам поўная сіл ды жарсці кабета.*

*На століку пры ложку грувасціўся гурбаю стосік папер. Анэта ўзяла адну з іх, прыклала да сцяны.*

*Кіці слізганула па паперчыне паглядам, і вочы яе на хвіліну пасвятлелі. Але толькі на хвіліну: іншае займала яе, іншае поўніла ўсю яе істоту.*

*Яна цяжарная! Няўжо? Можа, усё-ткі доктар памыліўся? Ды не падобна, стары, па ўсім відаць, дасведчаны, ды і млоснасць уранні каторы дзень не адпускае — галоўная прыкмета. Яшчэ на катамаране пачалося, а яна, дурніца, не надала тады гэтаму значэння, не да таго было. Каб жа ведала загадзя, што такое здарыцца, хіба паперлася б сюды?*

*Зноў узняўся за вакном вецер, шкамочучы панілкыя ад зашкаў вільгаці галоўкі цюльпанаў і рамонкаў усцяж агароджы, перакінуўся з вулкі на праточку, спярэсціў паверхню вады дробнаю рабізной.*

*Анэта прыляпіла скотчам да сцяны паперчыну, запытальна зірнула на Кіці.*

*— Ну, як табе?*

*Кіці безуважна ўтаропілася паглядам у здымак.*

*Мужчына сярэдняга веку са скіпетрам у руцэ пахмура ўзіраўся ў блакітна-зялёную далеч, сатканую з пасаў лясістых узгоркаў і азёрных упадзін, на тле якіх корпаліся ля вадаёмаў з рыбнымі статкамі кабеты і мужчыны з радаснымі,*

*асветленымі прамянямі сонца і ўдзячна скіраванымі ў бок уладара тварамі.*

*— Што гэта?*

*— Новы ваявода Азёрнай Цюханіі, хіба не бачыш? Дарэчы, і вершык во ёсць... Паэт нейкі, Харэня, напісаў у гонар новага абранніка. Чула пра такога?*

*— Ліха яго ведае. Таго, што пры Амяле быў, іначай звалі, здаецца. Бук, ці Дундук, ці як там... Ат, гары яны! — Кіці азірнулася, накіравалася да дзвярэй. Прычыніла іх шчыльней, вярнулася зноў да ложка. — Параіцца трэба, Анэтка, пакуль Гахі нямашака, — сказала і міжволі падумала пра тое, што карысці будзе з размовы, калі і без яе ўсё вырашана.*

*Яна зірнула зноўку на здымак на сцяне, і выраз абыякавай утрапёнасці, што межавала з разгубленасцю, упершыню змяніўся на яе твары ўсмешкаю нясветнае лагоды. Лагоду выпраменьвалі яе вочы, лагодаю поўніўся голас. І калі яна скончыла гаварыць, Анэта доўга яшчэ заставалася ў палоне неспадзеўнае тае, настальгічна-мройлівае лагоды.*

*— Бач ты, як бывае, — сказала нарэшце і, поўная пагарды да Гахі, які, канечне ж, ніколі — хто б сумняваўся — гэткім шчасцем, што напаткала Кіці, яе не адорыць, зазбіралася ў краму, куды меліся прывезці апоўдні свежую партыю тавару.*

*Шопінг дык шопінг!*

*Кіці цяжка, быццам ужо была на апошнім месяцы цяжарнасці, паднялася з ложка, пайшла следам за Анэтаю. Анэта ўгаворвала яе застацца ў пакоі (раптам прыцягнецца Гахі і ніводнае не заспее), але яна не згадзілася. Ад адной думкі пра нейкія там забавы, якія ўчора яшчэ гэтак заводзілі яе, ёй зрабілася так млосна, што яна ледзь дала рады ўтрымаць у горле шорсткі камяк.*

Стужка адштурхнулася ад дна, няспешна, бы на шпацыры, падалася зноў угору. Месца, куды яна зараз трапіла, паддаўшыся спакусе ўплысці ў абсаджаную дэкаратыўным кустоўем і кветкамі праточку, нагадвала кірмашовы пляц. Сотні неонавых ліхтароў поўнілі дрыготкае ад блізкасці вады паветра морам сполахаў, дзесяткі маладых цюхаў з прыкрытымі дзеля прыліку вузкімі паскамі, а то і проста валасамі саромнымі месцамі самотна грэліся ў чырванавата-жоўтым святле ў чаканні ўвагі спешчаных размаітасцю жывога тавару мінакоў.

Паўсляпы цюх з радзімкаю на пераноссі, спадкаемны часальшчык воўны, а затым па волі лёсу — ваявода адной з выспавых краін, народ якой не ацаніў як след яго безумоўна карыснай для дзяржавы суворасці і выправіў у бестэрміновае выгнанне, выбіўшы перад тым камянём левае вока, падхапіў яе, здарожаную, размораную стомай, з аблепленай цінаю, напалову затопленай падчас дажджу прыступкі пры набярэжнай, куды яна ўсплыла, каб лепш бачыць усё тое сярэдначнае хараство, доўга круціў у руках сяк і так, нарэшце, рады нечаканай здабычы, панёс у краму з кідкім, бачным здалёку назовам «Sexshop». Распаліў у бакоўцы пліту, мабыць, каб здзерці скуру ды падсмажыць, але не паспеў. Хтосьці паклікаў яго, і ён, заклапочаны нейкаю тэрміноваю справаю, сышоў, пакінуўшы Стужку на прылаўку. Прадавачка, якая з'явілася ў памяшканні праз колькі хвілін, зіркнула на яе даўгое ільснiстае цела, шпурнула безуважна ў гурбу муляжоў грудзей і фаласаў ды іншых прычындалаў для любошчаў.

Стужка ўжо крыху асвойталася сярод усяго гэтага інтымна-разбэснага начыння, як увайшла першая пакупніца. Гэта была цюха год пад трыццаць

з гарохавым струкам у роце, з якога яна раз-пораз спрытна вымала зубамі па гарошыне, патрымаўшы хвілю на кончыку языка, з асалодаю праглынала. Яна з абыякавым выглядам прынялася корпацца ў залежах тавару.

Найперш цікавілі пакупніцу фаласы. Яна так доўга перабірала іх, што прадавачка пачала нервавацца. Пагляд цюхі ўпаў на Стужку, і выраз яе твару з грэблівага перарабіўся на ўсцешны. «Вось, здаецца, тое, што мне трэба, — сказала яна, падхапіла Стужку даланёй, пайшла да касы. — Трэба ж — бы жывы вугор. А даўгі-і-і, гад...»

Жытло, куды яны прыйшлі, нагадвала сумесь салона і вясковае хаты. На стале стаяла клетка з вераб'ямі. Сцяну над ёю ўпрыгожваў партрэт малойца ў аздобе выяваў вугрыных тулаваў на тле патрушчаных гарохавых струкоў і ссохлых, з рэштаю атруты на станчэлых абалонках ягадзін амялы.

Цюха зашмаргнула гардзіну на вакне, хуценька распранулася, легла на ложак. Стрымліваючы дыханне, што штуршкамі вырывалася з роту, паднесла Стужку да голага, бы вытаптанае гусямі поле лона.

Стужка ўцягнула голаў у тулава, паспрабавала вызваліцца з не надта далікатных, з ледзь улоўным пахам рыбінай лускі пальцаў цюхі.

— О, дык мы з гонарам! — засмяялася тая і цмокнула ўяўную прыладу ў хрыбет. — Хто б мог падумаць: амаль праўдзівы вугор. Не тое што ў гэтага нездалякі аднавокага. Собіла мне квапіцца на замежжа... — Яна зноў паднесла Стужку адною рукою да нізу жывата.

— Мая Анэтка мяне чакае? — пачуўся голас ад дзвярэй, і на парозе вырасла таўсматая, падперазаная шырокім пасам пастава гандляра. — Мая смачненькая! — Яго пагляд упаў на здымак вая-

воды над сталом, і выраз гуллівасці на ягоным твары саступіў грымасе здзіўлення. — Здаецца, тут іншы ўчора быў партрэт...

— Гахі, які ты праніклівы! Аж нецікава з табою, — сказала цюха млявым голасам і прыкрыла Стужку прасцінаю. — То ўчора, а сёння во іначай...

— Адкуль ён у цябе?

— З сеціва, адкуль яшчэ... Усё цячэ, каханы, усё мяняецца, праўда? Рыбу вынішчылі ў маёй Азёрнай Цюханіі, кепска стала з харчам, во і падняўся люд, скінуў ваяводу... Жах! А гэткі, здаецца, памяркоўны-ціхамірны быў. А тут яшчэ адзін з ваяводавых намеснікаў, пішуць на сайце, падліў масла ў агонь, падсядзеў начальніка. От і давай ты каму веры! Ды ты сам ведаеш, як яно на гэтым свеце подла ўладкавана...

— А няўжо ж, — пагадзіўся гандляр і са скрушлівым выразам на твары пакратаў вока-пратэз пад брывом. Пасунуў руку пад прасціну, схапіў Стужку за бок. — А тут што ў цябе?

— А тое, што цябе не тычыцца, вісус! — адказала цюха паўжартам і нямоцна хвастанула яго Стужкаю, бы бізуном, па баку. — Прасі не прасі не лезці ў чужое — як аб сцяну гарох! Так, цацка, нічога асаблівага...

— Штосьці новае, — сказаў ён і сеў на ложак. — Не ведаў, што мая любка прагная да такіх забаваў... Не трэба, выкінь ты гэтую дрэнь!

Цюха са шкадобаю зіркнула на Стужку, уздыхнула, быццам знарок адцягваючы хвіліну расстання, сказала:

— Кіці заўтра з'язджае, ведаеш?

— Яшчэ што брашы! — не даў веры гандляр. — Як гэта? Толькі прыехала і ўжо — з'язджае? Блага ёй тут?

— Цяжарная яна, вось што. Дурніца! Не ведала нічога, пайшла да доктара і там толькі даведалася... Як табе гэта?

Гахі абыякава перасмыкнуў вуснамі.

— Ат, хай едзе, менш будзе турботаў. Пачне па лекарах хадзіць — то ж адны выдаткі... Як там у вас кажуць: баба з воза — каню лягчэй? Так, здаецца?

— Каму лягчэй, а каму, наадварот, — цяжэй... Усё ж зямлячка, словам хоць было з кім перакінуцца...

— Дзівосы дый годзе! То варагавалі вы, сучкамі адна адну называлі, а то во: сяброўкамі ўвадначас парабіліся. З чаго б гэткія метамарфозы?

— З жаноцкае салідарнасці, вось з чаго. Што незразумелага?

Мяккія, ледзь чутныя крокі пачуліся з калідора, цюха ў кароткай паркалёвай спадніцы ў дробненькі гарошак увайшла ў пакой. Гэта была Кіці — ціхамірная, паважная, ні кроплі падабенства да той, якая была на возеры.

Гахі варухнуўся на ложку, упетрыўся вачыма ў твар Кіці.

— З'язджаеш? А як жа дамова наконт працы?

— Я кантракта не падпісвала, самі ж вы таго не пажадалі, сказалі: час патрэбны для іспыту. — Кіці прайшла да ложка, села на край. — Вось і маеце іспыт. А мне тут пры вашых забавах у ролі чалядніцы не выпадае заставацца. Так што ўжо як-небудзь самі, без мяне...

Гандляр выхапіў Стужку з рук Анэты, размахнуўся, каб шпурнуць у вакно, але не паспеў. Кіці перахапіла яе пальцамі за тулава, пяшчотна, бы немаўля, прытуліла на імгненне да грудзей.

Пагляды іх перакрыжаваліся, змогшы перашкоду, што нябачнаю завесаю варожасці і злосці

паўстала між імі яшчэ падчас першае — у лазні — сустрэчы, павольна, як два раўчукі падчас паводка, зліліся ў экстазе ўзаемаразумення. Кіці падышла да дзвярэй гаўбца, прымеціўшыся, як мага асцярожней кінула Стужку ў напоўнены вадою басейн.

Пяць хвілін палёту ад ложка да басейна на дзядзінцы перад будынкам здаліся Стужцы вечнасцю.

Вада разышлася хвалямі па паверхні басейна ад яе цела, адазвалася радасным воклічам.

— Пластык, а гук пры падзенні нібы жывая істота выдае, — сказаў, высунуўшы праз хвіліну ў вакно густа paрослае валасіннем цела, Гахі, і здзіўлены яго, з характэрным паўднёвым тэмбрам голас, што нагадваў чымсьці гук бубна, рассыпаўся дробным рэхам па-над праточкаю.

*Кіці прачнулася ад гарачыні. Падхапілася з канапы, каб выйсці на гаўбец, але не паспела і двух крокаў зрабіць да дзвярэй, як Анэта варухнулася на сваім ложку.*

*— Блага табе? — спытала спрасонку і зноў заспала, усклаўшы голаў на вокладку часопіса са згадкамі Аманды Лір.*

*На двары было ціха, асветлены неонам басейн аддаваў срэбрам і нагадваў з вышыні гаўбца прыпарушанае снегам ворыва пад гарох у Азёрнай Цюханіі. Кіці слізганула паглядам па вадзе, вока яе міжвольна зачапілася за нейкі тонкі, накшталт пруціны, прадмет збоч сходаў.*

*Падобна было на тое, што вугор усё яшчэ быў у басейне. Але чаму? Чаму ён не плыве прэч, а застыў на месцы, нібы скаваны палярушам? Ён ці, можа, яна? Калі меркаваць па даўжыні ды форме цела, усё-ткі, хутчэй за ўсё, — яна, вугрыха.*

*Кіці дастала з шафы гаржэтку, ускінула на плечы. І адразу адчула сябе нашмат больш упэўнена, чым увечары, калі размаўляла з Анэтаю і Гахі пра немінучы ад'езд.*

*Да басейна цягнула, бы жалязяку магнітам. Яна сышла на дол, хутаючыся нізам твару ў пер'е боа — на дварэ было прахалодна, — ціхім крокам наблізілася да басейна з таго боку, дзе была рыбіна. Апусціла руку ў ваду з намерам змусіць вугра плысці прэч, але той не толькі не паплыў, а, наадварот, яшчэ шчытней прыціснуўся целам да кафлі, быццам запрашаў і яе, Кіці, у хаўрус.*

*Вада была зімнаватая, такая, як у возеры напрыканцы лета. Не такая зімная, праўда, каб адразу ж і прастудзіцца, ды ўсё-такі... Ці не адаб'ецца гэтае восеньскае купанне на здароўі дзіцяці? А калі так, то ці не след ёй, Кіці, быць больш абачлівай ды асцярожнай?*

*Яна націснула кнопку на пульце, паволі, пакуль цяплела вада ў басейне, скінула з сябе боа, зняла вопратку. І як толькі пачалі ўзнімацца panад паверхняю басейна клубы пары, кінулася ў яго.*

*І вугор тае ж хвіліны ажыў, адштурхнуўся хвастом ад кафлі, рашуча паплыў ёй напярэймы, нібы знарок пакідаючы пасля сябе на траекторыі руху танюсенькі, ледзь бачны паўз рабізну паверхні ланцужок ікры.*

*То была, без сумневу, вугрыха. І ці не тая акурат, што прыляпілася да яе ў моры ля катамарана? Кіці выпрастала руку, каб дацягнуцца да рыбіны, але не паспела.*

*Вугрыха сама абвіла яе руку хвастом, падсунулася галавою пад запясце, усклала голаў на далонь.*

*Кіці асцярожна, каб не ўпудзіць знячэўку вугрыху, перавярнулася на спіну.*

*Рыбіна варухнулася, саслізнула з рукі, знікла ў вадзе. Але праз хвіліну зноў з’явілася. Вымыкнула на тры чвэрці цела па-над паверхняю басейна, пазыбалася серпікам упобачкі ды і паплыла да працілеглага краю, дзе знаходзілася сцёкавая адтуліна, што лучыла басейн з пратокаю.*

*Кіці вылезла з басейна, пайшла да пульта, націснула кнопку спуску. Вада гайданулася, з шумам рынулася прэч з цэментова-кафлевага палону.*

*Неўзабаве басейн быў пусты. Кіці абгледзела яго, баючыся, што вугрыха, крый Бог, не здолела выплысці, але асцярога была дарэмнай.*

*Штосьці ледзь чутна рыпнула ўгары, быццам хто ступіў на маснічыну падлогі ды і суцішыўся, напалоханы гукам ад уласных крокаў.*

*Мабыць, Анэта, падумала Кіці і ўзняла голаў ды разявіла рот, каб гукнуць сяброўку.*

*Але то была не Анэта.*

*Зоркі Вялікага Каўша ўхвальна падміргнулі па чарзе ёй з неба, завіліся шнурам, паплылі ўсцяж аблокаў да небакраю, туды, дзе, калі даваць веры мапе ў пакоі Гахі, павінна знаходзіцца Азёрная Цюханія.*

Зноў Стужка плыла. Як — толькі скалы ведаюць, ды вецер, ды статкі рыбаў усцяж бясконцых, як само яе падарожжа, рыфаў... Ды яшчэ зараснікі марскіх водарасцяў, што не аднойчы і не адной ёй прыдаліся ў міг неспадзеўнае небяспекі для жыцця.

Тлустыя разлівы нафты з тушамі панішчаных рыбаў абапал параненых караблёў паўставалі на яе шляху.

Цельпукаватыя субмарыны вымыкаліся напераррэз з марскіх нетраў.

Паддонныя магматычныя схроны пужалі знячэўнасцю выбухаў.

Шкілеты ўпотай скінутых маткамі цюхамі ў марское прадонне немаўлят агаломшвалі няцюхскасцю ўчынкаў.

Армады ненажэрных акулаў, тунцоў, скатаў ды іншых драпежнікаў страхавітымі шыхтамі перагароджвалі ёй дарогу, падсцерагалі на дне, ляскалі ўслед зубамі.

Ды нішто не магло спыніць яе ў імкненні да няведамага, дзе павінна была яна, верная покліч у прыроды, скласці жыццё ўзамен на працяг роду.

Яна плыла, і месяц радзіў ёй, куды кіраваць, і зоркі Вялікага Каўша падказвалі шлях.

Цяпер, пасля ўсіх перыпетый падарожжа, яна дакладна ведала, што ані ў чым не варта шукаць волі і шчасця, апроч як у самой сабе.

Ні стомы, ні страху за жыццё яна не адчувала. Наогул нічога не адчувала — проста плыла ды, пэўная, што будзе ўсё як след, зрэдку прыпынялася, каб перавесці дух.

Адзіны ўспамін наведваў яе зрэдку — пра Стужыка. Ён павінен быў быць побач, ён адзін мог бы стаць зарукаю бясконцасці яе жыцця. Яна згадвала іх першую — у азярку — сустрэчу, і сэрца яе зноў поўнілася скрухаю і маркотай.

Дзіўна, але і тут, у моры-акіяне, яна штораз натыкалася на цюхаў. Гультаі і руплівцы, жабракі і багацеі, калекі і атлеты, злачынцы і праведнікі, цнатліўцы і распуснікі — хто толькі ні вымыкаўся на яе сцяжыну, хто толькі ні лічыў патрэбным сцвердзіць собскую самасць дэманстраваннем фізічнае перавагі перад слабейшым пад бой размаі-

тых паводле аздобы ды формы — ад пляскатых, як блін, да прадаўгаватых, як халява цюшынага бота, ад серпападобных, як ветах на небе, да круглых, як вока камбалы, — бубнаў. Часам яна ўнікала тых сустрэч, а часам, наадварот, імкнулася да іх.

Асабліва прываблівалі яе палкія стогны ахопленых жарсцю маладзіц ды малойцаў, што, карыстаючыся адсутнасцю сведкаў-падглядчыкаў, аддаваліся адно аднаму на вільготных, белых ад марской солі палубах сустрэчных кацераў ды катамаранаў. Заўважыўшы здаля такіх каханкаў, яна падплывала ўпотайкі пад борт судна, напружвала слых, чуйна лавіла кожны гук найвялікшае пакуль што для сябе таямніцы. Часта стогны тыя пераходзілі ў рыкі, такія гучныя і страхавітыя, што здавалася, быццам не з цюшыных вуснаў яны зляталоць, а з чэрава самой марской стыхіі прабіваюцца да паднебных вышыняў.

Яна слухала тыя стогны і міжволі згадвала — і калі тое было, а вось жа помніцца! — забавы Кіці і цюха-панурчыка ў возеры, і гэта адзінае было цяпер, што дадавала імпэту плыць далей яе стомленаму, хоць і лёгкаму, бы парушынка, целу.

Натыкалася яна і на супляменнікаў. Найчасцей гэта былі вугры тутэйшыя, марскія. Часам калоніі іх былі такія шматлікія і яны ў такіх маляўнічых позах — у выглядзе станчэлага сярпа — застывалі на дне, утыкнуўшыся хвастамі ў глей, што нагадвалі засеянае дзівоснымі раслінамі поле.

Сустракаліся ёй і тыя, што прыплылі здалёку. Аасабліва шмат было такіх з абсягаў далёкай Цюханіі Падзорнай, краіны-імперыі, дзе, калі даваць веры іх расповедам пра тамтэйшыя норавы, галоўны цюшыны харч — стравы з белага зерня, а адметнасць аблічча — такія вузкія вочы, што яны

ледзь-ледзь бачныя між павекаў. Узрошчаныя зазвычай ва ўмовах садка ці сажалкі, гэтыя вугры часам былі так дрэнна прыстасаваныя да існавання ў натуральным асяродку, так кепска арыентаваліся ў марскіх абшарах, што вельмі хутка рабіліся лёгкаю спажывай для драпежнікаў. Як, напрыклад, той занадта даверлівы вугрык, што, падмануты ўдаваным міралюбствам мурэнавага вугра, неабачліва наблізіўся да ягонае нары і тут жа быў бязжаласна праглынуты суродзічам-канібалам.

Ёй захацелася адпачыць. У пратоцы з назовам з двух кароткіх, раздзеленых рыскаю словаў — яна паспела ўгледзець іх паўз шэрань на ўказальніку пры спуску на прыстань — выяўна адчуваўся подых акіяна. Было неспакойна, хвалі, што ўздымаліся ўсё вышэй, абяцалі непагадзь, і яна вырашыла схавацца пад паромам. Падплыла пад дол, зачапілася за выбоіну, прыціснулася целам да настылага íсподу.

Купка цюхаў схілілася над парэнчаю, захісталася гурмою ценяў між хваляў.

Яна выпрасталася на аблепленым планктонам паддоне, замёрла ў нерухомасці. Падумала, што няблага было б паглядзець на сябе збоку, ды тут жа і супакоілася: што там убачыш усцешнага пасля ўсяго, чым гэтак шчодра адарыў лёс апошнімі днямі, што давялося перажыць? І паціху, закалыханая хвалямі ды адоленая стомаю, заснула.

Ёй прымроілася, быццам яна — цюха-вугрыха. Вандроўніца ў прасторы, што, надзеленая здольнасцю перасягаць бачныя і нябачныя перашкоды, пранікаць у самыя глухія, патаемныя куточкі

пазачасся — ад велічных у сваёй жахлівасці руінаў зніклых пад ціскам злыбяды гарадоў да прыцемненых шатамі джунгляў дзікунскіх паселішчаў з іх культам свяцілаў і каменных багоў, — гойсае па-над зямлёю-акіянам у пошуку свайго цюха-вугра. Гэткая дарэшты заклапочаная неперадольным жаданнем працягу роду рызыкантка, што вырвалася з цянётаў абрыдлых азёрна-марскіх нетраў і з настойлівасцю знашчанае непамысным — насуперак прыродзе — устрыманнем самкі пераследуе кожнага, хто, аслеплены такім жа, як і яна, жаданнем займець нашчадкаў, губляе розум і пільнасць дзеля кароткае, але слодычнае хвіліны яго здзяйснення.

Каго толькі не спаткала яна ў тых мроях, з кім толькі не звёў яе лёс. Ад сталага цесляра з сухім, бы перапечаны сонцам кішміш, целам да зграбнага папуаса з дыхтоўна выштукаваным торсам і тамтамам за плячыма. Ад прыбітага роспаччу з прычыны здрады каханкі службоўца, што без супынку румзаў ды наракаў на лёс, да прыхільніка ранішніх мастурбацый забарадацелага тэрарыста-смяротніка. Ад аматара свіных кумпякоў да вегетарыянца-сёрфінгіста, які дзень праводзіў на пляжы, а к вечару, намасціўшыся сродкам ад жамяры, скакаў пад бой бубна-карынгі, каб пазбыцца адзіноты, праз вогнішча. Ад цнатлівага служкі экзатычнай рэлігіі да распуснага, белага, як марская пена, аматара танцаў, што прывёў яе дахаты і перш чым аддаць пяшчоту ёй, аддаў яе жарстліва-полымнай, бы сонца падчас змяркання над акіянам, прыяцельцы-мурынцы.

Ніводзін не аказаўся ёй даспадобы, ні да аднаго яна не адчула не тое што сімпатыі, а нават звычайнай прыязнасці. Усё было не тое, усё — боб з

гарохам. І тады яна вырашыла звярнуцца па параду да празорцы. Той уважліва паслухаў яе, паказаў у бок возера, што выблісквала паверхняю з-за асветленага скупымі прамянямі ўзгорка.

На беразе пры рыбным пітомніку, пры якім мітусіліся сюды-туды з кошыкамі корму для рыбы цюхі рознага ўзросту ды цаласкладу, сядзеў паэт Ямбук і рваў на галаве валасы. Ён ужо выдраў на цемю ладны плех, і валасы гурбаю груваcціліся ля ягоных ног, нагадвалі пра шчаслівыя моманты ўзвышэння, што сплылі незваротна неўзабаве па сыходзе з возера абылганых вугроў. Вецер раз-пораз павяваў з-за ўзгорка, разбэрсваў гурбіну, і паэт скрушліва вадзіў вачыма па наваколлі, дзе ўжо шнарыў у пошуках рыфмаў адвечны яго супернік — клеўрэт новага ваяводы Харэня.

Напалоханая, што гэта, мусібыць, і ёсць той, каго яна шукае, яна ўжо наструнілася, каб кінуць усё ды бегчы прэч, як убачыла таго, каго насамрэч шукала.

Малады цюх-вуграпод стаяў на беразе паблізу і сартаваў з нерата па балеях вылаўленых у возеры вугроў. Браў толькі срэбных, гатовых да адплыцця ў мора Сяродморскае, астатніх, зялёных ды чорных, кідаў зноў у ваду, і колер яго вачэй штоpазу мяняўся, бы скура хамелеона, адпаведна колеру здабычы, што трапляла гэтае хвіліны яму ў рукі. Гэта быў Люцік.

Яна памкнулася да яго, каб памагчы, але ён адмовіўся ад дапамогі.

Тады яна распранулася, пакінуўшы толькі андатравую гаржэтку на плячах, пабрыла да таго месца, дзе калісь стала сведкаю любошчаў Кіці і цюха-панурчыка. Спынілася на быстраку, удаючы абыякавасць, упетрыла пагляд у статак курмялёў

ды пласкірак, што абляпіў яе ногі ў пошуку спажывы.

Люцік кінуў балею, распажаджаны выглядам яе вабнага вугрына-цюшынага цела, борзда скінуў з сябе світку і нагавіцы, рынуўся ў возера. Падсунуўся ззаду, рашуча, але разам з тым пяшчотна ўвайшоў плоццю ў лона. Струмень ягонага семя, магутны, як рака падчас паводка, спакваля перацёк у яе, стаў яе часткаю.

Купка цюхаў вымкнулася з боку паселішча, з ваяўнічымі воклічамі пабегла да возера — нішчыць паняволеных у балеях вугроў, якіх ён перад гэтым сартаваў.

Яна замерла ў чаканні, што Люцік зробіць штонебудзь, каб абараніць няшчасных, над якімі навіслі ўжо доўбні, і хлопец нібыта ўжо і скрануўся з месца, каб тое зрабіць, але раптам зноў застыў у здранцвенні ды застаўся стаяць пасярод ціны з абыякавым выразам на здаволеным прамінулаю любоўнаю ўцехаю твары.

Яна адпіхнула яго ад сябе, кінулася паўз вострыя камяні, што балюча калолі ў ногі, на бераг, паперакульвала балеі ў ваду.

Хтосьці (па паху рук яна здагадалася, што гэта ці не Валер) схапіў яе за лытку, тузануў да сябе з намерам паваліць. Дзесяткі іншых рук абшчаперылі яе, мкнучыся здзерці з плячэй ненавісную андатрава-лебядзіную гаржэтку, замітусіліся побач. Яна ўжо падрыхтавалася ў думках да горшага, як раптам убачыла яшчэ адну руку, што мільгнула ў паветры ды ўчапілася кіпцюрамі ў Валераву. Азірнулася, каб паглядзець, хто гэта ёй памагае, і не паверыла вачам.

Скрай берага стаяла вялікая, як гара, цяжарная Кіці, не даючы Валеру як след ухапіцца за лытку, метадычна акунала яго галавою ў ваду.

Яна зноў зрабіла спробу вызваліць нагу, адчуваючы, як калянее, пакрываецца вугрынаю скураю ды сліззю цела, счакала хвіліну, пакуль дарэшты аслабее Валерава рука, шмыганула да вады. Люцік ступіў следам за ёю ў заточку ды тае ж хвіліны амаль выскачыў назад на бераг. Яна зірнула на яго з-пад рукі, што ўжо напалову ператварылася ў плаўнік, і выраз сполаху на ягоным твары астудзіў яе глузды ўсведамленнем марнасці спадзеву.

Гаржэтка саслізнула з яе плячэй, узнялася, падхопленая ветрам, угору і зноў апала долу, пад ногі цюхаў. Яна падумала, што нядрэнна было б падняць яе, але вяртацца — хто ведае, што ў іх наўме? — не наважылася. Узмахнула штомоцы плаўнікам-рукою, нырнула ў возера.

Люцік, а за ім Цімох з Дыянкай, што немаведама скуль тут узяліся, ступілі дружна ў заточку і, перш чым раз’ятраныя цюхі далі рады даўмецца, што да чаго, ускаламуцілі нагамі ваду, зрабілі Стужку недасяжнай для злосці натоўпу.

Акунь і судак злякана ляснулі зубамі, далі ёй дарогу, стаіліся ў цені альшыны. Гамуз асмялелых плотак праплыў паўз іх, порстка рассыпаўся ў трыснягу.

Зноў была яна — вольная, і зноў — адна, самнасам з воляю.

*Кіці прахапілася ад сну, прытрымліваючы аберуч велізарны свой, што рос ужо нават не па днях, здаецца, а па хвілінах, жывот, асцярожна спусціла ногі з ложка на падлогу, прыслухалася. Зноў гэтыя бубны? Ці, можа, здалося ёй спрасоння, што яны, прытрызнілася немаведама што ў дрэме? Хоць што дзіўнага было б, каб і прытрызнілася, ці*

*ёй, пракаветнай цюхаазёрненцы ды яшчэ спадкаеміцы васьмі каленаў бубначоў, прывыкаць да іх бою? Была б нагода ўчыніць галас, а ўжо бубен, не такі, дык гэткі, у тутэйшых шыротах заўсёды знойдзецца. Як і ахвотнікі біць у яго, дарма што з выгляду люд нібыта рахманы.*

*Яна паднялася, каб пайсці ў матчын пакой ды запытацца, што да чаго, глянула ў вакно.*

*Маці пералівала палонікам з саганка ў слоікі адвар з ягадзін амялы ды распавядала Валеру, які гэта файны лек ад прастуды, асабліва пры запаленні лёгкіх.*

*Валер стаяў побач, пускаў раз-пораз з роту кольцы дыму ад цыгарэты і, як толькі старая змаўкала, штосьці з імпэтам пачынаў ёй даводзіць, мабыць, чарговы раз скардзіўся, якая яна, Кіці, бессардэчная, бо ніяк не жадае брацца з ім шлюбам, ды схіляў маці паспрыяць у такой важнай, далікатнай справе.*

*Дзівак! Іншаму і дзесятае часткі таго, што выказала яна апошнім разам наконт немажлівасці іх сумеснага жыцця, хапіла б. Яму ж што ні скажы — нібы аб сцяну гарох. Пагатоў увесь свет падыме на ногі, абы толькі давесці, быццам гэтае во, што ў чэраве яе, дзіця, — ягонае. З таго часу, як яна вярнулася з замежжа, дня не мінула, каб не паназаляў, быццам свет клінам для яго сышоўся на ненароджаным тым дзіцяці.*

*Яна высунула галаў у вакно.*

*— Мама, клікала мяне? — спытала сіплаватым спрасонку голасам.*

*— Не, з чаго ты ўзяла? — адказала тая. — Вось, пра «Рыбанагляд» гамонім з Валерыкам ды пра амбарга...*

*— Пра якое яшчэ эмбарга?*

*— А ты не ведаеш нібыта! Прырэчная Цюхачнія аб'явіла нам насуперак адстрэлу гусей амбарга на гандаль голкамі ды іншым жалеззем. Ліха іх, гэтых амбаргаў: аб'яўляць, а ты круціся, як хочаш. Хоць шаршаткаю вышывай. Ды і напарстак во апошні, што, як падзіравіцца...*

*— Ну ж і клопаты ў цябе, мама: эмбарга! А з «Рыбанаглядам» што?*

*— Аднаўляюць пасля скасавання «Краёвага Штаба Рыбалова», дык раімся, ці варта Валеру пераходзіць туды на працу. Заробкі там лепшыя, як у рыбным цэху, абяцаюць, зноў жа — пры харчы заўжды будзе. Ды і не так клопатна, казаў той, і ўлежней, і ўежней... Сама ведаеш.*

*— Дзе харчы, там і тарчы? — пацвялілася Кіці і махнула рукой. — Ну-ну...*

*Валер пакрыўджана шморгнуў носам, пайшоў прэч.*

*Кіці вярнулася ў пакой, крутнула ручку прыймача. Знаёмы (штодня па колькі разоў у эфіры) голас ваяводы Амяліны заклікаў усіх, каму неабыякавы лёс цюхаазёрненскага краю, згуртавацца ў змаганні супраць ненажэраў гусей ды іх блізкіх сваякоў лебедзяў. Не паспеў ён аціхнуць, як бубен азваўся яму з вуліцы, і шыхт мужчынаў са стрэльбамі пазаплечу і паходнямі ў руках прайшоў паўз гароды, накіраваўся да возера.*

*Маці ўвайшла ў хату, замітусілася з кута ў кут.*

*— Магла б і ласкавей з Валерам абыходзіцца, — сказала і абвяла скрушлівым паглядам дыванок з выяваю так усё яшчэ і не давышыванага радаводнага дрэва, што самотна шарэўся асноваю на зэдлі пад нядаўна ўрэшце дазволенымі пасля амаль гадовае забароны абразамі. — Чалавек някепскі, і мне во памог бы па-сваяцку голак расстарацца. А то*

*вымкнецца якая ды прысабечыць малойца... Вунь, кажуць, Ядзя ўжо наўкола завіхаецца... Вось і падумала б, пакуль не позна, памеркавала б. Дык не — у змаганкі, бач, кінулася. Гусей будзе яна, цяжарная, абараняць, дай рады! Бытта больш няма каму... Бытта мала гэткага дабра на свеце. Адных паб'юць — іншыя прыляцяць. Такой бяды!*

*Кіці ўскінула на плечы ўсё яшчэ ніштаватую, хоць і крыху, праўда, збадзяную падчас пазычак сяброўкам у доме Гахі ды перыпетый вяртання ў родныя пенаты гаржэтку, выйшла на двор, пасунулася следам за паляўнічымі.*

*Ля рыбных яслікаў пры возеры Люцік, ад нядаўняга часу топ-менеджэр рэканструяванага кааператыву «Мярэжа», утраіх з Цімохам і Дыянкай сартавалі малёнкаў. Падхватнік то высока ўзлятаў у іхніх руках, то з імпэтам апускаўся ў ваду, сотні кропляў разляталіся ўбакі ад іх праніцаных сонечнымі прамянямі целаў і зноў вярталіся ў зарыбленую дарэшты сажалку. Тысячы краснапёрак, язёў, карпаў і іншых рыбак-аўтахтонаў, штурхаючыся, мітусіліся па ясліках у пошуку ежы ды зручнейшага месца пад сонцам.*

*Люцік перакуліў у сажалку запоўненую рыбкамі балейку, убачыў Кіці, падняўся насустрач. Памкнуўся загаварыць, але яна адмоўна хітнула галавою, пасунулася далей паўз асаку да возера.*

*Вада ў возеры была цёплая і мяккая, бы пер'е боа на шыі. Яна падумала, што няблага было б убрысці ды пастаяць у возеры колькі хвілін, але не адважылася: раптам пачнуцца ў вадзе схваткі, што тады?*

*Цьмяны, ледзь заўважны з берага пасак лянівa варухнуўся сярод прыпарушанага гусіным пер'ем багавіння, застыў пруцінаю збоч выкінутага кімсьці дзіравага нератка з друшляком усярэдзіне.*

*«Вугор, ці што? — падумала Кіці здзіўлена і тут жа прагнала прыпушчанне: — Пасля гэткага паляванне? Ці можа такое быць?».*

*Яна нахінулася, каб зачэрпнуць жменяю вады ды апаласнуць твар, як раптам наўкола стала цямнець. Спачатку зрабілася шэрым паветра, затым шарызна імкліва перакінулася на прыбярэжныя асочнік і хмыз, і вось ужо густая, рудавата-непранікальная, хоць вока калі, цямрэча запанавала над усім.*

*Няйначай, зацьменне, падумала яна і азірнулася ў надзеі ўгледзець паўз шэрань ды паклікаць на дапамогу Люціка і Цімоха з Дыянкай, але дарэмна. Ні ясляў, ні Люціка і яго хаўруснікаў пры іх, ні берага не было бачна.*

*Яна хацела закрычаць, каб усё-ткі даклікацца хлопцаў ці хоць каго, хто мог бы аказацца ў гэтую хвіліну побач, але страх так скаваў яе, што з роту не вылецела ні гуку. Яна ў адчаі задзёрла галаў угору, быццам звяртаючыся па паратунак да самога неба, і ўбачыла слабыя, прымружаныя марывам абрысы сузор'я Вялікага Каўша, што павольна выясняліся на тле густога небнага прадоння, рабіліся ўсё больш выяўнымі і ўрэшце зыбнуліся, паляцелі долу, асвяцілі на імгненне тысячамі зырклівых прамянёў застыглае ад пярэпалаху возера і прыбярэжныя зараснікі.*

*Дзесяткі бубнаў, што драмалі дагэтуль па берагах возера ў соннай зняможанасці, адгукнуліся здалёку на той неспадзеўны заркапад такім нязвыкла лагодным боем, што яна міжволі здзівілася: няўжо такое мажліва? Бубен, страхавіты бубен, што каторы год поўніць зляканую надазёрную прастору страхавітымі гукамі, можа быць гэткім кранальна-далікатным?*

*І вось зноў стала паўсюль светла. Кіці хіснулася да берага і ўжо амаль дапала да яго, як раптам убачыла на быстраку збоч купкі багавіння ўсё тую ж звілістую, падобную да вугра істоту. Выпрастала рукі, каб дакрануцца да яе, ды не дала рады. Моцны боль унізе жывата працяў цела, і яна без прытомнасці павалілася ніцма на прапахлую падчас прадаўніх паляванняў рыбаю траву.*

*Маці з вышыванкаю ў руках падбегла да яе, перавярнула дагары, падаслала вышыванку пад спіну.*

*Немаўля выслізнула з улоння Кіці на дыванок, зайшлося плачам. Барвовая пляміна сцякла з яго-нага цела на вышыванку, абвесціла з'яўленне дзевятага калена цюхаазёрненскіх бубначоў Бубначоў кволым лісцікам-лептацэфалам* на вольнай дагэтуль галінцы.*

*— Бач, і дрэва прыдалося, а наракала: навошта вышываю, — сказала маці і падхапіла дзіця з вышыванкі. Ухутала бездапаможнае ружовае цельца ў гаржэтку, перадала Люцыку.*

*Люцык пераняў дзіця з рук старой, пагляд яго, асветлены радасцю, слізгануў па вадзе, упаў на вугрыка.*

*— Але ж жывучыя, заразы, — прамовіў задаволеным голасам і шпурнуў у тое месца, дзе стаілася рыбіна, драбок гліны.*

*Вугор махнуў хвастом, нібы ўсцешаны гэткаю ўвагаю да сваёй персоны, паважна выгнуўся ўсім целам, знік сярод багавіння.*

Стужка вынырнула на паверхню, агледзелася па баках. Парома ні паблізу, ні воддаль не было.

---

* Лептацэфал — ларва (малёнак) вугра даўжынёй 6—9 мм і формай у выглядзе вярбовага ліста.

Паўсюль, колькі бачыць магло вока, слаўся акіян. Значыць, аднесла сонную, падумала яна і ажно сцепанулася ад сполаху: гэтак і да бяды недалёка. Прыснеш знячэўку, хтосьці лясь зубамі — і канец. А ёй зараз такі фініш зусім недарэчы. Сотні тысяч малёнкаў даспяваюць у ёй, чакаюць свайго часу, і яна павінна, проста абавязана выпусціць іх на волю, даць калі яшчэ не жыццё, дык хоць шанц на яго. Нават калі і ўзамен на ўласную згубу — не мае значэння, лёс не выбіраюць.

І колькі ж часу яна вандравала сонна-непрытомная? Калі меркаваць па тым, як значна пасалянела вада, нямала, хоць якая розніца? Зараз галоўнае — не патрапіць у якую-небудзь пастку. Як шмат гадоў таму, калі падчапілі сеткаю ды вывалаклі во дзесьці гэтым якраз месцам на палубу цюхі з плоймаю рыштунку. Нешта ўсё абмяралі, разлічвалі-вылічалі, скончылася, на шчасце, тым, што ўсіх без вынятку выпусцілі ў акіян, пазначыўшы колькі асобін перад тым, як дараваць зноўку волю, незразумелымі меткамі. І што, як зноў дзе-небудзь падчэкваюць, каб тыя даследзіны паўтарыць?

Агромністы шар з сардзінаў вымкнуўся аднекуль з долу, павольна паплыў ёй насустрач. Яна сасупіла ўбок, не рызыкуючы патрапіць у калатнечу, што, памятала, заўжды спадарожнічаў во гэткаму шчытнаму рыбінаму гуртаванню, паплыла ўгору наўсцяж сілуэтаў тунцоў, што ўжо акружалі няшчасных. Паднялася па-над паверхняю, зляканая нягегласцю — косці, ды скура, ды вочы — уласнага адбітку, што азваўся кароткім паглядам з вады, папраставала далей, туды, адкуль усё часцей трапляліся насустрач і сведчылі пра блізкасць Цюханіі Прыморскай, а значыць, і мора Сяродморскага разбраклыя адзінокія бобіны...

...Яна страпянулася, усё яшчэ знаходзячыся ў палоне ўспамінаў, што чарадою пранесліся прад вачыма і стаялі, заслоненыя зыбкім, як восеньскі сонечны прамень, што прабіваецца паўз лістоту, мільгаценнем увачччу, адштурхнулася хвастом ад дна, накіравалася ўгору. Але сілаў было так мала, а водарасцяў так шмат на шляху, што і марыць даплыць да паверхні не было сэнсу. Яна памяняла накірунак, няспешна, бы падчас вечаровага шпацыру ў возеры, паплыла паўз гурму самцоў, якія па-ранейшаму кружлялі наўкола, усцяж аблепленага панцырамі малюскаў, ды ікрою, ды вугрынымі парэшткамі дна.

Плыла ды зноў і зноў згадвала, як калісьці ў азярку, растузаная зайздрасцю да матак, што маюць магчымасць люляць дзяцей, мроіла вось пра гэтую хвіліну. Згадвала ды дзякавала прыродзе, якая і да яе ўрэшце павярнулася тварам, адарыла шчасцем мацярынства, шанцам хоць па сконе займець нашчадкаў — даць жыццё таму, каго не тое што не давядзецца ніколі апекаваць, а нават хаця б аднойчы пабачыць.

Купка водарасцяў хіснулася ёй насустрач, сткалася ў харугву, спавіла, бы немаўля ў зыбцы, знашчанае колькімесячным голадам, змізарнелае цела паскамі сцяблінаў. Гэта было і нечакана, і да спазмаў у роце ўсцешна: упершыню тут, у моры Сяродморскім, хтосьці паклапаціўся пра яе, упершыню атуліў пяшчотаю і спачуваннем. Яна згадала, як абышліся колісь з надпісамі на харугвах ды крыжах насельнікі Азёрнай Цюханіі, і ёй нясцерпна захацелася выправіць іх аблуду — вярнуцца на харугву адпрэчаным сімвалам. А раптам нейкім чынам дойдзе да іх праз мораакіян апошні яе жэст і адзавецца ў іх жыцці нечым годным?

Яна падплыла ў сярэдзіну харугвы, выгнулася імем Бога Сына на тле сцяблінаў, замёрла нібы ў чаканні

чагосьці, што ні разу раней — ні ў возеры, ні цяпер, за тысячы вёрстаў ад яго, — не выпадала яшчэ ёй... Не выпадала там, але гэтак во неспадзявана выпала знябожанай душы тут, у моры-акіяне, на амаль кіламетровай глыбіні — за хвіліну да скону.

Спуджаныя нязвыклым відовішчам крабы ў паніцы рынуліся куды каторы. Прывід смерці, гэтак адчувальны наўкола яшчэ хвіліну таму, клубамі ўзняўся ад дна ўгору, рассыпаўся белавата-празрыстымі пухірамі сярод водарасцяў. Хтосьці вельмі падобны да Стужыка падплыў да харугвы, застыў перад ёю ў немым, што межаваў з адчаем, сполаху ад яе схуднелага, ледзьве жывога цела.

Цьмяныя, бы ад доўгага глядзення на святло плямы паплылі перад яе вачыма, і яна страціла раўнавагу. Перавярнулася на бок, застыла ў здранцвенні. Як шкада, што не стае моцы падняцца на паверхню!

Раптам купіна з выяваю Бога Сына адарвалася ад дна, быццам адгукаючыся на яе немы нутраны пазоў, падалася ўгору, пацягнула яе сцяблінамі водарасцяў за сабою.

Начное неба па-над морам нагадвала прадонне нерата з абрысамі Вялікага Каўша ўсярэдзіне. Такога вялікага і неабсяжнага, што апроч яго наўкола нічога не было бачна.

Сем зорак жахнулі з Каўша пукамі святла, ператварылі на імгненне ноч у дзень, пасеклі дашчэнту нерат, так, што ён рассыпаўся на друзочкі, і зноў у задуменні павіслі над вадою.

Яна падумала, што гэта, мабыць, ці не ўзнагарода ёй за штосьці, у салодкай знямозе прыхінулася шчыльней да харугвы.

Ёй згадалася гарохавае поле. Ды яшчэ — статкі празрыстых вугрыкаў-ларваў, што вылупіліся з пакінутых на дне мора ікрынак ды прастуюць, ускорм-

леныя харчам ад бацькоўскіх парэшткаў, пад покліч памяці продкаў у няведамую далеч, туды, дзе так страхавіта гучыць уранні падчас лову-палявання бой бубнаў, але ж і так прыгожа свеціцца-залаціцца паверхняю на схіле дня сярод кустоўя *ЯЕ* і *ІХ* возера. Колькі сетак ды нератаў і венцераў паўстануць на іх шляху, колькі нягодаў давядзецца ім пераадолець? Колькі іх загіне ў турбінах электрастанцый ды пашчах драпежнікаў, так і не пабачыўшы запаветных берагоў. Ды нічога: прыйдуць за імі малёнкі іншых плодных самак, больш спраўныя ды рухлівыя, і ўсё пачнецца нанова... Такі адвечны парадак жыцця, і хто ці што можа пярэчыць няўмольнай яго, аднойчы ўстаноўленай хадзе?

Гэта было апошняе, што яна дала рады падумаць. Цюшонак-нямко, той, што калісь вызваліў яе насуперак волі бацькі з акварыума, ды стары з ф'ёрда, ды шчасліва-стомленая — урэшце матка — Кіці з дыванком-выяваю васьмі каленаў продкаў за плячыма і немаўлём на руках па чарзе схіліліся наастатак над ёю, і ўсё знікла.